Іван Мележ

Завеі, снежань

Раман

Мінск
Мастацкая літаратура
1995

ББК 84 (4 Беі)6
М 47
УДК 882.6-93

Для старэйшага школьнага ўзросту

ISBN 985-02-0190-8

ЧАСТКА ПЕРШАЯ

Раздзел першы

1

Снег пацерушыў трохі і перастаў. Вецер за дзень вымеў белую муку, пазаганяў яе па шчылінах, па закутках. Яркія белыя пасы і латкі толькі дзе-нідзе пярэсцілі панурасць двароў і агародаў.

А холад не толькі не адступіў, а як бы нават узяўся мацней. І днямі, і начамі ўсё стыла на роўнай, шкляной халадэчы. І днямі, і начамі, не сціхаючы, гайсаў над зямлёй сухі, сіверны вецер, сунуліся нізкія шэрыя хмары. Пад нелагодным небам, вылізаныя ветрам, цьмяна льсніліся заледзянелыя лужы на вуліцы, балотныя разлівы, што падступалі да голых зараснікаў. І тыдзень, і другі лічылі толькі халады ды сцюдзёныя вятры: на самым разыходзе восені і зімы нібы раптам прыпыніўся адвечны рух прыроды; восень адышла, а зіма не бралася як след. Усё жыло, здавалася, чаканнем снегу. Чакалі парадзелыя, чорныя алешнікі на балоце, гладкая, бліскотная роўнядзь разліваў і луж, гарбатыя, крывыя рады хат і гумнаў, цвёрдыя, у скамянелых грудках і каляінах дарогі, бясколерная, нежывая трава...

Далёка да позняга ў гэтыя дні світанку ўставала Ганна, вобмацкам выбіралася ў вузкую каморку кухні, поцемкі намацвала запалкі, лямпу. Лупіла бульбу, паліла ў печы, распальвала дзве грубкі ў калідоры, што павінны былі грэць класы, грубку на пакой другой настаўніцы, пачынала варыць снеданне. У клопаце сваім ніколі не прапускала той момант, калі на звонкім, намерзлым двары паяўляліся першыя галасы, патрэскваў ад першых крокаў ганак. Пад тупат і гоман, што ўсё мацнелі, множыліся, весялей было ўпраўляцца са сваім клопатам, самую поўніла беспрычынная радасць. Яна ўжо без здзіўленасці і без няёмкасці хадзіла ў калідоры сярод таўкатні дзяцей, якім да самага званка не сядзелася ў класе; ды і дзеці ўжо не дзівіліся ёй. Яна цяпер нямала каго ведала: з якога класа, як зваць, які характарам, з кім дружыць. Амаль са ўсімі яна абыходзілася, як знаёмая.

Пад той час, калі дзеці сыходзіліся ўсе, грубкі былі выпалены, у класах было цёпла, утульна, снеданне для Параскі прыгатавана. Калі звінеў званок і Параска з журналам, кніжкамі і сшыткамі, важная, строгая, выходзіла ў клас, Ганне наступаў доўгі час цішыні, у які можна было не спяшацца; можна было чуць сябе дзіўна, нязвыкла

вольнай ад пільных абавязкаў. Колькі таго трэба было хуткай Ганне, каб прыбраць у пакоі, прыгатаваць абед: яна часта не ведала, што б яшчэ зрабіць, куды дзець сябе. У такім настроі Ганна любіла прыслухоўвацца да галасоў у класах, радавалася вірліваму тлуму перапынкаў, не разумела Галіну Іванаўну, якая моршчылася ад галаўнога болю і крычала на дзяцей, каб прыціхлі.

Ганна была давольная, што школа жыла з ранку да позняга вечара. Толькі перад вечарам і ў пачатку вечара – гадзіны дзве-тры – маўчалі пустыя класы. Тады ўвальваліся хлопцы, дзядзькі, цёткі: уціснуўшыся ў світах і кажухах у дзіцячыя парты і між доўгіх сталоў, разгортвалі па загаду Параскі газеты і кніжкі, чыталі, адказвалі ёй; часам збіраліся самі, на сход, – гаманілі, крычалі, іншы раз да мацюкоў, абмяркоўвалі свае арцельныя справы; дымілі так, што ў калідоры кашлялі. Раз сабралася купка маладых, дзверы зашчапілі з калідора: развучвалі з Параскай спектакль. Доўгі, нязграбны хлопец Мікалай, запхнуўшы пад сарочку згорнуты пінжак, паказваў пузатага багацея-кулака; другі, трохі шапялявы Апанас, выдаваў з сябе папа. Злосны Мікалай з хітрым Апанасам згаворваліся, як настрашыць людзей, каб яны баяліся ісці ў калектыў. Удвух яны пускалі ўсялякія плёткі, гразіліся божаю караю, і людзі дрыжалі перад калектывам і адмаўляліся ісці, але прыходзіла Параска, смелая і разумная камсамолка з горада, выкрывала плёткі кулака і папа, звала людзей у калектыў, і людзі дружна падымалі рукі за калгас і спявалі «Інтэрнацыянал»...

Параска, у чырвонай хустачцы, завязанай ззаду, у белай, з кароткімі рукавамі кофтачцы, не толькі з запалам гаварыла за камсамолку, але і паказвала Мікалаю, Апанасу, усім іншым, як трэба ім хадзіць, гразіцца, паказваць страх. Пакуль дайшлі да канца п'есы, Параска стамілася, але гаварыла весела, падбадзёрвала ўсіх; згарнуўшы сшытак з п'есаю, здаволена сказала, што будзе добрая пастаноўка. Ужо калі засталіся адны, падміргнуўшы Ганне, пагразілася, што ў новай п'есе і Ганне падбярэ ролю!

Ганна смехам жа адказала, што нічога, мабыць, у яе не выйдзе. Не здатная яна, Ганна, на такія штукарствы!

2

Ганна і Парасцы, і ўсім, хто цікавіўся, як ёй жывецца цяпер, паказвала, што яна шчаслівая і нават бесклапотная. Але калі праўда, што яна, як бы там ні было, радая была вялікаю, такою чаканаю пераменаю ў сваім жыцці, то ніякай бесклапотнасці яна не знала.

Пільна схаваны ад людскіх вачэй неспакой жыў у ёй, насцярожваў, не даваў поўна, шырока цешыцца радасцю вызвалення. Як ні цвёрда стаяла перад Яўхімам, калі ён дабраўся сюды, як ні смела, ганарліва адказвала на яго пагрозы, абяцанне яго: «Усё роўна без мяне табе не жыць» – увесь час помніла; як папярэджанне, якое абавязвала быць заўсёды напагатове. Яна знарок пасміхвалася са сваёй трывогі: і сцены школы, і Парасчына заступніцтва, і само новае становішча – нагадвала яна сабе – давалі ёй чуць сябе тут усё ж у бяспецы, але цвярозы розум не драмаў, напамінаў няспынна, што бяспека гэта не вельмі надзейная. Хто яго можа стрымаць, калі ён уварвецца сюды, разлютаваны, з нажом; або ж хіба цяжка яму падцікаваць яе на двары, на ганку. Ледзь не ўвесь час цягнула яе да акна на вуліцу, прымушала ўслухоўвацца ў крокі дарослых, у галасы.

З гэтым неспакоем жыў у Ганне яшчэ адзін, пра які ніхто не толькі не ведаў, а і не мог здагадвацца, але да якога яна ўсё больш звыкала і які ўсё больш вызначаў, як ёй быць, што рабіць далей. Трэці месяц у Ганне расло, дужэла, заяўляла пра сябе дзіця. Несказаўшы нікому слова пра яго, Ганна, мяркуючы, як жыць далей, ужо нязменна прымяркоўвала і яго. З ім у Ганніна жыццё ішло багата невядомага, багата такога, што давала яе думкам пра будучыню няпэўнасць. Як ёй, адной, з ім, калі і самой між зямлёй і небам жыць даводзіцца? Калі – гэта ж ясна – давядзецца выйсці з гэтага, няхай сабе не вельмі надзейнага, а ўсё-ткі ж знойдзенага прытулку. Гэта ж ясна – не жыць жа ёй тут, калі прыйдзе пара раджаць! Трэба будзе кудысьці ісці – куды, хто прыме ад яе малое? Цяпер, калі яна і думаць не можа пра тое, каб хоць пад якім прымусам вярнуцца ў Курані...

У гэтыя турботы нязменна ўлазілі горкія думкі, што от суджана малому, якое яшчэ не нарадзілася, спатыкацца з бядою. Паявіцца, быць без бацькі. Невядома як быць. Не раз сярод гэтых разваг цяжка, супярэчліва ўспамінала яна Васіля. Яна ведала, што дзіця – не Васілёва. Ад Яўхіма. Цяпер, калі гарачкавы чад хапаткіх сустрэч, хваравітай прагі шчасця, ліхаманкавых надзей сышоў, яна думала цвяроза, што Васіль, калі б сышліся, сталі жыць разам, – пакуль не прывык бы, мабыць, нядобра глядзеў бы на малое. Злаваў бы на яе. Раней, у тым гарачкавым імкненні, гэта не толькі не стрымлівала яе, а нібы не даходзіла добра да галавы; дзіўна ўпэўнена, лёгка думала: прывыкне хутка, злагодзіцца. Цяпер, працверазелая, яна не думала пра гэта з такой лёгкасцю, але, хоць і ведала, што няпроста і не адразу прымірыўся б ён з малым, была і цяпер упэўнена: прывык бы ўсё ж, прымірыўся б. Маглі б жыць добра, шчасліва! Малое не

шкодзіла б іх шчасцю, як і яго сын, калі б ён узяў з сабою! Таму і цяпер, між блытаніны разваг пра сённяшняе, пра заўтрашняе, не раз ажывала, ныла крыўда на тое, што ён, Васіль, мала любіў яе, не захацеў пераступіць усяго. Не паслухаўся яе, не падаўся разам. Удваіх было б усё інакш.

У хвіліны спакойнай разважнасці крыўду змяняў одум: ці ж Васіль вінаваты ў тым, што не можа пайсці? Ці ж можна вінаваціць чалавека, што ён жыве так, як умее? Як душа вядзе? Што ён не можа іначай, што яму так цяжка мяняць? Што тое, што аднаму лёгка, другому – такое цяжкае, што сілы не мае пераступіць! Была пара, лёгка было ім, вольным, само, здаецца, шчасце ішло. Бяры яго, шчасце, ды дзякуй долі, дык – не ўзяла, дурная! Страціла з-за дурной сваёй галавы! Назаўсёды страціла! Не хлопец, не вольны цяпер. Гаспадарку зладзіў сваю, столькі сілы ўпяў, столькі агораў. Прыкіпеў душою, душу ўсю аддаў. Калі б і кінуў усё, пайшоў з ёю, багата б там асталося. Не вольны. Не можа. Свая дарога. Неахвотна, прымушаючы сябе, адступалася, адрывала яго ад сваіх надзей: няма чаго хапацца за тое, што прапала. Трэба жыць тым, што дае доля. Жыць адной. Меркаваць адной.

Думала не раз пра Курані: што там гавораць пра яе? Стараючыся адгадаць, яна амаль чула галасы: спачуванне, асуджэнне, ухвалу. Сярод іншых згадвала – насцярожана – мачыху, лагодна, журліва – бацьку: як ён перажыў падзею гэту ў несамавітай долі сваёй дачкі?

Даведаліся ж, пэўна, дзе яна. Не могуць не даведацца. Павінны, мабыць, прыехаць скора...

Яны прыехалі на другі дзень пасля таго, як заявіўся Яўхім.

Ганна толькі памыла падлогу ў Парасчыным пакоі, выйшла з вядром бруднай вады на ганак, калі ўгледзела, што з вуліцы на шырокі школьны двор уязджаюць калёсы. Адразу насцярожана стала: пазнала – перад калёсамі ступаў сівы бацькаў конь. Яна кінулася назад, ткнула вядро ў куток кухні, хапатліва апусціла падаткнуты край спадніцы, хутка выцерла ногі, рукі.

Ступіла ў Парасчын пакой, па мокрай яшчэ падлозе падышла да акна. З хваляваннем, з неспакоем сачыла: бацька спыніўся сярод двара, няўпэўнена агледзеўся. Мачыха кіўнула ў бок школы, штосьці сказала, але ён, крутнуўшы нязгодна галавою, палез з калёс, стаў наматваць вожкі на ручку. Кінуў каню сена. Мачыха таксама злезла з калёс, настрылася позіркам на школу. Ганна схамянулася, выйшла на ганак. З ганка ступенька за ступенькай сышла ўніз.

Мачыха ўзрадавана засняшалася насустрач. Бацька замітусіўся, узяў з воза клунак, таксама пайшоў хапаючыся, быццам баяўся спазніцца. Мачыха паздаровалася, пацалавалася, бацька ад хвалявання толькі любасна, жаласна заморгаў вачыма.

– Мы тут падушку ды коўдру прывезлі, – сказала дзелавіта мачыха. Яна трымалася спакойна, з такім выглядам, быццам нічога і не здарылася асаблівага.

– От ето добра, – спакойна ж адказала Ганна. Са спакойнай жа гасціннасцю запрасіла: – Заходзьце. Гасцямі будзеце!.. Дайце мне клунак, тато!

– Да ўжэ данясу, – не згадзіўся бацька.

Яна першая пайшла ў калідор, у баковачку кухні. У кухні заўважыла: мачыха, прыціхлая, пільная, азіраецца, разглядвае ўсё навокал, бацька стаіць няёмка, не зварухнецца – трымае на руках клунак. Ганна ўзяла клунак, ускінула на печ, каб не маўчаць, растлумачыла:

– Ето – кухня. Тут я гатую...

Мачыха кіўнула спрытнай галоўкай:

– Аге.

Падала абаім табурэткі. Бацька сеў асцярожна, сядзеў напружаны, не зводзіў з Ганны ўважлівых, спачувальных вачэй. У пакой убегла вясёлая, з бляскам у вачах Параска, мачыха адразу падхапілася, дала «добры дзень». Устаў, пакланіўся бацька.

– Ето бацько з маткаю прыехалі, – сказала Ганна.

– Праведаць захацелася... – памагла мачыха.

– А-а! Я так і падумала! Як пабачыла, што ідуць, – рашыла: не інакш – бацькі!.. Вельмі добра! – пахваліла яна так, быццам прыехалі да яе. – Сваякі не павінны забывацца на сваіх!

– Хто ж думае... – падхапіла мачыха.

– Я і кажу – вельмі добра!.. Толькі што гэта вы сядзіце так? Чаму гэта вас не просяць распранууцца? Не частуюць чаму? – Бацька сказаў, што нічога не трэба, але Параска слухаць не хацела: – Ганначка, самавар гасцям! Чаю з варэннем клубнічным!.. – Яна прыслухалася: з класа, які яна пакінула, ішоў гоман, недавольна пакруціла галавой: – На хвіліну пакінуць адных нельга! – Выскачыла з кухні.

Мачыха сказала, як бы не верачы: харошая якая. Ганна адазвалася з захапленнем: харошая! Схамянулася, падбегла да самавара, дастала з печы гарачага вуголля, укінула ў трубу. Пакуль яна гнулася каля самавара, мачыха не ўтрывала, прыадчыніла дзверы

ў Парасчын пакой, зазірнула. Зачыніўшы, стуліла сухія губы, паківала галавой Чарнушку:

– Чысто, як у паноў!

Яна хацела глянуць і ў другі пакой, Галіны Іванаўны, але раптам зазвінеў званок, і яна спалохана адскочыла ад дзвярэй. Борздзенька села на табурэтку, ураз нагнала на сябе выгляд ціхі, нясмелы. Адразу пасля гэтага ўвайшла Галіна Іванаўна, нелагодна зіркнула на абаіх, моўчкі прайшла ў свой пакой. Пазней зноў зайшла Параска, стала распытваць, як жывецца, хваліць Ганну за працавітасць, за розум. У калідоры між тым бушавалі тупат, крыкі, потым – было падобна – пачалася нават бойка. Параска ўсхапілася, кінулася туды...

Пасля перапынку, калі Галіна Іванаўна зноў моўчкі прайшла праз кухню і ў калідоры стала ціха, распрануўшыся ўжо, асцярожна налівалі ў сподачкі чай, сёрбалі і амаль увесь час маўчалі. Мачыха піла ўпраўна, і варэнне спытала добра, і хваліла яго, бацька цягнуў ваду без смаку, да варэння не дакрануўся. Глядзеў усё жаласнымі, трывожнымі вачыма; па вачах відаць было, як шкадаваў, трывожыўся. Ганне аж супакоіць яго хацелася.

Напіўшыся, выціраючы яшчэ чырванейшы, потны твар, мачыха хвіліну сядзела важная, сур'ёзная. Як бы паказваючы, што цяпер пара пра галоўнае пачаць.

– Буў ужэ?.. – не то запытала, не то адзначыла проста. Ганна зразумела – пра Яўхіма гаворыць.

– Буў.

Мачыха сур'ёзна стуліла губы. Уздыхнула.

– І к нам прыходзіў. Гразіўся.

– Няхай грозіцца! – Ганна весела ўстала, накрыла слоік з варэннем. – Тут таксамо страшыў! Да я астудзіла трохі!

Бацька не павесялеў ад яе слоў. На твары паявілася нешта нават такое, нібы папракнуць хацеў.

– Ты асцярожней будзь, – папрасіў лагодна. – Ён – паганы...

– Аге, ён калі пагразіўся, дак нешто думае, – павучальна дадала мачыха. – Ты ўсё-такі бойся!

– Не такі ён страшны, – разважліва ўжо, каб не трывожыць лішне бацьку, прамовіла Ганна.

– Страшны не страшны, а – асцярожней будзь.

– Да ўжэ ж, сама не палезу на ражон.

Зноў папілі чаю са сподачкаў і сталі збірацца. Ужо каля калёс, перад тым як развітацца, бацька яшчэ нагадаў:

– Ён – паганы. Не адступіцца так... Ну, і тое – беражонага – Бог беражэ...

– Ето праўда, – стуліўшы губы, кіўнула мачыха.

Ганна не стала пярэчыць. Бацька раптам болесна скрывіўся, ледзь не заплакаў. Але стрымаўся.

– Калі што трэба будзе, накажы.

– Накажу.

Пасля іх было маркотна, трывожна думала пра Яўхіма. Але з усім была і палёгка: цяпер ведала, як яны там, пасля ўсяго, што яна зрабіла.

Пад вечар таго ж дня заехаў Міканор. Прывязаў каня каля плота, доўга атрэсваўся каля калёс, выціраў запыленыя боты. На ганку ўжо прыпыніўся, агледзеў сябе яшчэ раз, абцягнуў пінжак, з калідора громка, смела пастукаў.

Ганна, хоць у акно бачыла ўжо, запыталася, хто там; а калі ён брава ўвайшоў, акінуўшы позіркам яго нацятую постаць, сказала радасна:

– О, Міканор сам! Не забывае сваіх куранёўскіх!

– А чаго ж забываць, – у тон адказаў Міканор. – Ето от штоб некаторыя куранёўскія не зазналіся. Не забылі сваіх!..

Ён, адразу заўважыўшы, што Параскі няма, прыслухаўся, ці не чуваць на кухні, у класах. Ганна перахапіла яго, з насмешачкай памагла:

– Параскевы Андрэеўны няма. Пайшла на сяло. Саўсім нядаўна.

Ён нібы не заўважыў яе насмешкі, знарок спакойна патупаў, зірнуў у акно да каня.

– Ехаў от з Юравіч. Дай, думаю, пагляджу, як жывуць...

– Жывем от неяк. Не жалуемся. – Падчапіла: – Каб часцей заязджалі некаторыя, дак, можа б, шчэ лепей жылі.

– На адчот у райком вызывалі, – нібы не заўважыў ён жарту. – Як да зімы падгатовіліся. – Міканор сеў на крэсла каля стала са сшыткамі, узяў адзін, разгарнуў. – Ето ж сколькі труда трэба, штоб навучыць чалавека розуму!..

– Ну, і што там у раёне? Пахвалілі?

– Усяго было. Трохі пакрыцікавалі. Далі саветы. Усё як палажано. – Міканор устаў, ступіў некалькі крокаў спакойна, павольна. Глянуў на Ганну, што сачыла з усмешачкай. Нібы не бачачы гэту ўсмешачку, пахваліў: – Усё-такі набралася духу! Дала адстаўку Глушаку! Даўно трэба было!

– От не магла дадумацца сама! А ты не падказаў!

– Сама думаць павінна б! Е галава на плячах!.. – Прайшоўся яшчэ трохі, сказаў тонам, у якім таілася нешта грознае: – Нічого.

Скора возьмемся так, што заенчаць Глушакі! Канчаецца іх панаванне! Так што ты не бойся!.. Буў, кажуць, ужэ?

– Буў...

– Не бойся!

– Дзякую за падмогу. Толькі я – не баюся.

– От і правільно.

Ганна падумала раптам, што і ходзіць, і гаворыць ён так, быццам Параска бачыць і слухае яго. Ёй стала смешна за яго. Міканор улавіў кплівы яе позірк, недавольна нахмурыўся.

– Твой Дзятлік от за розум не бярэцца! – прамовіў строга, з папрокам. – Пагано можа кончыцца!

Ганна перастала смяяцца.

– А ты б памог яму. Падышоў бы як трэба.

– К яму падыдзеш! Толькі загаворыш, морду адварочвае!

– Значыць, гаворыш так! Ты ж так гаворыш, што часто і не зразумееш, ці ты раіш, ці загадуеш! Як камандуеш усё адно!

– Нагаварыўся ўжэ, аж у роце горко! Увесь час таўчэш адно, а яны хоць бы варухнуліся!

– Так ето проста варухнуцца! Даў загад – і зразу ўсе штоб пагналі ўсё ў камуну! Пабеглі, падскокуючы з радасці!

Міканор зазлаваў. Не стрымліваўся ўжо:

– Ты ўсё знаеш! Усе падходы!

– Знаю, – сказала яна, зноў нібы ўсміхнуўшыся. – А і табе знаць бы трэба! Калі за гуж узяўся.

Ён толькі ўзлавана зіркнуў. Хаваючы злосць, падышоў да стала, зноў разгарнуў сшытак, стаў разглядаць.

– Ты ето, можа, прыйшоў, кеб указанне Парасцы даць, як вучыць?

– А што ж, думаеш, не магу? – Ён зноў гаварыў паблажліва: – Маю право на ето!

– То-то я і гляджу: прыйшоў важны! Прыбраўся! – Хацела стрымацца і не магла, дадала кпліва і сур'ёзна: – Е ўжэ ў яе, каму ўказваць!

– Мало хто е...

– Не мало і не багато. Адзін.

Міканор момант вагаўся. Зірнуў з асцярогай.

– Хто ето?

– Ён. Знаеш...

Міканор спахмурнеў. Знае. Невясёлы, ссутулены, доўга маўчаў. Лістаў, не бачачы, сшыткі. Нарэшце схамянуўся, устаў.

– Трэба ехаць. – Пастараўся ўсміхнуцца. – Есці хочацца. А зямлячкі не частуюць... Бацьку, можа, што перадаць?

– Буў тут сам.

Падаў здаровую, абыякавую руку. Ужо без смеху, шчыра яна папрасіла:

– Прыязджай. Хоць – па дарозе...

– Будзе час – заеду...

Яна потым пашкадавала: нашто растрывожыла яго? Але адразу ж запярэчыла сабе: няхай не дзярэ галаву вельмі! І попусту няхай не цешыцца!..

Раздзел другі

1

Наступным вечарам неспадзеўкі прынесла Дубадзела. Дужы, жылаваты, у шынялі і ў ваеннай шапцы, крывароты, адразу заўважыла Ганна, трымаўся неяк нязвыкла ліслівa і разам афіцыйна, і гэта зацікавіла яе. Ён неахвотна прысеў на крэсла, калі Параска, таксама цікаўна зірнуўшы на яго, запрасіла сесці, мякка сказаў, што сядзець асабліва няма калі – справы. Пра гэта гаварыў, здавалася, не толькі ўвесь яго выгляд, але і палатняны партфель, які Дубадзел трымаў на каленях і па якім неспакойна бегалі яго пальцы.

– Ну, не ўвесь час справамі аднымі займацца? – хітравата зірнула Параска, падымаючы галаву ад сшыткаў, якія правярала.

– Увесь не ўвесь. А гуляць, можно сказаць, некалі...

– Вам жа не трэба сшыткаў правяраць! І непісьменных вы грамаце не вучыце! Часу ў вас павінна быць аж лішне!

– Дыхнуць некалі! Як у раён перайшоў!

Ён, пасля таго як не выбралі ў сельсавеце, уладзіўся раённым упаўнаважаным. Невялікае, але ўсё ж начальства, з партфелем ходзіць! І палёгку даць, і прыціснуць можа, што ні кажы – раённы прадстаўнік! Недарэмна частуюць ледзь не ўсюды! Ганна заўважыла неспакойны бляск у яго вачах, падумала: і цяпер от, не інакш, з пачастунку! Аж шрам каля рота пачырванеў!

Дубадзел перахапіў яе позірк, кіўнуў, каб выйшла на ганак. Яна павяла плячыма, нібы не зразумела. Ён падумаў, устаў, строга афіцыйным тонам вялеў:

– Ганна, прашу выйсці.

– Чаго ето?

– Дзело есць! Выясніць трэба...

– Дак выясняй тут.

Ён ніякава памаўчаў. Скоса, асцярожліва зірнуў на Параску. Перавёў позірк на Ганну, недаволына пакруціў галавою: нездагадлівая!

– Пры пастаронніх нельга...

Параска адразу адгукнулася:

– Дык я магу выйсці!

– Не, вы работайце! – Ён сказаў нецярпліва, патрабуючы: – Часу няма. Выйдзі!

Ну што ж. Ганна, не апранаючыся, выйшла ў калідор. Ён папрасіў выйсці на ганак. Паслухалася. На ганку стала.

– Ну, выясняй.

– Хадзем трохі шчэ, – лагодна ўзяў за руку.

– Не хочу.

– От скула ж ты! – засмяяўся, як бы хвалячы. – Усё па-свойму гнеш!

– Ну, што ты хацеў выясніць?

Ён выпусціў яе руку, важна прамовіў:

– Ты ето правільно зрабіла, што Глушака кінула.

– Дак ты для етаго і пазваў – штоб пахваліць?

– Ну язык! – Ён зноў засмяяўся, як бы хвалячы. Сказаў: – Правільно. Хваціць гнуць карак на іх!

Дубадзел узяў яе за руку. Ганна хацела зразу ж адабраць яе, але ён не аддаў. Пацягнуў Ганну да сябе. Аж заванітавала: дыхнуў гарэлкай.

– Т-ты што ето?! – здзівілася нібы.

– А нічого! – забулькаў брыдкі смех. – Паўхаджуваць от хочу за табою.

– Унё! Дак для етаго трэба было цягнуць сюды? На холад. – Холад такі браў яе. Асабліва мерзла спіна. – Паўхаджуваў бы там. Перад Параскаю.

– Наравішся ты мне! – як бы не заўважыў ён кпіны, усё цягнуў да сябе. Яна цвёрда ўперлася яму ў грудзі. – Ну, чаго ты? Н-не нараўлюся?

– Не наравішся.

Рукі яго трохі паслабелі. Але ён усё ж не выпусціў яе.

– Чаму ето?

– А не знаю. Просто – гадкі.

Чула: гэта яго нібы ўдарыла. Момант разгублена маўчаў. Потым сказаў злосна:

– Чаго дзярэш нос?

Яна спакойна загадала:

– Пусці!

Дубадзел пусціў.

– Няма чаго дзеўку строіць з сябе! Не знаю, думаеш, як ты з етым Дзятлікам на гумне?

– Знаеш?

– Знаю.

– Дак старайся не забыць!

Гэта здзеклівая парада раз'ятрыла яго.

– Чаго дзярэш нос, кулацкая падсцілка!

Яна стрывала, прамовіла з пагардай:

– Ето ўсё, для чаго ты пазваў мяне?

– Т-ты шчэ пашкадуеш аб етом! – выціснуў ён люта.

– Тады тое будзе!

Ганна спакойна зачыніла дзверы.

Калі ўвайшла, Параска зірнула ад сшыткаў гулліва, падсмейваючыся:

– Ну што, пагаварылі?

– Пагаварылі, – Ганна сказала такім тонам, што ўсмешка на Парасчыных губах замерла.

Параска ўглядзелася ўважліва і не стала распытваць. Нахілілася зноў над сшыткамі. На кухні, на адзіноце, Ганна дала волю гневу: «Ах ты, гад, гад, як абазваў, аж успомніць гадко!» Старалася суцешыць сябе: добра ўпякла яго – адскочыў адразу; але гнеў не сціхаў. «Думае, як я адна, дак і ўсё можно. Прыходзь дый бяры, рада будзе... Кінецца сама! Аге, толькі цябе мне і не хапало... Ждала, не магла даждацца!.. Грозіцца яшчэ: «Пашкадуеш!» Пашкадую, ды пра другое! Што не плюнула ў вочы!..»

Неўзабаве супакоіла сябе зусім: ёсць перажываць з-за каго!

Праз дзень прыйшоў яшчэ чалавек. Быў вечар, позні вечар, хутка павінны былі кончыцца вячэрнія заняткі – са старымі, калі Ганна пачула, што ў калідор нехта зайшоў. Пашаргаў у цемры лапцямі, стаў, мабыць, не ведаў, куды ісці.

Яна адчыніла дзверы ў калідор, глянула ў змрок.

– Хто тут?

Ён стаяў наводдаль, са святла ў змроку калідора ледзь відна была постаць. Яна не так пазнала, як здагадалася.

– Ты?..

Голас яе дрыжаў. Яна ўмомант захвалявалася. Узрадавалася: прыйшоў! Радасць нядаўніх сустрэч першая ажыла.

Ён паволі, таксама ўзрадаваны, падаўся насустрач.

– Заходзь!

Калі ён асцярожліва зайшоў, амаль заплюшчыўся ад святла, у яшчэ летняй шапцы, у расшпіленай свіце, яна ўзрадавана прыпала да яго позіркам, але амаль нічога добра не бачыла. На міг недарэчы заўважыла нейкі белы пыл на рукаве: снег, ці што? – і больш нічога, што б здзівіла неяк. Усё было такое знаёмае, роднае. Гледзячы на яго, яна не так бачыла, як адчувала, можна сказаць, толькі адчувала. Быццам стаялі, прытуліўшыся...

Ён, хмурачыся, няёмка, як бы недаверліва агледзеўся. Хмурыўся ён, можа, ад святла, але ёй падумалася, што яму не падабаецца тут. Яна схамянулася. Накінула на плечы хустку. Рашуча ступіла ў калідор.

– Хадзем!

Выйшлі на ганак – на цемру, на вецер. Момант здавалася, быццам нічога іншага не было, толькі спатканні. Усё было, як тады перад гумном, пад яблыняю. Як у гумне.

Ішлі хутка, нецярпліва. Нецярплівa стала. У баку ад дарогі, каб не зашкодзіў ніхто.

– Прыехаў! Не забыў! – Голас яе перарываўся.

– Не...

– Я думала, забыў!

– Скажаш!..

– Не прыязджаў доўго!

Ён памаўчаў.

– Не так просто...

Яна зразумела недагаворанае: не так проста вырвацца. Маня, матка, суседзі. Усе сочаць. Абавязкі перад сваімі. У радасць яе ўліўся нядобры халадок. Не так проста. Не так проста!

– Ты прыйшоў? – спытала стрымана.

– Прыехаў...

– З дому?

– З Алешнікаў... – Ён дадаў: – Муку малоў...

Яна запытала, абы не маўчаць:

– А дзе – калёсы?

– На вуліцы.

Узялі дрыжыкі. Пачула, які халодны вецер. Трэба было хоць бы накінуць каптан. Выскачыла згарача!

– Як ты тут? – пачула.

Смутак, трывога, любоў былі ў голасе.

– А нічого. – Пастаралася схаваць гаркату. – Жыву... Добра жыву... А – ты?

– Ат...

Многа сказала ёй гэтае «ат»!

– Маня – як? – не стрымала раўнівае.

– Што ёй...

– А сын?

– Расце...

Нялёгка было гаварыць: за тым, што казалі, было багата іншага, пра што і казаць не хочацца, і забыць не забываецца. Таму ахвотна маўчалі.

Але і маўчанне было поўнае хвалявання.

– Землю адабралі! – нібы паскардзіўся ён. Яна пачула ў голасе адчай. – Усю, што каля цагельні.

– Мне казалі, – паспачувала яна.

– Пасеянае перааралі. Міканор усё...

Ён, здалося, чакаў, што яна паспачувае. Скажа нядобрае пра Міканора. Яна не сказала. Нашто вярэдзіць лішне боль яго.

– Не знаю, што будзе, – зноў пачула адчай.

– Будзе нешта. – Спакойна, супакойліва сказала: – Горай, як було, не будзе.

Ён падумаў над тым, што сказала.

– Можа і горай буць.

– Не будзе.

Яна была ўпэўнена ў гэтым. Зноў маўчалі. Гуляў вецер, халадзіў шыю, плечы. Бралі дрыжыкі.

– Ты не абіжаішся на мяне? – прамовіў ён ціха. Як бы нясмела і вінавата. Насцярожыўся, чакаючы, што яна адкажа.

– Не-а, – сказала яна спакойна. Нібы здзівілася: – Чаго абіжацца?

Ён узрадаваўся. Памкнуўся да яе, хацеў, здалося, абняць. Але стрымаўся. Не наважыўся. Усё ж нейкая вясёласць, зухаватасць была, калі гаварыў:

– Чорт яго знае, запуталася ўсё!..

– Запуталася...

– Што будзе, адзін Бог знае!..

Ён быццам апраўдваўся перад ёю. Вінаватым усё чуў сябе, хоць яна і знаку не падавала на гэта. Нашто ён пра гэта – вінаваты не вінаваты, што ад таго? Лягчэй хіба стане?

– Як ты будзеш далей? – пачула зноў вінаватую заклапочанасць.

– А так і буду.

– Ты не абіжайся, – зноў папрасіў. – Калі б можно було!..

Ну, нашто ён гэта! Як бы яна вінаваціць! Не вінаваціць яна нікога: кожны жыве як можа. Кожны сам за сваю долю вінаваты.

– Не абіжаюся я.

Ён усё ж наважыўся. Абняў на развітанне, нясмела, нязграбна. Быццам не абдымаў ніколі. Яна не развяла яго рукі, але і не прыгарнулася вельмі. Як бы не ўзрадавалася. Ён адразу чула заўважыў гэта, стрымаўся. Дужыя, нецярплівыя рукі яго аслабелі. Абняўшы, ён нібы не ведаў, што рабіць. Стаялі моўчкі, нерухома. Было непагана, але ўжо не было так, як раней. Чагосьці ўжо не хапала. Халаднаватасць была ўжо нейкая.

Ён пацалаваў. Яна адказала. Але таксама спакойна – нібы з успаміну пра тое, што было.

– Дак бувай...

– Бувай...

Пастаяла, паслухала, як стукаюць яго калёсы ўпоцемку. Па мёрзлай, скамянелай зямлі.

2

Тады, як Ганна кінула Яўхіма, жыццё, здавалася яму, страціла ўсякі лад. Як ні няскладна ішло несамавітае яго жыццё дагэтуль, усё ж быў яшчэ ў жыцці гэтым хоць трохі звыклы, заведзены людзьмі распарадак, быў хоць для людскіх вачэй нейкі выгляд гаспадаркі, сямейнай асновы. Была, няхай ненадзейная, паганая, гаспадыня, жонка, было каму загадваць, каго ўпікаць, на кім спаганяць злосць...

Ён і не ведаў раней, як багата значыла ў нецікавым жыцці яго паганая, здавалася, ненавісная жонка. Толькі цяпер, калі яна ўцякла, знікла, адчуў, злуючыся на сябе і на яе, Яўхім, як дзіўна, неадольна апусцела ўсё ў хаце, ува ўсім жыцці яго, якім зрабілася ўсё бяссэнсным, бязглуздым. Злосць была на Ганну тым большая, што ў шал злосці амаль нязменна ўліваўся непатрэбны, горкі струменьчык прыкра кволай крыўды за тое, што от, паганая, не палюбіла, не пашкадавала, кінула ў такі час, кінула на сорам перад усім сялом; што з-за яе, паганай, столькі болю, прыкрасці яму, што, як ні стараецца, не можа плюнуць на яе, сцерці са свае памяці; не можа, нібы наканавана, жыць без яе.

«Сука! Гадзіна!» – кляў ён не раз. «Закаешся! Навек закаешся! Папомніш!» – гразіўся ён. Сланяючыся па двары, пакутуючы бяссонніцай начамі, ён у гарачай ліхаманцы, прагнучы помсты, строіў сабе малюнкі адплаты, біў у салодкім шале па ненавісным твары, ламаў упартыя рукі. Былі хвіліны, калі ён, прагнучы патолі, гатоў быў ухапіцца за сякеру, згадваў схаваны ў застрэшшы абрэз. Ні праклёны, ні грозьбы не давалі палёгкі: хоць не ведаў гэтага, любіў яе, паганую,

ненавісную, па-ранейшаму любіў дурной, як хвароба, неадчэпнай любоўю.

З таго дня, як Ганна ўцякла, як ніколі, нямілым стаў яму родны двор. Не, Яўхім не ва ўсім быў падобны на старога Глушака: жыццялюбны, ахвочы да жыццёвых уцех, ён і раней без вялікай радасці цягнуў на сабе цяжар гаспадарчых клопатаў, цяпер клопаты гэтыя сталі зусім прыкрымі. Ён амаль перастаў гаспадарыць. Каб не бацькі, якія цяпер трымалі сынаву гаспадарку пад пільным прыглядам, конь, карова Яўхіма век былі б няпоены і някормлены, свінні вішчэлі б з голаду. Стары, што нелагодна сачыў, як сын, заспаны, марудлівы, вылазіць са сваёй палавіны на ганак ледзь не пад абед, як сланяецца па двары, па хаце, быццам рабіць няма чаго, не раз спрабаваў ушчуваць яго, але не дабіўся нічога. Старая шкадавала, угаворвала старога, каб не злаваў, але той з дня на дзень кіпеў усё больш нецярпліва.

Асабліва злавала старога тое, што Яўхім п'е. Ледзь не кожны вечар знікаў ён куды-небудзь і вяртаўся дадому толькі пад ранак або і зусім удзень. З гневам стары заўважыў, што прапалі ўжо некаторыя рэчы Яўхіма, сярод якіх былі дарагія хромавыя боты і пінжак.

Глушак месца сабе не знаходзіў, заўважыўшы гэту прапажу. Увесь вечар і ўсю ноч не спаў, усё прыслухоўваўся, калі вернецца Яўхім. Той зашаргаў п'яна пад вокнамі, зарыпеў варотамі толькі пад раніцу. Стары ледзь стрымаў сябе, каб не кінуцца, не даць волю свайму гневу; ледзь паддаўся голасу развагі: усё роўна п'янаму гаварыць цяпер нінашто. Чуў, як Яўхім паволі сунуўся ўпоцемку сваёй палавінай, як стукнуў конаўкай па вядры, доўга піў ваду, бервяном зваліўся на ложак.

Увесь дзень чакаў Глушак моманту, каб зноў пачаць трудную гаворку. Толькі пасля абеду, калі Яўхім, прытуліўшыся да вушака, закурыў цыгарку, паблажліва пусціў струменьчык сіняга дыму, стары адчуў, што можна пачаць.

– Дзе чобаты хромавыя? – спытаў стрымана, нібы зусім спакойна. Упіўся вачыма ў сына.

Яўхім брывом не варухнуў. Быццам чакаў. Пусціў спакойна яшчэ струменьчык дыму.

– Дзе булі, там няма. Прадаў...

– Прадаў... Каму ето?

Яўхім пусціў яшчэ струменьчык дыму.

– А не ўсё адно – каму?

– Грошы палучыў? – не адступіў Глушак. Позірк зноў павастрэў.

– Палучыў.

– Сколькі ўзяў?
– Сколькі можно було, столькі ўзяў...
– А ўсё-такі – сколькі?
– Небагато. Ды і, сказаць, нямало...
– Дзе яны, твае грошы?
– Каторыя – пры мне, – Яўхім гаварыў так, нібы здзекаваўся, – а каторыя – спажыў...
Глушака затрэсла ад гневу.
– І пінжак – спажыў?!
Яўхім перастаў дыміць. Узняўся, сказаў супакойліва:
– Тато, не трэба так...
Але стары не мог ужо спыніцца:
– Скора ўсе спажывеш! Усе на гарэлку распетрыш!.. Усе дабро!..
Яўхім зірнуў на яго нявесела, як бы са шкадаваннем. Як на малога, што назаляе неразумна.
– Нашто ето ўсе, тато... Ці вы – дзіця, не бачыце нічого?
– Ты – бачыш!.. Засляпіў вочы гарэлкай!
– Ад таго, тато, і засляпіў, што бачу ўсё...
Яўхім гаварыў вельмі шчыра і з вялікім хваляваннем, і старому гэта перадалося. Адчуў балючую праўду сынавых слоў, разгублена, больш з-за абавязку, папракнуў:
– Цераз нейкую галадранку свету не бачыць!
– Тато, не чапайце ето, – папрасіў ён лагодна. Дадаў разважліва: – Не ў адным етым – бяда. – Глушак пачуў злавеснае, калі Яўхім сказаў: – Ето мы пеpажывём! – Ён не скончыў, але ў тым нясказаным стары адчуў: ёсць большае, горшае! Яўхім не даў старому весці спрэчку далей, папрасіў: – Пагаворым пра ето пазней. Нешто трудно зразу пасля абеду...
Ён выйшаў, і неўзабаве стары пачуў, як у суседняй палавіне рыпнуў ложак.
Увечары Яўхім прыйшоў зноў. Калі сёрбалі боршч, у хату ўваліўся Пракоп Лясун, буркнуў: «Добры вечар у хату», падзякаваўшы, як заведзена, на абавязковае запрашэнне за стол, глыбай апусціўся на канапу. Павячэраўшы, Яўхім не захапаўся, як звычайна; абапершыся аб вушак, задуменна задыміў цыгаркаю. Быццам толькі што перарвалі дзённую гаворку, сказаў старому:
– Жыць, тато, усе адно не дадуць...
Стары таксама лагодна і павучальна запярэчыў:
– Дадуць не дадуць, а дзяржацца трэба.
– А як я не магу! Характер у мяне гарачы, знаеце ж!
– Характер дзяржаць трэба! Не распускаць.

– А як не ўмею я!
Стары, спасцярожліва паглядваючы на Лесуна, стрымана і цвёрда заявіў:
– Трэба ўмець! Цяперашнім светам усяму трэба навучыцца!
– А я от не ўмею!
– Трэба ўмець!
Яўхім не адказаў. Дыміў цыгаркаю, думаў пра нешта. Дакурыў, кінуў пад ногі, расцёр апоркам, моцна, злосна. Тады загаварыў гарачкавата, як пра набалелае:
– Робіш на некаго! Як парабак!.. Робіш, а ён – жаба – прыйдзе ды вычысціць пад мятлу! Як бы ето не тваё, а яго! Камандуе ўсякае, а ты слова не скажы!.. Ей-бо. – З лютай шчырасцю, з той раптоўнай, няўтрымнай адвагай, якой заўсёды апасаўся стары, прадказаў: – Не ручаюся: стукну я калі-небудзь етаго Дамецікаваго! Стукну так, што свінячае папрэ з яго! Ей-бо! Рукі даўно чэшуцца!
Стары кінуў позірк на Пракопа, недавольна папракнуў:
– Пляцеш усякае!.. Чалавек падумае: і праўда...
– Праўда, тато! – не хацеў нічога разумець Яўхім. – Стукну! Цярпення ўжэ няма!
– Не балбачы! Здурнеў саўсім!
Яўхім быццам і не чуў старога.
– Толькі от вас ды матку шкода, дак і дзяржуся. А так – даўно б!
– Здурнеў саўсім! – закруціў Глушак галавой, пазіраючы дружбацкі на Лесуна, як бы просячы не браць сур'ёзна.
Пракоп слухаў Яўхіма панура, усхвалявана.
Яўхім неспадзеўкі весела варухнуў плячыма, закінуў рукі за галаву.
– Адзін выхад: з'ехаць куды-небудзь! Покуль суд ды справа!
Глушак зірнуў на Яўхіма: не жартуе.
– От пабуду шчэ трохі, – з вясёлай адвагай сказаў Яўхім, – ды плюну на ўсё! Шчасце, што ні жонкі, ні галапузых – ніхто не ўчэпіцца! Вазьму світу на плечы – ды ў белы свет! Куды душа павядзе! У свеце мест добрых нямала! Буць таго не можа, штоб і мне не знайшлося!..
– Ждуць там цябе! – недавольна, з трывогай папракнуў стары.
– Знайдзецца места. Цяпер усюды такое будаўніцтво! Абы рукі!
У старым узнялася раўнівая злосць. Сярдзіта, з крыўдай засіпеў:
– А тут – бацько няхай адзін! Бацько няхай адзін мучыцца! Даждаўшыся добрых сыноў!..
– Не канешне і вам аставацца!

– Не канешне?! – абурыўся стары. – Не канешне?! А дабро на каго?! Чорту лысаму пад хвост?.. Ці мо Міканорку Дамецікаваму? За ласку ўсю яго?

Стары так кіпеў, што Яўхім не стаў спрачацца. Пасядзеўшы трохі з нейкімі сваімі думкамі, скруціў зноў папяросу, прыкурыў ад вугальчыка, які выкаціў з печы. Дыміў, затоена, упарта мружыў вочы.

– От, даждаў помачы, – ужо спакайней паскардзіўся Лесуну стары. Нібы прасіў спачування.

Лясун прамаўчаў. Глушак бачыў: пад навіссю панурых броваў бляск вачэй трывожны, зацяты.

Калі Лясун глыбай устаў, сабраўся ісці, Глушак падаўся ўслед. У сенцах стары прытрымаў госця, ціха, асцярожліва папрасіў:

– Не помні, Пракопко, што мы тут плялі... Ён усё ето так – абы язык пачасаць!

– Яўхім праўду казаў, – прагрымеў Лясун. Глушак улавіў у голасе адчай і рашучасць.

– Ат, – запярэчыў на ўсякі выпадак. – І ты тое ж... Не пляці, Пракопко!..

Вярнуўшыся ў хату, зіркнуў на Яўхіма, што ўсё дыміў, узлёгшы на вушак. Упікнуў ад душы:

– Плявузгаеш перад чужымі абы-што!

Яўхім варухнуўся, перастаў дыміць.

– Тато, надаело мне! Надаело мне цярпець! Калі на горло становяцца!

Ён сказаў так набалела і так нецярпліва, што старога ўзяў раптам жаль да яго. Ён трывожна павёў вачыма на акно, ці не чуе хто-небудзь. Вунь як набалела: ледзь не крычыць! Як малому, стрымана і лагодна параіў:

– Трэба цярпець! Не канешне знаць кажнаму, што думаеш!..

Яўхім нецярпліва варухнуў плячыма: ёсць пра што клапаціцца! Устаў на ўвесь рост, сумотна павёў позіркам – быццам не ведаў, куды падацца.

– Скруцяць скора саўсім! – прамовіў жорстка, без жалю.

Словы гэтыя кальнулі Глушака ў самае балючае. Але не паказаў кволасці і не папракнуў сына, што не шкадуе вярэдзіць бацькаву збалелую душу. Не да таго было.

– Скруцяць не скруцяць, – сказаў, як мог, спакойна, разважна, – а няма чаго самому шукаць гібелі! Лезці самому ў пятлю!.. – Хоць не быў упэўнены, для сынавай карысці, з жыццёвай мудрасцю дадаў: – Як галава будзе на плячах, не канешне скруцяць!.. – Не даў запярэчыць, параіў сваё: – Ждаць трэба! Не пара цяпер! Сіла ў іх!

– Даждаліся! – нядобра, як бы вінавацячы кагосьці, адазваўся Яўхім.

– Була пара, – згадзіўся стары. – Була – ды сплыла. Дак і астаецца адно – ждаць. Е ж Бог, буць не можа – пачуе, літасцівы, малітву нашу. Прышле падмогу няшчасным, прышле!

– Аге, надзейцеся на яе!

– Не смейся! – загадаў строга стары. – Прыйдзе ён, прыйдзе! Пабачыш, усе пабачаць! Прыйдзе пара!

– Доўго, тато, ждаць прыйдзецца!

Стары быццам не заўважыў насмешлівага Яўхімавага шкадавання, ведаючы, што за кожным словам сочаць там, на небе, сказаў горача:

– Сколькі ні прыйдзецца, дажджэмся! Буць не можа, штоб не даждаліся! Е Бог на небе!

– Эх, тато!..

– Дажджэмся!

Яўхім сказаў «дабранач», ляніва пацягнуўся ў сенцы, дадому.

Дома ён доўга не спаў. Варочаючыся бяссонна на ложку, думаў. Думак было багата, самых розных. Асабліва ўціналася, вярэдзіла адна – куды падацца? У ёй бачыўся яму шчаслівы ратунак, адзіны ратунак з усяго, што так заблытала яго жыццё. Кінуць усё. Адразу. Не шкадуючы нічога. І махнуць хоць куды. Паспрабаваць яшчэ раз. Жыць тут усё роўна не дадуць...

У тую ноч ён быў гатоў «махнуць». У тую ноч гэта здавалася самым простым і надзейным. І хто ведае, як склаўся б яго лёс, каб «махнуў» ён тады. Можа, інакш, зусім інакш пайшла б яго дарога.

Але не «махнуў» ён. Не так проста было «махнуць»...

Раздзел трэці

1

Праз свае трывогі і клопаты Ганна, як пра далёкае і неабавязковае, чула, чым жыве сяло. Яе мала хвалявалі размовы, якія раз-пораз ішлі ад розных людзей: што ў калектыве – нелады, што ледзь не ўсе, хто ўступіў, – недавольны і што калектыў – ледзь ліпіць і з дня на дзень можа скончыцца.

Без якога-небудзь узрушэння ўзяла яна і чутку, што калектыў такі скончыўся. Спакойна, са звычайнай цікаўнасцю слухала яна неспакойны гоман на вуліцы, глядзела, як ехалі порстка адна, другая

фурманкі, накладзеныя розным прыладдзем, – з гаманлівым натоўпам, што рушыў побач.

Як больш блізкае, што неяк датычыла і яе, адзначыла, што там, у натоўпе, з дарослымі – дзеці, што ў школу ідуць сёння толькі нямногія і няруджна. Двор у гэты ранак не віраваў дзіцячымі постацямі і не звінеў бясклапотнымі галасамі, у класах і ў калідоры было нібы прасторней, чым у іншыя дні. Дзеці збіраліся купкамі, дзяліліся навінамі, штосьці меркавалі, твары ў большасці былі ўзрушаныя і не па-дзіцячы заклапочаныя. Заклапочанасць гэта, аднак, была не панурая: у вачах малых больш паблісквала цікаўнасці, так і відаць было – іх хвалюе асабліва сама навіна, яе новыя праявы.

Небагата было ў калідоры і ў класах і тады, калі падышоў час пачынаць заняткі. Ганна з неспакоем паглядзела на гадзіннік над Парасчыным сталом: большая стрэлка набліжалася да самага верху, да лічбы «12», – хутка трэба было даваць званок, а Параскі не было дома.

Параска прападала недзе на сяле. Пабегла яшчэ даві́дна і не паказвалася.

Стрэлка дабралася да «12» і пачала сыходзіць уніз, Ганне трэба было даваць званок, але яна не брала яго. Яна то корпалася на кухні, то спакойна выходзіла ў калідор, і выгляду не падаючы, што нешта здарылася. Каб трэба было, яна і не такое зрабіла б для сваёй Параскі. Не такую дробязь. Толькі ў пакоі яна неспакойна паглядвала ў акно: Параскі ўсё не было відаць.

Параска паявілася, калі большая стрэлка мінула трэцюю лічбу. Яна ішла хутка, здалёк было відаць – узрушаная, неспакойная. Ускочыла на ганак, убегла ў пакой, нецярпліва развязала хустку, кудлатая: валасы ва ўсе бакі, апусцілася на табурэтку. Расшпіліла паліто.

– Званка не было? – запытала, але такім тонам – нібы пра нешта неабавязковае.

– Не.

Тады ўжо яна павяла позіркам на сцяну і, убачыўшы гадзіннік, не здзівілася. Невясёлы, прытомлены твар кранула мілая Ганне змоўніцкая, хітраватая ўсмешка. Пахваліла ўсмешкай: добра зрабіла, скеміла!

Ганна падміргнула ёй: можаш не сумнявацца, не схіблю. Абедзве зарагаталі, радыя адна адною. Ад гэтага рогату Параска быццам ажыла, з раптоўнай жвавасцю ўскочыла з табурэткі, кінула хустку на ложак, павесіла паліто. Рашуча, імкліва рушыла на кухню, стала шумліва плюхацца над тазікам. Выцершыся, падбегла да люстэрка на

стале, узялася хутка прычэсвацца – зашчаміла ў чарнату валасоў вялікі, з рудаватымі жылкамі грэбень.

– Давай званок, – загадала яна, абцягваючы, убіраючы ў спадніцу ніз кофтачкі.

Яна не стала снедаць. Ледзь выпіла паўшклянкі малака, ухапіла вялікі школьны журнал, кніжкі, сшыткі, знікла за дзвярыма.

Ёй было, відаць, не да заняткаў: пакуль ішоў урок, яна некалькі разоў пакідала клас, вярталася ў свой пакой, неспакойна бадзялася па ім, паглядвала ў бок вуліцы. Неспакой яе не прайшоў і калі пачалася пераменка і калідоры напоўніў гул і гоман дзяцей, і калі ў прыціхлых класах пачаўся другі ўрок.

Недзе ў сярэдзіне другога ўрока прыйшоў хлопец у чорнай паддзёўцы, у ботах. Пакуль ён абмятаў венікам боты, Параска выйшла на ганак. Разам з ім вярнулася ў пакой.

Хлопца Ганна ведала: ён ужо не раз быў у Параскі. Глінішчанскі актывіст, камсамолец, Барыс Казачэнка. Глінішчанскі Міканор, жартам называла яго ў думках Ганна.

Глінішчанскі Міканор толькі хмурна паздароваўся і ўжо не заўважаў Ганну. Павярнуўшы даўгаваты, з гарбінкаю твар да Параскі, глядзеў трывожна і стомлена. Нібы чакаў парады ці дапамогі. Параска маўчала, знарок не глядзела на яго. Ці то вінаваціла яго, што такі бездапаможны, ці то вінаватай адчувала сябе. Што не можа ні памагчы, ні парадзіць.

– Трудна цяпер, канешне... – прамовіла раздумліва і, мусіць, працягваючы гаворку, пачатую на ганку. – Калі дайшло да гэтага...

– Слухаць нічога не хочуць. Хоць ты кол на галаве чашы! А некаторыя – дак кінуцца зразу гатовы. Учапіцца ў цябе за адну гаворку... І ўсё – мацюкі ды мацюкі... – Ён гаварыў з прысвістам: замест «чашы» ў яго выходзіла – «цясі», «мацюкі» падобны былі на нейкія «масюкі». – Асабліва жанкі пашалелі!.. Так і глядзі, штоб каторая не кінулася з кіпцюрамі!..

Яму было, відаць, няёмка прызнавацца Парасцы ў сваёй няздольнасці пераконваць. Ён нібы трохі і падсмейваўся з сябе.

– Трудна, канешне... – зноў адгукнулася Параска. – І ўсё ж нельга апускаць рукі. І кіпцюроў жаночых баяцца! – раптам пакпіла з яго. Узяла сваю ролю.

– Ды я і не баюсь. У мяне шкура тоўстая. Толку от ніякага! – павесялеў Барыс.

– Нам цяпер так: ці пан, ці прапаў! Выбіраць няма чаго!

Параска пастаяла момант, разважаючы, тады раптам рашуча загадала:

– Пастой тут.

Цвёрдым крокам падалася ў клас. Амаль адразу ж там пачуліся радасны гоман, ляскат парт, шоргат і стукат ног у калідоры. Дзеці, як чарада, што выпушчана з загарадкі, з галасам вывалілі на ганак.

Параска кінула на стол журнал, кніжкі, сшыткі, зняла з цвіка паліто. Хутка завязала хустку, скамандавала Барысу:

– Хадзем!

Барыс рушыў за ёй.

Зноў убачыла Ганна Параску пад вечар. Параска ішла не адна. За ёй, акрамя Барыса, кіравалі з вуліцы да школы Дубадзел, Гайліс, Чарнаштан. Дубадзел, у кароткай паддзёўцы, у галіфэ, з ваеннай сумкай цераз плячо, рэзаў побач Парасkі – наперадзе, лёгка і нібы весела. Гайліс крочыў у зашпіленым шынялі, вецер ірваў полы шыняля і, было відаць, замінаў ісці. Але Гайліс не зважаў на вецер, ішоў роўна, цярпліва. Барыс ступаў каля Гайліса. Ганна не дала яму ніякай увагі. Яна адзначыла: Чарнаштан дыбаў ззаду ўсіх, уткнуўшыся позіркам кудысьці ў зямлю, вінавата прыгорблены...

Ганна намерылася была падацца на кухню: умомант згадалася агідная сустрэча з Дубадзелам, але агіда гэта і боязь адразу ж і стрымалі яе. Яна знарок узяла на кухні вядро і пайшла насустрач: не хапала толькі, каб яна ўцякала ад яго. Паглядзім яшчэ, як ён сустрэне!

Калі выйшла з калідора, яны якраз уздымаліся на ганак. Ганна весела, як бы знянацку сустрэўшы, прывіталася, кінула востры позірк на Дубадзела. Той важна паправіў сумку, глянуў, быццам на незнаёмую. Яна знарок строга загадала:

– Дайце дарогу.

Дубадзел саступіў ёй, прапусціў.

Калі яна вярнулася, яшчэ з калідора пачула: гаманілі ў класе. Не пайшлі ў Парасчын пакой. Можа, таму, што не хацелі несці гразь, а мо таму, што гаворка сакрэтная. Заўважыла: дзверы ў клас зачынены. І гавораць не надта голасна.

Сакрэтная, няхай – сакрэтная. Цікава, канешне, што там яны мяркуюць, але калі ім так трэба зачыняцца – няхай зачыняюцца. У яе галава поўна сваімі «сакрэтамі». Не да іх сакрэтаў. Праходзячы і раз, і другі калідорам, яна мімаволі чула за дзвярыма то спакойны гоман, то нібы спрэчку, але не прыслухоўвалася. Не мела такой звычкі. Не магла прыніжаць сябе. Адзначала адно: за дзвярыма сцямнела, яны сядзелі ўпоцемку, не адразу запалілі лямпу. Мабыць, нялёгка было.

Калі яны разыходзіліся, Дубадзел раптам заявіўся на кухню. Убачыўшы яе, важна патрэбаваў вады. Яна падала карэц. Дубадзел зачэрпнуў з вядра. Да таго як піць, пацікавіўся:

– Як жывеш?

– Анігадкі.

Ён выпіў карэц, выцер бараду. Важка ўпяўся позіркам.

– Не ўзялася за розум?

– А чаго? У мяне яго заўсёды было даволі...

Ён паставіў карэц на стол. Заявіў стрымана і з пагрозай:

– Не з тым гуляешся!

Цвёрда застукаў ботамі ў калідоры.

Параска правяла ўсіх на ганак, пастаяла. Зайшла ў клас, патушыла лямпу, вярнуўшыся на кухню, накінулася на яду.

– Згаладалася я! – нагнала на сябе весялосць.

– Дзіва! Цэлыя паўшклянкі выпіла ўранку!

– Дзень такі! Падумаць не было калі!.. Пападзе нам, Ганначка, за гэты дзень! І Гайлісу, і Чарнаштану, і мне за кампанію!

– А ты пры чым?

– Пры тым. Пры ўсім.

Ганна чакала, што яна раскажа пра дзённыя прыгоды, пра трывогі свае, але Парасцы сёння было не да гаворак. Ужо калі лажыліся спаць, Ганна не вытрывала, нібы жартам, пацікавілася:

– Пра што ето сакрэтнічалі так доўга?

– Ат, пра ўсякае. – Яна, белая ў сарочцы, з распушчанымі валасамі, прыкруціла лямпу, дзьмухнула ў шкло. Упоцемку дадала клопатна: – Галоўны сакрэт: заўтра будзе сход.

2

І ў гэты дзень многа дзяцей не прыйшло. Заняткі пачаліся ў час, але Параска, было відаць, падалася ў клас без ахвоты. За гадзіну яна зноў раз і другі выходзіла з класа – нібы не магла дачакацца канца ўрока.

Амаль адразу пасля таго як адзвінеў званок з пераменкі і ў класах прыціхла, у калідоры затупалі боты. Крокі адразу спыніліся: чуваць было, што з класа выйшла Параска. Яна з кімсьці ўзрадавана прывіталася, разам з ім ступіла ў свой пакой.

Калі Ганна зайшла ў пакой, госць, не распранаючыся, у паддзёўцы, сядзеў на табурэце. Адно зняў каракулевую, стаўбуном, шапку, пакручваў у руках. Блішчэў шырокаю, ледзь прыкрытаю рэдкімі бялявымі валаскамі лысінаю. Ганна пазнала госця: Парасчын дзядзька з Юравіч, Іван Анісімавіч. Ветліва прывіталася.

Апейка ўстаў, падаў ёй руку. Запытаўся, як жывецца.

– Жывецца. Грэх жалавацца.

– Назад не думаеш уцякаць? – Іван Анісімавіч усміхнуўся добрай, прыязнай усмешкай.

– Назад мяне вяроўкай не зацягнуць.

– Ого, значыць – цвёрда.

– Цвёрда.

Ён ужо не толькі з усмешкай, і з пашанай паглядзеў на яе. Тады зірнуў да Параскі, мусіць, вярнуўся да перарванай гаворкі:

– Нічога не скажаш – нарабілі клопату... – У голасе яго былі нездавальненне і папрок, але лагодныя, паблажлівыя.

– Ой, не кажыце... – Параска не таіла шкадавання.

Апейка пакруціў галавою. Момант штосьці затоена думаў. Быў недзе далёка з думкамі. Потым ускінуў позірк, запытаў дзелавіта:

– Гайліса тут не было?

– Учора быў. І сёння, канешне. Недзе на сяле, не інакш.

– Ага! – Апейка кіўнуў, узняўся, намерыўся ісці. Зірнуў на абедзвюх, нібы разважаў: развітвацца, не развітвацца?

– А можа б, перакусілі пакуль? – паспрабавала затрымаць яго Параска.

– Потым. – Ужо клопатны, засяроджаны, насунуў стаўбун, дзелавіта сказаў: – Ну, я к Чарнаштану!

На двары ён адразу адвязаў каня, ускочыў на таратайку і пакіраваў на вуліцу...

І сёння Параска не вытрывала, адпусціла дзяцей да часу. Спехам перакусіўшы, яна надзела хутка паліто, завязала хустку і знікла на вуліцы. За ёй неўзабаве адпусціла дзяцей і Галіна, і ўва ўсёй школе наступіла цішыня. За ўвесь дзень ніхто больш не паказваўся ў школе. Прыйшоў толькі, як заўсёды, да Галіны яе кавалер – Пятро. Як звычайна, яна, хапатлівая, вясёлая, спачатку частавала яго, потым яны зачыніліся на зашчапку, і з-за дзвярэй даходзілі толькі ціхія галасы. Потым і яны сціхлі.

Ужо збіралася цямнець, калі да ганка хтосьці пад'ехаў. Ганна думала, што вярнуўся Парасчын дзядзька, але каня прывязваў хтосьці незнаёмы: малады, чарнявы, у скураной фуражцы, у акуратнай, добрай шынельцы. Праз хвіліну ён, стройны, танканогі, у хромавых ботах, пругка і лёгка ўзбягаў на ганак.

Пастукаў для прыліку ў дзверы і, не чакаючы адказу, ступіў у пакой. Ганна падала выгляд, нібы прыбірае стол. Калі ўвайшоў, адарвалася ад занятку, зірнула знарок без цікавасці.

Незнаёмы кінуў прывітанне, мелькам паглядзеў на яе. Позірк яго чорных вачэй быў неспакойны і цвёрды і насцеражыў яе. Але ён тут жа абыякава адвёў позірк.

– Таварыша Апейкі не было? – Голас у яго быў прастуджаны, з хрыпласцю.

– Буў. Зранку.

– Гэта я ведаю. Цяпер не заязджаў?

– Не.

Ён гаварыў адрывіста, упэўнена. Зноў цвёрда, аж непрыемна было, паглядзеў на яе. І зноў заўважыла ў яго позірку нецярплівасць і нібы недавер'е.

– Вы – хто? – У голасе яго была строгасць.

У ёй ускінулася ўпартасць.

– А вы?

Ён не чакаў, зірнуў, нібы не разумеючы.

– Я? – Ён прыгледзеўся да яе, недавольна, але ўжо з увагаю. Быццам хацеў зразумець, што за гэтым пытаннем. – Я – Башлыкоў. – Ён заўважыў у яе вачах незразумелае недавер'е. Яна яшчэ як бы чакала тлумачэння, і ён дадаў: – Сакратар райкома.

Яна і не ўтаіла здзіўлення. Бачыла яна Башлыкова ўпершыню, але прозвішча яго чула не раз: Башлыкова слухаліся, пабойваліся, і Ганне думалася, што ён – высокі, плячысты, грозны з выгляду. А тут аказваецца – звычайны, нічым не адметны чалавек. З выгляду – нават зялёны хлопец!

– А я – Ганна, – адказала яна знарок спакойна, паблажліва. Ён хацеў яшчэ штосьці запытаць, але стрымаўся.

Зноў нездаволена павёў позіркам па хаце. Ступіў крок, строга аб'явіў:

– Я пачакаю тут.

– Пасядзіце. Табурэта не праседзіце.

Але ён не сеў. То стаяў, то ступаў крок, другі, вяртаўся назад. Ступаў, як бы стрыножаны. І ўсё думаў пра штосьці сваё, невядомае. Адно толькі відаць было, што думаў ён – пра непрыемнае, важнае, якое гняло яго. І якое рабіла яго старэйшым, непадобным да таго, якім ён здаўся Ганне ўпачатку. Не хлопцам зялёным, а рана пастарэлым чалавекам, незвычайным, незразумелым. Яна мімаволі сачыла, як ён нецярпліва ходзіць, далёкі думкамі, і старалася адгадаць, што яго гняце так. Відаць, толькі што быў у сяле, хадзіў, глядзеў. І от, мабыць, – успамінае пра тое, што пабачыў, пачуў, пахадзіўшы ў нашай гразі. От, мабыць, і гняце яго – у навінку. Гарадскі ж сам, відаць...

Гарадскі. Не з нашых балотных. Можна і не пытацца. Прысланы, пэўне, калектывы рабіць. Вучыць цёмных нас розуму... Граматны вельмі, не інакш. Граматны. Канешне. Не нашага поля ягада...

Штосьці і далёкае, адасобліваe, і разам – цікаўнае, прывабнае было ў гэтым – гарадскі, невядомы. І цікаўнае, і – дзіўна раўнівае: што от ён такі, граматны, гарадскі. Не іх поля ягада... Таму, пэўне, і паставілі – такога маладога – над цэлым раёнам. Таму і слухаюцца ўсе, маладыя і старыя. Не глядзяць, што – малады... Апейку колькі давялося паспытаць усяго-ўсякага, пакуль падняўся, займеў такое права, а гэтаму – усё зразу. Гарадскі, адукаваны...

Канешне, яна думае пра яго не таму, што ён неяк кінуўся ў вочы. Нічога ў ім такога асаблівага, калі глянуць добра. І не відны вельмі, і плечы, што ў малалетка. І характарам – відаць – не лёгкі. Проста – не падобны ні на кога, што бачыла раней. Упершыню бачыць такога. Усё ад гэтага...

А наогул – пустое ўсё гэта, схамянулася Ганна. Не цікавіць яе ніхто. Ані трохі. Яўхім – от што цікавіць яе. Ды тое, пра каго ніхто яшчэ не ведае...

Дзе ж гэта Параска? Ці хоць бы Апейка. Няхай бы сядзелі ўдваіх, гаварылі пра свае справы.

То выходзіла на кухню, паліла ў печы, то вярталася ў пакой, для прыліку прыбірала. Паказвала: ёй няма чаго сядзець склаўшы рукі.

Заходзячы ў пакой, яна бачыла, што ён тупае і тупае, як на прывязцы. Часцей ён не заўважаў яе, нібы яе і не было блізка. Але калі-нікалі яна лавіла яго позіркі. Ён паглядваў недавольна, непрыхільна, быццам яна замінала яму. Ці, можа, так здавалася: ад таго, што думаў непрыемнае. Перажываў.

Дзіўна, яна мімаволі чакала, што ён загаворыць, запытае нешта. Але ён маўчаў. Тупаў і тупаў. Далёкі, незразумелы.

3

Ішоў вечар. У пакоі цямнела, што далей – больш. Але Ганна не запальвала лямпы: па звычцы берагла газу.

Ужо добра сцямнела, калі ўбегла Параска. У цемры адразу пазнала госця: ці, можа, ужо хто-небудзь пераказаў, што ён тут, – ледзь прычыніла дзверы, аб'явіла здзіўлена, узрадавана:

– А я і не ведала! Уцякла з хаты і не спяшаюся назад!.. Даўно вы тут?

– Не, – Башлыкоў гаварыў яшчэ нібы здалёк.

Параска адразу захадзілася гаспадыняю.

– Што ж вы так! У цемры! Не распранаецеся! – Яна жвава скінула хустку, паліто, падказала госцю: – От тут цвічок! – Крыкнула Ганне весела, загадна: – Зараз жа лямпу! Святло!

Тады, як Ганна запальвала лямпу, звонка – ну, чыста артыстка! – папракнула:

– Хіба ж так, Ганначка, сустракаюць гасцей! Ды яшчэ – такіх!

Ганна знайшлася:

– Госць думаў вельмі нешто. Не хацелася перабіваць...

Башлыкоў не адказаў.

Ледзь стала светла, Параска схамянулася, кінулася да люстра. Хапатліва прыгладзіла валасы, папраўіла кофтачку. Тады зноў гасціннай гаспадыняй зірнула на Башлыкова:

– Госць, пэўна, галодны!

Башлыкоў, ужо без шыняля, танклявы ў сіняй гімнасцёрцы, перацягнутай шырокім бліскучым поясам, уціснуўшы пад пояс пальцы, адвёў складкі назад, адказаў няцвёрда:

– Паабедалі...

– Кажыце! – не паверыла Параска. Бадзёра супакоіла: – Нічога! Мы зараз з Ганнай арганізуем! Уміг!

Вясёлая, дзейная, пацягнула Ганну на кухню.

– Ты што ж гэта? – зашаптала з папрокам, пасяброўску. – Так сустрэць! Самога Башлыкова!

– А што ж – лістам перад ім слацца?

Шчыра прызналася:

– Усё глядзела, гадала: што ў ім такое, асобае?..

Параска не стала слухаць, перабіла. Не да гаворак цяпер. Уткнулася галавой у печку, адсунула засланку:

– Што тут у цябе? – У скаварадзе – бабка, з чыгунка, ледзь узняла покрыўку, вырваўся духавіты, нецярплівы пах баршчу. Голасна, давольна, каб, пэўна, чуў і ён, прамовіла: – От добра! – Распарадзілася шчодра і неадхільна: – Усё, што ёсць, – на стол! – Дадала шэптам, пазмоўніцку, як бы тлумачачы: – Настрой у яго – бачыш які?

– Гарэлкі, можа, дастаць? – параіла пошапкі ж Ганна, завіхаючыся ўжо каля печы.

– Гарэлкі! – Параска пакруціла галавой: прыдумала! Шэптам, стрымліваючы смех, гулліва падахвоціла: – Пастаў! Пакажы яму! Пабачыш, што ён скажа!.. – Сур'ёзна ўжо растлумачыла: – У рот не бярэ! Добрай нават. Завадской!.. Тым больш – у такі дзень!

– Глядзела я ўсё, глядзела на яго, – зноў вярнулася Ганна. – Нічога ў ім такога, асобага... – Яна нібы чакала, што Параска растлумачыць. Ёй чамусьці карцела гаварыць пра гэта. Параска, што памагала ёй, быццам не чула яе. – Чаму ён такі пануры, недавольны. Няўжэ з-за етаго, з-за калгаса?

– Нічога ты не разумееш! – толькі і сказала Параска на яе шчырасць. І тонам адказу, і адказам спыніла Ганну: не да гаворкі цяпер. Загадала па-прыяцельску: – Давайма жыва ўсё на стол!

Убегла ў пакой. Кнігі, сшыткі са стала – на падаконнік. Стол – ад сцяны. На стол – чысты настольнік.

– Вось так! Пачатак ёсць!.. – Кінулася на кухню, унесла бохан хлеба, нож. Загадала ўжо Башлыкову: – Памагайце!

Ён паказаў на рукі, яна спахапілася.

– Ганна! Госцю трэба памыцца! – Папрасіла Башлыкова: – На кухню, калі ласка...

Башлыкоў выйшаў. Расшпіліў гузікі на рукавах, закасаў іх па локаць. Расшпіліў каўнер, адсунуў яго ад шыі, нахіліўся над тазікам. Ганна зачэрпнула карцом з вядра, асцярожна – каб не абпырскаць! – стала ліць на яго далоні. Яны стаялі нязвычна блізка, галовы іх амаль сыходзіліся, было ў гэтым штосьці неспадзявана дамашняе, свойскае – ад гэтага ўсярэдзіне ў Ганны нешта чула насцеражылася. Ёй кінулася ў вочы: рукі яго, з цёмнымі валаскамі, былі белыя, далікатныя. Шыя, акуратна паголеная, загарэлая вышэй за каўнер, ніжэй была таксама белая і кволая. Зусім юначая. Штосьці мяккае, жаллівае няпрошана ўвайшло ў яе чуласць.

Ён то паслухмяна выцягваў жменькай далоні, то старанна цёр мылам рукі, шыю. Не падымаў галавы, не глядзеў на яе, рабіў усё моўчкі, але і ў ім, здалося ёй, паявілася раптам тая ж чуласць блізкасці. Без слоў, без позіркаў на час штосьці як бы ўзнікла між іх.

Падаючы ручнік, яна старалася не глядзець на яго і паказвала сябе абыякавай. І ўсё ж, здалося, улавіла няпросты, пільны яго позірк.

– Дзякую, – сказаў ён, падаючы ручнік. І ў тым, як сказаў, пачулася таксама незвычайнае.

– Ну, памыліся? – уварвалася ў кухню Параска.

– Як абнавіўся, – ён гаварыў спакойна, стрымана, але Ганна адзначыла ўдзячную нотку ў яго голасе. – Вада – добрая, свежая. Мабыць, нядаўна з калодзежа.

– Нядаўна, – Ганна стаіла сябе.

Вярнуліся ў пакой Парасکі. Башлыкоў, зашпілены ўжо на ўсе гузікі, стройны, прычасаўся, стаў як бы сваім у пакоі. Параска намерылася запрасіць за стол, калі схамянулася:

– Гуркі ў нас, капуста – аб'ядзенне! Можа, любіце?

– Люблю.

– Тады – дастаўлю! Яны тут – у пограбе!

Параска з Башлыковым удваіх узнялі за колца века ў падлозе на кухні. Ганна спусцілася ў прапахлы зямлёй халаднаваты прыцемак,

падала Парасцы адну талерку, другую: гуркі і капусту-шаткаванку. Калі ўзнялася па лесвічцы, Башлыкоў працягнуў руку, памог выйсці. Рука была моцная, гарачая.

Селі за стол, сабраліся вячэраць, і тут Параска з усяе сілы стукнула рукою па стале. Глянула на госця з адчаем:

– Прыйдзецца грэх на душу ўзяць! Карайце не карайце!

Устала і, вярнуўшыся з кухні з адважным выглядам, са стукам паставіла на сярэдзіну стала пляшку наліўкі.

– От ён, мой грэх!

Яна тут жа хітра змяніла кірунак гаворкі:

– Вада, закрашаная вішнямі! Для дзяцей хіба!

Апярэдзіла Башлыкова.

Башлыкоў, што хацеў быў штосьці сказаць, няўпэўнена прамаўчаў. Моўчкі, не ўхваляючы, але і не пярэчачы: пэўна, з далікатнасці становішча госця, сачыў, як паставілі чаркі, як налілі, па абавязку чокнуўся. Але выпіў да дна. І нават дазволіў сабе стрымана пахваліць наліўку.

– Ат, вада ды вішні! – няшчыра запярэчыла Параска.

Вячэра пайшла ўдала. Башлыкоў, відаць, добра-такі нахадзіўся за дзень: і гуркі, і капуста, і боршч – усё было ўсмак. Наліўка аказалася проста акрасай вячэры: яшчэ тройчы бутэлька ў спрытных руках Параскі абыходзіла чаркі, пакуль Башлыкоў не прыкрыў сваю цвёрда далонню. Даў знак, што – даволі. Упіцца гэтай вадою не ўпіліся і жанчыны, а ўсё ж наліўка зрабіла сваё. Хмель на час разгладзіў твар нават Башлыкова, які тут, за сталом, сярод павесялелых, незласліва кплівых жанчын, ужо не так паныла глядзеў на свет.

Ён помніў сябе і цяпер: ніякіх жартаў асаблівых не дазваляў сабе; Параску распытваў пра тое, як даводзіцца працаваць, ці хопіць дроў, ці памагае сельсавет, як наведваюць школу дзеці. Параска адказвала то сур'ёзна, то жартам – строіла з сябе весялуху, і ён час ад часу, хоць і неахвотна, пасмейваўся з ёю. Калі ён смяяўся, здаваўся яшчэ нібы прыгажэйшым, а галоўнае – станавіўся хораша таварыскім. Нібы бліжэў.

Ганну ён не распытваў: ёй думалася – таму, што лічыў – яе няма аб чым распытваць. І праўда: пра што ён можа яе запытацца – пра тое, як яна варыць, мяце падлогу? Ад гэтага ў ёй уздымаліся, вярэдзілі ганарлівую душу рэўнасць і злосць: гарадскія, грамацеі абое! Тады мацнела, пякло нездавальненне: трапіла ў шчасце, служка, прыбіральшчыца! У ёй расла непрыхільнасць да абаіх. Уздымалася ў душы дзёрзкасць, што рвалася на свет.

– А вы, якія ў вас планы? – зірнуў нарэшце Башлыкоў на яе.

– Вялікія! У мяне кожны дзень – вялікія планы! – Яна ледзь стрымлівала сябе. – Пойла зрабіць. Карову накарміць. Падаіць. Печ выпаліць. Выпаліць грубкі. Памыць падлогу...

Ён адчуў яе настрой. Зніякавеў крыху, хацеў паправіцца:

– Мне здаецца, вы да большага здатны...

– Мала што можа здавацца! – нелагодна перабіла яна. Цішэй ужо, стараючыся вярнуць спакойную кплівасць сваю, дадала: – Гэта так – з выгляду я такая. Нібы разумная. А папраўдзе...

– Ганна! – знарок весела папракнула Параска, якая дасюль са здзіўленнем углядвалася ў Ганну. Засмяялася знарок: – От выдумала!

– Чаго выдумала! Ці ж не такая я?

– Вы – граматная? – пастараўся прытушыць спрэчку Башлыкоў.

– Дзе там! Навука не па мне. Галава не тая.

– А вы вучыліся?

– А няўжэ ж не?

– Брэша яна, брэша! – абурылася Параска. – Розуму ў яе – на пецярых. Доля ў яе от – няскладная...

– Ах, Параскева Андрэеўна! Ну нашто вы ето! Доля. Ці доля – горб ад Бога? Доля – ад чалавека! Ад розуму!.. – Стрымана, кпліва папракнула: – Нашто хлусіць таварышу сакратару. – Яна раптам ветліва, гасцінна зірнула на госця: – Ешце бабку! Не крыўдуйце!

Башлыкоў больш не распытваў яе. Яна хоць тым была давольна: не хапала, каб ён палез у яе долю, вучыць стаў, што трэба было рабіць, а чаго не трэба! Параска, выхопліваючы момант, калі Башлыкоў не глядзеў, пакручвала нядобра галавой: што ты гэта выдумала? Але яна падавала выгляд, што не разумее Парасчыных знакаў, старалася хаваць неспакой. Зрабіла тое, што трэба было. Дайшло там да іх ці не дайшло, а хоць сябе паставіла як належыць.

Спрэчка гэта, раптоўная злосць, што яшчэ жыла ў ёй, аддалілі зноў Башлыкова. Цяпер ужо і знаку не было той дзіўнай паразумеласці, якая чулася там, на кухні, і спачатку тут, за сталом. Тое насцярожлівае, што паявілася раптам тут, было зусім іншым, яно адразу аддаліла, зрабіла іх чужымі.

На хвіліну Параска кудысьці выйшла, і, калі яны засталіся адзін на адзін, гэта насцярожаная чужасць адчулася яшчэ вастрэй. Нядобрае, нацятае было маўчанне...

Ганна была давольна, калі Параска вярнулася. Параска ўмомант разагнала маўчанне.

4

Калі скончылі вячэраць, Ганна ўзялася прыбіраць са стала. Параска весела памагала ёй: прыбрала тое, што Ганна не змагла забраць, услед за ёй вынесла ў кухню.

Яна амаль адразу ж вярнулася да госця, а Ганна засталася на кухні – мыла, выцірала посуд, складвала на палічцы над лаўкай. Яна хутка скончыла гэта, спынілася ў роздуме – што цяпер рабіць? Можна было б вярнуцца ў Парасчын пакой, але яна тут жа стрымала сябе. Чаго ёй тырчаць там з імі? У іх свой інтарэс, свая гаворка.

Яна, хоць старалася не слухаць, чула: у пакоі гаманілі. У роўную, скупую на словы гаворку госця ўнізваўся звонкі, знарок вясёлы і ўпэўнены Парасчын галасок. Госць, адзначыла, гаварыў мала, гаворка ішла ўвесь час з перапынкамі, але гэтыя маўчанкі, што раз-пораз наступалі там, хвалявалі Ганну больш за гаворкі. Мабыць жа, не так сабе яны маўчалі.

Кожны раз пасля такой маўчанкі Парасчын галасок, здавалася, спяваў усё весялей. «Толькі і не хапае там мяне», – кпліва падумала Ганна.

Але сядзець на кухні адной мала было весялосці. Не ведаючы, што рабіць, яна пашкадавала, што ў школе ціха, пуста, што людзі так доўга збіраюцца. Не спяшаюцца на сход. І наогул – не спяшаюцца. А сёння – дык асабліва.

Яна падалася ў цёмны калідор, прайшла паўз Парасчыны дзверы, знізу якіх вырэзвалася вясёлая палоска святла. Стала на ганку. У цемры ночы хаты і хлявы чарнелі маўклівыя, затоеныя. Ні аднаго голасу на вуліцы. Каб не рэдкія, цьмяныя агеньчыкі, можна было б падумаць, што сяло заснула. Што ніхто не прыйдзе.

З балота, з поўначы, густа ішоў вецер, халодны, сіверны. У святле з Парасчынага акна час ад часу мільгалі дробныя, ледзь відныя сняжынкі. Як бы дражніліся, абяцаючы даўно чаканы снег. Распранутая, у паркалёвай кофце, без хусткі, Ганна з ахвотай цярпела холад, што лез за шыю, за спіну, сцінаў бакі. Стрымліваючы дрыжыкі, што бралі ўсё мацней, яна чула, як ціхнуць смутак, адзінота, недарэчная зайздрасць чужому шчасцю.

«Трэба ж, дурная, – пазайздросціла!.. Як усё адно-мала паспытала ўжэ етай радасці!.. Закаяцца навек, здаецца, трэба б, кеб трохі розуму було!.. Дак не ж, не забула смаку той «радасці», як ужэ зайзрасць бярэ на чужую!.. І на чыю?!» Да яе зноў дайшоў вясёлы галасок з-за акна, і Ганна падумала: «Радая... І няхай – радуецца! Няхай цешыцца, калі ўдаецца!.. Не ва ўсіх жа так па-дурному буць

павінно, як у мяне!.. Павінно ж буць у некага шчасце! А калі павінно, то найперш у такіх, як яна. Як Параска. Такая кажнаго зробіць шчаслівым сама».

Яна ўспомніла, як Башлыкоў паявіўся, як хадзіў па хаце, унурыўшыся ў нешта сваё. Маўклівы, зацяты, недавольны, ён мала змяніўся і тады, калі ўбегла Параска. Мала паддаўся ёй. Ці дасць шчасце ён ёй? Шчасце ж робіць не адзін чалавек... Яна ўспомніла: суседка, Галіна Іванаўна, казала, што Башлыкоў не раз калісьці заязджаў да Парaскі. Чаму ж цяпер ён так доўга не наведваўся? Заняты быў? Ды ці ж яму доўга было звярнуць са шляху? Зазірнуць на хвілінку? Да таго ж гэты сённяшні прыезд яго можна і не лічыць. Невядома, да каго ён найперш прыехаў. Паявіўся вунь толькі цяпер, калі абышоў сяло...

«Як паглядзіш, дак і не знаеш: ці любіць ён яе?» – прайшло ў яе галаве, і яна не адчула, што шкадуе Параску. Здалося нават, што давольна, што ў іх, можа быць, не ўсё гладка. Ёй стала няёмка, брыдка за сябе: нібы бядзе Парaскі, сваёй збавіцельніцы, рада, і яна зазлавала на сябе. «Любіць не любіць – не знаеш! А што табе да таго?! Любіць! Любіць, канешне! Калі не дурны!»

Думкі яе ўчапіліся ў яго. Нібы ўбачыла зноў, як стаяла побач, льючы ваду з карца. Адчула дужасць яго рукі, якой памагаў вылезці ёй са склепа. Пасядзеўшы з ім за сталом, паслухаўшы яго скупыя, цвёрдыя заўвагі, яна мала што ўведала пра яго. Паглыблены ў сябе, скрытны, ён нібы знарок хаваў, што там у яго душы. Толькі адно Ганна добра адчула: ёй гэта асабліва кінулася ў вочы і адразу вылучыла, узняла нявіднага Башлыкова сярод іншых.

«Еты знае, куды ісці і што рабіць. І зробіць, што б там ні було», – падумала яна цяпер асабліва ясна. І ад таго, што гэта ў цяперашнім яе жыцці было самым важным, што ад гэтага залежала ўсё ў яе лёсе, адчула вялікую павагу да яго. «Еты не нам раўня», – прызнала яна яго перавагу. Тое ж, што так мала ведала яго, што ён быў незразумелы, яшчэ нібы прыдавала яму значэння.

«Не нашаго поля ягада...» Хтосьці рыпнуў дзвярыма, выйшаў на ганак, і яна азірнулася. Параска.

– Ты чаго тут? – здзівілася Параска.

– А от, пастаяць захацелася... – Параска была ў паліто, у хустцы. – А ты – куды?

– У сяло. Каб не сарвалі сход, чаго добрага.

У голасе яе Ганна ўлавіла прыхаваны смутак. Адчула вінаватасць за нядаўнія думкі, пашкадавала Параску.

– Ідзі ў хату. Прастудзішся. – Параска сышла з ганка, падалася ў цемру.

Вярнуўшыся ў хату, на кухню, Ганна доўга не магла сагрэцца. Прытулілася спіною да цёплай печкі, уціскала далоні ў цяплынь абтынкаванай цэглы, стрымліваючы дрыжыкі, чула за дзвярыма мерныя, няспынныя крокі. Раз, другі крокі набліжаліся да самых дзвярэй, прыпыняліся, і яна мімаволі чакала, што Башлыкоў зойдзе. Але крокі за гэтым аддаляліся. Яна падумала, што скажа, калі Башлыкоў загаворыць з ёю. Скажа, што ён чэрствы і нялюдскі, калі так абышоўся з такім чалавекам, як Параска. Дасць яму добры ўрок.

Потым яна перастала чакаць, зразумела, што ён не зойдзе. У яго сваё на думках. Свой клопат, зусім іншы. Падумала звыкла: можа б, запаліць ужо лямпы ў класах, але стрымала сябе – рана яшчэ. Чаго свяціць у пустым пакоі. Тым больш што сход будзе, пэўне, доўгі. Пагарыць яшчэ газы...

Ганна ўзрадавалася, калі пачула крокі на ганку. Ухапіла запалкі, хутка падалася ў калідор. Прыйшлі Барыс Казачэнка і Дубадзел.

– Чаму святла няма? – патрабавальна сустрэў Дубадзел. Не так запытаўся, як пагразіў.

– Няма для каго свяціць, – спакойна заявіла Ганна.

– Таму і няма нікога, што цёмна! – павысіў голас Дубадзел. – Хто будзе ісці, калі цёмно ў вокнах!

– Хто захоча, прыйдзе.

Адчыніліся дзверы з Парасчынага пакоя, і ў светлай пройме паявілася постаць Башлыкова. Ад таго, што святло было ззаду, постаць віднелася цёмнай і твар ледзь быў бачны. Башлыкоў павёў галавою, аглядваючы ўсіх, мабыць, стараючыся зразумець, пра што была гаворка.

– Ну што? – спытаў ён праз момант Дубадзела строга і патрабавальна.

Дубадзел стаяў выпрастаны, усім сваім выглядам паказваючы павагу і адданасць. Нібы і не ён толькі што гразіўся Ганне.

– Аб'явілі, – амаль тонам рапарта адказаў ён.

– Усім? – У голасе Башлыкова не знікла патрабавальнасць.

– Усім. Некаторым – па два і тры разы.

– Усім, – памог Дубадзелу Барыс.

– Святла от няма, – Дубадзел як бы пазваў Башлыкова на падтрымку, зноў пагрозна павёў вачыма на Ганну.

– Ды будзе святло! – Ганна нібы засмяялася з яго кпліва.

Не хапаючыся, з годнасцю пайшла ў цемру класа, запаліла лямпу ў адным, потым у другім пакоі. Дзверы між пакояў былі расчынены

на адну палавіну, яна адчапіла зашчапку і адчыніла другую – расхінула дзверы на ўсю шырыню. Расхінула дзверы ў калідор.

Тады, калі яна гэта рабіла, Башлыкоў, а за ім Дубадзел і Барыс таксама зайшлі ў клас. Башлыкоў строгім позіркам агледзеў пакой – парты, праходы між іх, плакаты на сцяне. Усё моўчкі, невядома што тоячы. Не сказаў нічога, лёгкім, цвёрдым крокам падаўся ў другі пакой, агледзеў таксама. Ганна цікаўна сачыла за ім, бачыла: цяпер ён быў яшчэ больш незразумелы, загадкавы.

Вярнуўшыся ў першы пакой, ужо каля дзвярэй ён стаў, павярнуўся да Дубадзела і Барыса, сказаў важка:

– Трэба забяспечыць стопрацэнтную яўку ўсіх калгаснікаў. Усе да аднаго павінны быць.

Ён гаварыў і глядзеў так, нібы хацеў перадаць, як усё гэта важна. І як бы папярэджваючы, што ўся адказнасць за няяўку ляжа на іх. Разам з адказнасцю за тое, што ўжо здарылася.

– Мы аб'явілі ўжэ – па два, па тры разы, – пачаў быў Дубадзел, нібы супакойваючы і разам выказваючы сваю стараннасць. Але Башлыкоў так зірнуў, што ён змоўк: апраўдваючыся і стараючыся падмацаваць уражанне дзелавітасці сваёй, дадаў асцярожна: – Не тое што акціў, а і школьнікаў мабілізавалі – каб прасачылі за яўкай!

– Яно і відаць, як вы мабілізавалі! Дамабілізавалі да таго, што выпраўляць становішча трэба!..

Башлыкоў, недавольны, падаўся ў Парасчын пакой. Дубадзел і Барыс хвіліну стаялі ў роздуме, мабыць, разважаючы, што рабіць, потым Дубадзел рашуча закінуў вайсковую сумку за спіну, кіўнуў Барысу: «Пайшлі!» – і яны зніклі ў калідоры.

Ганна засталася ў пакоі. Стараючыся не слухаць крокаў Башлыкова за калідорам і разам з тым дзіўна ловячы ўсё, што адтуль ішло, востра адчуваючы, што ён там, неспакойны, трывожны, – яна знарок нецярпліва чакала: калі ж гэта пачуюцца галасы на двары, калі ж гэта пачнуць сыходзіцца. Яна ўзрадавалася, калі на ганку пачуліся тупат і з ім валтузня за дзвярыма; адразу здагадалася, што – дзеці, ахвотна адчыніла дзверы і весела загадала ўваходзіць.

Увалілася адразу цэлая чарада хлопчыкаў і дзяўчат – школьнікаў. Выткнуўшыся з калідора на святло, усе раптам сціснуліся каля дзвярэй, прыціхлі; паглядваючы насцярожана на Ганну, сталі падштурхоўваць адно аднаго, шморгаць насамі. Ганна загадала ім праходзіць, яны момант павагаліся, нясмела рушылі да парт, паселі.

«Першыя наведвальнікі. Акцівісты!» – мімаволі пажартавала сама сабе Ганна.

– Што ж ето вы бацькоў не папрыводзілі? – папракнула вельмі сур'ёзна малых.

Ёй адказаў рознагалосы гоман:

– Прыйдуць шчэ…

– Сабіраюцца...

– Унё, ён паслухае мяне!

– Куёўдзяцца недзе!..

Яна хутка адчула, што лішняя пакуль тут, і выйшла на кухню. Паспрабавала рабіць, што трэба; хоць стрымлівала сябе, зноў слухала, што чуваць за дзвярыма, у Парасчыным пакоі, мімаволі гадала, пра што ён думае, што адчувае, незвычайны, незразумелы чалавек. «Цьфу, прыліпла!» – зазлавала яна хутка на сябе і падалася да класа, у які, яна чула, зайшло некалькі чалавек. У пакоі былі жанкі, сярод іх Ганне адразу кінуліся ў вочы даўняя знаёмая Годля, глінішчанская швейка, і рослая, дужая цётка Маня, пра якую гаворкі таксама хадзілі ў Куранях, але з якой Ганна пазнаёмілася толькі нядаўна. Пра цётку Маню гаворкі ішлі, пэўна, далёка: казалі, неяк у Алешніках, каля млына, дзе сабраўся добры натоўп мужчын, счапілася яна неяк борацца з мужчынамі. З адным, з другім, з пятым – і ўсіх паклала. З той пары па сёлах ішла слава, што няма такога мужчыны, якога яна не пабарала б. За гэтымі дыміла папяросінай яшчэ адна нядаўняя знаёмая, сухая і злая з выгляду, як вядзьмарка, старая, якую чамусьці звалі Гечыха. З мужчын быў адзін Годлін чалавек – Эля; уціснуўшы пад парту доўгія ногі, курыў з Гечыхаю – трымаў папяроску далікатна, няўмела. Курыў, было відаць, каб падтрымаць мужчынскую годнасць.

Амаль адразу за Ганнай з вуліцы паявіўся Апейка з Міканорам і Гайлісам. Сцягнуўшы з галавы стаўбун, расшпільваючы каўнер паддзёўкі, Апейка акінуў позіркам клас, голасна і весела адзначыў:

– Самыя смелыя ўжэ прыйшлі!

– Аге! Можно і пачынаць! – адгукнулася хрыплым басам Гечыха.

– Пачнем! – бадзёра запэўніў Апейка. – Толькі от трохі пачакаем іншых. Каб не наракалі потым, што – без іх.

Ён прайшоў да парт, стаў здаровацца за руку: з аднымі, маладзейшымі ці роўнымі яму па гадах, – як роўны, як таварыш, з жанкамі і старэйшымі – больш стрымана і пачціва. Амаль увесь час жартаваў. Гайліс стаяў каля дзвярэй: вузкі, у зашпіленым шынялі, глядзеў строгімі блакітнымі вочкамі, чакаў. Касцісты, са сцятымі вуснамі твар быў засяроджаны, няўсмешлівы.

Яны неўзабаве пайшлі ў Парасчын пакой. Амаль адразу пасля таго, як яны зніклі, з двара паявіўся зноў Казачэнка Барыс.

Заклапочана акінуўшы вачыма пакой, ён кінуў позірк у суседні, заявіў насмешліва:

– Дзе ж ето мужчыны ўсе падзеліся? Ці мужчын ужэ не стало ў Глінішчах?

– Шкадуем... Беражэм!.. – адказаў знарок задзірыста хтосьці з жанчын.

– Мы што – не людзі?

– Аге! Не канешне мужчыны!

– Цётка Агапа, а дзе ж ето ваш Пятро? – не саступіў, насмешліва ўкалоў у дружны гоман Барыс. – Чаго ето ён вас прыслаў за сябе?

– Нядужы нешто, Барыско...

– І ваш Апанас занядужаў? – так жа едка пацікавіўся Барыс ужо ў іншай жанчыны.

Не стаў слухаць, паківаў галавою з папрокам, з абурэннем:

– Эх, людзі!..

Ён сабраў дзяцей, разаслаў па сяле – зваць мужчын, адразу ж сам зноў рушыў на вуліцу.

Прыйшло яшчэ некалькі мужчын. Па два, па адным. У світах, у кажухах. Выткнуўшыся з цемры на святло, хмурна мружыліся, пільна аглядваліся і, уткнуўшы галаву ў плечы, стараліся прашыцца між жанок за спіны пярэдніх. Некалькі мужчын у клас не пайшлі, тоўпіліся ў прыцемку калідора, нервова дымілі папяросамі. У прыцемку, каля дзвярэй, дыміў цыгаркаю і Чарнаштан Павел – старшыня былога калгаса. Дыміў, заўважыла Ганна, ніякава і падобна – безнадзейна.

Раз-пораз то там, то тут завязвалася гаворка, але яна амаль адразу ж ірвалася. І ў калідоры, і ў класах найбольш панавала маўклівасць, нядобрая, насцярожаная. Зацятае чаканне, адчувалася, поўніла людзей. Гэтая зацятасць мацнела, чым далей, тым больш. Чым больш сыходзілася народу.

Сярод маўклівасці і зацятасці асабліва вылучаліся двое мужчын, што сядзелі каля сцяны, нібы знарок на самым відавоку. Адзін – чырванатвары, дзіўна бесклапотны, мабыць, п'яны, а другі – худы, высушаны працай, з кепачкай на макаўцы. Чырвоны – лагодны і гаварлівы – штосьці расказваў: мабыць, непрыстойнае, бо мужчыны, хоць нявесела, пасмейваліся, а жанкі – адварочваліся, пляваліся. Сухі, з кепачкай, не смяяўся, ўссеўшы на край парты, глядзеў навокал бясстрашна і задзірыста, нібы толькі і чакаў, каб счапіцца.

Раздзел чацверты

1

Было вельмі позна, але ўсё не пачыналі. Усё збіралі людзей. У пакоях ужо густа вісеў дым і ўсё часцей чуліся недавольныя галасы: «Дакуль жа ето ждаць?», «Ці да рання?».

Нарэшце дзверы з Парасчынага пакоя расчыніліся, і ў іх паявіўся заклапочаны Барыс, за ім – Дубадзел, важны і вельмі энергічны. За імі выйшлі стрыманы, цвёрды ў хадзе Башлыкоў, спакойны, нібы бесклапотны, Апейка, сабраны, нацяты Гайліс, сціплы Міканор. Апошнім, вінавата горбячыся, ступаў Чарнаштан.

Гоман, што прабіваўся там-сям, адразу апаў, але ў суседнім пакоі хтосьці гаманіў. На яго кінуліся нецярплівае шыканне, галасы: «Ціхо вы там!», «Пачынаецца ўжэ!». Пад гэтыя гукі Барыс зайшоў за стол.

– Дак е прапанова выбраць прэзідзіум, – аб'явіў ён у цішыні.

Барыс прачытаў з лістка паперы спіс. Спрэчак не было, прагаласавалі. У тым, як стрымана ўздымалі рукі, як пільна маўчалі, чакаючы далейшага, адчувалася, што насцярожанасць яшчэ павастрэла. З маўклівай насцярожанасцю сачылі, як заходзілі за стол, сядалі Гайліс, Апейка, Башлыкоў. Нават на сваіх аднавяскоўцаў, што ішлі ў прэзідыум, глядзелі недаверліва.

– А вы, цётко Мар'я, чаму не ідзеце? – паглядзеў Барыс у пакой.

– А чаго я там не бачыла? – адказала пракураным голасам Гечыха.

– Выбіралі. Значыць – трэба ісці.

Гэчыха адрэзала:

– А я не хочу!

Ускінуўся і адразу аціх смех. Барыс намерыўся ўступіць у спрэчку, але Апейка даў знак: не трэба. Пачынай сход.

Барыс стрымаўся. Памаўчаў, настроіўся на іншы лад.

– От што мы нарабілі з вамі, дзядзькі і цёткі, – пачаў ён засмучона, такім тонам, быццам запрашаў усіх раздзяліць агульную, вялікую бяду. – Нарабілі такое, што на ўвесь раён шум пайшоў. Усё раённае кіраўніцтва кінуло другія справы і зразу прыбуло к нам у Глінішча. На ўсё Глінішча мы палажылі пляму перад цэлым раёнам. Просто сорамно глядзець у вочы людзям. Што пра наша Глінішча ідзе такая слава. Што ў нас такі несазнацельны народ... Трэба адумацца, пакуль не позно!

– Хто шчэ хоча сказаць? – павёў ён вачыма па зале.

– Дай мне! – устаў з падаконніка Дубадзел. Яшчэ да таго, як Барыс даў згоду, Дубадзел рушыў да стала прэзідыума.

Момант стаяў моўчкі, сярод нацятай цішыні. Выцягнуў шыю, ускінуў галаву, рашучы, адважны.

– Граждане, а також гражданкі сяла Глінішча! І асобенно – калхознікі, якія ўчора разабралі сваю маёмасць і тым самым выйшлі з калхоза «Рассвет»! – Голас яго быў поўны настойлівасці і закліку. Нервова абцягнуўшы зашмальцаваны картовы пінжачок, Дубадзел, вастраплечы, з касцістым тварам, на якім крывіўся, торгаўся сіняваты шрам, імкліва кінуўся ў наступ: – Тут ужэ ў сваім выступленні Барыс Казачэнко, які выступаў перада мной, правільна сказаў, што вы сваім учарашнім пастулкам паклалі пляму на ўсё сяло. Але ён не сказаў, што ета пляма, якую вы ўчора паклалі, легла не толькі на ваша сяло, а легла яна і на ўвесь сельсавет, Алешніцкі сельсавет, а також і на ўвесь Юравіцкі раён. Бо сваім пастулкам, усім тым, што вы зрабілі, а іменно – тым, што вы самавольно расхваталі ў прошлом часных коней і кароў, а також свае ў прошлом часныя калёсы, плугі, бароны і ўвесь іншы абагулены інвентар, вы паказалі ўсяму народу, якое ў вас яшчэ мужыцкае, некалхознае нутро. Якое думае толькі пра сваю выгаду і якому напляваць на тое, што робіцца ў перадавом нашым раёне і ў нашым окрузе, а також ў нашым Савецкім Саюзе, які ў даны мамент акружаны з усіх бакоў рознай буржуазіяй, якая з усіх сіл стараецца задушыць наш Савецкі Саюз, а іменно – стараецца, штоб сарваць нашу пяцілетку, нашу індустрыялізацыю і калекцівізацыю, якія наносяць ёй смярцельны ўдар!

Дубадзел гаварыў амаль без прыпынку, усё высокім голасам – вінаваціў, заклікаў. Па тым, як ён гаварыў, адчувалася, што для яго не так важныя самі словы, думкі, якія ішлі часта без ладу, паўтараліся, – колькі тон прамовы, той запал, якім ён не даваў прытухаць ні на секунду.

– От рэжа! Як рэпу грызе! – сказаў нехта каля Ганны, у прыцемку калідора. Яна ўлавіла ў голасе непрыхільнасць.

– Стараецца! – адгукнуўся хтосьці іншы, хрыпаты, прастуджаны. – Прапіўся, паляцеў з сельсавета, дак цяпер са скуры лезе!

– Начальство ж унь, побач сядзіць! Заўважыць можа!

– Аж ахрып! І патыліца – умокла!..

Патыліца, праўда, мокла ад поту, Дубадзел нецярпліва раз-пораз выціраў яе далоняй. І хрып, што далей, то больш: усё часцей вымушан быў прыпыняцца, пракашлівацца. Але і не думаў канчаць гаворку. Ганна не першы раз дзівілася яго настойлівасці і ўпартасці.

Здзіўленне яе, як і ў тых, што смалілі цыгаркі побач у прыцемку, было не толькі без якой-небудзь спагады, а рэзка непрыхільным: за ўсім тым, што гаварыў Дубадзел, увесь час адчувала яна жывога яго, даўно ўжо і непрыемна знаёмага ёй. «Даў жа Бог сілу чалавеку і зацятасць!..» – думала яна з насмешкай, цярпліва чакаючы, калі ж ён зможацца. Водзячы вострым позіркам па тварах людзей, што сядзелі ў пакоі, яна бачыла, што многія з іх таксама амаль не слухалі і чакалі таго ж самага. Вельмі ж добра вядома была ўсім асоба гарачага прамоўцы! Ганна захацела пабачыць, як слухае Дубадзела Башлыкоў, але з калідора відна была ёй толькі спіна. Усё ж яна суцешыла сябе: «Етаго не правядзе, пэўне! Еты бачыў ужэ такіх, не інакш!..»

2

Гайліс пасля Дубадзела загаварыў, здалося, незвычайна спакойна, ціха. Выпрастаны, у вайсковым кіцелі, з акуратна зачасанымі назад русявымі валасамі, стаяў ён за сталом і нехапатліва, старанна вымаўляючы кожнае слова, выразна выказваючы кожную думку, разважаў:

– Былі недахопы ў рабоце. Это – праўда. Былі. І недахопы немалыя. Вялікія... – Людзі і ў калідоры, і ў пакоях глядзелі моўчкі, пільна чакалі. Ён жа спакойна, важна клаў, нібы цагліны: – Чэсныя людзі работалі, работалі, а палучылі – мало. Дзвесце грамаў за дзень – это не палучка. Кілаграм картошкі – тожэ не палучка!..

– Не палучка! – выдыхнуў хтосьці побач з Ганнай.

– Правільно!

У калідоры і ў пакоях завірыў усхваляваны, гарачы гоман. Гайліс нерухома, быццам безуважна, пастаяў, перачакаў яго.

– Мало кармоў нарыхтовано, – павёў ён тым жа роўным, важкім голасам. – Скаціну вясной не будзет карміць чым. Саломай карміць трэба будзет. Скаціна будзет галадаць – это ўжэ відно... – Кожнае слова латыша адгукалася сярод слухачоў неспакойным гулам. У калідоры так гаманілі, што Ганне цяжка было слухаць. Хтосьці з мужчын не вытрываў, крыкнуў:

– Ціхо бо вы!

Слухаючы, як слова за словам строгі латыш маляваў невясёлае становішча ў калгасе, як рос нядобры гул, Башлыкоў, адзначыла Ганна, нецярпліва павярнуўся да Гайліса. Відаць, быў нездаволены кірункам яго выступлення. Але Гайліс не заўважыў – ці не хацеў заўважаць – башлыкоўскага позірку: вёў і вёў гаворку пра бядоты няўдалага калгаса. Толькі дамаляваўшы становішча, спыніўся.

– Канечно, тут дым без агня не бывает, – нібы падумаў ён услых. – Есць усякія прычыны. Віна есць... Вінавато кіраўніцтва калгаса. Праўленне, старшыня калгаса таварыш Чарнаштан. Это – правільно... Але, – голас Гайліса памацнеў, набраў упартасці, – вінаваты не толькі яны. Не адно кіраўніцтва. Вінаваты і вы самі! Калгаснікі. – Ён перачакаў гоман нездавальнення: – Які ўраджай сабралі?!

Ён глядзеў у залу, як суддзя, чакаў адказу. Адказаў Барыс Казачэнка:

– Жыта – чатыры з палавінаю цэнтнеры з гектара, картоплі – дзвесце трыццаць пудоў...

– Вот! Это не ўраджай!.. – заявіў строга Гайліс. – Чаму так палучылось? – Ён абвёў вачыма прыціхлы пакой, патрабаваў адказаць. Усе маўчалі. Адказаў сам: – Так палучылось таму, што – пагано аралі. Пагано сеялі. Пагано ўбіралі... Работалі не так, як на сябе. А як на паноў! – У цемры калідора завязалася нейкая спрэчка, у класе зноў рос гоман, але Гайліс не зважаў, вёў сваё. Многа дабра пакралі зладзеі. А нікога не паймалі. Гайліс судзіў непахісна: у калгасе не было парадку, дысцыпліны. А без парадку, дысцыпліны – няма работы. Або ёсць паганая работа... Ён заявіў горача: у калгасе павінна быць добрая дысцыпліна. І трэба працаваць – як на сябе, а не як на паноў! Скончыў, нібы распарадзіўся: трэба вярнуцца ў калгас! Умацоўваць яго!

Калі ён сеў, у абодвух пакоях хвалямі хадзіў гоман. Гаманілі і ў калідоры, каля Ганны, зацята зыркалі цыгаркамі. Гоман быў, чула Ганна, больш нездаволены, але Гайліс хоць бы варухнуўся за сталом.

Устаў Барыс.

– Здаецца, багато ахвотнікаў выступіць паявілася? – У голасе яго была кпінаачка. – Дак хто хоча сказаць слова?

Гоман пачаў хутка сціхаць. Вочы амаль усіх скіраваліся да Барыса, але ніхто не прасіў слова.

– Няўжэ няма нікога?! – з кпінкай здзівіўся Барыс. – Столькі ж унь гуло!..

– Няхай начальство гаворыць! – крыкнуў задзірлівы худы, з кепачкай на макаўцы.

– Начальство ўжэ гаварыло! Добра було б паслухаць трохі і народ!

– Паслухаеце вы! – унізаўся злосна галасок.

– Аге!

3

Зноў пайшоў нядобры гоман. Барыс аб'явіў, што выступіць Міканор, сакратар алешніцкай партячэйкі. Міканор устаў, няёмка сутуліўся сярод гоману, тады як Барыс прасіў сціхнуць, паслухаць.

– Ужэ і куранёўцы вучыць будуць! – мацюкнуўся хтосьці ў прыцемку.

– Не кажы! Усе лезуць!

Ганна ад неспадзяванай прыкрасці стаілася, пачырванела. Тоячы крыўду, з асаблівай раўнівасцю сачыла за Міканорам: нібы яму трэба было абараніць гонар не толькі свой, а і яе, і ўсіх куранёўцаў. Адчула яго раптам самым блізкім сабе: адзін ён быў тут з яе роднага кутка, з яе маладосці.

Міканор пачаў таксама з дакору: усе глядзелі на Глінішчы – як на перадавую вёску, як на прыклад для іншых, на які трэба ўсім раўняцца. А выйшла так, што Глінішчы паказваюць цяпер прыклад таго, як не трэба рабіць.

– От ты і пакажы! – перабілі яго насмешлівым воклічам.

Барыс адразу моцна застукаў па стале, загадаў не перабіваць. Міканор перамаўчаў вокліч, маўкліва сцярпеў яго. Нібы не захацеў увязвацца ў спрэчку. Калгас распусціўся – стрымана вярнуўся да таго, на чым перапынілі, – і гэта ў такі час, калі Алешніцкі сельсавет у цэлым павярнуў на новую дарогу. Калі ў нас, не сакрэт, ёсць немалыя поспехі – асабліва ў калгасе «Камунар» і іншых. Апярэджваючы гоман, што стаў расці, Міканор тут жа адзначыў разважліва: канешне, у нас ёсць і калдобіны, і ў другіх, бывае, нягладка ўсё ідзе. Ён доўга гаварыў пра тое, як цяжка было спачатку наладжваць калгас у Куранях і як не ладзілася раней у «Камунары». За гэтым стаў расказваць пра тое, што трэба сельсавету зрабіць у гэты год. Гаварыў пра ўсё, што прыходзіла ў галаву, раскідана і дзіўна для яго няўпэўнена. Слухаючы яго, Ганна адчувала, што гісторыя гэта з глінішчанскім калгасам вельмі прыгнечвае яго, што ён не верыць, нібы сход можа паправіць штосьці. І гаворыць толькі таму, што трэба гаварыць па абавязку. Ганне спадабалася, што ён адчуваў настрой людзей і не задзіраўся, як звычайна ў Куранях, – гаварыў стрымана, сціпла.

За ім Барыс звонкім, давольным голасам аб'явіў:

– А зараз выступіць наша настаўніца – Параскева Андрэеўна Дарошка!

Параска пайшла да стала сваёй лёгкай, пругкай хадою, ледзь паводзячы звыкла плячыма, з вясёла ўзнятай галавой. Упэўнена паклала руку на край стала, з узнятай галавой павяла позіркам па

пакоі. Ганна бачыла: проста вачавідкі адбылося незвычайнае – хмурныя, недаверлівыя твары па ўсім пакоі яснелі. Вочы глінішчанцаў глядзелі з прыхільнасцю і цікаўнасцю...

– О тут Барыс сказаў, – весела кіўнула яна на Барыса, – сказаў – зараз выступіць настаўніца!.. Я – настаўніца. Я – чалавек, якому па закону трэба вучыць. Мяне для гэтага рыхтавалі. Мне для гэтага далі многа розных парад. – Параска ўсё трымалася таго ж даверлівага, вясёлага ладу. – Вядома, могуць знайсціся такія разумныя людзі, якія скажуць, што я не наогул настаўніца, а школьная настаўніца! Што мая задача адна – вучыць школьнікаў! Ды яшчэ школьнікаў пачатковай школы, самых малых! Але так могуць казаць толькі людзі, якія носа не высоўвалі з горада. Не ведаюць, хто такі – настаўнік у вёсцы!.. Настаўнік у вёсцы, – у голасе пачулася гарэзнасць, – і кум, і сват, і – чорту брат!.. Павінен умець навучыць усяму і малога, і старога! Ён не можа сядзець толькі ў школе і не бачыць таго, што робіцца на вуліцы!.. І от я таксама, на стале кожны вечар – гара сшыткаў, стараюся не сядзець толькі ў школе. Адкладваю сшыткі на ноч, выходжу ў сяло! Паглядзець, што хто робіць! І што наогул у нас робіцца!.. І от я і цяпер гляджу – і стараюся разабрацца: што ж гэта ў нас робіцца?.. – Ганну не дзівілі ні бойкасць, ні знарокавая Парасчына шчырасць: ведала добра Параску. Бачыла, што Параска недарэмна старалася падступіцца. Па калідоры, па пакоі ішоў згодны, прыхільны гул. Жанкі ўздыхалі, ківалі галовамі: праўду кажа, хадзіла, глядзела, памагчы старалася! – Бачыла я, як гаравалі, бедавалі ўсе. І дзядзька Змітро, і цётка Мар'я, і цётка Гечыха, і ўсе іншыя... Бачыла я, як гаравалі, і думала сабе: няхай цяпер цяжка – потым лягчэй будзе! Наладзіцца!.. Быць не можа, каб не наладзілася! У іншых жа ідзе на лад, чаму ж у нашых не наладзіцца?.. Хіба ж нашы горшыя, як другія? Хіба ў нашых рукі горшыя ці рабіць яны не прывучаны? Ці не такія разумныя?.. – Параска горка пашкадавала: – А вось жа не выйшла ў нас!.. Чаму?!. – Ганна пільна чакала: што яна далей скажа, як павядзе далей? Параска не адказала адразу. Толькі шчыра, разумна адзначыла: – Я ведаю, кожнаму з вас баліць. І мне таксама баліць, вельмі баліць... А калі баліць, то хочацца крычаць, а не думаць!.. Але не трэба і гарачыцца вельмі! – асцярожна параіла яна. – Трэба падумаць добра. Падумаць, што зрабіць, каб паправіць усё, што не так!..

– Думай не думай, адна трасца! – перабіў яе нечы безнадзейны басок: відаць, Гечыхі.

– Паламалася ўсё! Сам чорт не разбярэ!..

– Няма чаго папраўляць!..

– Не збівай хоць ты, Параска!

– Я хіба кажу, што гэта лёгка... Баліць, кажу, і мне... Трудна гэта... Я кажу, што не трэба гарачыцца... Падумаць цвяроза трэба...

Яна гаварыла і цяпер са шчырасцю і спагадай, з вопытнай дасведчанасцю, але яе ўжо, як і Міканора, не раз перабівалі, слухалі нязгодна. Спрачаліся, праўда, мякка – стрымлівалі, відаць, даўняя пашана да Параскі і яе спачувальная далікатнасць. Усё ж яна, хоць і хавала гэта, было відаць Ганне, трымалася няўпэўнена, бянтэжылася. Збівалася ў гаворцы, нялёгка знаходзіла доказы. Яна, заўсёды такая знаходлівая, хуткая...

4

Апейку сустрэлі насцярожанай увагай. Ён жа падняўся ленавата, з нейкай нядбайнасцю хіліў галаву. Ва ўсёй постаці была дзіўная расслабленасць.

– Была ў нас калісьці гісторыя... – мірна, паблажліва загаварыў ён. Загаварыў так, быццам вагаўся: гаварыць ці не гаварыць. – Я быў тады смаркачом. Чужыя агароды правяраў... Пажаніліся ў нас хлопец з дзеўкай. Ён быў наш, праз дзве хаты жыў, Іван, канешне, зваўся. А дзеўка з-за ракі, з Барбарова. Алена... – Ён пальцам будзённа пачасаў макаўку. Успомнілася – от і гаворыць. Вочы глядзелі на яго збольшага спакайней. Дзе-нідзе – з цікаўнасцю. – Дзеўка – як дзеўка. І хлопец – як хлопец... Але от пабраліся, аддзялілі іх. Хатку сваяцтва скляпала. Сталі жыць сабе. Самі па сабе... Не ўломкі, старацельны хлопец ён. І яна – як тая мурашка. З рання да вечара – у полі, у хляве. Шчыруюць абое... Не ўломкі... А от што выйшла... Пасеялі. Нізінка ў іх была. Дак вясной усё вымакла. Сена накасілі. Дождж. Пагніло... Зімой у нас каля ракі – ночы вялікія. І лучыны мала. Дак – дзело маладое – летам яна ўжо раджаць гатова. А часу няма. Усё – на бягу. На бягу, у разоры, і радзіла!.. Мёртвае!.. Як наканаваў хто – то адно, то другое. Як напасць якая! Не там – дык тут!.. Праўда, калі разабрацца, дык і самі там-тут вінаватыя. Маладыя, нявопытныя... Яно, можа б, і нічога ўсё – мала ў каго не бывае! Толькі ж яны да ўсяго папаліся і гарачыя. Як от некаторыя ў нас, у Глінішчах! – падчапіў раптам Апейка. Барыс засмяяўся. Засмяялася яшчэ некалькі з тых, што глядзелі насустрач. – Яна – што не так – на яго, ён – на яе. Такая-сякая! А часам і з кулакамі!.. Яна вартая была яго. Ён ёй слова, яна – два! Век на іх двары гвалт! Як на юравіцкім базары ў нядзелю! – Зноў пайшоў смяшок. Апейка ж будзённа павёў далей: – Чубіліся, чубіліся. Не вытрывала яна. Уцякла! Чалавек яе спачатку: ну, няхай! Можа, і на

лепшае! А потым – жаль узяў. Ды і гонар мужчынскі, мабыць, загаварыў!.. Адно – калі ты кідаеш, а калі цябе – ето саўсім другое!

– Аге! – чула адгукнулася некалькі галасоў. Найбольш – жанкі.

– Зашчымела ў Іванавым сэрцы! – паспачуваў Апейка. – А тут – матка і бацько з уговорамі. «Дзе ето відано такое! Пазаві!..» Угаварылі. Селі на паром – і цераз раку. Што там было – не чуў. Не скажу. А толькі – прывозяць яе... Ва-ажная прыехала!.. А ўсё-такі ўжэ не крычыць! А пра яго і казаць не трэба: цішэй вады. Абыходлівы – не пазнаць! Людзям ужэ нудна стало – спектакля няма!.. Зімой ён – на заработкі ў лес. Вясной добра ўгнаіў, пасеяў у пару. Лета ўдалае. Добра выспела ўсё. Да збожжа – сена добрае... Парадак стаў. Даўно ето было, – задумаўся, пастражэў голас Апейкі. – Як я яшчэ цялят не ганяў. Даўно ўжэ абое пастарэлі. А жывуць усё разам. Жывуць – не горай, як людзі... Усяляк, праўда, і цяпер часам бывае: загаворыць раптам гарачая кроў. А не чубяцца, як было. І не кідаюцца ў розныя бакі. Ведаюць: жыццё пражыць – усяго пабачыць. Не трэба адразу – у адчай!.. – Не разабраць было спачатку: ці то развражаў проста, ці раіў. – Усякая гаспадарка цяжка зладжваецца. Не адразу – бывае – усё складна выходзіць. Трэба часам прыцерціся, як кажуць. Ето – што да сям'і, да двух чалавек. А што казаць ужэ пра вялікую гаспадарку. Пра калектыў.

Ён памаўчаў. Як бы даваў падумаць пра тое, што сказаў, ці збіраўся з думкамі.

– От тут я і хацеў бы сказаць, што думаю пра ваш калгас... – Ён гаварыў па-ранейшаму будзённа, але ўжо вельмі сур'ёзна, значна. – Вы можаце сказаць, што – позна. Аднак, я думаю, агледзецца з толкам не позна ніколі. Трэба разабрацца, высветліць усё. Трэба высніць: што ж такое здарылася? У чым прычына, што так здарылася?.. Я згодзен з тым, што сказаў таварыш Гайліс пра ўраджай і пра дысцыпліну. Я лічу, што таварыш Гайліс асабліва правільна сказаў: вялікая віна ва ўсім кіраўніцтва. У тым ліку і наша віна – што не паправілі ў час, не папярэдзілі... Мы з гэтай няўдачы зробім вывады. Мы паправім памылкі. – Ён павёў вачыма па ўсіх, хто быў у прэзідыуме, як бы паказваючы: тое, пра што ён гаворыць, усе гатовы ўзяць на сябе. Чарнаштан глядзеў спадылба на стол, выгляд быў такі, як бы яго гняла гэта віна найбольш. Як на судзе падсудны. Гайліс таксама, здавалася, гатоў быў узяць сваю частку віны. Башлыкоў, падобна, віны за сабой не бачыў. Апейка нібы не заўважыў гэтага, кіўнуў у залу: от прызнаём сваю віну. – Але і вы павінны прызнаць свае! – Ён, аднак, не стаў ушчуваць надта: нашто перабіраць тое, што было, яно і так добра вядома. Вінаваты ўсе. Лепш

падумаць разам, як зрабіць, каб не было такога. – От я і хацеў бы даць парады на будучае... Што трэба ўлічыць вам на будучае?.. Першае, – раіў ён па-сяброўску, – не карміць болей гультаёў і трутняў! Карміць толькі тых, хто дае карысць. Па долі той карысці, якую кожны дае. Хто больш – таму больш, хто менш – таму менш. А таму, хто бокі абіваў, – дулю!.. – Неспакойны гул ухваліў яго. – Трэба паставіць добры ўлік. Усё лічыць: працу, прыбытак, палучку. Кожную капейку, кожны грам – на ўлік. Усім, у каго рукі лішне доўгія, – па руках... Адным словам – кантроль ва ўсім. Строгі кантроль. Калі не ўстановіце кантроль – усё прападзе. Ніякага дабра не хопіць!..

«От хітры, – падумала Ганна. – Гаворыць так, нібы яны яшчэ ў калгасе! Па-калгаснаму настрайвае!..» Заўважыла: прамова Апейкі растрывожыла людзей, ішоў гоман, чуліся воклічы, але воклічы былі нейкія дзелавітыя: папракалі – кармілі трутняў, разбазарвалі дабро!..

– Хто рабіў, хто не рабіў – усё адно! Кожнаму палачка!

– Хто ўрваў, той і спажыў!..

– Якая тут ахвота – старацца! Карак гнуць!..

– Усё ветрам пайшло!..

Калі Барыс устаў, гоман, воклічы пачалі хутка спадаць. Ён дачакаўся поўнай цішыні, важна, як асаблівую падзею, аб'явіў:

– А зараз выступіць сакратар райкома таварыш Башлыкоў!

5

Вочы ўсіх – мноства вачэй – глядзелі толькі на яго. Перасталі дыміць у калідоры, падступілі да дзвярэй. Сціснуліся так, што нельга было варухнуцца. Ганне сцінала дыханне.

Бачачы, як глядзяць на яго, як чакаюць, што ён скажа, разумеючы, як цяжка будзе яму разбіць насцярожанасць, Ганна раптам пачала хвалявацца за яго. Яе не супакойвала тое, што ён, адзначыла сабе, трымаўся спакойна, упэўнена.

І тон, і выгляд яго паказвалі, што тое, аб чым ён павінен будзе сказаць, вельмі сур'ёзнае і нядобрае і паставіцца да ўсяго гэтага трэба належна сурова.

Ён пачаў з міжнароднага становішча. Галоўная асаблівасць міжнароднага становішча СССР, сказаў ён, у тым, што Савецкі Саюз – адзіная рабоча-сялянская дзяржава – з усіх бакоў акружаны капіталістычнымі дзяржавамі, якія вядуць раз'юшаную барацьбу з намі. З той жа строгасцю на твары, з жорсткімі складкамі каля рота Башлыкоў стаў гнеўна расказваць пра разнастайныя злосныя ўчынкі і шкодніцтвы, якія арганізоўваюць капіталістычныя дзяржавы і іх

паслугачы для таго, каб сарваць будаўніцтва сацыялізма ў СССР і, нарэшце, знішчыць Савецкі Саюз. Адабраць заводы ад рабочых, ад сялян – зямлю. У сваёй звярынай нянавісці да Савецкага Саюза, бачачы, што Савецкі Саюз не толькі не гіне, а ўсё ўзмацняецца, яны ўпарта выношваюць планы крывавай вайны супраць нас. І тон, якім усё гаварылася, і тое, што малявалася за словамі, асабліва пагрознае – адбяруць зямлю, пойдуць вайной, прынясуць знішчэнне, смерць, – гэта моцна падзейнічала на ўсіх, хто слухаў. Цішыня была важкая, трывожная.

Вайна ў любы момант, паказваў Башлыкоў, гатова ўварвацца ў нашы гарады і сёлы. У нашы хаты. Паліць наша дабро, прымусіць туляцца па лясах нашых дзяцей, нашы сем'і. Вайна ўвесь час стаіць каля граніцы Савецкага Саюза. Вораг гатоў выкарыстаць любую нашу слабасць, любы зручны момант. Гэта абавязвае нас быць увесь час напагатове, трымаць порах сухім. Не дапускаць ніякай слабасці ў нашых радах.

Ганна лавіла кожнае яго слова. Яго клопатнасць, трывога і яго гнеў хвалявалі Ганну, уводзілі яе ў свет, які яна не ведала і які, аказваецца, так гразіўся ёй, усім людзям, і гэтым, і многім іншым на свеце, што жывуць бесклапотна, сляпа. Яго хваляванне пра ўсё гэта і між усяго – таксама ж і пра яе, зноў непрыкметна і хораша збліжалі яе з ім, яднал. Узрушаная, захопленая тым, што ён гаворыць, яна раз і другі дзівілася, як ён багата ведае. Ведае, што робіцца на ўсім свеце. «Було за што паставіць над раёнам! – падумала з гонарам і неадступнай рэўнасцю. – Е ж такія адукаваныя!..»

Ёй падабалася дзіўна тое, што ён часам гаворыць не так, як іншыя, быццам незразумела, па-вучонаму: да таго адукаваны, што дацягнуцца няпроста.

Строгім, трывожным быў Башлыкоў і тады, калі пачаў расказваць, што робіцца ў нашай краіне. Унутры СССР бальшавіцкае наступленне, адкрыта паведаміў ён, ідзе ў няспыннай барацьбе з самымі рознымі варожымі сіламі, якія ўсімі спосабамі імкнуцца падарваць нашу краіну знутры... Не зважаючы на тое, што бальшавіцкая партыя вядзе бой з ворагамі ўсіх масцей, гэтае супраціўленне не толькі не заціхае, а ўсё абвастраецца і стварае яшчэ большыя цяжкасці на нашым шляху. І калі мы ўсё ж дабіліся вялізных поспехаў у будаўніцтве сацыялізма, то гэта толькі гаворыць пра непераможную сілу Савецкага Саюза... Голас Башлыкова палагоднеў, нават павесялеў, калі ён з захапленнем, многімі прыкладамі, пачаў расказваць, якператварае Савецкую краіну індустрыялізацыя, што разгортваецца па плану пяцігодкі. Далёкія Магнітагорск, Чэлябінск,

Харкаў раптам аказаліся быццам блізкімі сваякамі і памочнікамі іх Глінішчаў, іх надзейнымі абаронцамі. Праўда, Ганна заўважыла, што тут увага да Башлыкова і яго ўплыў на людзей прыкметна паслабелі. Людзі варушыліся, у вачах паявіліся нецікаўнасць, недавер'е. Нібы казаў пра неабавязковае і пра такое, пра што можна варажыць па-рознаму. У гэты момант прамова Башлыкова страціла багата сваёй сілы.

– Што мы маем у сельскай гаспадарцы? – Башлыкоў зрабіў паўзу, як бы даваў час падрыхтавацца да новага, вельмі важнага. У голасе яго былі трывога і цвёрдая мужнасць, калі ён пачаў расказваць, што наступленне ў вёсцы асабліва абвастрыла шалёнае супраціўленне варожых элементаў, якія, прадчуваючы сваю блізкую пагібель, не спыняюцца ні перад чым. Тут Ганна адчула, як залу зноў працяла пільная, насцярожаная цішыня. Усе зноў глядзелі на яго, чакалі... – Па ўсёй краіне кулакі і іх пасобнікі ў бяссільнай злосці ідуць паўсямесна на адкрытыя выступленні. Паляць калгасныя пабудовы, дамы сельскіх актывістаў, страляюць з абрэзаў селькораў... Яны думаюць, што гэтым звярыным тэрорам запалохаюць нас, сарвуць калектывізацыю! – Голас Башлыкова набыў сілы. Башлыкоў заявіў цвёрда: – Дарэмна яны разлічваюць на гэта! Бальшавікі не з палахлівага дзесятка! Кулацкая барацьба яшчэ больш згуртоўвае нашы рады! Рады бальшавікоў і перадавога сялянства!..

Сіла яго слоў, чула Ганна, была не так у саміх словах, як у тым, што было за гэтымі словамі, у тым пачуцці, з якім яны былі зліты. За ўсім адчувалася шчырая, непахісная пераконанасць, адданасць, якая прымушала прыціхаць недавер'е многіх, а Ганну проста звала, захапляла. Такога гарачага пераканання яна яшчэ не адчувала ні ў кога. Ад гэтага да ўсяго прымешваўся непатрэбны раўнівы сум...

– Па ўсёй краіне, – загаварыў ён раўней, але ўсё з той жа пераконанасцю, – нечуванымі тэмпамі разгортваецца масавая калектывізацыя... Па ўсяму Савецкаму Саюзу ёсць ужо не толькі такія раёны, дзе калектывізавана больш за пяцьдзесят працэнтаў, але ёсць і раёны суцэльнай калектывізацыі!.. Такія раёны ёсць у Паволжы, на Кубані, на Украіне, у важнейшых зернавых раёнах СССР. Ёсць такія раёны і ў нас, у Беларусі. Напрыклад, Клімавіцкі раён... Ідзе справа да суцэльнай калектывізацыі і ў нас. Мы паставілі пытанне аб тым, – голас Башлыкова зноў набыў асаблівую значнасць, – каб і наш, Юравіцкі раён, уключылі ў вышэйшую групу па калектывізацыі, і ў ЦК падтрымалі нас. Мы ўзялі ўдарную, бальшавіцкую задачу: да вясны наступнага, 1930 года калектывізаваць раён на ўсе сто

працэнтаў!.. Мы паставілі гэту задачу, – загаварыў Башлыкоў моцна, нібы вылучыў, – і мы яе выканаем! Нягледзячы ні на што!

У пакоях, у калідоры была цішыня. Быў момант – здалося, усіх апанавала здранцвенне. Перасталі раптам дыміць цыгаркамі, сапці побач. З павагай і раўніва Ганна адчула: гэты зробіць! Што захоча – зробіць! От сіла!..

– У гэтым святле ўсім павінна быць ясна, – голас яго пацішэў, стаў дзелавіта стрыманым, – якое значэнне надае райком таму, што адбылося ў вашым калгасе. Гэта ўдар па ўсяму раёну. Таварыш Дубадзел правільна сказаў... Таму мы павінны прынцыпова ўскрыць прычыны, якія давялі да ўсяго гэтага. Тут таварышы, якія выступалі, называлі розныя прычыны, каб вытлумачыць тое, што здарылася. Чаму разваліўся калгас... Яны назвалі многа прычын, – у голасе Башлыкова пачулася стрыманая насмешка. – Але не назвалі галоўнай... Галоўная прычына – не будзем заплюшчваць вочы, назавём рэчы сваімі імёнамі! – сур'ёзная, палітычная. Калгас распаўся, – загаварыў Башлыкоў, вылучаючы кожнае слова, – у выніку варожай дзейнасці! Калгас падарвалі – яўнымі і скрытымі метадамі – кулацкія элементы!.. Таму тое, што адбылося тут, райком разглядае як палітычную з'яву, якая патрабуе палітычных вывадаў і мер. Бязлітасных мер.

Варожыя сілы ўсіх масцей, – загаварыў ён выразна, дужа, – дзейнічаюць шырокім фронтам. Яны дзейнічаюць у міжнародным маштабе і на ўнутраным фронце. Яны не грэбуюць нічым, каб падарваць нас. Яны шкодзяць нам і ў вялікіх, дзяржаўных, справах, і ў малых. У любым сяле, у любым калгасе...

Класавы вораг дзейнічае. І мы таксама, – голас Башлыкова ўсё цвярдзеў, – будзем дзейнічаць! Мы будзем бязлітасна біць па ворагу і яго пасобніках! Дзе б яны ні вылезлі!

У святле ўсяго таго, што я сказаў, – Башлыкоў, было відаць, сабраўся канчаць, – райком заклікае ўсіх калгаснікаў вёскі Глінішча вярнуцца ў калгас, аднавіць яго. Ударыць па ворагу нашай аб'яднанай сілай, калгасам!

Ён сеў. Была цішыня. Хоць бы хто кашлянуў. Хоць бы варухнуўся хто. Была разгубленасць перад ім. Перад сілай і праўдай, якую выставіў ён. І якую раптам адчулі так моцна. Потым Ганна заўважыла, як з калідора перасталі ціснуць, пачалі адступаць ад дзвярэй, у цемру. Заварушыліся ў пакоі, задымілі, хтосьці закашляў.

Схамянуўся, узняўся Барыс:

– Хто шчэ хоча сказаць?

Ён павёў галавой па класе. Адводзілі позіркі, апускалі вочы, смалілі цыгаркі. Пачакаў. Ніхто не адгукаўся.

– Няма ахвотнікаў?

– Хваціць ужэ! – заявіла спакойна і важка цётка Маня. – І так позно!

Як бы чакалі гэтага, адразу, нецярпліва падхапілі. Па пакоі, у калідоры пайшло:

– Аге! Развідняе ўжэ скоро!.. Дзень унь!..

– Пагаварылі ўжэ!.. Сколькі ж гаварыць!

– Хваціць!..

Барыс нахіліўся да Башлыкова. Той нешта гаварыў яму.

– Ну, калі няма ахвотнікаў, – сказаў Барыс прымірэнча, – дак трэба прыняць рашэнне.

– Якое шчэ рашэнне? – востра нацэлілася Гечыха. Зноў засмактала папяросіну, але вачэй не адвяла. У пакоі ўсе глядзелі на Барыса, чакалі.

– Ну, рашэнне, што мы, – стрымана, з годнасцю павёў Барыс, – аднаўляем калгас. І ўсе, каторыя выйшлі, вяртаемся назад... І будзем работаць, як раней...

Момант зноў была цішыня. Цішыня напружаная і насцярожаная. Позіркі то неспакойна бегалі па тварах бліжніх, што сядзелі за сталамі, на сталах, то ўпіналіся ў Барыса, у Башлыкова.

– А нашто ето канешне? – асцярожна запярэчыў хтосьці ззаду.

– Не трэба етаго! – адгукнуўся больш упэўнена другі голас.

– Не трэба! – загуло па радах.

Барыс стаў моцна стукаць далонню, пакуль не прыціхлі. Як неадменнае, заявіў зноў:

– Трэба рашэнне! – Нібы для таго, каб не было сумненняў, дадаў: – Ето – абязацельно.

– Абыдземся! – адрэзаў голасна, як бы з выклікам, худы, з кепачкай.

Па пакоі адразу пайшло:

– Паслухалі – і хваціць!..

– Хваціць!..

Устаў Башлыкоў. Упэўнена высіўся сярод гоману, чакаў, калі сціхнуць. Але гоман не сціхаў, нават памацнеў. Гаманілі, кідалі неспакойныя позіркі ўжо нібы да аднаго.

Ён не зварухнуўся, пакуль не наступіла мёртвая цішыня.

6

– Таварышы, тут, відаць, некаторыя думаюць, – у роўным, мерным голасе Башлыкова Ганна ўлавіла злую ўпартасць, – што мы сабраліся сюды жартачкі жартаваць. І хочуць сход наш ператварыць у вясёлую гаварыльню. У пустапарожнюю балбатню! – Голас яго ўсё стражэў, усё набіраў жорсткасці. – Дык – каб не было сумнення – аб'яўляю: мы прыбылі сюды не для вясёлых забавак, не для пустой гаварыльні! І мы выступалі, пераконвалі вас не для таго, каб дазволіць некаторым, што таксама прыйшлі сюды, са сваімі мэтамі, – сарваць сход! Мы прыбылі для таго, каб зрабіць важную справу – паправіць становішча, у якім вы апынуліся! Паправіць вашы неабдуманыя дзеянні, якія шкодзяць усяму раёну. Мы спадзяваемся, што вы зразумелі вашу цяжкую памылку і – выправіце яе!.. Я прапаную прыняць такое рашэнне: «Мы, калгаснікі калгаса «Рассвет», усведамілі сваю памылку і аднагалосна рашылі аднавіць калгас. Для чаго вяртаем у калгас усю абагуленую маёмасць і абязуемся працаваць пабальшавіцку!..» Вось так!

Ганна слухала яго з дваістым пачуццём: павагі да смеласці, рашучасці яго і – трывогі. Вельмі ж неасцярожна, напралом лез ён: каб не раззлаваў людзей, не сапсаваў усё. «Без падходу... Не знае нашых. Не знае – нашы не любяць такога... Да шчэ цяпер, калі ўсё так пячэ...» Яна павяла позіркам – твары былі недавольныя, зацятыя. Вочы вострыя, злыя. Не падабалася, не ўхвалялі...

Але маўчалі. Рашучасць Башлыкова, яго моцная пагроза трывожылі. Трывожылі, злавалі і – стрымлівалі. Пагроза Башлыкова – не жартачкі... Нядобрае, небяспечнае было маўчанне...

І раптам прарвалася:

– А як я – не хочу?!

Сказаў той, худы, у кепачцы, што тырчаў навідавоку. Сказаў голасна, як бы нават задзірліва. У позірку, ва ўскінутай, з паголенымі вострымі сківіцамі галоўцы быў нібы выклік. Вочы проста шалёныя адвагаю, усмешачка з-пад вусоў. «Ану, паспрабуй! Не хочу, от і не хочу!..»

– Чаго? – не зразумеў адразу Башлыкоў. Ці не чакаў такога.

Глінішчанец з тым жа выклікам заявіў:

– Вяртацца не хочу! У калгас!..

Башлыкову не далі сказаць. Спачатку беражліва, а потым усё больш вольна, злосна рынулася:

– Няма такога права!.. Застаўляць!..

– Ета так трэба?! Сілаю?!.

– Паспыталі ўжэ! Хваціло!..
– Не хочам! Не вернемся!
– Няхай другія папробуюць!
– Аге! Каторыя не булі!
– Не канешне нам адным!
– Па чарзе!..

Дарэмна Барыс загадваў, стукаў штосілы па стале – не слухалі. Гаманілі, крычалі ў пакоях, у калідоры мужчынскія пракураныя, жаночыя прарэзлівыя, звонкія маладых, хрыпатыя старых – усё шматгалоссе, сабранае з усяго сяла, гневалася, пагражала, клялося. Ганна глядзела на Башлыкова, што стаяў цярпліва побач з Барысам, і ад душы шкадавала яго: «Нялёгко, мабуць, ето яму бачыць, начальніку! Такое непаслушэнство...» Яна быццам моўчкі супакойвала: не пераджывай, глядзі спакойна! Чаго было чакаць іншага, калі людзям яшчэ так баліць! Няўжо ты не прадчуваў гэта да сходу! Прадчуваў, канешне, але ж трэба было паспрабаваць! Бо і так пакідаць нельга было!

У тую хвіліну яна асабліва, усім сэрцам і розумам, адчула, што і яго абавязак нялёгкі. Цвёрды і яго хлеб. Адчула і пранікласа спачуваннем да яго, як бы наблізіла яго да сябе. Стала побач з ім...

Толькі калі выказаліся, спатолілі нецярплівыя пачуцці, пачалі паволі аціхаць.

– Тут раздаваліся галасы, – адчула яна жорсткасць у голасе Башлыкова, – якія нельга інакш расцаніць, як варожыя. Як кулацкія, антысавецкія заявы. – Ён асабліва важка вымавіў апошнія словы. – Кулацкія элементы, што прабраліся на сход, і іх адгалоскі – відаць за вярсту – паставілі сабе задачу: сарваць сход, любымі метадамі не дапусціць аднаўленне калгаса!.. Але я заклікаю ўсіх сумленных жыхароў вёскі не паддацца гэтай кулацкай і падкулачніцкай вылазцы, даць належны, бальшавіцкі адпор і вярнуцца зноў на калгасныя рэйкі. Аднавіць калгас.

– А калі хто не хоча? – дапытліва, быццам думала ўголас, і настойліва сказала цётка Маня.

– Вам гаварылі ўжо, – рэзкавата прамовіў Башлыкоў. Ён, адчула Ганна, траціў цярплівасць. Канчалася вытрымка. Выразна, з непрытоенай зласлівасцю ён аб'явіў: – Таму, хто не хоча вярнуцца ў калгас, трэба будзе вярнуць у калгас маёмасць!

– Ето чаму? – не так запытаў, як запярэчыў недавольны мужчынскі голас з задніх радоў. Яго адразу падтрымалі гоманам.

– Вы ведаеце, – Башлыкоў і тонам гаворкі, і выглядам паказваў, што не хоча гаварыць попусту.

– Ведаем-то ведаем. Ды – не разумеем! – Дзядзька закрычаў злосна: – Ужэ сваім не распараджайся!

– І нашае ўжэ – не нашае!

Башлыкоў адужаў гоман:

– Вы абагулілі яе. Яна належыць калгасу.

Хтосьці запярэчыў зларадна:

– Няма ўжэ калгаса!

Башлыкоў коратка, непахісна адрэзаў:

– Гэта – калгасная маёмасць!

– Калгасная! Аге! – Хтосьці мацюкнуўся на ўвесь пакой. Гарачыя галасы прарэзаў нахабны свіст.

– Не вернем!!! – пачуўся крык.

– Не аддадзім!

– Нашае!..

Башлыкоў не стрымаўся. Паддаючыся агульнаму крыку, адужваючы яго, поўны гневу, распарадзіўся:

– Маёмасць усю неабходна вярнуць! – Відаць, адчуў, што гэта не падзейнічала. Падмацаваў сябе, пагразіўся: – Усе, хто не верне, будуць адказваць! Прыцягнем да строгай адказнасці!

Яго пагроза падліла масла ў агонь.

– Засудзіце? За нашае ж добрае!

– Арыштуеце! За што?

– За тое, што ўступалі!

– Усіх не арыштуюць! – крыкнуў нахабна, са здзекам пярэдні, з кепачкай.

Башлыкоў, разгневаны непаслушэнствам, заўважыў гэты крык. Ледзь Барыс прыцішыў галас, Башлыкоў накінуўся на дзядзьку:

– Гэта – варожы голас! Кулацкі голас! Вы – хто?..

– Я – Свердзел, – адказаў дзядзька. У вусах затаілася ўсмешка.

– Гэта – што, прозвішча? – Башлыкоў прыціх, раптам страціў упэўненасць.

– Так імянуюць. – Дзядзька адчуў увагу на сабе, яшчэ пасмялеў. Як бы насміхаўся. – Свердзел. Значыць, свердзел...

– Празвалі так, – памог Башлыкову Барыс. – Прозвішча яго – Чарняк Змітро.

Башлыкоў момант вагаўся. Непрыемная выйшла сітуацыя. Стараючыся паказаць сябе па-ранейшаму ўпэўненым, аб'явіў:

– Я пазбаўляю вас голасу!

Ганна пачырванела: нашто гэта ён! Разгубіўся, зусім страціў разважнасць. «Не трэба! Не так!» – проста хацелася сказаць яму. Так

захацелася паправіць, памагчы. І так раптам адчула: малады, зялёны зусім! І гарадскі, зусім не ведае нашых!..

Дзядзька азірнуўся, усе глядзелі на яго, чакалі. Ён раптам адкрыта засмяяўся проста ў твар Башлыкову:

– Дак, можа, мне дадому можно? А то ж цярпення ўжэ няма!

Башлыкоў жорстка прыплюшчыў вочы.

– Ідзіце! – Паабяцаў пагрозна: – А пасмяецеся потым!

Свердзел патаптаўся лапцямі, не пайшоў адразу. Спадабалася роля.

Паспрабаваў яшчэ:

– Дак, можа, і другіх адпусціце? А то ж – утаміліся ўсе...

– Ідзіце! – загадаў Гайліс Свердзелу.

Калі Свердзел выйшаў, устаў Апейка. Паспрабаваў памагчы Башлыкову вывесці сход з тупіка. Загаварыў, што адразу цяжка ўсё рашыць, што ён і яго таварышы спадзяюцца, што калгаснікі абдумаюць усё спакойна, разважліва. І вернуцца ў калгас...

Але і яго не хацелі слухаць.

– Падумалі ўжэ! Хваціць!..

Калі Апейка, Башлыкоў і іншыя ішлі з класа, у калідоры дзядзькі і цёткі прыпыніліся, моўчкі прапусцілі іх. У Парасчыным пакоі было чуваць, як яшчэ доўга, сумна тупалі, шаргалі боты і лапці. У пакоі маўчалі, нібы слухалі гэты тупат і шарганне.

Башлыкоў стаяў адасоблена ад іншых, засяроджаны, затоены з невядомымі, нядобрымі думкамі. Ён быў так паглыблены ў сябе, што не адразу зразумеў, што яму гаворыць Чарнаштан, які нясмела падышоў да яго.

– Што? – нахмурыўся Башлыкоў.

– Я хачу пайсці ў Туманы, у калгас, – асцярожна паясніў былы старшыня калгаса. – Рахункаводам могуць узяць. Дак – ці можно?

– Ідзіце кім хочаце, – Башлыкоў упершыню падняў позірк на Чарнаштана. Позірк быў цяжкі, не зычыў дабра. – Толькі спачатку адчытаецеся за сваю «дзейнасць» камісіі з раёна...

Ён павярнуўся, пашукаў вачыма па пакоі. Важка пайшоў да Міканора і Гайліса.

– А вам прыйдзецца растлумачыць гісторыю з калгасам «Рассвет» на бюро райкома...

Ён прыслухаўся і раптам стаў хутка збірацца. Ганна падрыхтавала яму і Апейку перакусіць, папрасіла на хвіліну затрымацца. Апейка гатоў быў згадзіцца: прагаладаўся, але Башлыкоў не прыпыніўся.

За ім заспяшаўся і Апейка.

– Другім разам, – папрасіў прабачэння. – З лепшым настроем...

Раздзел пяты

1

На ганку адразу навалілася халодная, з ветрам цемра. Пасля святла вочы першы момант бачылі кепска, Башлыкоў прыпыніўся.

– Мяце! Халадзеча! – апынулася побач Параска. – Сама прырода – каб перачакалі!

– Праўда: заначуйце... – памог ёй Барыс.

Башлыкоў цвёрда кінуў:

– Не! – Прытрымліваючыся за бакавінкі, стаў рашуча сыходзіць па ступеньках.

Цяпер было відаць: не так і цёмна. У шэрым прыцемку зімняй ночы добра значыліся цёмныя абрысы коней, постаці возчыкаў, два вазкі. Башлыкоў гукнуў свайго возчыка, пайшоў на голас. Іншыя, што выйшлі са школы, пайшлі таксама, моўчкі глядзелі, як ён уладжваецца на заднім сядзенні. Было падобна, што чакалі яшчэ чагосьці.

Ён маўчаў. Возчык азірнуўся, шмаргануў лейцамі, і ўсе, хто быў побач – Дарошка, Казачэнка, Гайліс, Глушак, – імкліва пайшлі назад. Зніклі ў цемры.

Паўз самы школьны двор – зімняя дарога да шляху. На самым выездзе з двара вазок нагнаў некалькі чорных постацей, што неахвотна збочылі ў снег. Калі прамчаў міма, здалося: спіну ніжуць нядобрыя позіркі, мімаволі насцеражыўся. Насцярожанасць уздымалася, калі ўслед палезлі ў вочы гарбатыя, варожа затоеныя абрысы: справа – нядаўняя вуліца з хатамі, хлявамі, гумнамі, а злева – загуменне той, старой часткі вёскі.

Праехаў між іх – быццам вырваўся з палону. Вольна, прасторна разлеглася ўперадзе шараватая снежная шыр. Адчуваючы, як у ім не сціхае, гоніць яго нецярплівае, злое – хутчэй, далей адсюль, Башлыкоў чуў у сабе проста патрэбу падганяць возчыка, коней. Не без намагання стрымліваў ён у сабе гэта жаданне: бачыў, што возчык разумее яго, стараецца і без падгонкі. Не першы раз едуць, ведае ездака. Таму, калі ў полі вазок раптам спыніўся, Башлыкоў нервова і нездаволена кінуў:

– Ну што такое!

– Іван Анісімавіча не відно!.. – адказаў возчык, гледзячы да сяла.

А, чорт! Башлыкова ў яго нервовым неспакоі ўзлавала не толькі тое, што давялося спыніцца, але і павага, пяшчота ў возчыкавым: «Іван Анісімавіча!» Нібы папракнуў, што – Іван Анісімавіч от затрымаліся, развітваюцца па-людску. Яшчэ адзін дарадчык, інструктар знайшоўся. Нядобра падумаў пра Апейку: затрымаўся, разводзіць лагоду, каб паддобрыцца, набыць сабе аўтарытэту; выставіць сябе шырокім дэмакратам побач з башлыкоўскай рэзкасцю.

Недзе шчымела няёмкасць. Не было цвёрдасці, што зрабіў вельмі добра. Нешта далікатнае не першы раз пярэчыла грубасці. З кім-кім, а з Дарошкай, з Казачэнкам можна было б абысціся лепш. Асабліва – з Дарошкай, з жанчынаю. Але ён не даў расквоміцца, стрымаў сябе. Усё гэта – дробязі, нікчэмнасць у параўнанні з тым галоўным, што адбылося. І значэнне якога ён не будзе прытойваць ніякімі далікацтвамі, як – іншыя дэмакраты... Ён і паказваў, і будзе паказваць, як недаволаны. Галавацяпы! Слоў няма такіх, якія заслужылі!..

Ён, не азіраючыся, пачуў, калі пад'ехаў Апейка. Вазок падышоў амаль упрытык: Апейкавы коні саплі ў патыліцу.

Вазок піскнуў і зноў памчаў. Хутка ён, аднак, запыніўся так рэзка, што коні ззаду ледзь не наскочылі на яго. Пад палазамі цяжка зашаргацела: пацягнулася голая, вымеценая ветрам дарога. Адолеўшы гэты адрэзак, коні былі зноў узялі лёгкі бег, але неўзабаве пільны возчык сам прытрымаў іх. Зноў шаргала ўнізе і марудна ішло амаль голае поле. Ехалі так марудна, што Башлыкову хацелася саскочыць на зямлю і пабегчы самому.

Увесь час налятаў вецер, сыпаў снегам у твар, усё намагаўся насыпаць за каўнер. Пасмы снегу раз-пораз перабягалі цераз дарогу, праносіліся ў паветры перад вачыма – ад гэтага ўсё выглядала варухлівым, неспакойным і нібы няпэўным. Уражанне неспакойнасці і няпэўнасці яшчэ ўзмацняла цьмяная шэрань, што атульвала ўсё поле, давала больш-менш добра бачыць толькі блізкае. Неспакойнае было ў бегу коней, у няспынным дзікім варушэнні быльнягу абапал дарогі, на межах, у самім няроўным, кідкім ветры...

Злева, трохі наводдаль, штосьці зачарнела, Башлыкоў не так разгледзеў, як успомніў – невялікі гаёк у полі. Калі цёмная пляма трохі наблізілася і стала няпэўна акрэсліваца, Башлыкоў раптам праз варушэнне снегу заўважыў там, пад покрывам цемры, дзіўныя постаці. Ён прыглядзеўся, і разважлівае сумненне пацішэла: тое, што ён хацеў бы лічыць прывідамі, жыло, варушылася, рыхтавалася. Адчуваючы, як халадзее спіна, ён нервовым рухам палез у кішэню,

сціснуў цёплую, цвёрдую рукаятку нагана. Рашуча пералажыў наган за пазуху паліто. Павярнуўся назад крыкнуць Апейку, папярэдзіць, але вазок, нібы знарок, плёўся далёка.

«Не паслухаўся!.. Не застаўся!.. Дурная нецярплівасць!.. Даказаць хацеў нешта!.. – хутка, хваравіта, горача білася ў галаве. Апякло крыўднае: – Як гэта мог не бачыць, што і сляпы пабачыў бы! Прагныя, злосныя позіркі. У якіх вачавідкі гарэла: разлічыцца! Кончыць!.. – І горкае, кволае: – Так па-дурному ўліпнуць! Так кончыць! Не ўправіўшыся нічога!..»

Пальцам адвёў курок, другі паклаў на спускавы кручок і ўсё ўглядаўся ў цемру ўзлеску, да рэзі ў вачах. Ад напружання вочы завалакло, ён нецярпліва выцер вочы, нязводна сачыў. «З абрэза ці з вінтоўкі пекануць, – прайшло ў свядомасці. – Хутчэй – з вінтоўкі. З вінтоўкі – больш дакладна...» Як гэта цягуча было: ехаць, адчуваючы сябе пад прыцэлам вінтоўкі, наведзенай вопытнай рукой. Ехаць і чакаць, калі грымне стрэл, які кончыць усё. «Так рана! Калі толькі пачаў!.. І так па-дурному!..»

Стрэлу не было. Ужо ад'ехалі нямала, а сэрца гулка грымела. Супакаенне прыходзіла паволі і няпоўнае: трывога па-ранейшаму гняла грудзі. Быў там хто ці не было? Няўжо толькі здалося?.. Не можа быць, што здалося!.. Ён жа добра бачыў: постаці, рухі нават!.. Чаму ж не стрэлілі? Пабаяліся ў апошні момант?..

З радасцю, што жыве, з супакаеннем – не стрэлілі, абышлося пакуль, увёў сабе клопатнае, значнае: сказаць Харчаву, загадаць, каб прыгледзеўся, высветліў. Няпрошанае ўзяло сумненне: а можа, не варта казаць – стары, грубы рубака, можа, не паверыць. Палічыць, што – усё прывіды багатай фантазіі. Страху. Гэта – можа быць. І Апейку не гаварыць, відаць. Гэты наогул мог праспаць і заявіць, што нічога не было. І не дакажаш нічога. Відавочца... Адужаў прыкрую няёмкасць, пакпіў з сябе: а брыдкая была хвілінка! Аж у пот, ліха яе, увагнала!..

За белым поплавам дарога вывела да шляху. Па баках у сухім шорсткім пошуме адна за адной пайшлі старыя бярозы. Вушы зноў востра лавілі гукі, сярод якіх супакойвалі толькі тупат і пырханне ззаду Апейкавых коней; вочы падсцярожліва сачылі за ценямі, за ўсякім рухам. Бярозы за бярозамі, з аднаго боку і з другога, і за кожнай можа чакаць небяспека. А тут злева насунуўся, узняўся чорнай сцяной усутыч лес. Лес да засценка, і далей, да Прыпяці. На многія кіламетры – балота і лес. Райскі прытулак для бандытаў.

Пакуль сунуўся лес, Башлыкоў насцярожана цікаваў яго цемру. За роўняддзю шлях пачаў сыходзіць уніз, уціснуўся ў крутыя берагі. З

аднаго боку бераг і з другога – усё закрылі. Знізу не відаць, што на іх, за грэбнем. А стуль усё – як на далоні. Берагі блізка – нейкія тры крокі ў бакі. Сціснулі так, што і развярнуцца з вазком няпроста. От дзе пекануць зручна!.. Добра адно, што коні, як бы разумеючы небяспеку, з горкі падбавілі бегу. Непрыемнае, цягучае чаканне. Увага адначасна ў адзін і другі бок. Рука аж нямее, сціскае наган.

Нарэшце берагі пачалі рассоўвацца, рассунуліся. Ні лесу, ні бяроз абапал, шэрая, мутная шыр. Шыр балота. Шлях пабег грэбляй, што выткнулася над заснежанай нізінай. Позірк Башлыкова ўнізваўся ў змрок наперадзе, намагаўся разгледзець цёмны, шырокі бераг. Камунарскі бераг. От ужо масток над Тур'ёй – капыты коней, як у бубен, застуганелі па дошках. За мастком – зусім побач – горка, на ёй цёмныя камунарскія будынкі.

Коні на горку прыцішылі бег, пайшлі спакайней. Нібы адчулі, што небяспека ўжо ззаду. Злева плыў плот, плылі копы яблынь за плотам. Справа – некалькі хат, без адзінага агеньчыка. Уткнуліся ў неба і зніклі ў змроку таполі, і зноў разлеглася, папаўзло па баках мутнае поле. Башлыкоў перастаў ціснуць ручку нагана, сунуў яго ў кішэню. Уткнуў шыю, бараду ў каўнер, прыплюшчыў вочы. Сядзеў расслаблена, слухаў прасторны пошум ветру, чуў халодны пах снегу. Як бы здаля, але суцешліва даходзіла, як паскрыпвалі палазы, што час ад часу чаплялі голую зямлю. Як горача пасапвалі ззаду Апейкавы коні.

Нядаўняе ўтрапенне паволі прыціхала. Трывога жыла ўсярэдзіне ўжо не толькі як рэальнасць, але і як успамін пра перажытае. Успамін гэты вярэдзіў непрыемна: цяпер, калі ўсё цверазеў, няёмка было адчуваць, што так гарачыўся, нерваваўся. Нават нібы спалохаўся. Не, не спалохаўся – няма чаго кляпаць на сябе. Проста быў напагатове, як трэба. Глядзеў адкрыта ў вочы праўдзе. Гатовы быў адказаць у любы момант. І адказаў бы як належыць!.. Усё ж – непрыемна вярэдзіла яго – не круці: спакою, вытрымкі належнай не было. Хваравіта трымаўся: сэрца хапалася, як у навабранца. Хлапчук! Ледзь не прызваў на дапамогу Апейку!..

Зноў узяло ранейшае: было там, у кустах, што ці не было? Праўдзівы перад сабой, ён адчуваў цяпер, што вельмі магло стацца – не было нічога. Здалося. Прычаўплося. Ад неспакою. Багатай фантазіі... Ён вылаяўся ўголас: «Ч-чорт!.. Дайшоў!..» Папракнуў: «Праклятыя нервы!..»

Непрыемнае ўзрушэнне, што не хацела адыходзіць, увяло іншае. У памяці ажыло: духата, густы, едкі дым папярос. Цяжкі дух поту, аўчын і свіст. Цёмныя, з неспакойнымі ценямі аблiччы. Потныя,

непадатныя. Злосна ашчэраныя раты. «Няма такога права!» «Его не па закону!..» За гэтым прыйшло дзённае: як хадзіў па пустым калгасным двары – сіратлівая пустэча канюшні і свірна, сумная адзінокасць паржавелай жняяркі. Як хадзіў з Чарнаштанам, з Гайлісам па дварах уцекачоў, спрабаваў кожнага ўгаварыць адумацца, вярнуцца. Згадаў, як ледзь не кожны, заўважыўшы яго на двары, насцярожваўся, спрабаваў схавацца. Жонкі, злыя іх вочы. І злыя, варожыя крыкі.

Чым больш хадзіў, тым больш адчуваў – марна гэта. І цяпер запякло адчуванне глухаты іх, варожасці, нават – нянавісці. І разам – сваёй слабасці, сваёй прыніжанасці. Брыдкае адчуванне. Ніколі, здаецца, не было такога...

Ён успомніў, што тая ж глухата і варожасць сталі перад ім, калі загаварыў на сходзе. Успамін пра гэта асабліва ўсхвалёваў, бо тут ён выйшаў, вытраціўшыся за дзень, звярэдзіўшы ўсяго сябе. Бо тут высільваўся над меру. Аддаваў рэшткі сябе. Дзіўна, хоць, перабіраючы тое, што казаў, не бачыў памылкі, яго ўсё ж гняло нездавальненне сабой. Нібы ўсё-ткі казаў не тое, што трэба, і не так, як трэба. Можа, гэта было ад таго, што не пераканаў жа, не змяніў нічога. З прыкрасцю думаў, што не вытрываў пад канец, загарачыўся. І яшчэ больш сапсаваў усё... За гэтым пачаў перабіраць паводзіны, выступленні іншых прамоўцаў. Ад Дубадзела нельга было чакаць большага, стараўся, колькі хапіла. А вось Глушаку можна было б лепш выступіць. Гаварыў, нібы хацеў адбыць. І Дарошка – далікацтва нейкае развяла. Але найбольш «цікавае» ўсё ж – слова старшыні выканкома. Байка пра нейкага Івана – проста анекдатычны ўзорчык сярмяжнай філасофіі. Падробкі пад мужычка. А фактычна – узор апалітычнасці, апартунізму. Якіх далей проста-такі нельга ўжо даравац. Якія ўжо чорт ведае куды вядуць.

Ён успомніў, што Апейка з самага пачатку не таіў, што не верыць у поспех гэтага сходу. І хоць цяпер непрыемны вопыт быццам бы паказваў, што ў яго была рацыя, Башлыкову не хацелася згаджацца. Усё-ткі сход трэба было зрабіць, як гэта ні непрыемна. Трэба было! Трэба было выпрабаваць усе сродкі. Высветліць усё да канца. Цяпер сумленне чыстае можа быць. Усё, што маглі, зрабілі...

А што не ўдалося змяніць, не іх, не яго, Башлыкова, віна. Нічога нельга было зрабіць. Цяпер відна, як на далоні: сплялося варожае кубло. Усё заражанае паганым, кулацкім душком. Нават бядняцкая частка заражана. Ці – запалохана кулачком... «Вылезлі ў адкрытую, – прыйшла, як ясны вынік, думка. – Скінулі маску!.. Вайна ў адкрытую!.. Што ж – тым лепш! Ударам – на ўдар!.. Трайным ударам на паганы ўдар!..»

Ад злосці, што ўздымаецца, у ім мацнее адчуванне сілы, упэўненасць у сабе, у сваёй уладзе. Трайным ударам! Ён не ўдакладняе, як гэта будзе – трайным ударам: думаць цяжка. Даўно ўжо чуе – усё мацней навальваецца, абцяжарвае ўсяго змора. Але ён ведае: гэта будзе, трайным ударам!..

Думаць глыбей яму замінае не толькі стома. Ён знарок стрымлівае сябе, смутна адчувае: са злосцю грозіцца ўпаўзці больш неспакой. Бяда. Катастрофа. Адганяе думкі пра гэта, трымаецца за ранейшае: трайным ударам!

Знарок прыслухоўваецца да сваёй стомы: ах, як ён змарыўся! Хутчэй бы дапасці да дому, кінуцца на ложак. Ці хоць на падлогу. Не распранаючыся нават. Перадыхнуць трохі ад усяго...

Яшчэ ён чуе, як унізваецца, сцінае ўсяго мароз. Ён мерзне ўсё мацней, але трывае, не варушыцца. «Зіма бярэцца... Бярэцца...» – думае ён дзіўна ўсцешана.

2

Калі спусціліся ўніз, у цішыню юравіцкай вуліцы, возчык павярнуўся да яго:

– Куды везці?

Башлыкоў апусціў каўнер, трасянуў плячыма.

– У райком...

Намерзлыя губы варухнуліся непаслухмяна, выйшла нейкае «вайком».

Возчык мог бы і не пытацца: кожны раз, вяртаючыся, ехалі найперш у райком. Можа, пакуль ездзіў, адбылося што-небудзь важнае: трэба неадкладна даць распараджэнні. Ды і наогул даведацца пра становішча, быць у курсе апошніх падзей. Ведаць усё... Пасада такая і час такі, што трэба ўвесь час быць напагатове...

З акна райкома прывітаў жоўты агеньчык. Ураз адкідаючы здранцвенне, што сцінала ўсяго, Башлыкоў ахвоча выскачыў з вазка. Левая нага ледзь не падагнулася, ён прытрымаўся, адужаў млявасць у ёй, яшчэ накульгваючы, падаўся на райкомаўскі двор, узышоў на ганак. Паспрабаваў адчыніць дзверы, але яны былі зашчэплены з сярэдзіны. Цёплай пасля рукавіцы рукой энергічна пастукаў па дошках.

Адчынілі не хутка. Дзяжурны, русявы хлопец, убачыўшы яго, лыпаў вачыма санліва і няёмка. Задрамаў. Ухапіўся прыгладжваць валасы.

Башлыкоў з той лёгкасцю, якая заўсёды паяўлялася пры людзях, рашуча прайшоў міма. Не сказаў нічога, папрок вымавіў маўчаннем. Ужо ў прыёмнай прыпыніўся, кінуў:

– Званіў хто?

– Званілі!.. – злавіў яго позірк дзяжурны. У голасе была радасць: мабыць, ад таго, што можна выправіцца.

– Даўно?

– Ды – за поўнач. За поўнач добра.

– Адкуль?

– З Мозыра. З округа. Таварыш Галубовіч...

– Казаў што?

– Казаў. Запытаў, дзе вы. «Дзе таварыш Башлыкоў?» Я сказаў: на раёні. Калектывізацыю праводзіць...

– Не пытаў нічога?

– Пытаў: «Як справы?» Я сказаў: «Ідуць». Тады ён папрасіў прачытаць зводку. Я прачытаў. Міша мне пакінуў...

– Больш нічога не казаў?

– Сказаў: «Дзякую. Усяго добрага».

Башлыкоў адамкнуў дзверы ў кабінет. Упоцемку знайшоў у кутку вешалку, павесіў паліто. Падаўся да стала, дзе павінна была стаяць лямпа. Чыркнуў запалкаю, падняў пад зялёным абажурам шкло, запаліў падгарэлы беражок кнота. Зялёны абажур на лямпе адзначыўся раздражненнем: ч-чорт, не забраў гэтае мяшчанства! Раздражненне было на памочніка, які недзе выкапаў дурны гэты абажур і не выканаў загаду зняць.

Не хапала яшчэ, каб у кабінеце сакратара райкома разводзілася гэта мяшчанская ўтульнасць! «Для вачэй зручнасць, супакойвае зрок!» – згадаў ён з'едліва памочнікаў доказ. Самы клопат – супакойваць зрок, калі трэба толькі глядзець ды глядзець! Не першы раз затурбавала: дзе ён дастаў гэта, ці не ў нэпмана якога? Канечне ж, не ў бедняка. Падумаў строга: трэба прыглядзецца лепш, узяцца як належыць за памочніка. Часу ўсё не знойдзеш, круцішся, як чорт. Ды і хлопец спраўны ж, талковы...

Зняў абажур, сунуў у куток пад вешалку. Заўтра ж загадаць, каб і знаку нэпманскага гэтага блуду тут не было.

На стале на заўсёдным месцы бялеў лісток. Зводка за суткі. Башлыкоў, зайшоўшы за стол, звыкла працягнуў да яго руку і раптам важка спыніў. Зводка! Устарэла, паламалася зводка! Стрымліваючы непрыемнае пачуццё, што адразу ажыло, узяў два канверты, якія ляжалі побач зводкі. На першым ён адразу пазнаў почырк Нінкі – сястры. Ліст з дому. Почырк на другім быў таксама знаёмы, пісаў

гомельскі прыяцель Лёня Мандрыка. Аб гэтым сведчыў і подпіс унізе канверта: некалькі літар з адмысловымі кручкамі. Подпіс, годны, як смяяўся Лёня, таго, каб падпісваць грошы. Пісьмо было напісана пачціва, афіцыйна – «Сакратару Юравіцкага райкома таварышу...». Нават за подпісам гэтым бачыўся вясёлы таварышаў характар.

Башлыкоў адарваў край канверта: захацелася пачуць вясёлы голас. Ледзь разгарнуў сіні, шурпаты, з лінеечкамі лісток, у вочы кінулася: «Алёшка, чарцяка!» Ад гарэзнага, таварыскага ўсярэдзіне адразу пацяплела: быццам раптам аказаўся ў мілым Гомелі, сярод прыяцеляў ці дзе-небудзь у парку над Сожам. Ухапіўся позіркам у ліст: «Як ты там ваюеш? Як ты пераворваеш там старыя ўласніцкія межы? Крышы там кулацкую і ўсякую іншую нечысць! Штоб усе адчувалі тваю цвёрдую, рабоча-пралетарскую руку!.. Алёшка, я чытаю пра цябе ў газетах і – ганаруся! І проста не веру, што гэта з табой лазіў праз плот, у дзірку, на стадыён. Помніш, чарцяка?.. А цяпер я – ганаруся, ты – наша слава!..» За ўсім гэтым Башлыкоў чуў задзірысты, гарэзны голас Лёнькі, якога ён калісьці любіў, з якім так лёгка было глядзець на свет. Сёння голас гэты не толькі не весяліў, а абуджаў непрыемнае ў душы, тое, што не хацелася чапаць. «Ганарымся!.. Ты – наша слава!.. Чытаем!..» – словы гэтыя сёння быццам недалікатна дражнілі.

Ён ужо хацеў кінуць чытаць, калі позірк раптам выхапіў сярод радкоў – «Лена». Чуючы, як часта стала біцца сэрца, ён пайшоў па радках: «Зайздрошчу і ганаруся, між іншым, не толькі я. Я зараз табе напішу такое, што ты – заікам станеш! Падрыхтуйся, чарцяка, і трымайся! Не падай на падлогу! Бачыў я тут на днях, каго б ты думаеш? Век не адгадаеш! Лену!.. Іду па Савецкай і проста – твар у твар! Я аж вачам не паверыў!..» Як бы праз туман, праз гарачы звон, пранізвалася: Лена ў Гомелі. Прыехала ад мужа. Не вельмі шчаслівая – «мякка кажучы!». Хоць і выгляду не падае. Доўга, «аж сцінала ёй дыханне», распытвала пра яго. «Пра Алёшку». Сказала, што ён далёка пойдзе і што яна – «рада за яго»! А пра сябе расказваць не стала: «Нічога асаблівага. Жыву і – усё...» Кожнае слова адгукалася звонам, біла, а апошняе мацней за ўсё: «Праз дзень, сказала, паедзе назад! Нявесела сказала!.. Разумееш ты, чарцяка, што робіцца на свеце?!» – пытаўся недарэчы весела Лёня.

За гэтым Лёня пісаў пра гомельскія навіны, пра тое, якая гэта неспакойная і вясёлая служба – яго клуб. Відаць, здагадваючыся, што растрывожыў напамінкам пра Лену, зазначыў, што ў Гомелі многа паявілася дзяўчат харошых, і раіў: на свеце ёсць і іншыя важныя рэчы, акрамя спраў. Вырвіся на дзень-два, шкадаваць не будзеш!..

Башлыкову не спадабаліся пашлаватая гуллівасць апошніх радкоў пісьма і запрашэнне з намёкамі, асабліва непатрэбныя пасля ўсяго, што было пра Лену. Але гэта адзначылася мімаходзь у душы, ва ўсёй істоце было адно: Лена! Ці ад таго, што ён быў стомлены, ці ад таго, што такая навіна абрынулася так неспадзявана, Башлыкоў дзіўна не мог думаць, жыў толькі гарачым і важкім адчуваннем: Лена, была ў Гомелі, нешчаслівая, любіць. Любіць усё ж. Лена, Лена, Лена – звінела на розныя галасы...

Ён з намаганнем зварухнуўся, узяў пісьмо ад Ніны. Кожны раз, калі ён браў пісьмо з дому ці проста думаў пра дом, пра родных, яго нязменна апаноўваў складаны свет. Вярталася галоднае, у знясільнай працы маленства, цёмны, сыры барак у залінейным раёне. Уваходзіла ў пакой, станавілася побач, век у турбоце, у страху пра хлеб, пра дзяцей, маці. Пяшчотная і няшчасная на ўсё жыццё сястрычка Ніна, здаровы, пешчаны маткаю Барыс. Ажывала ў памяці даўняя крыўда, непрыхільнасць: мучыліся адны, пры жывым бацьку, які недзе, былі ўпэўнены, раскошастваваў з іншаю жанчынай. Стракатае, поўнае прагнай дзейнасці і шырокіх, на ўвесь сусвет, надзей камсамольскае юнацтва ледзь не ўвесь час хмарылі неадольныя супярэчнасці з тым, што было дома. Старыя бядоты не ўсе засталіся ў бараку, многія пераехалі ў светлы, каменны пакой каля парку, які далі Башлыкову. Пяшчота да маці, што гадавала траіх, мяшалася са шкадаваннем: не ўберагла, дала на памяць яму і Ніне сухоты. Ніну зрабіла калекай. Ніна, мілая, разумная Ніна, з вострымі плячыма, з няшчасцем-горбам...

У супярэчлівы свет памяці заўсёды ўнізвалася, турбавала адчуванне віны: памагае мала. Праўда, грошы пасылае, кожны месяц усё, што можа. Але хіба даволі грошай адных ім. Ніне, якую неяк трэба было б завезці да добрага спецыяліста, паспрабаваць выбавіць з бяды. Барысу, якога трэба было б накіроўваць цвёрдай рукой. Маці, якая адна разрываецца між абаіх...

Сёння з усім гэтым неспакоем мяшалася і свежая, неспадзяваная туга пра Лену. Лена, Лена...

Ніна пісьмо, як заўсёды, пачыналася пяшчотным: «Добры дзень, любы наш Алёшка!» Пытанні, як жыве, шкадаванне, што, мабыць, работы многа. Не глядзіць сябе, недасыпае і галадае. У дарозе ўсё, на холадзе. А яна – вучыцца, і вучыцца добра. На вельмі добра. І здаровая, і вясёлая. «Дзяўчаты і хлопцы ў нас – як адзін. Дружныя і дасціпныя. На пераменку да нас прыходзяць з другіх груп – каб парагатаць! Ведаюць: у нас сумаваць не ўмеюць!» Маці таксама здаровая. Толькі ўсё перажывае за яго, за Алёшу. І наказала нават,

каб напісала: няхай беражэ сябе! «Адным словам – усё ў нас паранейшаму», – супакойвала, цешыла Башлыкова сястра. Здаецца, сёння яна лішне ўжо старалася супакоіць яго, і ў Башлыкова ў стоме з'явілася прадчуванне, што ў іх там нешта здарылася. І праўда, за гэтым ішло асцярожнае: «Толькі з Барысам – важныя навіны. Барысік наш, здаецца, сур'ёзна сабраўся стаць дарослым! Прыбіцца, нарэшце, да берага і пачаць сталае жыццё!.. Пра тое, як гэта сур'ёзна, можна меркаваць ужо з таго, што ён цяпер усе дні ля адной прыстані... Прыстань гэта – Ліза Шэпель!.. Усе дні, усюды – разам! Проста – галубкі!.. Увесь вольны час – у яе пакоі... Мяркуючы па ўсім, у іх далёка зайшло. Ходзяць чуткі, што можа быць нейкі нашчадак... Так што ў нас, Алёшка, новы сваяк – таварыш Шэпель!..»

Як ні быў знябыты, перапоўнены ранейшымі падзеямі, Башлыкоў некалькі хвілін не знаходзіў месца ад хвалявання. Устаў, закурыў, зацягнуўся, аж зайшоўся кашлем. Нецярпліва, раззлавана хадзіў па пакоі. «Сваяк – таварыш Шэпель!» Таварыш Шэпель! Пан Шэпель! Гаспадар некалі багатай аптэкі! І моднага парфумнага магазіна! Нэпман, гандляр, вядомы ўсяму гораду!

Усяго, здаецца, можна было чакаць ад гэтага балбеса, ад Барыса. А такога не чакаў. Дадумацца не дадумаўся б! «Сваяк таварыша Шэпеля! Таварыша Шэпеля!» Сакратар райкома – сваяк Шэпеля, нэпмана, прайдзісвета!

З глузду ён з'ехаў, ці што, дурань гэты? Гэта ж дадумацца – з тысяч дзяўчат, харошых, рабочых дачок выбраць такую спадарожніцу! Нібы знарок! Ды і знарок, каб хацеў, дадумацца б трэба! Каб раней гады два-тры! Зразумець яшчэ неяк можна было б! А цяпер, цяпер!.. Зразумець можна было б, ён бачыў Лізу Шэпель, ведаў красуню. Але ён так абураны быў цяпер усім, што не разумеў, не хацеў разумець! Зрабіць такое глупства ў цяперашні час – калі ідзе такі наступ! Паставіць сябе і яго, брата, у такое становішча!

Ён падумаў, як адгукнуцца на ўсё гэта сябры там, у Гомелі. Загадзя ўявіў, што ледзь не кожны, не інакш, будзе вінаваціць яго, Башлыкова. Не выхаваў як належыць. Свайго меншага брата не здолеў выхаваць! Кіраўнік!.. Будуць вінаваціць – і будуць рабіць справядліва! Не выхаваў! Не змог!

Прыйшло ў галаву: цяпер, кожны раз, расказваючы пра сябе, ён павінен будзе паведамляць пра гэта. Тлумачыць у анкетах, у аўтабіяграфіях! Упісваць у сваё жыццё! Якое ён хацеў жыць чыстым! І быў чыстым дасюль!..

Усё так блыталася, што яго раптам узяў адчай. Чорт ведае што за ноч! Злыя твары на сходзе. Поўны правал у Глінішчах.

Непатрэбная, балючая вестка пра Лену. І напаследак – гэтае: сваяк пана Шэпеля! Усё разам, сышлося адусюль!

Не было ўжо сілы ні думаць, ні трываць гэта. Ён раптам перастаў мераць кабінет, кінуў недакурак. Прыдушыў аб прыбор. Рашуча абарваў думанне: хопіць на сёння!

Дастаў з шафы падшыўку газеты, згарнуў на канапе пад галаву. Узяў з вешалкі паліто, шапку, рушыў да стала. Крутнуў колца кнота, дзьмухнуў у лямпу. Падаўся да канапы.

ЧАСТКА ДРУГАЯ

Раздзел першы

1

Устаў рана. Цвёрдая сялянская канапа не давала залежвацца. Ды і пачуў, што мястэчка абудзілася, трэба было пачынаць дзень.

Ад таго, што спаў мала, у галаве нядобра звінела, ува ўсім целе была млявасць. Але ён намацаў шапку, што была за падушку, усцягнуў на сябе паліто. Хістаючыся, няцвёрдай хадою выйшаў на ганак.

Ранішні сіняваты прыцемак сустрэў добрым, вострым халадком. Важка рыпаючы ботамі па снезе, Башлыкоў выйшаў з двара, пакрочыў па вуліцы. Хаты ўжо часта жаўцелі вокнамі, у іх на дварах усюды віднеліся постаці; насустрач выткнуліся, праехалі сані з двума седакамі. Рух гэты, клопат навокал настройвалі і яго на дзейны лад. З турботнасцю жывой рэальнасці прыходзіла звыклае адчуванне нязменнага абавязку дзейнічаць. Цішэла санлівасць, дужэў.

Пачынаўся дзень. Важны, нялёгкі дзень.

Башлыкоў харчаваўся ў сталоўцы, якую называлі райвыканкомаўскай. Сталоўка гэтая служыла ўсім дзяржаўным работнікам раённага цэнтра, розным камандзіровачным, удзельнікам пленумаў і нарад. Непрыкметная з выгляду, стараватая драўляная хата гэта, комін якой дыміў з ранку да вечара, была паважнай, неабходнай установай, значэнне якой асабліва вырастала, калі ў цэнтры збіраліся дэлегаты ці ўдзельнікі.

Гаспадыня, дзе Башлыкоў кватараваў, бралася гатаваць яму дома, клапатліва ўгаворвала нават, што так, як яна, там не згатуюць, але ён ветліва, цвёрда адмовіўся. Акрамя таго, што ён у душы лічыў клопат пра тое, дзе паесці смачней, нечым не вартым дзелавога чалавека, ды яшчэ партыйца, кіраўніка, было тут і іншае меркаванне. Што там ні кажы, харчаванне ў гаспадыні ў нейкай ступені – мяшчанства, уступка старому быту. Сталоўка ж – гэта разам і асаблівая грамадская ўстанова, і новы быт, які трэба падтрымліваць і ўвагай да якога належыць паказваць прыклад іншым работнікам.

У сталоўцы снедала некалькі чалавек, сярод якіх Башлыкову кінуўся ў вочы Зубрыч, што ўжо разлічваўся з афіцыянткай, строгі, заклапочаны. Башлыкоў з тым уздымам, які звычайна ўзнікаў у ім на людзях, бадзёра паздароўкаўся, распрануўся каля вешалкі, па-дамашняму нахіліўся каля ўмывальніка. Вада была халодная, відаць,

нядаўна з двара, і ён з асалодай чуў яе сцюдзёную свежасць. Весела пакіраваў у сціплы куток, дзе меў звычай абедаць. Афіцыянтка – паўнацелая, крамяная полька Ліза, з местачковых – чакала ўжо, калі ён сядзе. Адразу падышла.

Ведала: сакратар райкома – чалавек вельмі заняты, сядзець попусту, чакаць яму няма калі.

– Перакусіць чаго-небудзь, Ліза. – У голасе яго былі разам і ветлівасць, і дзелавітая сабранасць.

– Сягоння – рагу і чай.

– Давай рагу і чай, – сказаў ён згаворліва.

Яна адразу павярнулася да кухні, кемлівая полька. Яму заўсёды прыемна было бачыць яе, але цяпер, зірнуўшы ўслед, ён раптам адчуў штосьці прыкрае. Не адразу зразумеў: прыкрасць была з імем яе – Ліза... У пісьме была таксама Ліза... Ён адагнаў успамін. Сапраўднае імя не Ліза, а Алаіза Янкоўская.

Алаіза Янкоўская не дала доўга чакаць. Быццам убачыла, што ён, звычайна спакойны да яды, сёння галодны. Галодны, як звер.

За тыя дзве-тры хвіліны, што яе не было, ён раптам адчуў, як страшэнна хоча есці. Нецярпліва чакаючы, ён згадаў, што не вячэраў учора. Выпадак не быў выключны, раней такое здаралася не раз, і ён гатоў быў папракнуць сябе за нецярплівасць, нявытрыманасць. Але голад не слухаўся.

Шчыруючы над рагу, ён успомніў, як яго запрашалі павячэраць учора. Ноччу. За гэтым, нібы праз туман, але з дзіўнай прывабнасцю згадаў абед у школе. Нібы нанава ўбачыў, як побач стаіць, лье з карца на яго рукі. Адчуў цвёрдую далонь, калі памагаў вылезці са склепа. І пачуў голас, што прасіў застацца, павячэраць... Дзіўны голас. І дзіўная рука. І ўся дзіўная. Хто яна?.. Але адразу ж з гэтым усярэдзіне ажыло глухое, нядобрае – сход, злыя позіркі і крык. І ганебнае адчуванне бездапаможнасці. Ён сціснуў зубы, стрымаў сябе.

Хутка даеў рагу, не чуючы смаку, выпіў шклянку фруктовага чаю. Забыўшы разлічыцца, рашуча апрануўся і выйшаў на двор.

Трэба было пераадзецца з дарогі. Ён не быў франтам, у адзенні імкнуўся да сціпласці, якую таксама лічыў абавязковай партыйнай, сакратарскай адзнакай. У яго было два не новыя, дзе-нідзе ўжо акуратна падлапленыя касцюмы, якія ён насіў з той беражлівасцю, што засталася ў спадчыну ад матчыных павучэнняў і беднасці, зазнанай у залінейным бараку. З той жа прычыны, а можа, ад звычкі, якая прыжылася потым, у Башлыкова было разам проста хваравітае правіла: адзявацца заўсёды ў чыстае. Ён зусім не выносіў бруднасці. Чыстымі павінны былі быць не толькі бялізна, але і гімнасцёрка, і

штаны, якія ён нярэдка, пад аханне і дакоры гаспадыні, мыў і прасаваў сам...

Гаспадыня – Цыля Савулаўна, або, як яе найбольш звалі, Савельеўна, – убачыла яго праз шыбу, яшчэ калі ён узыходзіў на ганак. Але, калі ён паявіўся ў пакоі, не прызналася: нібы непрыстойна было паказаць, што бачыла раней, – уразілася так, быццам заявіўся сын з Ленінграда, матчыны скруха і гонар.

– Ох, хто прыйшоў!.. Тато, Лёва! – пазвала гаспадыня парадавацца.

Сын – Лёва, што тут жа за сталом снедаў, мабыць, збіраючыся ў школу, хутчэй дажаваў нешта, праглынуў, устаў і, пачырванелы, задаволены, прывітаўся. Тады ж з прыадчыненых дзвярэй, прыгорблены, у нязменнай чорнай камізэльцы, выпацканай крэйдай, высунуўся стары Савул. Уткнуўшы вострую бародку ў грудзі, паглядзеў на Башлыкова з-пад акуляраў, моўчкі кіўнуў. Быццам падумаў нешта, але не сказаў – моўчкі павярнуўся назад. Спакоем сваім паказаў гэтай мітуслівай, ненармальнай жанчыне, што неабавязкова падымаць крык на ўсё мястэчка ад таго, што вярнуўся чалавек.

Радасць жанчыны, як заўсёды, адразу змянілася цвярозай дапытлівасцю:

– Зноў на сходзе начавалі? – У тоне, як звычайна, чуліся разам дакор і насмешачка старэйшай. І дабрадушная нецырымоннасць.

– На сходзе, – усмешліва пацвердзіў Башлыкоў.

– І вячэралі – на сходзе?

– Пасля.

– А можа, і не вячэралі?

– Вячэраў. Нават паснедаў ужо...

Башлыкоў заўважыў, як чырванеў за матчыну недалікатнасць, але стрымліваўся Лёва, што звешваў галаву над талеркай. Цыля ж не зважала на яго, прыгледзелася – зусім як стары Савул, трохі скасабочыўшы галаву, – і раптам заявіла:

– У вас нешта здарылася непрыемнае!

Як ні ведаў яе, Башлыкоў крыху збянтэжыўся. От жа зіркастая.

– Не... Нічога асаблівага...

Падаўся нарэшце ў свой пакой.

Пакой быў невялічкі, вузкі, але Башлыкоў быў давольны ім. Нашто яму, адзінокаму, партыйцу, да таго ж вельмі занятаму, харомы. Ды і які ён прыклад паказаў бы ўсім, сакратар райкома партыі, калі б паддаўся харомным прынадам, мяшчанскай раскошы. Якія толькі адрывалі б ад справы, зацягвалі ў балота. Усё тут, у пакоі,

ёсць, і больш не трэба. Акенца на вуліцу, з форткай для чыстага паветра. Жалезны ложак, стол пры сцяне з кніжкамі, з двума гнутымі крэсламі. Чысты, адпрасаваны касцюм на плечыках на сцяне, прыкрыты прасцінаю. Пад ложкам – плеценая карзіна з бялізнаю, з рознымі патрэбнымі дробязямі. Падлога памытая, чысціня ўсюды. Што яшчэ трэба дзелавому чалавеку?

Пераадзяваючыся, Башлыкоў чуў праз дзверы, як Цыля разважала:

– Непрыемнасць зноў!.. Адны непрыемнасці!.. Якая радасць так жыць!.. Днём – сход, вечарам – сход! Паесці няма калі!..

– Мама, ты нічога не разумееш, – перабіў яе Лёва. Ён так гаварыў, што адчувалася – яму вельмі няёмка за яе перад сакратаром райкома партыі, які ўсё чуе. Лёва – камсамолец, член бюро камсамольскай ячэйкі школы.

– Ты – разумееш! Ты рана стаў разумны, Лёва! Такі разумны, што ўжэ матку вучыш! – Цыля не так абураецца, як высмейвае сына. Развакліва наступае: – Чалавек павінен спаць? Павінен есці? Няхай ён і бальшавік... Бальшавікі павінны есці ці не?

– Мама!..

– Што – мама! Я ўжэ скора семнаццаць гадоў табе мама!.. Я – не разумею! Вы чулі, тато, я ўжэ не разумею нічога?!. – Яна, вядома, не чакае адказу, ведае, што стары Савул прамаўчыць. Пытанне – проста так, як звычка. Яна зноў надае гаворцы практычны кірунак: – Ты таксама, калі матка не напомніць, дак не паясі. І спаць не ляжаш у час! Да раніцы будзеш сохнуць над кнігай! Я ўжэ не кажу пра твае бясконцыя сходы!..

– Мама! – Голас у Лёвы ўжо рашучы, пагрозны.

– Ну добра, не буду чапаць сходы! Вы жыць без іх не можаце! Як без хлеба! Ну добра, добра! Не буду! Хадзі на сходы, калі ўжэ так трэба! Будзь актывістам!.. – Яна змоўкла, але толькі на момант. Потым зноў павяла – для Лёвы і Башлыкова: – Калі вы не будзеце спаць і есці, вас хопіць ненадоўга... У чалавека галоўнае што? Здароўе! Што навука і пасада добрая, калі няма здароўя? Ноль...

Тут Башлыкоў, ужо адзеты, зашпілены, выйшаў з баковачкі, і яна павярнулася да яго:

– Можа б, чаю выпілі?

Башлыкоў не прыпыніў хады.

– Няма калі.

2

Праз некалькі хвілін ён быў каля райкома. Дзелавітым, цвёрдым крокам прайшоў па калідоры, адзначыў: у пакоях яшчэ амаль ціха. Ранішняя млявасць. Быццам знарок, пярэчачы яму, застукала пішучая машынка. Бася пачала працу.

Сакратарка была на месцы, штосьці хапатліва хавала ў стале. Люстэрка, не інакш. Ён прывітаўся, загадаў паклікаць памочніка. Але клікаць не прыйшлося – не быў бы то Міша. Гатовы, ужо стаяў побач, з заўсёднай папкай у руцэ. Следам за Башлыковым увайшоў у кабінет.

Кашчавы, у франтаватым фрэнчы і галіфэ з крагамі, па-вайсковаму выцягнуўся, уручыў папку. Пісьмо, тэлефанаграму. Паведаміў, што павінны званіць з акружкома, таварыш Галубовіч. Башлыкоў прачытаў пісьмо, тэлефанаграму – нічога асаблівага. Узняў галаву:

– Больш – нічога новага?

У хітрых, зладзейкаватых Мішавых вачах успыхнулі гарэзныя агеньчыкі:

– Яшчэ – Абрам з Хаімам пабіліся. Хаім сказаў, што Абрам – нэпман, спекулянт...

Ён адразу ж асекся: па адным мімавольным руху броў Башлыкова перахапіў – сакратару райкома сёння не да жартаў. Адразу нагнаў сур'ёзнасць і паважнасць на твар, ціха і з годнасцю пакіраваў да дзвярэй.

Башлыкоў пасядзеў хвіліну нерухома. Прыгорблены, стомлены, заклапочаны з выгляду і – бяздумны. Быццам адпачываў, набіраўся сілы перад дарогай, што павінна была пачацца.

Пачуў зноў звон у вушах, трываў цягучую знямогу ў спіне, у плячах. Не выспаўся. Стаміўся. Трэба было б прылегчы на які дзесятак хвілін. На дзесятак хвілін, і ўсё пройдзе. Але ён з намаганнем адужаў сябе: няма чаго кволіцца, песціць сябе. Рашуча зварухнуўся, працягнуў руку да газет, пакладзеных на стол.

Выбраў «Правду» і менскі «Рабочий»: даведацца пра агульныя і рэспубліканскія навіны. Газеты былі ўжо нязменнай неабходнасцю: чытаць іх было таксама неабходна, як глядзець – каб бачыць.

Радкі за радкамі ўцягвалі яго ў неспакойны і неабсяжны свет, адгукаліся рознымі пачуццямі – радасцю, гневам, нецярплівасцю. Ён уважліва ўчытваўся ў тое, чым жыве свет, лавіў зацікаўлена навіны з Гомеля, весткі пра акругу. З хваляваннем сцярог, ці няма чаго пра раён, мімаволі, нядобра чакаў – можа быць крытыка. Ні хвалы, ні

крытыкі не было. Раён не згадвалі. Але гэта не супакоіла. За ўсім, што ён чытаў пра другія раёны, ён чуў свой раён. Усё, што там, блізка і далёка, адбывалася, адгукалася ў ім так, быццам датычыла яго асабіста.

Кожны раз, калі чытаў газеты, Башлыкоў асабліва моцна адчуваў еднасць усяго, што робіцца ў вёсках і раёнах краіны. Уся краіна бачылася ім як адно неабсяжнае вялікае поле, дзе ідзе цяжкае калектыўнае наступленне. Дзе па ўсім полі – кулацкія звярыныя стрэлы, падпалы, смерць актывістаў і пажары. Дзе ідзе лютая, крывавая класавая барацьба. Ён адчуваў, што наступленне цяпер, можа быць, у самым вялікім напружанні, што іменна цяпер трэба напяць усе сілы, каб зламаць праціўніка, рушыць далей. Кожны крок цяпер бярэцца боем, але яго трэба браць. Кожны раён бярэ, і ён павінен узяць.

Сярод усіх гэтых думак адна мела для Башлыкова асаблівую важнасць. Ён заўсёды помніў, што наступленне гэтае, якое яно ні цяжкае, павінна ісці самымі вялікімі тэмпамі. Тэмпы – гэта мэта, да якой трэба імкнуцца ўсімі сіламі, якой неабходна аддаць усё. Тэмпы – гэта не проста поспех, гэта – жыццё. Ён бачыў, што поле наступлення ўсё ў няроўным руху: адны вырываюцца ўперад, другія адстаюць. Тым, хто ўперадзе, – гонар і слава, тых, хто ззаду, – б'юць. І справядліва.

Сёння ў адстаючых будзе плесціся ён. Яго раён...

Башлыкоў неспакойна згарнуў газету, адлажыў. Сціснуў ручку тэлефона, загадаў звязаць з Апейкам.

– Пагаварыць трэба. Зайдзі.

Пачаў мераць неспакойнымі крокамі кабінет – з кутка ў куток.

У новым яшчэ будынку старога мястэчка, што выцягнулася ўсцяж нізіны паўз Прыпяць, мераў і мераў пакой чарнявы чалавек у сіняй гімнасцёрцы. Адметны як асоба, ён разам з тым клопатам, настроем быў падобны на многіх іншых, што ў мястэчках, гарадах, у палях хадзілі, вялі нарады, спяшаліся цераз заснежаныя прасторы. Тысячы людзей, большасць якіх асабіста не ведалі адзін аднаго, не думаючы адзін аб адным, былі аб'яднаны аднолькавымі турботамі і імкненнямі.

Пры ўсім тым гэта былі вельмі розныя людзі, і розныя акалічнасці былі, у якіх пачыналі яны гэты дзень. Башлыкоў пачынаў яго ў звыклай абстаноўцы. Вакол яго былі няхітрыя, арцельнай, юравіцкай красы стол, канапа, шафа. Звыклыя сцены, бляклыя, з цьмяным «срэбрам» шпалеры, што спадалі з-пад столі няроўнымі хвалямі: шпалеры былі наклееныя проста на бярвенне. Будынак не

тынкавалі. Ад таго, што тынку не было, унізе там-сям пацёртыя спінамі шпалеры былі прарваны. На сценах ярчэлі ўвесь у чырвані, у магутных літарах і заводскіх трубах плакат «Пяцігодку – у чатыры гады!» і дзве карты – Савецкага Саюза і паўшар'яў. На самым пачэсным месцы, над сталом, узвышаліся два партрэты: чорна-белы – Леніна і каляровы – Сталіна. Ленін стаяў у рост, рука ў кішэні, глядзеў кудысьці лагодным, засяроджаным позіркам. Сталін стаяў за сталом, у жаўтаватым, вайсковага крою фрэнчы, костачкамі сагнутых пальцаў лёгка дакрануўся да стала. Башлыкова хвалявала нязменнаю пашанаю тая сціпласць, якая адчувалася і ў простым фрэнчы, і ў самой паставе, і ў кладцы рота пад коратка падстрыжанымі вусамі. Пашана гэта была асабліва трывалаю, бо за сціпласцю Сталіна помнілася такое незвычайнае, вялікае жыццё: ссылкі, уцёкі, рэвалюцыя, Грамадзянская вайна.

Больш за ўсё хваляваў Башлыкова позірк арэхавага колеру вачэй з-пад смаляной, без адзінай сівінкі, шорсткай чупрыны. Уважлівы позірк гэты, здавалася Башлыкову, заўсёды глядзеў проста ў яго. Здавалася, пытаўся: як ты тут? Калі справы ладзіліся і быў добры настрой, позірк гэты не толькі не турбаваў, а радаваў. Быццам было каму паказаць сваю працу. Далажыць, што не падвёў. Сёння Башлыкоў, не заўважаючы таго, мімаволі не ўздымаў вачэй. Трывожыўся сустрэцца позіркам...

Як толькі ўвайшоў Апейка, Башлыкоў спыніў мераннне. Пацiснуў руку і адразу з заклапочаным выглядам пакіраваў за стол. Не трэба марнаваць часу. Ён сеў і толькі намерыўся пачаць гаворку, калі рэзка, патрабавальна зазвінеў тэлефон.

Башлыкоў мімаволі павярнуўся, але не ўзяў трубкі. Момант марудзіў, насцярожаны, нацяты. Не таіў трывогі. Потым адолеў сябе.

– Башлыкоў слухае, – сказаў раптам упэўнена, з годнасцю. З імя, якое ён назваў, адказваючы на прывітанне, Апейка даведаўся: на другім канцы трубку трымае сакратар акружкома Галубовіч. Апейка стаў зацікаўлена ўслухоўвацца.

Башлыкоў гаварыў:

– Быў у ад'ездзе. Сход праводзіў... Не магу пахваліцца, – прамовіў Башлыкоў, як бы вымушаны прызнавацца ў нядобрым. – Няма чым хваліцца... Трыццаць сем гаспадарак... Так, за тыдзень... Так, менш за працэнт... Так, топчамся... – Башлыкоў не пярэчыў, самакрытычна судзіў сябе. Ён згаджаўся, трываў тыя жорсткія словы, якія чуў, заўважыў Апейка, з нязвычнай вытрымкай, нават спакоем. Відаць, ад таго, што Апейка добра ведаў: тое, што пакуль паведаміў

Башлыкоў, не самае горшае, ён зразумеў прычыну стрыманасці, якую выказваў сакратар райкома. Чаго тут бедаваць, калі ёсць горшае.

Ад таго, што гэтае горшае яшчэ было наперадзе, Апейка чакаў далейшае неспакойна. Скажа ці не скажа, цяпер ці на іншы раз адкладзе?

Башлыкоў, відаць, вагаўся. Апейка зразумеў гэта па тым неспакоі, нават адчаі, што з'явіўся ў вачах Башлыкова. Позірк Башлыкова прабег па пакоі, спыніўся на момант на Апейку, але не ўбачыў яго. Быў невідушчы, сабраны ў сабе.

Раптам у твары Башлыкова з'явілася рашучасць. А, што будзе, тое будзе!

– Дзмітрый Андрэевіч! – загаварыў ён цвёрда. – Я павінен далажыць вам: у нас – прарыў! Распаўся калгас – «Рассвет»! Я якраз там і быў! Разабраўся ў прычынах, правёў сход! Спадзяваўся выправіць становішча, але не змог!.. – Нейкі час Башлыкоў маўчаў, чакаў, што там скажуць. Але там таксама маўчалі. Потым запыталіся, ён адказаў: – Дваццаць дзевяць гаспадарак.

З гэтай хвіліны Башлыкоў панура, цярпліва слухаў, што казаў Галубовіч. Сказаўшы самае цяжкае, ён спачатку прымаў тое, што чуў, з нязвычным спакоем. Адчуваў, было відаць, нават быццам палёгку: зрабіў сваё. Амаль абыякава, як асуджаны, гатовы да ўсяго, адказаў:

– Сячыце.

Згадзіўшыся яшчэ раней з тым, што – вінаваты, нават не паспрабаваў апраўдвацца. Як бы ажыў, загарэўся толькі тады, калі абяцаў:

– Зробім сёння ж, Дзмітрый Андрэевіч!

3

Паклаўшы трубку, пакруціў галавою, шумліва выдыхнуў: «Уф!» Хвіліну сядзеў моўчкі, быццам не мог апамятацца. Потым глянуў на Апейку, паведаміў аптымістычна:

– Сказаў: голавы здымуць!

Апейка згадзіўся:

– Так, прыйдзецца пакласці іх...

– Пакласці не страшна, – прамовіў нелагодна Башлыкоў. – Калі б было за што...

Апейка сказаў раздумліва:

– Баюся: трэба чакаць горшага.

Башлыкоў кінуў на яго хуткі, неспакойны позірк.

– Дачакаемся! Калі будзем сядзець, як бажкі! Склаўшы рукі...

Ён не вытрымаў, рэзка ўзняўся, нервова захадзіў. Штосьці таіў у сабе непрыемнае. Потым падышоў да Апейкі, стаў насупраць. Упяў вузкія, вострыя зрэнкі.

– Мне не спадабаліся твае паводзіны на сходзе. – Ён гаварыў горача, выразна – слова за словам. Удакладніў: – Тваё выступленне. Тваё і Гайліса.

– Чаму?

– Чаму? – Башлыкоў прамовіў так, быццам не верыў, што гэта незразумела. – Таму, што так не робяць! У такі момант!

Апейка няцямна павёў вачыма.

– Ясней кажы.

– Ясней? – Апейкаў спакой раззлаваў Башлыкова. Цвёрда, тонам абвінаваўцы стаў рэзаць, пункт за пунктам. – Спасавалі ў рашучы момант! Замест таго каб – наперад, туліцца да зямлі сталі! Лавіраваць! Падладжвацца.

Апейка абурыўся:

– Хто – падладжваўся? Хто лавіраваў? Ты ведаеш, што гаворыш?

Шчокі Башлыкова пакрывіла на міг ухмылка.

– Байку развёў!..

– Байка – прыказка! Намёк!.. – Апейка стрымаўся. Схаваў хваляванне за насмешкай: – Ты мяне ставіш у цяжкае становішча. Каб апраўдвацца перад табой, я павінен хваліць сябе. А я не люблю гэтага...

– Апраўдвацца няма чаго. Улічыць трэба. – Башлыкоў прапусціў міма ўвагі нязгоду, нават іронію, якія былі на Апейкавым твары, сказаў цвёрда, але спакайней: – Павінен наогул, як таварыш, зазначыць табе, каб ты сур'ёзна ўлічыў: ты не першы раз абыходзіш даваць палітычныя ацэнкі. Быццам пазбягаеш іх.

– Гэта – няпраўда.

– Ты ўлічы гэта, – настойліва параіў Башлыкоў. – Ты – не адзін раз ужо – замест чоткай палітычнай ацэнкі даеш перавагу старасвецкім мудрасцям. Сялянскай «філасофіі». Я разумею, кожнаму хочацца падабацца. Але гэта, глядзі, можа далёка завесці.

Апейка стрымаў сябе.

– Дзякую за папярэджанне. Толькі, думаю, яно мне не спатрэбіцца.

– Глядзі. Усякае забыццё палітыкі – небяспечная штука. І не заўважыш...

– Заўважу! – перабіў яго Апейка. Не мог ужо слухаць больш гэтых парад. – Тым больш што ніякага «забыцця палітыкі» ніколі ў мяне не было. Проста палітыка такая штука, што трэба яшчэ варыць і сваёй

галавой. А мы варым – кожны па-свойму. – Але яму не хацелася ў гэты момант весці агульную, наўрад ці карысную спрэчку. Карцела іншае, жывое. – А ты ведаеш, – сказаў ён, ваяўніча падаючыся тварам да Башлыкова, – я таксама не ў захапленні ад тваёй прамовы!

Башлыкоў зірнуў недаверліва.

– Чым жа яна была дрэнная?

– Яна была проста выдатная. Але ў яе быў адзін недахоп. Гэта быў – пусты стрэл. Стрэл – у неба. Абы-куды.

Башлыкоў не разумеў.

– Па-мойму, калі я што-небудзь кемлю, кожнае слова мае значэнне толькі тады, калі яно... як бы сказаць – адказвае людзям... памагае ім разабрацца ў тым, што іх непакоіць... І даходзіць да іх. Да іх душы... Тваё – не адказала ім і не дайшло.

Башлыкоў момант думаў. Хацеў, было падобна, спрачацца спачатку, але стрымаў сябе.

– Трэба людзей падымаць, – прамовіў як канчатковае. – А не плесціся ў хвасце.

Ён пайшоў за стол і, заклапочана-засяроджаны, паказваючы, што дыскусію кончыў, загаварыў пра тое, для чаго запрасіў:

– Абмеркаваць трэба, што рабіць. Давай падумаем.

Апейка моўчкі кіўнуў. Трэба абмеркаваць. Ён гатовы.

– Мы ў прарыве. Трэба зараз жа зрабіць сур'ёзныя вывады. І прыняць неадкладныя захады. Перш за ўсё – вывады пра сябе, пра нашу дзейнасць. Трэба адкрыта паглядзець, назваць рэчы сваімі імёнамі. Мы гулялі ў лібералізм, міндальнічалі. У абстаноўцы, дзе трэба было дзейнічаць рашуча. Праявілі недаравальнае галавацяпства. – Бышлыкоў, відаць, адчуў, што Апейка гэта можа зразумець, як папрок яму, дадаў строга: – У гэтым у першую чаргу вінаваты я, як сакратар райкома. – Ён сказаў, бачыў Апейка, не для прылiку. Ды Апейку гэта і не здзівіла: Башлыкоў заўсёды быў строгі да сябе. Але Башлыкоў не быў настроены доўга крытыкавацца. Трэба было дзейнічаць. Рэзка, рашуча стаў весці далей: – Вынікі нашага галавацяпства – на кожным кроку. Самы галоўны – актывізацыя кулацкіх элементаў. Карыстаючыся нашай паблажлівасцю, кулаччо ўзняло галаву! Ідзе адкрыта вайною! Сход учарашні – паказаў гэта вачавідкі!.. – Ён стрымаў прыкрасць ад успаміну. Стройны ў абцягненай пад поясам гімнасцёрцы, важка апусціў руку на стол. – Першая задача – ударыць па кулаччу!

Апейка кіўнуў галавою. Згодны.

– Я думаю зараз жа выклікаць Харчава і даць указанне. Выехаць у «Рассвет», расследаваць прычыны. Прыняць неадкладна строгія

захады. Найбольш злосных прыцягнуць да судовай адказнасці. Я лічу, што, акрамя кулачча, трэба ўдарыць і па іх саюзніках усіх масцей. Па ўсіх, хто самкнуўся з імі, дзейнічае як іх пасобнік. Па ўсіх падгалосках. Незалежна ад сацкатэгорыі.

– Харчаў – чалавек гарачы, – дзелавіта перапыніў яго Апейка. Разважліва памеркаваў уголас: – Трэба – каб разабраўся цвяроза. Каб пад гарачую руку не перахапіў. Спіскі, меры трэба перагледзець разам. Абавязкова.

Башлыкову не спадабалася ні тое, што Апейка перабіў яго, ні тое, што ён казаў. Неахвотна згадзіўся:

– Прагледзім... Сур'ёзныя партыйныя вывады, – загаварыў ён ранейшым, рашучым тонам, – трэба зрабіць адносна дзейнасці Алешніцкай ячэйкі. Я лічу, што дзейнасць Гайліса, Чарнаштана трэба абмеркаваць на бюро і даць ім належную ацэнку. І даць па заслугах. Рашэнне бюро шырока абмеркаваць у іншых ячэйках раёна.

Яму надакучыла стаяць. Ён неспакойна варухнуўся, ступіў за сталом крок, другі – туды, назад. Па тым, якія напружанасць, імкненне адчуваліся ў прамой, зграбнай постаці, было відаць, што будзе яшчэ гаварыць. І вельмі важнае.

– Я наогул лічу: тое, што адкрылася ў Глінішчах, служыць нам сігналам, што трэба зрабіць сур'ёзныя вывады ў цэлым па раёну. Мы павінны прыняць неадкладныя меры ў адносінах да кулачча па ўсяму раёну. Усе найбольш злосныя элементы трэба ізаліраваць. Прыняць меры ў адносінах розных іх пасобнікаў, падбухторшчыкаў. Яўных і тайных кулацкіх агітатараў. Адным словам, прыняць рашучыя меры па ўсяму раёну.

Раздзел другі

1

Скончыўшы, Башлыкоў адчуваў сябе ўзрушана і дужа. Рашучасць, з якой гаварыў, нібы падняла самога, надала сілы. Ён гатоў быў дзейнічаць.

Башлыкоў помніў, што яны з Апейкам на многае глядзяць пароознаму і што Апейка чалавек упарты, але цяпер тое, што выказаў, Башлыкоў лічыў настолькі правільным, неабходным, што ўсё ж чакаў – павінен згадзіцца. Калі ж Апейка пачне зноў гнуць сваё, Башлыкоў гатоў быў і да гэтага: гатоў быў даць бой, сур'ёзны і прынцыповы. Папярэдзіць як належыць.

Ён хацеў толькі аднаго, каб спрэчка не была доўгай: нельга было траціць час попусту. Засунуўшы рукі ў кішэні штаноў, ён пранікліва глядзеў на Апейку.

– Я згодны, – сказаў Апейка, – трэба дзейнічаць. І дзейнічаць зараз жа... І згодны, што трэба вывады па ўсяму раёну... Ты праўду кажаш: тое, што здарылася ў «Рассвеце», – сігнал. Сігнал – небяспечны... А от вывады, якія ты зрабіў, – у Апейкавым голасе пачулася цвёрдасць, – я лічу аднабаковымі.

– Якія ж твае вывады? – Башлыкоў прамовіў так, быццам паказваў, што ні трохі не здзіўлены. У Апейкі заўсёды свае вывады.

– Вывады маю такія, – павысіў голас Апейка, – што ва ўсім вінаваты перш за ўсё мы самі. Давай глядзець праўдзе ў вочы! І не ківаць на кагосьці! Калі ўжо сказаў, што вінаваты...

Папрок Апейкі, нібы ён, Башлыкоў, не глядзіць праўдзе ў вочы і ўзяў віну на сябе толькі для прыліку, Башлыкову не спадабаўся. Адчуваючы сябе несправядліва пакрыўджаным, ён усё ж больш заўважыў дзіўнае: «не ківаць на кагосьці!».

– Як гэта разумець: «не ківаць на кагосьці»?

– Так і разумець. – Апейка глянуў прама, рашуча. – Узяць віну найперш на сябе. Не шукаць чарцей там, дзе іх няма. А сур'ёзна разабрацца ў сапраўдных прычынах.

– Ты разумееш, што твой намёк – дрэнна пахне?

У тоне Башлыкова добра адчувалася, што ён папярэджвае – пах гэты вельмі небяспечны.

– Я разумею, – сказаў Апейка ўпарта, – што ніякага міндальнічання ў нас не было. Наогул! Тым больш да кулацкіх элементаў! А от ты разумець не хочаш, што сілаю не ўсяго можна дабіцца!

– Лібэральнічанне – у такі момант, як цяпер, – наогул...

– Лібэральнічанне! – непахісна перабіў яго Апейка. – Якое лібэральнічанне?.. Тыя людзі, якіх мы ўчора ўгаворвалі, прыйшлі самі ў калгас. Сярод першых... Значыць, яны не горшыя. Не праціўнікі нашы ва ўсякім разе. Не праціўнікі. – Апейка ўзняў вочы на Башлыкова, позіркі іх сустрэліся. Башлыкоў заўважыў: позірк Апейкі быў настойлівы, патрабавальны. – А от пабылі, паспрабавалі абяцанага і ледзь не ў адзін голас: «Не хочам!» І ўгавораў новых не паслухаліся. І ўгавораў, і пагроз!.. От што зрабілася! От што павінна трывожыць!.. Людзі паверылі нам, пайшлі, куды мы звалі. Пабылі і – расчараваліся і ў арцелі, і разам – у нас... А цяпер мы рашылі, – у Апейкавым голасе пачулася насмешлівасць, – «правільны вывад»:

«прынящь меры!». Папомсціць ім! За што? За тое, што яны паверылі нам? За тое, у чым мы самі вінаваты?

Башлыкоў, чым далей, тым больш, слухаў яго нецярпліва. Не толькі таму, што гаворка была не ў час і блытала думкі, а і таму, што чуў у Апейкавых словах непатрэбную, проста шкодную цяпер жаласлівасць. Жаласць, да ўсяго і фальшывую: тое, што Апейка так чулліва маляваў, – ён, Башлыкоў, сам бачыў – выглядала крыху інакш. Ён хацеў спыніць Апейку, але той сухім голасам апярэдзіў:

– Пачакай! Каб было ўсё ясна, слухай, яшчэ раз скажу: кулацкія элементы, розных крыкуноў і злосных трэба прыціснуць!.. Але ж, зразумей, – голас яго пацішэў, – там былі не адны кулацкія элементы...

– Што там былі не адны кулацкія элементы, я сам добра ведаю, – загаварыў Башлыкоў з раздражненнем. – А вось ты гаворыш так, быццам іх не было. Быццам мы выдумалі «чарцей», як ты выказаўся. Ты фактычна змазваеш, што ідзе жорсткая класавая барацьба...

– Нічога я не змазваю! Я толькі лічу, што даволі нам ківаць на гэтую барацьбу адну. Што трэба пачаць нарэшце сур'ёзна працаваць з людзьмі. Прыслухоўвацца да іх, старацца зразумець. І памагаць ім. Што пара нарэшце нам узяцца за калгасы, як гаспадары. Добрыя гаспадары. Разабрацца ва ўсім. Навесці парадак.

– Я гэта ўжо чуў учора.

– Я скажу гэта і сёння. І дадаць магу. От мы заварушыліся – бяда ў «Рассвеце». А пра бяду гэту папярэджваў Чарнаштан два ці яшчэ тры месяцы. У гэтым самым кабінеце. Цябе самога. І мяне – таму, што я быў таксама тут. Казаў: «Недаволыны людзі. Хто работае, хто не работае – кожнаму палачка!» За тое, што адбыў дзень. Што ты, што я зрабілі на гэта?.. А такія гаворкі, настроі такія не толькі ў «Рассвеце»!..

– Ты зноў пра гэта! – Башлыкоў нецярпліва захадзіў за сталом. – Няўжо не ясна, што не ўсякім настроям мы павінны патакаць! Што патаканне такое – чысцейшы апартунізм! Прывычкі старога – гэта пустазелле, якое моцна трымаецца. І мы яму не кланяцца павінны, а рваць яго. Змагацца з ім.

– Я не думаю, што гэта «пустазелле старога». І не бачу нічога ў тым, што людзі хочуць, каб той, хто больш зрабіў, больш атрымаў.

– Ты многага не бачыш! – Башлыкоў не таіў, што адчувае перавагу перад гэтым блытанікам, якому ўсё не ясна. – Бярэшся толькі меркаваць аб усім. Дай табе волю: зноў кулакоў новых развядзеш! На калгаснай аснове!

Апейка, запалены сваімі думкамі, не мог спыніцца:

– Мы разгарнулі гаспадарку, а нярэдка сунемся, як сляпыя. Мацаем дарогу кіёчкам. Туды ступім, памацаем, у другі бок ступім.

Разгарнулі, а яшчэ спрачаемся, як плаціць. Па едаках, па паі... Не ведаем толкам – што абагульняць?! Адны – толькі коней, кароў, другія – падчыстую...

– Ты, канечне, напалавінку рабіў бы. Каб адной нагой – у калгасе, другой – на сваёй палосцы. Каб у калгасе так, напалавінку. Для выгляду.

– Пры чым тут – для выгляду! Што з тых курачак ды свінак, – зазлаваў Апейка. – Што, калгас на курачках паедзе? А з-за іх столькі галасу ў жанок! Як бы весялей пайшло б усё, каб не гэтыя курачкі!

– Рэвалюцыю трэба рабіць або да канца, або – зусім не брацца! Рэвалюцыю нельга рабіць напалавіну! І жаласць у ёй – штука небяспечная. Асабліва тут, у сяле. Дзе ў кожным жыве ўласнік!.. Дзе гэты самы мужычок і ў табе ўвесь час гаворыць!..

Башлыкоў і выглядам, і тонам гаворкі паказваў: пара канчаць гаварыльню. Ён кінуў нецярплівы позірк на тэлефон: трэба зараз жа выклікаць Харчава, даць указанні.

Але Апейка не хацеў канчаць.

– Я не прарок, Аляксей. Але я прадчуваю: можа быць горш. Калі мы сур'ёзна не перагледзім усё. Калі мы не перастанем лічыць толькі працэнты. Як кура кураняты! Ашукваць сябе і іншых! – Башлыкоў пачуў: Апейкаў голас судзіў. – Ты ўпэўнен, што сярод тых працэнтаў няма такіх, якія мы мелі ў «Рассвеце»? Ты ўпэўнен, што няма яшчэ арцеляў, якія ледзь ліпяць? Няма калгаснікаў, якія глядзяць убок?

– Для чаго ты ўсё гэта разводзіш?

Башлыкоў, засунуўшы рукі ў кішэні, глядзеў на Апейку строга і востра. І ў позірку, і ў тоне адчувалася, што разважанні Апейкі для яго не проста развагі. Што ва ўсім гэтым ёсць, ён разумее, і іншы сэнс.

– А для таго «разводжу», – павысіў голас і Апейка, – што трэба нам з табою – зразумей ты – сур'ёзна агледзецца, разабрацца. Адзначыць, дзе ёсць слабіны. І «прыняць меры». Своечасова. І яшчэ для таго, што мы з табой павінны стаць гаспадарамі. Займацца калгасамі, як добрыя гаспадары...

– Я за ўсёй гэтай тваёй філасофіяй, – цвёрда, упэўнена загаварыў Башлыкоў, – бачу адно жаданне: каб мы затрымаліся. Сталі, агляддаліся. Корпаліся. Даўняе тваё жаданне, якое ты ніяк не хочаш кінуць. І якое ты ўжо каторы раз адстойваеш. Раздуваючы нашы цяжкасці і некаторыя памылкі... Я цябе, Іван Анісімавіч, яшчэ раз папярэджваю: ты становішся на хісткую глебу. Твае гэтыя развагі – гэта хістанні, якія маюць небяспечны палітычны характар.

– Давай не будзем падводзіць вялікую палітыку сюды. – Апейка гаварыў таксама рэзка, цвёрда. – Не трэба прыпісваць мне грахі, якіх у мяне няма. Ды яшчэ з палітычнымі ацэнкамі. У мяне сваіх даволі.

– Я папярэджваю цябе яшчэ раз. І раю вельмі сур'ёзна задумацца! Цябе ўжо не першы раз фактычна заносіць управа! – Башлыкоў заўважыў, што Апейка намерыўся быў запярэчыць, але прамаўчаў. Нібы палічыў, што спрачацца – ніякай карысці. Гэта Башлыкову дадало жорсткасці. – Ты ўжо не першы раз рознымі спосабамі фактычна стараешся прытармазіць нашы тэмпы. Як гэта назваць цяпер, калі партыя патрабуе ад нас – не спыняючыся, з усіх сіл ісці наперад? Калі партыя патрабуе: тэмпы, тэмпы, тэмпы?!

Башлыкоў глядзеў гнеўна: словы, якія ён сказаў горача, узрушылі і самога. Глядзеў, поўны разумення сваёй дужасці: праўда яго думкі, адчувалася, была такою моцнаю, бясспрэчнаю. Апейка адвёў вочы. Сумна маўчаў.

– Ты не быў пад Варшаваю? – не то спытаў, не то проста сказаў. – У дваццатым. Калі наступалі.

Башлыкоў не адказаў. Пры чым тут гэтае недарэчнае пытанне? Тым больш што ён добра ведае – не быў.

– А я быў. Ледзь не пайшоў там... у іншы свет... Узводны Сарокін вывез. Паўз уланскія патрулі... – Ён зірнуў на Башлыкова. Вачыма, якія былі недзе далёка, з успамінамі. Загаварыў раптам непрыязна: – Калі мы ішлі на Варшаву, у дваццатым, таксама, помню, былі тэмпы. Дайшлі да самай Варшавы. А потым аказаліся – пад Менскам...

Башлыкоў наогул не любіў Апейкавых «штучак»: вобразы-намёкі, загадкі. Тут жа гэтае параўнанне проста нібы дражніла.

– Аналогія гэта твая – няўдалая. Палітычна нясмачная.

– Гэта – не аналогія. Проста ўспомнілася дарэчы... Пры любых тэмпах трэба добры тыл. Асабліва – пры хуткіх...

2

Башлыкову пачулася насмешачка: «асабліва – пры хуткіх». І гэта дакончыла ўжо цярплівасць яго. Апанаваў гнеў: так гаварыць на яго прынцыповае, партыйнае папярэджанне!

Башлыкоў рэзка абарваў гаворку. Першы. Паказаў, што ён выклаў самае важнае і не дасць сябе заблытаць у непатрэбнай гаварыльні. У разважаннях з нядобрым душком.

З адчуваннем праваты сваёй і дужасці маўкліва стаяў за сталом, трымаючы руку ў кішэні штаноў, адасоблены, замкнёны ў сабе. Не хаваў нездавальнення. Не лічыў патрэбным хаваць.

Была цішыня, няветлівая, нязгодная. Потым Апейка неахвотна ўзняўся, прамовіў панура: «Да пабачэння». Башлыкоў адказаў стрымана, як бы знарок паказваючы тую мяжу, што легла між іх. На момант позіркі іх сустрэліся, і Башлыкоў дадаў – як папярэдзіў:

– Раю падумаць сур'ёзна.

Апейка прыпыніўся, зірнуў спадылба, па-бычынаму:

– Нам абодвум падумаць трэба...

І ўпартасць, і тон гаворкі: нібы звысака гаворыць! – зноў зачапілі Башлыкова, і ў ім ускінуўся гнеў. Нелагодна сачыў ён, як Апейка, угнуўшы галаву, важка сунуўся да дзвярэй.

Калі дзверы зачыніліся, яшчэ нейкі час стаяў за сталом. Не мог адразу адолець злога ўзрушэння спрэчкай, тым, што Апейка не разумее нічога і не хоча зразумець. Не слухае, па сутнасці. Дазваляе сабе гаварыць так, нібы не сам, а ён, Башлыкоў, чагосьці не разумее. Башлыкоў думаў пра гэта без сумненняў у сабе, з добрым адчуваннем сваёй праўды. Яму было добра ад таго, што ён вёў у спрэчцы не толькі адзіна правільную лінію, але і трымаўся прынцыпова, цвёрда.

Ён трымаўся прынцыпова цяпер і, што там ні будуць плясці потым розныя блытанікі, з прынцыповай лініі не саступіць ніколі. Не пахіснецца нават.

Думкі гэтыя давалі адчуванне дужасці, трываласці грунту пад сабой. Яснасці таго, што ёсць навокал і куды трэба ісці. Перавагі над чалавекам, які многае не бачыць. Не можа зразумець.

Ён выйшаў з-за стала і цвёрда, упэўнена захадзіў.

Але дзіўна: якім цвёрдым ні хацеў ён здавацца сабе, у жаданую ўпэўненасць яго ўсё ж штосьці ўнізвалася, трывожыла. Неспакойны, ён стаў перабіраць спрэчку з Апейкам. Амаль адразу памяць нагадала, што Апейка сказаў пра яго выступленне: «Пустое... Пусты стрэл!..» Непрыемна зашчымела ўсярэдзіне – Апейка крануў балючае: выступленне не дайшло, не адгукнулася ў людзях. Памяць адразу за гэтым падсунула новае: Апейка папракнуў, быццам ён ківае на кагосьці. Баіцца глядзець праўдзе ў вочы. Хлусня гэтых слоў пачулася Башлыкову такой відавочнай, што ў ім зноў ускінулася абурэнне. Калі гэта ён, Башлыкоў, спіхваў на кагосьці адказнасць, туліўся за спіны другіх?

Ён успомніў, як Апейка сіліўся даказаць, што ва ўсёй бядзе з калектывізацыяй у раёне вінаваты быццам няправільны падыход да сялян. Мала, бачыце, вучылі, як трэба сеяць і касіць у калгасах, лічыць зробленыя грошы. Мала чуласці да тых, хто ўчапіўся ў сваю латку зямлі і не хоча разумець нічога. Мала чуласці «да душы»! Перабіраючы ўсё гэта нанава, Башлыкоў пранікліва бачыў, што пад

усімі гэтымі «мудрымі» прыдумкамі скрываецца, па сутнасці, не што іншае, як імкненне пераканаць, што патрэбна не ясная і цвёрдая партыйная лінія, а туманныя ўгаворчыкі. Не бязлітасная класавая барацьба, а ліберальнае міндальнічанне. Наступаючы ў думках на Апейку і мімаволі шкадуючы, што не ўсё выказаў як мае быць, не знайшоў найлепшых слоў, ён з уцехай успомніў, што ўдала, дакладна выказаў формулу дзеянняў. Рэвалюцыю трэба рабіць або рашуча, да канца, або зусім не брацца. Да канца, да канчатковай перамогі трэба ісці!

«Апартуніст. Форменны апартуніст, – з той жа яснасцю, пераконанасцю даў адзначэнне Апейку. – Яўна кульгае на правую. І відаць ужо – безнадзейна... Не разумее сутнасці. І не хоча разумець... – Тое, што чулася раней, набыло выразнасці. – З такім далёка не пойдзеш у адной упражцы. – Натуральна вынікла далейшае, практычнае: – Не на месцы. Яўна не на месцы».

Падумаў, што трэба рабіць сур'ёзныя вывады з усяго, даць усім фактам палітычную, бальшавіцкую ацэнку. Што далейшае яго замоўчванне поглядаў Апейкі падобна ўжо на ўласны апартунізм.

Так, яго, Башлыкова, цярплівасць папахвае апартунізмам. Вельмі чутна папахвае. Трэба неадкладна прыняць меры. Абмеркаваць на бюро. Папярэдзіць акружком.

І наогул – дзейнічаць больш рашуча!

3

Башлыкоў перастаў мераць пакой, энергічна пакіраваў да тэлефона. Выклікаў Харчава.

У нецярплівым чаканні ўзяўся пераглядаць паперы. Калі ўвайшоў Харчаў, адразу ўзняўся за сталом, моцна паціснуў руку.

Башлыкоў з самага пачатку даў зразумець, што гаворка будзе самая сур'ёзная. Ні аднаго пытання папярэдне, выгляд засяроджаны, афіцыйны. Як бы падкрэсліў афіцыйнасць тым, што сеў на сваё месца, па другі бок стала.

Пачаў адразу з галоўнага. Учора быў у Глінішчах. Высветліў, што там адбываецца. Днём прайшоў па многіх дварах, вечарам правёў сход. Яшчэ знаёмячыся з абстаноўкай удзень, пераканаўся: калгас распаўся невыпадкова. У сяле ваўсю ідзе скрытая антыкалгасная агітацыя, якая шырока пусціла карэнне. Сход, які ён рашыў склікаць, паспрабавалі сарваць, сабаціравалі. На сходзе перайшлі да адкрытых выступленняў, да злосных выкрыкаў пад выглядам голасу мас. Асабліва актыўнічаў тып з яўна кулацкім нутром па мянушцы

Свердзел. Адным словам, абстаноўка, якая склалася ў Глінішчах, вельмі нездаровая і патрабуе неадкладных і самых рашучых мер.

Ведаючы, што баявому, надзейнаму Харчаву нярэдка не хапае ўмення глядзець на з'явы ў іх шырокім палітычным значэнні, Башлыкоў спецыяльна падкрэсліў, што ўсё, што адбылося ў Глінішчах, нельга разглядаць як мясцовую з'яву. Варожыя вылазкі ў Глінішчах, бясспрэчна, выклікаюць варожую актыўнасць у іншых месцах. Па ўсяму раёну. Коратка, патрабавальна скончыў: трэба зараз жа выехаць у Глінішчы, расследаваць усё на месцы. Прыняць самыя строгія меры.

Абветраны, важкаваты твар Харчава быў уважлівы. Харчаў толькі раз-другі мелькам сустрэўся з позіркам Башлыкова, але ў Башлыкова было добрае адчуванне еднасці з ім. Гэтаму не толькі не шкодзіла, а нават нібы спрыяла тое, што Харчаў, як заўсёды, трымаўся незалежна, як роўны з роўным. Башлыкоў быў упэўнены ў галоўным: Харчаў разумее ўсё і на яго можна спадзявацца.

Калі Башлыкоў скончыў, Харчаў кінуў позірк: ці ўсё, спакойна ўзняўся. Ад усёй постаці Харчава ішло адчуванне дужасці: моцнае цела пад напятай, бляклай ужо гімнасцёркай, чырванаватая шыя цісне на каўнер. І дужасць гэта, і спакой падзейнічалі на Башлыкова абнадзейліва. Падтрымала і кароткае, гаспадарскае: зараз паедзе, зробіць усё.

Якраз увайшоў Міша, далажыў, штоявіўся, чакае карэспандэнт з Менска. Башлыкоў з афіцыйнай жа стрыманасцю, усё асцерагаючыся паказаць кволасць, паціснуў руку Харчаву, загадаў Мішу ўпусціць карэспандэнта.

Карэспандэнт аказаўся чорненькім, вельмі маладым хлопцам. Дробны, кірпаты, ён здаваўся проста хлапчуком, але Башлыкоў сустрэў яго з увагай. Башлыкоў паважаў журналістаў. Прывітаўшыся, ён, аднак, папрасіў пасведчанне: парадак ёсць парадак. Пільнасць ніколі не лішняя, раён, можна сказаць, у прыгранічнай зоне. І ён, журналіст, няхай ведае, што тут ёсць парадак.

Журналіст замітусіўся, з-пад пацёртага картовага пінжачка дастаў згорнуты, памяты лісток паперы. Ого, «Савецкая Беларусь», цэнтральная рэспубліканская газета. Хведар Кулеш, супрацоўнік аддзела калгаснага будаўніцтва. Башлыкоў вярнуў пасведчанне, запрасіў сесці, высветліў, калі той прыехаў, ці ўладзіўся з жыллём, што цікавіць у раёне.

Госця, вядома, цікавіла калектывізацыя. Як ідзе калектывізацыя гаспадарак, і ў цэлым становішча ў раёне з калгасамі.

– Ясна, – сказаў Башлыкоў. Як гавораць пра самае простае.

Ён і выглядам сваім паказваў, што яму ўсё гэта ясна і проста. Але ў душы яго было і няясна, і няпроста. Супярэчліва было. З пытаннем журналіста ў ім як бы памацнела трывожнасць ад учарашняга. Чалавека ўражлівага і праўдзівага перад сабой, яго гэта найбольш вярэдзіла. Але разам з праўдзівасцю жыла ў ім і даўняя звычка не паказваць нікому свайго непрыемнага, слабасці сваёй. Тым больш не любіў ён скардзіцца. Тут жа, да ўсяго, выступаў ён не проста як Башлыкоў, звычайны чалавек, а як сакратар райкома партыі. І быў перад ім не сябра-прыяцель, а работнік прэсы, прадстаўнік рэспубліканскай установы. І патрэбны былі яму не прыватныя адчуванні нейкага Башлыкова, а погляды партыйнага кіраўніка раёна. Прынцыповыя погляды.

Ясна было, перш за ўсё належала даць палітычную характарыстыку становішча ў раёне. У адпаведнасці з агульнымі, прынцыповымі палажэннямі аб калектывізацыі. Ён пачаў з таго, што паведаміў: у раёне ідзе вострая класавая барацьба. Кулацтва, адчуваючы сваю блізкую пагібель, не спыняецца ні перад чым. Дзейнічае ўсімі метадамі. Расказваючы пра варожую дзейнасць, Башлыкоў нанава ўспомніў спрэчку з Апейкам, загарэўся больш. Нібы стаў працягваць незакончаную спрэчку...

Як адзін з прыкладаў, дзе кулацтва асабліва разгарнула дзейнасць, Башлыкоў назваў вёску Глінішчы. Хацеў расказаць пра сход, але стрымаў сябе: непазбежна ён выказаў бы сваё бяссілле, сваё і ўсяго кіраўніцтва раёна. Ды і балела гэта занадта для таго, каб паказваць пабочнаму чалавеку...

– Вы, напэўна, ведаеце, што раён уключан у першую групу, – пайшоў Башлыкоў далей. Карэспандэнт кіўнуў: ведае. – Мы павінны калектывізаваць раён да вясны наступнага года. Гэта наша галоўная задача... – Башлыкоў самакрытычна прызнаў, што тэмпы калектывізацыі ў раёне пакуль недастатковыя. Каб у карэспандэнта не засталося думкі, што ў раёне зміры ліся з гэтым, ён адразу ж запэўніў, што раён будзе рабіць усё для таго, каб тэмпы рашуча паскорыць. І што задача, якая пастаўлена, будзе выканана.

Ён помніў: краіна павінна ведаць сваіх герояў, з гонарам стаў расказваць пра лепшыя калгасы, лепшых людзей. Карэспандэнт, схіліўшы галаву, на якой тапырыліся неадрослыя валасы, падобны на маладога шпака, хапатліва пісаў у сшытак, і Башлыкоў гаварыў павольна, каб той упраўляўся. Калі казаў назвы, лічбы, то нават паўтараў, каб газетчык не памыліўся. Сачыў, як той піша прозвішчы, папраўляў. Ён разумее, якая адказная справа – газета.

Перабіраючы ў памяці людзей, ён між іншых успомніў Казачэнку, Дубадзела, Міканора, Гайліса. Да паганай гісторыі з «Рассветам» ён ставіўся да іх па-рознаму, то хваліў, то крытыкаваў, цяпер жа, і то вагаючыся, адзначыў добрым словам аднаго Дубадзела. Башлыкоў параіў, куды лепш паехаць, да каго звярнуцца. Паабяцаў пазваніць, каб там дапамаглі. Тут жа ўстаў, паклікаў Мішу, загадаў арганізаваць падводу. У карэспандэнта было пісьмо з рэдакцыі. Башлыкоў паглядзеў яго: рэдакцыя пісала, што са Слабодкі паступіла скарга – прыцясняюць селькора Корбіта. Башлыкоў тонам, які паказваў, што ён добра разумее палітычнае значэнне скаргі, заявіў, што будуць прыняты строгія меры.

Правёўшы журналіста да дзвярэй, Башлыкоў вярнуўся за стол. Нейкі час сядзеў нерухома. У памяці засталося: у хлопчыка-журналіста быў дзіўна пранізлівы позірк. Зусім не юнацкі позірк. Было смутна на душы: нібы не ўсё сказаў добра. Было неспакойна. У кепскі час журналіст прыехаў...

Башлыкоў як бы прыслухоўваўся да сябе. Яго не палохае, што ён там напіша, карэспандэнт. Самае паганае – напіша ён ці не – гэта ёсць. Правал. Зноў гняло адчуванне ўчарашняй няўдачы. Помнілася сённяшняя размова з Апейкам. І званок сакратара акружкома. Была хвіліна суму, адзіноцтва. Потым ён стаў ліхаманкава думаць: што рабіць, як выбрацца з прарыву?

Трэба ўсё перагледзець нанава, усе сілы. Усё і ўсіх падняць на ліквідацыю прарыву. Апошнімі днямі, ездзячы па раёну, ён зусім выпусціў з рук раённыя звенні. Трэба ўзняць іх: агітацыю, моладзь, культурныя сілы. Шэфаў.

Ён даўно збіраўся паставіць пытанне пра шэфскую работу. Трэба сёння ж нарэшце паставіць. Сабраць усіх шэфаў і спытаць з іх. Ён дастаў паперу, пачаў складаць спісак. Спісак сакратароў партячэек. Усіх, каго належыць сабраць на нараду па шэфскай рабоце ў калгасах.

Імкліва рушыў да дзвярэй. Міша ўжо быў у пакойчыку прыёмнай. Загадаў яму склікаць усіх на семнаццаць нуль-нуль. Папярэдзіць, каб прыйшлі з матэрыяламі пра зробленае. Усе павінны будуць далажыць.

4

Было ліхаманкавае жаданне дзейнічаць. У дзейнасці як бы шукаў трываласць сабе, упэўненасць.

То аднаго, то другога выклікаў работнікаў райкома, адказных работнікаў раённых устаноў. І ў райкоме, і ў іншых раённых установах у мястэчку заставалася мала, большасць былі ў вёсках, займаліся калектывізацыяй, але яго гэта не супакойвала. Увесь час, як цень, жыла ў ім памяць пра ўчарашняе, пра спрэчку з Апейкам, званок з Мазыра.

Усе давалі адказ, што зроблена, што плануецца зрабіць. Усе адчувалі яго энергічную, строгую патрабавальнасць, незадаволенасць зробленым.

Пасля некалькіх такіх гаворак ён выклікаў загадчыка агітпропа Каржыцкага. Каржыцкі, чалавек таксама новы ў раёне і таксама малады, амаль увесь час бадзяўся па раёну. Выпраўляць не трэба было, ведаў сваю справу: то з агітатарамі дзе-небудзь у сельсавеце ці школе, вучыць, адукоўвае, то сам – на сходзе, з дакладам, з прамовай. Узялі яго з вучобы, з менскага інстытута.

Башлыкоў звычайна не папракаў свайго агітпропа. У той павазе, якую ён чуў да загадчыка агітпропа, было нават стоенае разуменне некаторай перавагі таго над ім, Башлыковым. Каржыцкі, не адзін раз заўважаў Башлыкоў, мацней быў у веданні гісторыі партыі, тэарэтычна быў лепш падкаваны. Башлыкова супакойвала тое, што Каржыцкаму было далёка да яго ва ўменні звязваць тэарэтычныя веды з практыкай, ва ўменні арганізаваць справу. Хіліў Башлыкоў да Каржыцкага мяккі, светлы характар загадчыка агітпропа.

У Каржыцкага і сёння быў чысты, сіні позірк вачэй. Былі дзелавітая сабранасць, акуратнасць ва ўсім. І расказваў ён талкова, з веданнем, роўным, як звычайна, голасам. Усё было ў ім як заўсёды, але сёння ўсё гэта выклікала ў Башлыкова глухую непрыхільнасць. Было такое адчуванне, быццам Каржыцкі, хоць таксама вінаваты ва ўсім, не хоча браць сваю долю віны на сябе. Стрымліваючы нядобрае ў сабе, распытваў Башлыкоў пра работу ў асобных сельсаветах, хатах-чытальнях, пра асобных агітатараў. З асаблівай пільнасцю высвятляў, што агітпроп рабіў у Алешніках, у Глінішчах. З раздражненнем слухаў, што было зроблена ў Глінішчах: выходзіла – нямала было зроблена. З нездавальненнем пачуў ён хвалу Парасцы Дарошка, адразу ўспомніў яе выступленне на сходзе. Успомніў так, быццам яна здрадзіла яму, які так спадзяваўся. Здрадзіла ў такі момант, ухілістка...

Вядома, не трэба было хваліць агітпропаўцаў у Глінішчах. Няма за што хваліць, калі на іх вачах развалілі калгас. У неразуменні гэтага выявілася слабасць Каржыцкага, якую Башлыкоў адзначыў зноў: мала практычнай хваткі. З адчуваннем бясспрэчнай перавагі сваёй

над Каржыцкім і дакладным веданнем мэты Башлыкоў пайшоў у крытычны наступ на загадчыка агітпропа.

– Там папрацавалі добра, – панура падхапіў думку Каржыцкага. Рэзка павярнуў: – Толькі – не мы, а іншыя. Вынікі іх работы добра відны. Учора сам бачыў у Глінішчах. Добра папрацавалі! Кулакі і ўсе іх падгалоскі. – Сінія, чыстыя вочы Каржыцкага замутніла збянтэжанасць. Вінавата адвёў позірк. На твары вынікла далікатнае, дзявочае ружавінне. Быў, здалося, не згодны, але не запярэчыў. Змоўчаў. Гэта яго нязгода дадала Башлыкову ўпартасці.

– Аб рабоце ўсіх нас будуць меркаваць па выніках, – сказаў ён, усё як бы набіраючыся дужасці. – А вынікі нашы – вось яны. Трыццаць сем гаспадарак за тыдзень новых улілося. І дваццаць дзевяць за дзень – з калгаса. Крок наперад, два назад. Нашы тэмпы. Вынікі нашай работы...

Башлыкоў добра разумеў, што, хоць ён гаворыць «нас», «нашы», Каржыцкі чуе гэта як абвінавачанне яго асабіста і яго аддзела. Гэта зусім адпавядала імкненню Башлыкова, ён і хацеў, каб Каржыцкі ўзяў вялікую долю віны на сябе. Чым большую, тым лепш. Тым лепш будзе старацца рабіць. З гэтым імкненнем Башлыкоў і вінаваціў Каржыцкага ў тым, што агітпроп далёка не спраўляецца з задачамі, якіх патрабуюць ад яго цяперашні адказны момант, тыя тэмпы, якія неабходна ўзяць, каб выканаць абавязацельствы па калектывізацыі раёна. Каб ліквідаваць той прарыў, у якім раён апынуўся. Каб дабіцца рашучага пералому.

Башлыкоў строга, прыдзірліва разгледзеў план агітпрапработы, пакрэсліў яго, пакрытыкаваў, вярнуў дадумаць, дапрацаваць. У плане, на яго думку, недастаткова скіроўвалася ўвага на барацьбу з кулацкай агітацыяй, і асабліва – на барацьбу за ўзмацненне тэмпаў калектывізацыі.

Калі Каржыцкі пайшоў, Башлыкоў адчуваў, што недарэмна стараўся: агітпроп, падобна, зразумеў становішча. Але супакаення ў Башлыкова па-ранейшаму не было. Наперадзе чакалі многія іншыя клопаты: многія звенні яшчэ трэба было мабілізаваць. Перш за ўсё – моладзь.

Кудравец толькі што прыехаў з раёна. Ён увайшоў у кабінет Башлыкова яшчэ чырвоны з холаду. Башлыкову кінулася ў вочы: быў незразумела чаму радасны і нават быццам бесклапотны. Гэта яго бесклапотнасць – у такі час – непрыемна здзівіла. Здзівіла, тым больш што Кудравец быў асабліва блізкі. У Башлыкова да Кудраўца было нават адчуванне роднасці: Кудравец жыў у тым свеце, які нядаўна

зусім быў і яго, башлыкоўскім, светам, у дарагім камсамольскім віраванні.

Кудравец прыехаў з Бярозаўкі. Башлыкоў спасцярожліва запытаў, што там у Бярозаўцы. Навіны былі добрыя, камсамол дабіўся – калектывізавалі яшчэ дванаццаць гаспадарак. Але Башлыкова гэта не супакоіла, ледзь даслухаў адказ, павёў гаворку на тое, што балела. Коратка, энергічна расказаў пра ўчарашнія дзень і вечар у Глінішчах, асабліва вылучыў, як паводзілі сябе камсамольцы і ў цэлым моладзь. Большасць камсамольцаў, павінен адкрыта сказаць, дзіўна сябе паводзіла: і днём – ззаду, цішком, і ўвечары, на сходзе, – моўчкі. Многіх і наогул нельга было зразумець: за каго яны? Адзін Казачэнка дзейнічаў смела, актыўна. Адным словам, усе факты гавораць пра поўнае разлажэнне цэлай ячэйкі. На вачах у райкома камсамола.

Башлыкоў бачыў, як проста вачавідкі вясёлую бесклапотнасць на твары Кудраўца змянілі вінаватасць і няёмкасць. Заўважыўшы мелькам, як ён стуліўся, як нацята, нібы школьнік, чакае далейшага, горшага, Башлыкоў раптам адчуў жаласць да яго. Але тут жа цвяроза прыглушыў жаласць: не тая абстаноўка, каб паддавацца кволасці. І наогул ведаў: павінен быць як мага строгім, прынцыповым. Цвёрда павёў далей: разлажэнне ячэйкі ў Глінішчах недаравальнае асабліва таму, што яно не выпадак, што ўсё гэта здарылася не за адзін дзень. Гэта, бясспрэчна, паступовае разлажэнне. І тое, што райком камсамола не змог заўважыць яго, гаворыць пра поўную страту пільнасці, пра слепату. Пра галавацяпства. Факт гэты сведчыць і пра тое, што райком у цэлым дрэнна ведае становішча ў ячэйках. Дрэнна ведае – значыць, і дрэнна кіруе імі.

Башлыкоў ніколі не гаварыў так рэзка з Кудраўцом, але ж ніколі дасюль не было і такой прычыны, такога становішча, якое вымагала само па сабе і асаблівай патрабавальнасці, і асаблівай строгасці. Не забываючы ні на момант становішча, Башлыкоў адчуваў як абавязак выказаць жорстка: калі галавацяпства ў кіраўніцтве наогул нельга дараваць, то цяпер – у ганебным прарыве, да якога яны давялі раён, – такое галавацяпства ёсць злачынства. Самае цяжкае палітычнае злачынства.

Адсюль Башлыкоў вёў гаворку пра тое, што найбольш трывожыла: як выправіць становішча ў раёне. Ужо не толькі судзячы, а і нібы далучаючыся, выказваючы спадзяванне на Кудраўца, на райком камсамола, яшчэ нелагодным голасам тлумачыў: трэба ўсё падцягнуць. Усе арганізацыі, усе сілы ўзняць. Дабіцца рашучага павароту ў тэмпах.

Не толькі таму, што перад ім быў кіраўнік моладзі, а і з непахіснага пераканання Башлыкоў падкрэсліў: вынікі ўсёй работы ў раёне будуць вельмі залежаць ад камсамола, ад моладзі. Шукаючы ратунку са сваёй бяды, ён больш за ўсё спадзяваўся на тое, што калі хто і можа выратаваць, то найперш – камсамол, моладзь. Была гэта вера і ад таго, што яшчэ і сам жыў, можна сказаць, у камсамоле, і ад адчування, што моладзь – самая жывая і дзейсная сіла ў грамадстве. У сельскую моладзь ён, праўда, і верыў, і не верыў. Яна не раз і радавала, і ашуквала. Здавалася – больш ашуквала: больш востра расчароўвала сваёй непадатнасцю, абмежаванасцю, чым старыя сяляне. У маладых вясковых ён проста цярпець не мог прывязанасці да прыватнай уласнасці, недаверлівасці, асцярожнасці. Памяць пра ўчарашняе гэтую звыклую непрыхільнасць яго рабіла яшчэ больш чутнай. І ўсё ж, як бы там ні было, – ён нагадваў сабе цяпер: і ў сяле, у гэтым нерухомым балоце, моладзь часта лягчэй адгукалася на новае. Хоць і не так, як трэба было і як хацелася б. Але хто асабліва абнадзейваў Башлыкова, дык гэта пралетарская моладзь. Яе, праўда, небагата ў мястэчку, дзе самы вялікі завод – паравы млын. Але яна ёсць. А ад таго, што яе мала, асабліва важна ўмела арганізаваць яе. Арганізаваць і накіраваць так, каб яна павяла іншых за сабой. У сяло, на калектывізацыю.

Няпростыя пачуцці турбавалі Башлыкова, калі ён раіў Кудраўцу, як арганізаваць моладзь, каб вывесці раён з прарыву, узняць тэмпы калектывізацыі. І надзеі, і сумненні, і цвярозая ацэнка, і легкадумныя мары – усяго было ў яго пачуццях, з якіх упарта лез, намагаўся адолець усё адчай.

Башлыкоў глушыў адчай, стараўся не паддавацца. Практычныя парады, указанні, якія пераказваў Башлыкоў Кудраўцу, то седзячы за сталом, то праходжваючыся, давалі дужасці самому. І давала дужасці яшчэ тое, што сакратар райкома камсамола, худы, русявы, аддана сачыў за кожным словам, кожным рухам яго. Гатоў быў падставіць плячо, верыў яму. Праўда, Башлыкова гэта Кудраўцова вера, наіўная, амаль дзіцячая, трохі і дражніла. Як бы ненадзейным чуў плячо, якое той мог падставіць. Ад таго ў патрабавальную строгасць тону гаворкі Башлыкова не раз унізвалася раздражненне.

Ён стрымліваў раздражненне. Як мог упэўнена і патрабавальна, тонам старэйшага таварыша скончыў:

– Прадумай усё, парайся. Прыходзь з прапановамі. Абмяркуем на бюро райкома.

Калі Кудравец выйшаў, было нейкае супярэчлівае нездавальненне. Відаць, лішне рэзка гаварыў, асабліва спачатку. Пакрыўдзіў

несправядліва стараннага, адданага хлопца. Тады ж зазлаваў на сябе, на сваю мяккацеласць: няма чаго шкадаваць, праўду сказаў. Адданы, старанны – гэта так. Але ж таксама факт, што – слабаваты. Мала арганізатарскай хваткі. Настойлівасці малавата... Ці не замяніць? Кім? Можна папрасіць у акружкоме? Пашкадаваў мімаволі: каго-небудзь з Гомеля б, з сяброў!

Пасля Кудраўца Башлыкоў выклікаў яшчэ некалькі чалавек. Самым важным сярод іх быў, бадай, загадчык райана Мармаль.

Мармаль, былы настаўнік, немалады ўжо, увайшоў у кабінет, нібы ў клас, выпрастаны, падрыхтаваны да ўсяго, з папачкай у руцэ. У картовым пінжаку, у чырвонаармейскіх штанах і начышчаных ботах, ён спыніўся каля дзвярэй, няўпэўнены і быццам вінаваты.

Башлыкоў выйшаў насустрач яму, пацiснуў руку, запрасіў сесці. Мармаль сеў на край крэсла, папачку ўзяў у абедзве рукі на каленях, ціха глядзеў на сакратара райкома.

Башлыкоў трымаўся з ім ветліва, але строга афіцыйна. За знарокавай ветлівасцю і афіцыйнай халаднаватасцю прыхоўваў Башлыкоў незадавальненне: загадчык райана не падабаўся, глухаваты што да палітыкі, няўпраўны, быў яўна не на сваім месцы. Яго трэба было б даўно замяніць, Башлыкоў і замяніў бы, але Апейка ўпарта пярэчыў гэтаму, заступаўся за старога. Мела, вядома, значэнне і тое, што замяніць загадчыка было не так проста. Адукаваных, з арганізатарскім талентам людзей не хапала і на больш важных месцах.

Мармаль, не інакш, ці ведаў, ці здагадваўся пра адносіны сакратара да сябе. Усё гэта ўскладняла гаворку.

Немаладыя гады і настаўніцкае званне загадчыка райана вымушалі Башлыкова гаварыць як мага далікатна. Абавязак лічыцца з гадамі і званнем былога настаўніка, аднак, не перашкодзіў Башлыкову выказаць усё, што трэба было, з належнай прынцыповасцю. Аддзелены ад загадчыка райана мяжой стала, цвёрда ўсклаўшы рукі на яго паверхню, Башлыкоў слова за словам выкладваў, важка, жорстка. Настаўнікі мала працуюць з жыхарамі вёсак. Недастаткова вядуць работу па калектывізацыі. Не ўцягваюць сялян у калгасы, не вядуць растлумачальнай работы пра перавагі калгаснага ладу. Ухіляюцца ад барацьбы з кулацтвам. Амаль не прыцягваюць да калектывізацыі дзяцей. Каб дзеці ўплывалі на бацькоў, дабіваліся ад іх уступлення ў калгасы.

Гаворачы гэта, Башлыкоў успамінаў сход у Глінішчах: дзіцячыя постаці, што гайсалі па хатах, склікалі. Цікаўныя, усхваляваныя вочкі на сходзе, між дарослых. Чуў як бы дакор сабе за няпраўду жорсткіх

слоў пра дзяцей, але не мякчыў выразаў – помніў: галоўнае – настроіць загадчыка на рашучы пералом. Неабходнасць такіх слоў падмацоўваў успамін пра тое, як выступала на сходзе Параска.

Як вывад усяму Башлыкоў заявіў Мормалю, што райана, па сутнасці, амаль не займаецца калектывізацыяй, пусціў гэту важнейшую дзяржаўную кампанію на самацёк. Што гэтага ва ўмовах таго прарыву, у якім апынуўся раён, райком трываць далей не можа.

Мормаль, неспакойна соўгаючы папачку на каленях, вінавата спрабаваў пярэчыць: настаўнікі не ўхіляюцца ад калектывізацыі. З дзецьмі работа вядзецца, але бацькі не слухаюць іх. Райана ўвесь час займаецца калектывізацыяй. Бачачы, як недавольна слухае яго пярэчанні Башлыкоў, загадчык райана ніякавеў, згаджаўся: вядома, трэба больш рабіць. Лепш агітаваць.

Башлыкоў разумеў: Мормаль казаў праўду. Настаўнікі рабілі сваё, і райана займаўся калектывізацыяй. І ўсё ж гэтыя адгаворачкі злавалі: загадчык райана імі быццам хацеў адасобіцца. Не хацеў зразумець становішча, напружыць сілы так, як гэтага вымагаў момант. Башлыкоў гаварыў усё больш рэзка, дабіваўся зламаць гэты благадушны, апартуністычны настрой.

Дабіўся нібы нарэшце, бачылася – быццам дайшло. Мормаль пакляўся, што мабілізуе ўсе сілы настаўнікаў і школьнікаў. Башлыкоў дамовіўся, што Мормаль увесь час будзе дакладваць пра зробленае.

Калі развіталіся, не было палёгкі. Было ўсё тое ж адчуванне, што зрабіў мала. Увесь дзень вярэдзіла яно, не аціхала і цяпер.

5

Яно было прыціхла на бюро райкома, якое ён сабраў пасля поўдня.

На бюро прыйшло толькі чацвера, ды і то двое з іх – Апейка і Каржыцкі. З кандыдатаў у члены бюро быў Кудравец. Іншыя былі на раёне. Але сабраць бюро было неабходна, сярод усяго таго, што трэба было мабілізаваць у гэты момант, бюро належала найважнейшая роля. Акрамя таго, што Башлыкоў хацеў узняць супраць прарыву сваіх асноўных таварышаў, бюро неабходна было і для таго, каб арганізаваць некаторыя далейшыя мерапрыемствы. У бліжэйшыя дні Башлыкоў рашыў сабраць раённы сход упаўнаважаных па калектывізацыі і партыйнага актыву. Трэба, каб бюро выказала сваё меркаванні пра такі сход.

Башлыкоў знарок гаварыў стрымана, каб у членаў бюро не стварылася думкі, нібы ён паддаецца адчаю. Разам з тым ён і не

прыхарошваў становішча, зрабіў усё, каб члены бюро зразумелі, які небяспечны момант настаў. Асцерагаючыся, што спрэчка з Апейкам можа адвесці ўвагу ад галоўнага, ён ні словам не зачапіў старшыню выканкома.

Члены бюро ва ўсім падтрымалі Башлыкова: згадзіліся, што ўсім ім трэба раз'ехацца па сваіх сельсаветах, прыняць захады, каб не даць паўтарыцца таму, што здарылася ў Глінішчах. Усе дружна ўхвалілі думку Башлыкова пра сход упаўнаважаных і актыву. Усе згадзіліся, што сход такі ў цяперашні момант проста неабходны. Даклад даручылі Башлыкову, і Апейка згодна кіўнуў з іншымі.

Ці ад таго, што Башлыкоў адчуў падтрымку іншых, што бюро прайшло вельмі дружна і дзелавіта, ці ад таго, што на бюро зрабіў важныя захады на далейшае, першы час ён адчуваў сябе лягчэй. З адчуваннем дужасці сваёй і з настойлівай нецярплівасцю думаў ён пра заўтрашнюю паездку ў Алешніцкі сельсавет, якую аб'явіў на бюро і якою ён спадзяваўся выправіць тое, што пачалося ў Глінішчах.

З гэтым настроем рыхтаваўся Башлыкоў да нарады пра шэфства. Перагледзеў звесткі пра работу шэфаў, і даўнейшыя, і новыя, якія толькі што прынёс Міша. Перачытаў падабраныя Мішам рашэнні, у якіх гаварылася пра шэфства. Прадумаў і накідаў на паперы план выступлення на нарадзе. Калі ён рабіў гэта, думкі яго адбягалі то ў заўтрашнюю паездку ў Алешнікі, то яшчэ далей – на нараду актыву. Ён быў упэўнены, што дабярэцца там, у Алешніках, да самых каранёў, выведзе ўсякую нечысць напаверх. Навядзе парадак. Навядзе ды яшчэ іншых навучыць. На нарадзе актыву... Да нарады будзе жывы матэрыял. Тое, што ўбачыць сваімі вачыма...

За акном было цёмна, калі сталі сыходзіцца шэфы. Першым аб'явіўся Гірш Кофман, старшыня шавецкай арцелі, рушыў адразу ў кабінет, па-прыяцельску, зычліва прывітаўся. Ён быў у брызентавым плашчы, з пугаю, з чаго Башлыкоў вывеў, што Кофман прыехаў з Прудка. Кофман адразу ўлавіў, што Башлыкоў заняты, умомант нагнаў на сябе заклапочаны, афіцыйны выгляд, запытаў: «Дзе ето будзе?» – папрасіў прабачыць, што перашкодзіў. Проста ён хацеў высветліць, бо там нікога няма. І Мішы таксама...

Роўна а шостай, нібы хвалячыся дакладнасцю, Міша ступіў у кабінет, далажыў, што народ сабраўся, чакае, і Башлыкоў узяў падрыхтаваныя лісткі, пакіраваў да залы, большага пакоя ў будынку, дзе мелася быць нарада. З-за стала ён агледзеў пакой, зала была не запоўнена і напалову, але галоўныя, хто найбольш патрэбны, былі тут. Акрамя Кофмана, ён вылучыў чарнявага, маўклівага Лазара Голада, старшыню швейнай арцелі, загадчыка млына – рослага,

нецырымоннага Сопата, маладога, усмешлівага загадчыка школы Волаха, дырэктара дзіцячага дома Бабуру. Былі сакратары партыйных ячэек, камсамольскія кіраўнікі з ячэек, сярод якіх Башлыкову кінулася ў вочы Міхаленка, што калісьці, на чыстцы, так адважна абараняла Апейку.

Адразу было відаць, што сабраліся далёка не ўсе. Вядома, нямала каго не аказалася тут таму, што былі на раёне, не ўправіліся прыехаць ці не ведалі пра нараду. Як бы там ні было, Башлыкоў ад сваёй ужо нязменнай звычкі перагледзеў спісак запрошаных, час ад часу ўздымаючы вочы, пытаючыся ў залы, чаму не відаць на нарадзе таго ці іншага чалавека. У зале то гаманілі, адказваючы, то маўчалі, з самага пачатку, калі Башлыкоў пачаў перабіраць спісак, у ёй усё больш мацнела рабочая патрабавальнасць. Башлыкоў з самага пачатку даваў зразумець, што размова будзе строгая.

Ён быў сабраны і настроены рашуча, але разам з гэтым цяпер, калі ён чуў і бачыў людзей, у яго было і, няхай ціхае, адчуванне палёгкі. Перад ім нібы было падмацаванне, якое давала права спадзявацца на добрае.

Ён рашыў пачаць з дакладаў кіраўнікоў прадпрыемстваў і сакратароў ячэек. Седзячы за сталом, засланым чырвоным бляклым паркалем, ён запытаў, хто хоча пачаць, узяць першы слова. Хвіліну была цішыня, варушыліся, адводзілі вочы ўбок. Кофман на гэта сказаў, што таварыш сакратар ставіць усіх у цяжкае становішча, бо нікому няёмка першаму выходзіць хваліцца поспехамі. Яго жарт зразумелі, у зале паявіліся ўсмешкі, пачуліся вясёлыя водгукі. Усе ведалі: поспехаў няма, гаворка чакае нялёгкая, і слова Кофмана палагодзіла нядобрае чаканне. Кофман жа першы і ўзняўся ўсё з той жа пугай у руцэ. Хваліцца ён не хваліўся, цікава расказаў пра справы ў вёсцы, з якой прыехаў, але Башлыкову не спадабаўся яго гарэзны і бесклапотны тон, які, бачылася, няправільна, легкадумна настройваў людзей. Башлыкоў рашуча перапыніў яго, стаў патрабавальна дапытваць, што канкрэтна зроблена па шэфскай рабоце.

Ён хутка збіў бесклапотнасць з Кофмана, паказаў яму шэфскія яго «поспехі» ў сапраўдным святле, так што, вяртаючыся назад, Кофман адно круціў галавою ды адгукваўся. Узрушаны размовай з Кофманам, тым урокам, які падаў яму, Башлыкоў ужо не стаў пытацца добраахвотнікаў, а пачаў выклікаць. Уважліва, патрабавальна слухаў кожнага. Раз-пораз перапыняў пытаннямі, адзначэннямі таго, што чуў, найбольш – крытычнымі, незадаволенымі. Часам ён спехам запісваў у лістку думку, каб не забыць, прабягаў вачыма па зале, па тварах, але ні на момант не аслабляў пільнай увагі, цвёрдай рукой вёў

належную лінію. Кожнаму прамоўцу і ўсім у зале ён паказваў, як мала і як кепска зроблена такой важнай справы. І якія недаравальныя адносіны да яе.

Не ўсе разумелі яго становішча. Былі спробы апраўдацца рознымі прычынамі, нават – спробы ўхіліцца былі. Слухаючы некаторых, іх абяцанкі, ён адчуваў, што яго клопаты мала турбуюць іх. Што змен асаблівых не будзе. Гэта вярэдзіла яго, злавала.

Можа, ад таго, што яму так даліся ўчарашнія дзень і ноч, ён так хутка пачаў зноў нервавацца. Праўда, і становішча з шэфскай работай было – горш горшага; але ў тым, як адгукаўся цяпер Башлыкоў на нелады, з якой гарачкавасцю, адбівалася, не інакш, тое, што нервы не вытрымлівалі напружання. Гэтая гарачкавасць была ў ім і калі ён устаў, каб сваім словам скончыць нараду. Ён не толькі не шукаў нейкіх лагодных слоў, а як бы выбіраў самыя балючыя, бязлітасныя, калі маляваў становішча раёна з калектывізацыяй, калі расказваў пра тое, што здарылася ў Глінішчах, пра тую агідную работу, якую вядзе ў вёсках кулацтва і яму падобная нечысць супраць калгасаў. Вядзе ў той час, калі большасць шэфаў спяць абыякава. Ён, як бы выкрываючы, судзячы, гнеўна заявіў, што ў той фактычнай катастрофе, у якой раён апынуўся, вялікая віна і шэфаў, іх слабой дзейнасці, а ў многіх, па сутнасці, выпадках – бяздзейнасці. Такія адносіны да шэфскай работы, якія выявіліся ў некаторых выступленнях і тут, на нарадзе, заявіў Башлыкоў, ёсць не што іншае, як галавацяпства, цяжкае злачынства.

Яго гарачая, вострая прамова, бачыў Башлыкоў, хвалявала, даходзіла. Факт гэты, аднак, з-за незадавальнення станам спраў не толькі не цешыў, але і не супакойваў ні трохі. Настойлівы, зацяты, ён, як бы грозячыся, сказаў, што за зрыў шэфскай работы райком будзе патрабаваць, як за зрыў важнейшай дзяржаўнай кампаніі. Ніякія адгаворкі не будуць прымацца.

Як ні ўсхваляваны быў, не толькі належна настроіў усіх, але і даў канкрэтныя ўказанні. Дакладна падаў, што неабходна зрабіць кожнай установе. Назваў тэрміны, вызначыў адказных.

6

За вокнамі была ўжо ноч, калі Башлыкоў закрыў нараду і зала пачала пусцець.

Ён вярнуўся ў кабінет. Тут, за зачыненымі дзвярамі, адзін, нейкі момант пастаяў, як бы на раздарожжы. Як бы хацеў разважыць: што

ж далей. Не прыдумаў нічога. Угледзеў на стале пачак папярос. Закурыў, захадзіў.

Была вялікая стома і разам – узрушанасць. І рабіць больш не быў здатны, і адпачываць не мог. Не першы раз у галаве прайшло: гэтымі сваімі прамовамі, пэўна, не так другіх уздымаеш, як расцвельваеш сябе.

Трэба было б пайсці паабедаць, але есці не хацелася.

Схамянуўшыся, ён пазваў Мішу, распарадзіўся, каб той перадаў возчыку: заўтра да сямі быць гатовым у дарогу. Дазволіў Мішу ісці дадому.

Можна было б і самому ісці. Нават – трэба б. Адпачыць перад заўтрашнім. Але і ісці не хацелася. Нічога не хацелася.

Не зважаючы на змору, душу трывожыў неспакой. Вось жа ліха, разумеў: усё зрабіў як мог, а задавальнення не было. Не толькі задавальнення, а і якой-небудзь палёгкі.

Не, і разумення такога, што зрабіў тое, што мог і павінен быў, не было. Не было такой упэўненасці, тачыла нават глухое, але настойлівае адчуванне, што рабіў не тое, не галоўнае. Што мала зрушыў тое, што павінен быў. Можа быць, зусім не скрануў. І гэта адчуванне было тады, калі ўсё больш ціснула трывога, важкая, вялікая, неадступная. Калі так упарта насядалі паганыя згадкі-напаміны.

Удзень паганае гэта прыціхла за клопатамі, яго можна было стрымліваць; да таго ж тады – дзень быў наперадзе, надзея была. Цяпер дзень быў ззаду, усё, што мог, зрабіў, і цяпер відаць была цана зробленаму. З яснасцю, ад якой брала кволасць, бачыў, што зрабіў мала, нікчэмна мала, амаль нічога не зрабіў, а ў галаву, гарачую, узрушаную, усё ўнізваліся згадкі: учарашнія дзень і вечар у Глінішчах, размова з Галубовічам, Нінін ліст, спрэчка з Апейкам. Як бы нанава гучала: «Не пойдзем! Не аддадзім!..», «Галаву здымем!..», «Ты сваяк пана Шэпеля!..».

Сярод усяго ўбілася Апейкава, асабліва жорсткае, таму што і сам чуў значэнне, небяспечнасць яго: «Гэта толькі сігнал!.. Можа быць горш...» Пачуўшы зноў гэта, захадзіў хутчэй, крайне неспакойны. Можа быць горш. Хоць горш не трэба. І так пагана, далей, здаецца, няма куды. Да вясны з такімі тэмпамі – правал бясспрэчны... Тут думкі яго працяла раптоўнае: «Алёшка, чарцяка! Мы табой ганарымся!..» – і вокліч гэты стрэмкаю ўчапіўся ў сэрца. Як знарок, як насмешка!.. Не адразу змог вярнуцца да перарванай думкі, даць нейкі лад свайму думанню... Яму даверылі такую важную справу,

паставілі на такі важны ўчастак. А ён, відаць ужо, можа не спраўдзіць надзей...

За нядобрымі развагамі ўзяла больш кволасць. Сем месяцаў тут! Не спіць, не есць, можна сказаць – усю душу аддае! А вынікі?!. Узяў адчай, такі моцны, які можа захапіць, толькі калі ты без меры нацяты, калі ты гарачы і табе дваццаць пяць...

У гэту хвіліну агіднай кволасці яго апякла зноў згадка пра ўчарашні сход, пра паводзіны на ім Апейкі і Гайліса. Нанава ўспомнілася ранішняя спрэчка з Апейкам, і ў ім з новай сілай ускінулася нязгода з усім, што Апейка спрабаваў увесці ў яго.

Ён цяпер з яшчэ большай яснасцю ўбачыў усю ілжывасць Апейкавых мудрагельстваў, ілжывасць і нават небяспечнасць іх, якія маглі збіць з правільнай дарогі, аслабіць у той момант, калі так патрэбны цвёрдасць і ўпэўненасць. «Яўна кульгае на правую! Сам кульгае і другіх падбівае!» – падумаў абурана.

Пасля гэтага лепш адкрылася, чаму недавольны пражытым днём. Лепш бачылася, што гэты дзень і тое, што зрабіў, мала што зменяць у становішчы, таму што і Каржыцкі, і Мормаль не тая сіла, якая можа сур'ёзна выправіць тое, што ёсць. І не таму, што Каржыцкі і Мормаль кепскія самі па сабе. Хто б ні быў на іх месцы – нічога не зробіць. Таму што патрэбны не размовы, а дзеянні. Дзейныя, цвёрдыя людзі, сапраўдныя бальшавікі патрэбны там, на месцы. А там – чарнаштаны ды гайлісы. Мяккацеласць. Апартунізм. Правы ўхіл.

«Не тое робім, не так, – мацнела ўпэўненасць. – Гаворым многа. Многа спадзяванняў на словы. На ўгаворы. Тут наша няўдача. Угаворы – пустазвонства. Дзейнічаць трэба! Сіла трэба. На сілу сіла! І не чыкацца! Не міндальнічаць! Рашучасць трэба! Націск!.. Націснуць падаткамі! Судзіць злосных! Каб адчулі сілу!..» Ён ухваліў сябе, што добра распарадзіўся Харчавым...

Ад гэтых думак весялей было. Нібы ўбачыў наперадзе прасветліну, ясна ўбачыў, куды ісці, і ўбачыў, што дарога там абяцае яму добрае. Сам не заўважыў, як стаў хадзіць дужа, цвёрда.

У думкі ўнізалася вестка з пісьма: Лена пыталася, цікавіцца, шкадуе. У гэты момант напамінак пра Лену быў лагодны. Лена бачыла яго дужым, прыгожым. Няхай паглядзіць!..

Згадаўшы пісьмо, думаў нейкі час пра маці, пра Ніну, рашыў цвёрда: «Трэба забраць сюды. Забраць...» За гэтым ён намогся, павёў думкі на заўтрашнюю паездку. І раптам ва ўсю яго супярэчлівую турботнасць памяць увяла ўпарта яго новую глінішчанскую знаёмую. Нібы ўбачыў зноў, як яна схілілася да яго, льючы ваду; адчуў цяпло яе рукі, якую яна падала, вылазячы са склепа. Яна раптам нібы стала

перад ім. Яе вочы, кплівыя, незразумелыя, уся яна, незалежная, поўная годнасці, была, здалося, побач. І побач, і далёка.

Умомант апанавала дзіўнае: як не хапае яе тут. Яе воч, яе голасу, яе смеху. Усёй яе. У гэты вечар. У гэтую хвіліну. Здзівіўся, пашкадаваў: як ён так развітаўся з ёю? Чаму не прыгледзеўся, не распытаў хоць бы толкам?

Так захацелася пабачыць яе, пабыць з ёю, што ўзяла шалёная думка: сесці зараз у вазок ды махнуць туды. Зірнуць хоць. Ён тут жа стрымаў сябе цвяроза: прыхамаць дурная. Гэтага яму толькі не хапала. І наогул – што ён ведае пра яе? Хто яна?

Але развагі не даходзілі. Не знікала: яна павінна быць тут. З ім павінна была быць!..

Раздзел трэці

1

Башлыкоў выехаў з Юравіч зацемна, з такім разлікам, каб дабрацца да Алешнікаў у самым белым ранку. Калі яго вазок узняўся на гару, уся шырокая раўніна, што разлягалася перад ім, была шэрая, непраніклівая. Ішла ад гэтай шэрані ў душу неадольная панылая сумотнасць; толькі вецер, што налятаў тут, на абдзьмутай вышыні, як бы абяцаў штосьці абнадзейліваe.

Каля Вадавіч, як ён і спадзяваўся, стала прыкметна развідняцца. У гэтай парадзелай каламуці, што ўсё расступалася, вазок Башлыкова шухнуў цераз масток над Тур'ёю, паплыў па шляху паўз Глінішчы. Са шляху Башлыкоў мімаволі неспакойна і востра зірнуў туды, дзе павінна была быць глінішчанская школа. Разам з нядобрым, што засталося ад сходу, як ад павеву ветру, зачапілася ў душы зноў згадка пра нераспазнаную жанчыну. Спадзяваўся ўбачыць агеньчык з вокан, але яго не было. Можа, закрывала поле.

Толькі развіднела, калі ён выйшаў з вазка каля сельсавета. У сельсавеце быў адзін дзяжурны, ён, відаць, драмаў перад гэтым і, калі Башлыкоў, моцна гупаючы ботамі, абабіваючы снег, ступіў у пакой, сустрэў яго нібы вінавата. Глядзеў з незразумелай насцярожанасцю. Башлыкоў знарок весела патупаў па пакоі, пацiраючы рукі, паказваючы, што памёрз трохі ў дарозе, трэба сагрэцца, весела запытаў пра навіны. На людзях Башлыкоў заўсёды меў звычку трымацца весела і бадзёра. Дзядзька, аднак, трапіўся негаваркі, на пытанне Башлыкова адно няветліва аб'явіў, што Гайліс у Хвойным, па калектывізацыі, а сакратар пакуль не прыйшоў.

Ён павесялеў толькі тады, калі Башлыкоў загадаў яму паклікаць Дубадзела. Пажвавелы ўраз, усцягнуў на калматую галаву бараковую кучомку і, мякка ступаючы валёнкамі, выбег на ганак. Башлыкоў зноў захадзіў па пакоі, раз-пораз кідаючы позіркі ў акно на вуліцу. Ён чакаў Дубадзела з неспакоем: было б прыкра, калі б Дубадзела дома не аказалася. Дубадзел яму быў вельмі патрэбны. Яшчэ ўчора, думаючы пра гэту паездку, Башлыкоў згадваў Дубадзела, таму ён рашыў, што Дубадзел будзе ў гэтай паездцы пры ім. Башлыкоў хацеў прыгледзецца лепш да яго, прымерыцца, чаго ён варты. З Дубадзелам у Башлыкова былі важныя надзеі. Надзеі гэтыя трэба было праверыць.

Дубадзел быў дома. Башлыкоў убачыў яго, калі ён паявіўся перад акном – ішоў хутка, імкліва, так што крылы яго зашпіленага на адзін кручок шыняля разляталіся ў бакі. Разляталіся ў бакі вушы будзёнаўкі, што трымалася на макаўцы. Ногі ў разношаных ботах ступалі цвёрда, а на касцістым твары была рашучасць. Чалавек як бы спяшаўся на выручку і гатоў быў на ўсё.

Ён імкліва пратупаў па ганку, ступіў у пакой. Голасна прывітаўся, зычліва і разам з павагай назваўшы: таварыш сакратар. Руку, якую падаў Башлыкоў, пацісную моцна, як бы пацвярджаючы, што ў ім усё надзейна.

Башлыкоў зацягнуўся, зірнуў спасцярожліва:

– Трэба ў Курані.

У тым, як прамовіў, была значнасць. Значнасць была і ў позірку.

Дубадзел кіўнуў моўчкі і таксама значна: ясна. Твар дзелавіта засяродзіўся; шмаргануў прастуджаным носам.

– Зараз?

– А чаго ж? – Башлыкоў па-таварыску дадаў: – Адклад, кажуць, не ў лад.

– Аге, – шмаргануў носам Дубадзел. – Адкладуваць няма куды.

– От іменна. Так што – збірайцеся. Хутка.

Дубадзел ускінуўся, як па камандзе. Адазваўся ўмомант:

– А чаго тут сабіраць?

Рукі хутка, рашуча ўхапілі другі кручок на шынялі, зашпілілі, нацягнулі глыбей будзёнаўку.

– От толькі перакусім, – дадаў дзелавіта. – Паснедаем толькі...

– Вы не снедалі? – спыніў яго Башлыкоў.

– Да я ўжэ, канешно. Я пра вас. Жонка там умэнт...

Башлыкоў улавіў, што ў голасе яго тут не было цвёрдасці, не надта дабіваўся. Відаць, не вельмі верыў у снеданне сваё. Башлыкоў супакоіў:

– Я паснедаў ужо.

– Ну, тады – хоць зараз.

– Заедзьце дадому і паведаміце, – распарадзіўся Башлыкоў. – Каб не турбаваліся. Дні на два, скажыце…

Дубадзел рынуўся да дзвярэй.

2

Вазок хутка адкінуў назад рэшту алешніцкай вуліцы, павярнуў за вугал яе, рушыў да грэблі, да зараснікаў. Вымерзлая, наезджаная грэбля ўмомант дамчала да цагельні, і вось зачарнелі наперадзе ранішнія дымы над куранёўскімі стрэхамі.

У Башлыкове і дымы гэтыя, і стрэхі, нахмураныя, панурыя, хоць падбеленыя снегам, адазваліся неспакоем. Падыходзіла ўсутыч, уздымалася каменнай сцяной непадатнае, чужое, што належала зрушыць. І што не хацела зрушвацца.

Башлыкоў загадаў кіраваць да хаты Міканора Глушака.

Калі ехалі вуліцаю, чуў сябе пад маўклівым наглядам з двух бакоў. Пільна лавіў насцярожаную чарнату вокан, стракатасць двароў: і вокны, і двары былі амаль усе пустыя, вёска жыла, здавалася, бесклапотна, але ён добра ведаў, што спакой гэты зманлівы. Заўважыў, як выйшаў з хаты, застыў на ганку дзядзька, пільным вокам праводзіў, пакуль не схаваліся за рагом хаты. Двое жанок унізаліся позіркамі ад калодзежа, адна аж перастала цягнуць вочап.

Ад неспакою, ад адчування ўвагі падабраўся, сеў раўней, паставаю ўсёй выказваў рашучасць, смеласць. Бачыў: Дубадзел пажвавеў, выцягнуў шыю, нецярпліва і весела цікаваў за хатамі, за дварамі. Здавалася, трымаўся так, нібы адчуваў блізкую бойку і радаваўся ёй, ірваўся да яе. Гэтая вясёлая задзірлівасць была даспадобы Башлыкову. Перад двума радамі насцярожаных хат Башлыкову добра было чуць такую смелую ўпэўненасць, чуць побач чалавека, які ў любы момант гатоў быў памагчы.

Ля хаты Міканора Глушака Дубадзел першы саскочыў з вазка, рашуча пакрочыў да варот. Ужо ля варот ён схамянуўся, як бы стрымаў сябе, пачакаў Башлыкова, прапусціў яго наперад.

Ледзь ступілі на двор, на ганку паявіўся Міканор Глушак. Быў апрануты ў нефарбаваны, заношаны кажух, з заечай шапкай у руцэ. Падобна было: збіраўся кудысьці ісці, апрануўся за хвіліну перад гэтым. Глядзеў цікаўна, вочы на васпаватым твары былі

неспакойныя, пыталіся, чаго наведалася такое высокае начальства. З гэтым была ўсмешка на твары, лагодная, гасцінная.

– Сустракай гасцей! – прамовіў Башлыкоў, весела крочачы насустрач. Ён прыязна працягнуў Міканору руку.

Глушак спехам надзеў шапку, падаў сваю руку. Башлыкоў моцна, дужа пацiснуў яе.

– Угадалі! Заспелі дома! – сказаў Башлыкоў зноў, звонка, задаволена.

Ён узяўся абабіваць снег з ботаў, атрэсваць з паліто, з шапкі.

Гледзячы на яго, стаў абабіваць снег і Дубадзел, але без старання, абы-як. Нібы рабіў непатрэбнае.

Міканор няёмка, як належала, папрасіў:

– Ат, чаго тут... Заходзьце!..

У хаце было двое старых. Мужчына, седзячы на палацях, абуваў лапці, накручваў анучы, а старая замятала пры печы гліняную падлогу. Замятала, хапаючыся.

Башлыкоў тым жа звонкім голасам даў ім «добры дзень», працягнуў ружовую з марозу руку да старой. Тая, хапаючыся, выцерла сваю аб прыпол, як бы ўрачыста, лапатачкай падала яму. Рука яе была цёмная і касцістая, Башлыкоў пацiснуў яе асцярожна, з пашанай. Стары, завязаўшы абору, таксама ўстаў насустрач Башлыкову. На дужы поціск рукі сакратара адказаў ветліва, ахвоча.

Дубадзел растлумачыў, што гэта бацька і маці Міканора: Дамецік і Дамеціха – цётка Аўдоцця.

– Угадалі! Заспелі дома! – зноў сказаў Башлыкоў, ужо да старых. Завязваючы гаворку.

– Аге! – адразу адгукнулася Дамеціха. – То ж ужэ унь шапку ўзяў, сабраўся ісці! Кеб на мінуту пазней, дык і не було б тут!

– Не далеко сабраўся! – далучыўся Міканор. – Хазяйство паглядзець!..

Ён усё з цікаўнасцю чакаў адгадкі, чаго завітаў Башлыкоў. Такая ж цікаўнасць, толькі больш адкрытая, была відаць і ў старой.

Але над усім быў звычай, неадменны закон гасціннасці да чалавека, што ступіў у хату. Міканор запрасіў Башлыкова распрануцца, і старая з ухвалай падтрымала сына. Башлыкоў ведаў «закон», разумеў, што трэба было гасцінным гаспадарам паказаць сябе прыязным госцем, распрануцца, сесці да стала. Але не цярпелася, дораг быў час. Адно сеў да стала, расшпіліў верхні кручок паліто.

Глушак, пэўна, зразумеў настрой яго; аднак з сялянскай настойлівасцю паўтарыў, што просіць распрануцца, а маці распарадзіўся: накарміць гасцей. З дарогі людзі.

Маці падтрымала яго, але, адзначыў Башлыкоў, не надта цвёрда.

– Паснедалі ўжо, – сказаў Башлыкоў мякка і разам заклапочана.

– Калі тое було! – павёў сваё Міканор.

Башлыкоў даў зразумець, што ён не мае звычкі цырымоніцца, сказаў рашуча:

– Пройдзем па вёсцы. Тады – вернемся!

– Не зарабілі шчэ на снеданне! – весела кінуў позірк на Міканора Дубадзел. Ён зарагатаў. – Зарабіць трэба, ясно!

Трэба было ўсё ж, хоць трохі, аддаць належнае звычаям. Паказаць сябе перад гаспадарамі чалавекам, культурнаю істотаю. Башлыкоў затрымаўся ў хаце, дазволіў пабавіцца тут дзесятак хвілін. Да таго ж варта было лепш прыгледзецца да Глушаковага жытла, бацькоў яго.

За гэтым адразу пайшло галоўнае, турботнае: высветліць абстаноўку ў сяле, як яна бачыцца іх вачыма...

Седзячы пры стале, не выказваючы цікаўнасці, агледзеўся: хата маленькая, на адзін пакой, падлога з гліны. Можна сказаць, няма падлогі. Палаці, двое палацяў: сына і старых. Даматканыя коўдры. Вялікая скрыня – гонар сялянскіх хат на Палессі. Таксама, мабыць, з даматканым палатном, са святочнай вопраткай. На сценцы – партрэты Сталіна і Калініна. У кутку ўверсе – пуста, абразы зняты. Але ручнік вісіць, як даніна старому... На падаконніку – стосік кніжак. Брашуры... Дзе ж калгасныя дакументы? Пэўна, у скрыні...

Паветра было нясвежае, нячыстае. Нядобра, кісла пахла. Мусіць, у хаце кармілі свінню ці парася. І наогул у хаце не адчувалася чысціні, дбайнасці. Звыкліся. Башлыкоў набачыўся ўсякага, але ў апошнія гады ўсё ж меў свой пакой, звык да чыстага паветра, да ахайнасці. І тут, як і кожны такі раз, ён адчуваў, што горад – гэта горад, а вёска – вёска і што між іх ва ўсім адлегласць вялізная. Як два розныя светы. І адчуваў востра, нязменна, што ён – чалавек да драбніцы гарадскі, з таго, гарадскога свету. Ніколі не звыкнецца з гэтай чарнатой, нясвежым пахам. Трываць зможа, а звыкнуцца не звыкнецца.

Увайшоў з пугаю возчык, на запрашэнне Дамеціхі распрануўся, сеў каля Дубадзела.

Трэба было весці зычлівую гаворку.

– Як жа жывем, Аўдоцця Пятроўна? – пацікавіўся звонка, прыязна Башлыкоў. Імя па бацьку старой выпытаў ціха ў сына.

Тая на момант перастала завіхацца, азірнулася.

– Да як? Жывем.

Зноў адвярнулася да печы, стала чапялой гаспадарыць у глыбіні печы.

– Сын не крыўдзіць?

– Аге! – адказала насмешліва. – Е калі яму! Рэдко і відаць дома!..

– Нявестку б трэба, пэўна?

– Казала яму. Слухаць не хоча. Усё – дзело адно...

– Пары, можа, няма? – памог Башлыкову Дубадзел.

– Етаго цвету хапае. – Маці Глушака паставіла чапялу ў кут. Гаворка, было відаць, зачапіла за жывое. – Дзве было дабрэнныя. Адну, Хадоську, дак думалі ўжэ...

– Мамо! – перабіў Глушак-сын недаволька.

Але яна даказала сваё:

– Празяваў. Хоня забраў.

– Знайдзем другую, цётко! – весела паабяцаў Дубадзел. – І жэнім! У парадку парційнай дзісціпліны! – Ён зарагатаў.

Старой не спадабаліся і яго жарт, і яго рогат. Не тоячыся, нелагодна зірнула на Дубадзела; Башлыкоў заўважыў, што яна наогул не надта шанавала яго спадарожніка.

Не сказала нічога. Аднак спыніла гаворку, павярнулася да печы, узялася за вілкі. Стала гаспадарыць у печы.

Башлыкоў перачакаў, пакуль маці Міканора ўправілася ў печы, перабіў непатрэбнае маўчанне. Павёў гаворку пра тое, што карцела:

– Аўдоцця Пятроўна, скажыце, калі ласка: чаго гэта ў калгас у вашай вёсцы так туга ідуць?

Яна зірнула на Башлыкова, пільна, як бы з недавер'ем. Башлыкову здалося: позірк яе не верыў, што ён пытае гэта сур'ёзна, не ведае сам. Як бы павагаўшыся, адказала:

– Чаму? Баяцца.

– Чаго?

– Цёмны народ, – растлумачыў бацька Глушака, што звешваў ногі з палацяў.

– Як бы не ўскочыць у пельку, баяцца, – прамовіла яна, не слухаючы мужа, а выказваючы сваё. І ўсё быццам не верыла, што Башлыкоў гэтага сам не ведае.

– Чаго тут баяцца!

Маці Міканора нейкі час маўчала. Святло з печы ўскідвалася і ападала на яе твары, на плячы. Рухавы ад святла, у маршчынах, твар быў засяроджаны.

Міканор глядзеў на яе яўна занепакоена. Баяўся яўна нечага.

– Да і тое, – сказала яна задуменна, – вельмі хутко гоняць. А людзям – агледзецца хочацца. Прымерыцца.

– Хто ето гоніць? – абурыўся Глушак-сын. – Што вы кажаце, мамо!

Дубадзела, здавалася, пацешыў сынаў гнеў. Але ён не выказаў весялосці, строга папракнуў:

– Доўго думаюць, цётко!

– Абдумана ўсё, – заявіў Башлыкоў спакойна, паблажліва. – Па ўсіх пунктах. З усіх бакоў. Сур'ёзна абдумана. Можна не сумнявацца.

– Яно-то, пэўна, так, – кіўнула яна. Не то не вельмі паверыла, не то не хацела спрачацца. Далікатна, як бы тлумачачы, выказала: – Толькі ж не ўсе тое знаюць. Да і тое: у кожнаго ж свая галава е.

– У тым-то і бяда! – з'едліва адгукнуўся сын. – Да добра, калі ў каго шчэ разумная!

Башлыкову не давялося сказаць: тут у сенцах стукнулі дзверы і ў хату ступіў дзядзька ў кароткім кажушку і ў ботах. Чыста паголены, з вусікамі, ён з парога скінуў шапку, прывітаўся з усімі: «Здраствуйце». Упэўнена падышоў да Башлыкова, працягнуў руку, з выразнай пачцівасцю назваў: «Таварыш сакратар». Абышоў усіх, падаючы руку, назваў кожнага імем яго – бацькавым.

Справіўшы належна гэты абавязак, дзядзька зноў, з годнасцю, пакіраваў да Башлыкова, сеў побач. Дастаў капшук з-пад кажушка, стаў круціць папяросу. Па-сяброўску пацікавіўся ў Башлыкова:

– Рашылі, значыцца, пасяціць нашу куранёўскую глуш? Паглядзець, чым жыве-дыша ў глушы народ?..

Здавалася, ранейшая гаворка перарвалася зусім і будзе цяпер уладарыць іншая, тая, якую завязаў дзядзька – Андрэй Руды. Так яно нейкі час і было: папыхваючы папяроскай, далікатна пускаючы праз ноздры дым, Андрэй растарэкваў пра цемнату людскую, пра калектывізацыю – новы шлях для людзей, паказваючы, што і тут, у глушы, таксама не ўсе лыкам шыты.

Гаспадыня, здавалася, слухала яго і не слухала. То корпалася пры печы, то неспакойна думала. Было відаць: вярэдзяць старую нейкія турботы, не даюць спакою. Недавольна паглядвала на Рудога: трэба ж, прынесла не ў час балбатуна пустога.

– Да і ето, – адважылася нарэшце, нагадала пра перарваную размову, – гаворкі тут усякія. Пра раскулачанне...

Башлыкоў адвярнуўся ад Рудога, уважліва зірнуў на яе.

– Баяцца етаго. Не наравіцца ето, – горача выказала яна.

– Каму «не наравіцца»? – адразу напаў Глушак-сын.

– Людзям не наравіцца.

– Сказала!

– А то не? Не баяцца?

– Усе?! Кулакі, можа! Кулакам етаго трэба баяцца!

– Правільно, Дамецевіч! – з ухвалай кіўнуў Руды.

Дамеціха не паддалася сынаваму гневу. Нават як бы заўпарцілася.

– Брату на брата нагаворуваюць, – загаварыла галасней, зацята. – Сваяку на сваяка. Як бы кусаць адзін аднаго трэба!

– Кажаце вы, мамо!

Яна зазлавала, ускінулася:

– Дай сказаць людзям! Не з табой гаворацць! Слова ўжэ сказаць не можно!

– Гаварыце, да знайце што!

– Правільно, Дамецевіч! – заявіў важка Руды.

– Ты, Андрэй, прыйшоў, дак сядзі! Не лезь, куды не просяць!.. – Яна перавяла дыханне, заявіла сыну, усім: – Знаю! Праўду кажу!.. – Стрымала сябе, сказала цішэй: – От тут у нас сваяк е! Брат мой дваюрадны!

– Знайшлі брата!

– Брат! Халімон! Мая матка і яго бацька – сястра і брат родныя!

– Ето – пра Карча Халімона! Халімона Глушака! – растлумачыў Башлыкову Руды, задаволена пыхнуўшы папяроскай. Было відаць: страшэнна рады быў спрэчцы. Як цікаваму здарэнню.

Міканор з нянавісцю зірнуў на яго: знайшоў забаву. Трэба ж, прынесла ў такі момант, заўтра брахня пойдзе па ўсяму сялу...

– Аге, Глушак. Глушак Халімон, – пацвердзіла старая, у запале не заўважыўшы тону гаворкі Рудога. – Дак чаго ўжэ на яго! – Павяла шчыра, горача, верачы непахісна ў сваю праўду: – Мало таго што налогамі. Дак і ў калгас не пускаюць! Свет чалавеку завязалі! Так ето трэба?

– Сколькі ні талкую, не разумее нічого!

Міканор, ружова-чырвоны, няспрытнымі рукамі скруціў папяросу, схіліўся да Рудога, прыкурыўшы, патупаў да палацяў, сеў на іх. Згорбіўшыся, густа задыміў. Башлыкоў разумеў яго: Міканор Глушак, як на суддзю, глядзеў на яго, сакратара райкома. Быў разгневаны на маці і адчуваў сябе такім вінаватым, што гатоў быў на любую кару.

Так, было чаго хваляваща: зганьбіла старая, і перад кім, перад сакратаром райкома. Ды перад Дубадзелам, які яўна не спачувае, а як бы потай цешыцца.

– У адносінах да кулацкіх элементаў, Аўдоцця Пятроўна, – лагодна, стрымана сказаў Башлыкоў, – лінія ў нас цвёрдая. Кулацкія элементы мы лічым класавым ворагам.

– Які ён цяпер элемент! – старая зняважліва махнула рукой. – Толькі званне асталося – што багацей!

Дубадзел хацеў падчапіць жартам: не ведаў, што яна такая кулацкая заступніца, але старая не адазвалася на жарт.

Міканор Глушак, хапаючыся, нервова дыміў, ледзь стрымліваў гнеў.

– Падгаварыў ён вас, ці што! – У голасе яго з гневам чулася крыўда.

Башлыкоў улавіў: словы гэтыя былі як бы не толькі да яе, а і да яго з Дубадзелам. Можа, нават – больш да іх дваіх.

– Не можно – штоб брат на брата! – выказала яна зацята, непахісна.

Сын, угневаны, саскочыў з палацяў. Зірнуў злосна на старую, захадзіў нецярпліва.

Башлыкоў узняўся з лаўкі, сказаў, што пара ісці. Час не чакае.

Старая ўраз схамянулася, згадала пра абавязак гаспадыні:

– Дак калі вернецеся? Кеб знаць...

– От як вызвалімся, – няпэўна сказаў Башлыкоў. – Калі справу зробім...

– Дадзім знак як-небудзь! Калі прагаладаемся!

Старая няёмка папрасіла:

– Мо я што не так. То вы не сярдуйце... Я ад душы. Што думаю...

– Не сярдуем, – Башлыкоў паблажліва ўсміхнуўся. – Але з поглядамі вашымі не згодны...

Ён лагодна патрымаў старую за локаць, рушыў з хаты. На двары азірнуўся: усе выйшлі ўслед, нават стары стаяў, у сарочцы, без шапкі. Башлыкоў паклапаціўся перш пра яго: параіў вярнуцца, не прастудзіцца. Потым сказаў возчыку ісці ў хату, чакаць.

Заўважыў: Міканор Глушак лавіў яго позірк. Башлыкоў зрабіў выгляд, што не бачыць гэтага.

Калі выйшлі на вуліцу, Глушак не вытрываў.

– Падгаварыў, мабуць, гад, – сказаў вінавата. Як бы прасіў злітасціцца, зразумець. Дадаў злосна: – У сям'ю маю ўжэ ўлезці хоча!

– Васпітацельнай работай не займаешся! – укалоў знарок Дубадзел з рогатам.

Башлыкоў адвёў нялітасцівы позірк.

Чуў: Глушак пабойваецца нядобрага свайго сваяцтва, таго, што гэта вядома яму, Башлыкову. Так, трывожыцца ёсць чаго. Такое сваяцтва не ўпрыгожвае... Што там ні кажы, а сваяцтва ёсць сваяцтва. Сувязь. Сувязь з кулаком...

Было незадавальненне сабою: такога факта пра Глушака, пра актывіста, партыйца, не ведаў.

Праўда, віна тут найбольшая Глушака, але і сам вінаваты!

Не першы раз, як пра абрыдлае, непрыязна падумаў: «Усе яны тут перамешаны, паспрабуй разбяры!..» За гэтым як бы нанава пачуў плаканне-войканне старой, плаканне аб крывасмоку, узяло злое: жаласці дурной у людзей аж лішне! Крывасмокаў самых яўных то не судзяць, то – шкадуюць! І каб адзін-два, з дабраты шчодрай, а то ж – не ў адной вёсцы! Чуласць якая!..

Ён з прыкрасцю перарваў думанне, кінуў позірк да Глушака:

– З каго пачнем?

3

Глушак як бы не цяміў. Відаць, усё не мог супакоіцца. Схамянуўся нарэшце:

– Да от, к суседу можно.

Дадаў: адзін з тых, што ўпіраюцца асабліва. Дзяцел Васіль.

Пакіравалі да Дзятла.

Адразу, як ступілі на двор, ля новага зруба, трапілася пажылая жанчына. Ішла з хлява з пустым драўляным вядром.

– Эй, цётко, можно ў госці?! – Глушак як мог нагнаў на сябе весялосць.

– А чаго ж, – жанчына мелькам зірнула на іншых, прамовіла да Глушака: – Сусед, а рэдко заходзіш нешто...

Паяўленне нязваных гасцей выклікала ў яе клопатнасць, але яна схавала гэта. На прывітанне Башлыкова адказала ветліва, прыхільна.

– От госць з раёну, – сказаў Глушак, усё яшчэ з ранейшым хваляваннем і імкненнем разагнаць яго. Глушак назваў Башлыкова, і жанчына зноў зірнула на яго, з большай увагай і цікавасцю.

Запрасіла ў хату, першая падалася на ганак.

У хаце, каля палацяў, была яшчэ жанчына, паўнацелая, маладзейшая, з дзіцем на руках. Перад ёю паволі вяло калыску, што звешвалася са столі, – відаць, дзіця ўзяла з калыскі. Полаг на почапках калыскі быў адхінуты.

Башлыкоў і з ёй ветліва прывітаўся, але жанчына не адказала. Паглядзела на яго, кінула позірк на іншых, нядобра, спадылба. Вочы нібы судзілі: чаго прыперліся! Абвяла вачыма і адвярнулася.

Паказала, што ведаць не хоча.

Глушак, як бы і не бачыў маладой, з вясёлым тварам павярнуўся да першай, што паставіла вядро ў кут ля парога.

– От застаўляеце вы, цётко, начальство з раёну трывожыцца!

Башлыкоў прыкмеціў: маладая зірнула злосна, злосна адвярнулася. Лагодна перапыніў Глушака, дзелавіта спытаў у старой:

– Дзе гаспадар ваш?

Дубадзел паясніў Башлыкову, што чалавека ў цёткі няма, загінуў на вайне, гаспадарыць у цёткі сын Васіль.

– Ці дома ето Васіль?

– Дома, – кіўнула Глушаку старая. Момант як бы думала, разважала, не зусім упэўнена сказала: – У хаце новай корпаецца. Ніяк не ўлезем...

Дзядзька ў кароткім кажушку, што аказаўся і тут, варухнуўся быў кінуцца пазваць, але адумаўся. Рашыў, мусіць, што і тут старанне яго можа не спадабацца.

Старая выйшла. Пакуль не вярнулася, у хаце была негасцінная цішыня. Дзядзька ў кажушку не вытрываў, папракнуў маладую:

– Што ж ето ты, Маня, так нявежліво да гасцей? Спінаю, так сказаць...

Тая яшчэ нацялася, прамаўчала. Дзядзька гарэзліва падміргнуў Глушаку, Дубадзелу, пакруціў галавою: «От стварэнне!» Башлыкову прыйшло ў галаву, што гаспадар, не інакш, бачыў іх з новай сваёй будовы, не пажадаў бачыцца. Думаў, значыць, адсядзецца!

Башлыкоў павёў позірк па хаце: цесна, бедна. Як ва ўсіх беднякоў, ні аднаго ложка. Палаці, на палацях даматканае рыззё. Падлога, праўда, не земляная, але падгніла ўжо. Гнілыя вушакі ў акенцах. Сцены пакрыўленыя, гнілаватыя таксама. Па ўсіх прыкметах – век хаты нядоўгі. Як і ў іншых хатах – бруду даволі.

– От і хадзяін наш! – аб'явіла жанчына з парога.

Малады гаспадар, у світце, у лапцях, з парога павдароваўся, кінуў позіркам, запыніўся на Башлыкове. У тым, як паводзіў ён сябе, найбольш адчувалася годнасць, іменна яе ён выказваў тым, як спакойна зняў шапку, як стаяў каля дзвярэй. За гэтай знешняй упэўненасцю Башлыкоў, аднак, бачыў насцярожанасць. Позірк, прыкмеціў, быў пільны, нібы пытаў: чаго прыбылі! І ведаў загадзя: не для добрага.

Башлыкоў разумеў: дыпламатнічаць тут няма чаго. Пайшоў адразу напрасткі.

– Прыбылі мы да вас – даведацца, чаму не хочаце ісці ў калгас.

– Чаго ад народу адстаеш! – падмацаваў Башлыкова Дубадзел.

Гаспадар пераступіў з нагі на нагу, адвёў позірк. Адвёў з нудою: чуў ужо такое. І адказваў не раз. Чаго ж тут гаварыць попусту. Знарок зачапіў словы Дубадзела:

– Народ шчэ і там, і тут…

– Перадавы народ увесь там! – заявіў пераканана Дубадзел.

Гаспадар перамаўчаў яму. Перамаўчаў, было відаць, таму, што не хацеў пустой гаворкі, не таіў, што словы Дубадзела ні трохі не змянілі яго ўпэўненасці. Падобна было, што не надае тым словам ніякага значэння. Здавалася, што і самога Дубадзела не надта шануе.

Тут у хату ўвайшоў дзед, зняў шапку, пакланіўся. Лагодна з-пад белых броў агледзеў усіх. Башлыкоў думаў, што прыйшоў хтосьці з цікаўных суседзяў, але дзед, старэча горбячыся, зняў кажух, звыкла палез на палаці. З палацяў, цьмяна свецячы лысінай, ціха папытаў нешта старую, кіўнуў галавою. Башлыкоў улавіў, што глядзіць на яго. Разумным дапытлівым позіркам.

– Дак як ты, Дзяцел, на тое, што сказано? – прамовіў строга, патрабуючы, Дубадзел. – Чаму не ідзеш?!

Тон, якім ён гаварыў, добра паказваў, што далікатнічаць, валаводзіцца тут няма чаго. Трэба цвёрда весці сваё.

Маладая ля калыскі неспадзеўкі рэзка крутнулася. Твар яе скрывіла лютасцю.

– Сказалі ўжэ! Сто разоў казалі! – закрычала яна прарэзліва. – Чаго вы ўсё лезеце!

Гаспадар нядобра, строга зірнуў на яе:

– Не тваё дзело.

– Сходаў мало! – не паслухалася жонка. – Сходамі жыць не даюць! Дак шчэ і ў хату век!

Твар гаспадара скамянеў ад гневу.

– Не сунь носа! – узняў голас гаспадар. – Сказано!

У голасе яго чуліся сіла і цвёрдасць. Жонка зірнула на яго, недавольная, яшчэ поўная лютасці, але не запярэчыла. Не наважылася.

– Усё лезуць! – не вытрывала, прамовіла непрыхільна. Цішэй ужо, саступаючы.

– Тым часам, думаем пра ето ўжэ, – прымірэнча, разважліва ўступіў дзед ад палацяў.

У тым, як гаварыў дзед, адчувалася, што ён бачыць, што гаворка пайшла неразумна і нічога добрага з яе не будзе. Што без яго ўдзелу не будзе ладу ў гарачай і бесталковай спрэчцы маладых. У тым, як гаварыў і трымаўся дзед, бачылася, што ён наогул перакананы ў асаблівым значэнні сваім тут.

– Доўга думаеце, – з павагай, нібы становячыся ўпоравень з ім, як роўны роўнаму, зазначыў Башлыкоў.

– Доўго, – не запярэчыў дзед.

– Хутчэй думаць трэба! – параіў Башлыкоў з павагай і зноў як роўны з роўным. Нават непрыкметна для сябе пераняў яго лад гаворкі.

– Да яно б трэба. Толькі ж яно, – з давер'ем сказаў дзед, – тым часам, не просто так і рашыцца! Усё аддаць. Астацца ні з чым.

– Чаму ні з чым?! – здзівіўся Башлыкоў. – Усё ваша вашым і астанецца. Толькі што агульным стане.

– Аге, – кіўнуў дзед.

Башлыкову ў гэтым «аге» пачуліся цікаўнасць, разуменне, і ён стаў цярпліва, па-прыяцельску тлумачыць выгады агульнага гаспадарання. Дзед – Башлыкоў ведаў ужо, як яго завуць, казаў да яго пачціва «Дзяніс Ігнатавіч» – слухаў уважліва, ківаў згодна, ухваляў, падобна. Але абяцаў толькі адно: «Трэба падумаць».

Пільны Башлыкоў хутка зразумеў, што лагодны дзед, не інакш, хітруе, адводзіць гаворку ў спакойны кірунак. Змазаць хоча пытанне.

– Думаць цяпер ужо мала, – сказаў Башлыкоў цвёрда. – Дзейнічаць, рашаць трэба! Неадкладна!

Ён адвярнуўся ад дзеда, паказваючы, што ў яго не лішне часу, што чакае рашучых дзеянняў, патрабавальна зірнуў на маладога гаспадара.

– А што гаспадар «думае»?

Ён не таіў іроніі, знарок з націскам сказаў «думае».

Малады адразу, як адчуў увагу да сябе, нацяўся зноў, пастражэў позіркам. Выпрастаўся, нібы падрыхтаваўся да бойкі.

– А я пабачыць хочу, што з етаго ўсяго шчэ будзе, – заявіў без хітрыкаў, як бы з выклікам.

– Значыць, вы яшчэ сумняваецеся, што гэта – сур'ёзна?

– Пабачыць хочу.

Спрачацца, даводзіць, адчуваў Башлыкоў, было бескарысна. І ўсё ж, ледзь стрымліваючыся, паказаў, як гэта грунтоўна абдумана і праверана; абдумана партыяй, лепшымі галовамі, праверана мільёнамі людзей. Не першы раз, не першаму гаварыў гэта і не першы раз бачыў, што не даходзяць яго такія ясныя, пераканаўчыя доказы.

Як і многія іншыя, нібы не разумеў дарослы, сталы чалавек надзейныя, важкія факты! На шчырае слова Башлыкова ў адказ была тупая глухата.

Бачыў: позірк у гаспадара – упарты, тупаваты. Разумеў: марна даводзіць такому, не дойдзе да такога!

Башлыкова дурная глухата гэта паліла. Трываць не мог ён гэту няздатнасць разумець такі просты сэнс. Гэту дзікую ўпартасць. Каб трохі яшчэ, сарваўся б, нагаварыў бы нястрымных, гнеўных слоў. Але не хацеў паступацца годнасцю, даць ім адчуць перавагу іх. Стрымаў сябе.

Павёў позіркам па хаце, нібы нанава ўбачыў беднасць, убоства яе, гэтага іх «раю», які яны так аберагаюць; варухнулася цяжка, няцямна: чаго яны так чапляюцца за гэта?! Не мог уразумець гэтага. Падумаў ужо без горычы, апанавала раптам душу стома. Надакучыла, без меры надакучыла здзіўляцца глупству. Гаварыць адно і тое ж глухім...

У цішыні, што настала ў хаце, чулася варожасць.

– Мы не процію, не думайце, – азвалася зычліва і вінавата ад прыпечка старая. Яна глядзела Башлыкову ў вочы з трывогай і надзеяй, як бы прасіла яго злітасціцца. – Толькі ж, праўда, – асмеліцца трудно...

Яна верыла, што ён, такі дасведчаны, адукаваны, зразумее іх.

– Доўга вы асмельваецеся! – не паддаўся ёй, строга вымавіў Башлыкоў. Рэзка заявіў: – А мы чакаць не можам! Не можам!

Не таячы незадавальнення, нават знарок выказваючы яго, узняўся. Узняліся іншыя.

– Саветуем падумаць, Дзяцел! – з пагрозай параіў Дубадзел. Ён зірнуў так, як бы намякаў на нешта грознае.

Зноў апынуліся на двары. Башлыкову вастрэй кінулася цяпер: новая, з жаўтлявымі, старанна ачышчанымі бярвеннямі хата была не роўня старой – прасторная, з размахам. Трое вокан на двор, два пакоі – відаць у прарэз дзвярэй. Сенцы шырокія пачаты. Гэта ўжо іншая, не бядняцкая хата.

– Высніць трэба, адкуль лесу набраў! – зазначыў Дубадзел, перахапіўшы позірк Башлыкова. Намякнуў: – Колькі аплачано.

Калі выйшлі на вуліцу, Глушак вінавата паведаміў Башлыкову:

– Ета – жонка яго – кулацкага роду. – Дадаў з роздумам: – І сам ён, не сакрэт, з кулацкім нутром. Хоць ты цвёрдае давай...

Дубадзел як бы чакаў гэтага, падхапіў адразу ўпэўнена:

– А можно і даць!

Башлыкоў прамаўчаў. Але не запярэчыў.

Раздзел чацверты

1

Прыпыніліся: куды цяпер ісці. Глушак, не доўга думаючы, параіў – на край, пачаць з першай.

Башлыкоў згадзіўся.

Ступаючы побач з Башлыковым, паведаміў: гэты, калі б не Куліна, жонка, хоць цяпер гатовы ў калгас. Там усё жонка круціць...

Ужо калі ўздымаліся на ганак, Глушак сказаў раптам спакойна, абы сказаць:

– Ето хата той Ганны, што ў школе ў Глінішчах.

Сказаў так, што было відаць: не надае факту гэтаму нейкага значэння. Разумее, што Башлыкову ніякай цікавасці да гэтага, ён, можа, і не помніць ужо тую Ганну. Сказаў таму, што трэба было гаварыць, тлумачыць.

Башлыкоў і не сказаў нічога. Як бы не выказаў цікавасці да весткі. Зрабіў так, як належала. Але ў душы яго ўсё, што было перад ім, умомант зыначылася. Усё набыло раптам асаблівае значэнне, як бы зазырчэла ў неспадзяваным, яркім святле. На яго як бы абрынулася, апанавала яго моцнае хваляванне. Такое моцнае, што, здалося, не змог стрымаць, здалося, кінулася ўсім у вочы.

Добра, што ступілі ў сенцы, змрок іх памог ухаваць утрапенне. Даў момант, каб абвыкнуцца хоць трохі з неспадзеўкай. Мімаволі падумалася: трэба ж, каб так сышлося! Проста ў хату яе трапіць! Як знарок! За гэтым узяло вострае, новае: «А можа, і яна тут?!»

Хваляванне яго ўзяло новы кірунак. Сэрца забілася часта і трывожна прадчуваннем неспадзяванай, блізкай сустрэчы. Сустрэча гэта трывожыла асабліва таму, што чулася важнай яму і ён не быў, зусім не быў гатовы да яе.

Пільны, насцярожаны, ступіў ён у хату. Адразу ўхапіў позіркам: у хаце была адна пажылая, чырванатварая жанчына, што клапацілася пры печы. Як бы не верачы, агледзеў хату: у пакоі нікога больш не было. Ён на момант як бы ўзрадаваўся, адчуў палёгку.

Хаваючы толькі што перабытае, паважна, упэўнена прывітаўся. Жанчына, падгарнуўшы жар у печы, трымаючы чапялу ля ног, дапытліва і няцямна ўгледзелася. У позірку яе нелагодных, унізлівых вачэй было насцярожанае: чаго прыйшлі? Гэта, відаць, так турбавала, што не адказала на прывітанне.

– А дзе дзядзько? – са знарочыстай весялосцю спытаў Глушак.

– На печы... – нелагодна і, падобна, неахвотна прамовіла жанчына.

Дзядзька, мусіць, прыслухоўваўся да размовы. Пасля жончыных слоў на печы паказалася яго ўскудлачаная галава, потым і ўвесь ён, хударлявы таксама, у даматканых сарочцы і штанах, босы, з кручкаватымі жоўтымі пальцамі на нагах. Мелькам зірнуўшы на гасцей, павольны і спакойны ссоўваўся з печы.

– Што ж ето ты, Чарнушка! Сярод белаго дня! – папракнуў яго Дубадзел.

Чарнушка зніякавела паскардзіўся:

– Прастудзіўся недзе. – Нібы падмацоўваючы словы свае, сіпла закашляў: – Грэюся от.

Башлыкоў сачыў за ім з цікаўнай увагай. Звычайны селянін, якога ён упершыню бачыў, адразу вылучыўся сярод іншых: гэта быў яе бацька. Як і жонка яго, самы блізкі да глінішчанскай знаёмай незнаёмкі чалавек. Яна, тая загадкавая прысуха, была часцінкай гэтых людзей, у іх нібы таілася адгадка той загадкі, якая карцела яму.

Сочачы за дзядзькам, адзначыў мімаволі: тая, глінішчанская, мала падобная на бацьку. Толькі ў ладзе твару нешта блізкае, у позірку вачэй, спасцярожлівым, разумным. Але ў позірку гэтым няма той жывасці, неспакою, што раз-пораз пабліскваў ў вачах глінішчанскай красуні. З маці яшчэ менш падабенства. Здаецца, зусім няма... Побач з гэтым прайшло мімаволі: колькі зацятасці і непрыязнасці ў твары маці! Як бы загадзя папярэджвае: нічога добрага не чакайце!

Трывогі той, амаль страху, што момант былі апанавалі, ужо не ведаў. Сэрца білася ўпэўнена. Усё ж спакою поўнага не было. Хваляваў, даваў вастрыню адчуванням той факт, што гэта яе хата, яе звыклы свет. Ад таго з не абы-якой цікавасцю ўбіраў усё, што бачылася: пафарбаваная, сіняватая старая печ, прыладдзе для печы і венік у куце ля дзвярэй, кажух, кінуты на ложку. Ложак накрыты даматканай коўдрай. Вазоны ў абодвух вокнах, што на вуліцу. Стары, учарнелы стол без настольніка, з непрыбранымі міскай і лыжкамі. Абразы ў куце, здаецца, нyветліва ўзіраюцца ў няпрошаных гасцей... Небагатая, нават – бедная сялянская хата. Кожная рэч у ёй, здаецца, гаворыць пра кепскі дастатак, пра затхлую даўніну, затхлае жыццё.

Гэта дадавала ў адчуванні Башлыкова супярэчлівасці: неяк цяжка было паверыць у тое, што бачыў сваімі вачыма – што тут, у гэтай беднасці, гэтай затхласці, гэтай нікчэмнасці, магла яна нарадзіцца, жыць! Тое, якой ён яе бачыў і помніў, так не пасавала з

гэтым, што не ядналася ў адзін свет, ён нібы не мог уявіць яе сярод усяго гэтага. Не мог нават нібы згадзіцца, што такое магло быць.

Гэты факт меў і іншае, добрае значэнне. Тое, што яна не дзе-небудзь, а іменна тут жыла, адсюль выйшла, значыла, што ў яе годнае, блізкае паходжанне. Вядома, паходжанне яе не пралетарскае, не рабочае, але ўсё ж – працоўнае і, як можна бачыць, бядняцкае. Гэты факт значыў, што яна блізкая яму па становішчы, у адных з ім шэрагах. Ён, Башлыкоў, канешне, і не думаў, што яна памешчыцкая дачка, памешчыкаў даўно няма, але магло ж здарыцца, што ў становішчы яе ёсць якая-небудзь закавыка, якая б сапсавала ўсё адразу. Бывае ж такое тут ледзь не на кожным кроку... Не прызнаючыся сабе, пабойваўся гэтага: тым больш што ў глінішчанскай знаёмай чуліся нейкая ганарлівасць, непадступнасць. На шчасце, падазрэнне гэта адпала...

У тым, што хвалявала Башлыкова ў гэты момант, было і яшчэ адно, прытоенае. Ён стрымліваў гэта, як не вартае яго, але яно ўсё ж было і ўсё ж цешыла. Тое, што яна выйшла з такой беднасці, з такой чарнаты, што ён бачыў гэта, можна сказаць, дакранаўся сам да гэтага, рабіла яе ў яго вачах больш звычайнай, блізкай. Як бы там ні было, ад той сустрэчы ў Глінішчах жыло ў Башлыкове неадольнае захапленне ёю, адчуванне нейкай нібы незямной завабнасці, нават нібы недаступнасці. Смешнае, хлапечае пачуццё, дзіўнае ў сталым чалавеку, адказным работніку. І вось бачыў сам, сваімі вачыма: зусім зямная, падобная на іншых, нават звычайная. Даступная.

Поўны супярэчлівых адчуванняў, пільным позіркам вылучыў картку на сцяне ў самаробнай дубовай рамцы. Зацікавіўся ўмомант: на картцы было двое, мужчына і жанчына, маладыя, побач. Працяла здагадка: яна з некім, ледзь не ўстаў, не ступіў бліжэй. Стрымаўся, прыгледзеўся зводдалек: на здымку былі бравы, з круглай мікалаеўскай фуражкай, з пагонамі салдат і танклявая, у белай кофце і доўгай спадніцы жанчына. Даўняя, пажоўклая ад часу картка і мікалаеўская, набок, зухаватая фуражка сведчылі, што здымку багата гадоў.

Але танклявая маладая жанчына здалася дзіўна падобнаю на Ганну. Хто гэта?

Гадаючы пра гэта, узрушаны яшчэ ўбачаным і адчутым, Башлыкоў цяжкавата сачыў за тым, як Глушак цырымонна, па-сялянску падступаўся да гаспадароў, тлумачыў, чаго зайшлі.

Дубадзел, што нецярпліва і з гаспадарскай упэўненасцю пахаджваў па хаце, не вытрываў глушакоўскай цырымоннасці, перабіў яго, аб'явіў адразу:

– Адным словам, явіліся выясніць: чаго ў калхоз не ідзеце?

У тым, як ён гаварыў, было не так пытанне, як патрабаванне адказаць, адкрыта і ясна. Было і абвінавачанне: чаму валаводзіце ў гэтай, такой простай справе?

Стары, падобна было, і наогул чуў сябе ніякавата ад таго, што засталі на печы, горбіўся, адводзіў вочы. Пасля Дубадзелавых слоў ён, здалося, яшчэ больш угнуў плечы, унурыў позірк. Хвіліну было цягучае, звыклае ўжо маўчанне. Тады стары неспадзявана ажыў, усміхнуўся, дзіўна, па-змоўніцку да гасцей: як бы пасмейваючыся з імі. Вясёлым вокам павёў да печы, да жонкі.

– Да я хоць сягоння гатовы, – прамовіў хітравата, нібы бесклапотна. – Хоць зараз. Калі яна скажа, што згодна. Угаварыце яе!..

У позірку яго, у манеры гаварыць мільгнула Башлыкову знаёмае: так мела звычку паглядваць, гаварыць тая, глінішчанская, яго дачка. Старая ля печы, чырвоная, злосная і да таго, зіркнула на мужа так люта, што і Башлыкову стала не па сабе. Разгневаная, усхапіла чапялу, што трымала, з такім рашучым выглядам, што было відаць – не завагаецца ні на момант. Чарнушка адразу спрытна ўскочыў. Сур'ёзны, пагрозны, папракнуў:

– Ну, здурнела! Гасцей пасаромейся!

Мяркуючы па тым, як яна глянула на Башлыкова, толькі дзякуючы яму чапяла затрымалася, стала зноў на падлогу. Але старая дала волю гневу свайму:

– Ён хоць сягоння гатовы! Угаварыце яе! Гаспадар, няма чаго! Сам гатовы распетрыць усё! «Хоць зараз аддам усё!..» Кепікі яшчэ строіць!

Чарнушка, мусіць, каб не рызыкаваць больш перад гасцямі, адно прамовіў з папрокам:

– Чаго там распетруваць!..

Старая, разгневаная, не глядзела на яго. Худыя грудзі хадзілі часта, неспакойна.

Дубадзел, што сярод хаты сачыў за ўсім весела, як бы забаўляючыся, – на што аптыміст, а зазначыў важка, без радасці:

– З тваёй жонкай, Чарнушка, чорт не згаворыцца! – Ён, аднак, тут жа змяніў тон гаворкі: не яму было паказваць кволасць, ды яшчэ перад Башлыковым, дадаў нібы жартам: – Дажджэцца яна, што прыпаяем цвёрдае!

Жанчына ці не разумела жартаў, ці ведала, што значыць жарт Дубадзела, зірнула люта на яго, урэзала:

– Цвёрдае! Его нам цвёрдае?! Кеб у цябе язык папух, за такія твае словы!

Яна ў запале вельмі спрытна далучыла да гэтага яшчэ некалькі, такіх жа ласкавых і шчырых пажаданняў.

Было відаць: старая не ведае, што такое далікатнасць. Зацятая, было відаць, і смелая: стоячы за сваё, ні перад чым не спыніцца. Дубадзел, ці то таму, што добра ведаў старую, ці таму, што лічыў не годным паступацца перад жанчынаю, адказаў ёй рогатам: нібы ўхваліў спрыт пажаданняў. Паказаў, што не крыўдзіцца.

Усё ж надышла нядобрая няёмкасць. Няёмкасць гняла і Башлыкова, яго, можа, нават больш, чым іншых. Усё тое, што ён адчуў ад старой, маці яго завабнай знаёмай, так не пасавала з усім тым, што ад сустрэчы ў Глінішчах было ў душы. Гэтае так груба таптала тое кволае, добрае, што чулася яму як абраза яго шчырым пачуццям.

Абражаны, Башлыкоў не знаходзіў той цвёрдасці, якая прыходзіла заўсёды ў такі момант. Тое, што перад ім быў не нехта чужы, а самы блізкі чалавек загадкавай глінішчанкі, зыначвала, блытала ўсё.

Глушак, відаць, лічыў сябе асабліва вінаватым за нядобры лад гаворкі: як-ніяк, такое было ў яго вёсцы. У вёсцы, за якую ён фактычна адказваў перад райкомам як адзіны партыец і старшыня калгаса. Таму натуральным было, што ён рашыў выправіць становішча. Глушак палічыў самым надзейным сродкам ласкавасць.

– З цёткай Кулінай мы згаворымся, – прамовіў ён па-таварыску, мусіць, тым тонам, якім гавораць добрыя суседзі.

Жанчына, аднак, не адгукнулася на гэту хітрасць. Лісліваць, што чулася ў голасе Глушака, яе нават запаліла. Яна з дзіўнай радасцю абрэзала:

– Ты сваю матку ўгавары спярша!

Быў у яе словах нейкі намёк. Улавіўшы гэта і, пэўна, зразумеўшы, што гэта адчулі і другія, Глушак занепакоіўся, але зрабіў выгляд, што ў словах Чарнушчыхі няма нічога.

– Чаго яе ўгаворуваць? – нібы здзівіўся ён. – Яна ўжэ ўступіла...

Здзіўленне яго было такім няшчырым, так чулася ў ім трывога, што гэта было відаць усім. Ён, няйнакш, хацеў годна адступіць, не ганьбячыся перад гасцямі.

Лепш бы ён перамаўчаў старой. На яго словы Чарнушчыха зноў ускінулася.

– Аге! – згадзілася яна радасна-з'едліва. – Уступіла! Улезла! Да не знае, як вылезці!

– Што ето вы кажаце, цётко? – Глушак гаварыў зноў няшчыра і мірна, як бы прасіў перамаўчаць. Не сарамаціць перад чужымі.

– Што кажу! А што сяло ўсё чуе! – Не жадаючы гаварыць марна, яна змяніла кірунак размовы. Каб адразу выказаць усё, заявіла непахісна: – І слухаць не хочу пра ваш калгас!

Тут уступіў у спрэчку Башлыкоў. Роўным, стрыманым тонам, з упэўненасцю чалавека, які багата больш ведае і разумее, папракнуў за баязлівасць, за тое, што верыць варожым плёткам. Сказаў, што мільёны працоўных сялян адкінулі паклёпы кулацкіх элементаў, смела пайшлі па калгаснай дарозе. Што мільёны людзей пераканаліся ўжо на жывым вопыце ў перавагах калгасаў. Выбраліся з галечы, з голаду.

– Хто выбраўся, а хто – улез! – адрэзала нецярплівая жанчына.

Сказала так злосна і непахісна, што было відаць: гаварыць з ёй далей марна. Усё ж Башлыкоў з цярплівасцю, на якую толькі быў здатны, павёў гаворку далей. Паспрабаваў пераканаць, што страхі іх – дарэмныя, што трэба смела выходзіць на новы прастор. Гаварыў то да старой, то да Чарнушкі – Чарнушка, звесіўшы ногі з палацяў, горбячыся, слухаў з пільнай цікавасцю, старая ля печы камянела нерухома. Не таіла, знарок паказвала, што чуць нічога не хоча.

Зацятая злосць і глухата старой панурым ценем захмарылі ўсё, што ўвайшло ў душу Башлыкова ў гэтай неабыякавай яму хаце.

Нарэшце цярплівасць яго скончылася, ён важка ўзняўся з лаўкі. У яго было брыдкае адчуванне бяссілля і нібы зняважанасці, яны асабліва хвалявалі яго ў гэтай хаце. Стараючыся адолець прыкрасць, паказаць як мае быць сваю годнасць, ён строга, з намёкам параіў старой, Чарнушку добра падумаць над тым, што ён сказаў. Тон, якім ён гаварыў, паказваў: гэта вельмі важна. Каб не шкадавалі потым.

Даў стрыманае «да пабачэння» і цвёрда рушыў да дзвярэй. На ганку зіхнула шырокім святлом снежнага дня, дыхнула марозам. Башлыкоў маркотна, няцямна акінуў вузкі, убогі двор, падумаў стомлена: як яна вырасла такая тут, у глухамані, у затхласці гэтай!.. Акінуў неўразуменным позіркам двор, пакіраваў на вуліцу.

За веснічкамі Дубадзел, што выйшаў першы, пачакаў яго, пакрочыў побач, дужа, бадзёра пагойдваючыся ў хадзе. Зірнуўшы на заклапочаны твар Башлыкова, здагадліва зразумеў настрой таго, адгукнуўся па-сяброўску:

– Ету разгаворчыкамі не возьмеш! Етай трэба другое срэдство!.. Меры трэба!..

Глушак гойдаўся з другога боку, маўклівы, з вінаватым тварам. Башлыкоў не дзівіўся: было чаго адчуваць вінаватым. Не дзівіўся і не

спачуваў Глушаку: заслужана атрымаў. Глушак, як бы дабіваючыся вярнуць страчаную дружбу, выказаў раптам горача, гнеўна:

– Злая жмінда!.. Ето ж, – паведаміў шчыра, – з-за прагнасці сваёй Ганну выпхнула з дому! Жыццё дзеўцы пакалечыла!

Вестка гэта працяла панылае думанне Башлыкова, ён кінуў зацікаўлены позірк на Глушака. Вунь што! Вунь чаму яна ў Глінішчах! – адкрыў ён адну з загадак. У ім зацеплілася спачуванне. Башлыкоў, аднак, тут жа нагнаў строгасць на твар, паказаў, што турбуецца іншым, галоўным, і Глушак перамаўчаў.

Не адгукнуўся на Глушакову вестку і Дубадзел. Не да таго было: падышлі да новага двара.

2

Праз некалькі хат натрапілі на застолле.

На стале, пасярод яго, круглілася чорная скаварада з недаедзенай яечняй. Побач былі глыбокая гліняная міска з мокрымі агуркамі, кацялок з бульбай у мундзірах, паўбохана хлеба. Мутна значыліся дзве пустыя шклянкі.

Бутэлькі на стале не было. Пэўна, прыхавалі спехам, пакуль яны, госці, ішлі па двары, у сенцах.

Было відаць: не ў час прыбіліся.

У хаце было траіх. Адна, старая, сухая, корпалася пры печы. Двое другіх гаспадарылі за сталом, яны найбольш кідаліся ў вочы. Асабліва ўпадаў у вочы той, што быў насупраць: чырвоны, з сальным водбліскам на лбе, на шчоках, здаровы, горбіўся над сталом магутнай глыбай. З-пад нізкага лба дробныя вочы глядзелі нядобра, тупавата. Башлыкову мімаволі падумалася: сустрэнешся з такім у лесе – аднаго выгляду напалохаешся. Другі на першы погляд не вылучаўся нічым: нярослы, сухаваты, у старым пінжаку, у расшпіленай сарочцы, здаваўся вельмі звычайным. Заўважаўся хіба позірк: светлыя, з-пад чуба, вочы глядзелі востра, пранізліва.

– Здароў, Ларывон! – сказаў Глушак асобна, калі прывіталіся з усімі.

Ларывон зірнуў нібы з недавер'ем, не адказаў. У тупым позірку паявіўся цяжкі роздум.

– Здароў, – выціснуў неахвотна, пільна ўтаропіўся.

Башлыкоў успомніў мянушку Ларывона, якую яму сказаў Глушак: «Бугай». Падумаў з ухвалай: «Дакладна назвалі. Бугай і ёсць».

– Угашчаецеся? – ці то проста адзначыў, ці то папракнуў Дубадзел. Голас быў звонкі, гаспадарскі. – Свята якое?

– Свято, – адказаў Бугай з насцярожанасцю і з выклікам. Башлыкоў прыкмеціў: Бугай павёў позіркам да таго, у пінжачку, з чубам. Павёў позіркам не проста так, а нібы пытаючыся.

Глушак помніў сваю ролю, выказваючы тонам голасу належную значнасць моманту, назваў Башлыкова, яго пасаду. Потым, павярнуўшыся пачціва да Башлыкова, сказаў пра гаспадара: Ларывон Глушак. Тут Міканор затрымаўся, вагаючыся, мусіць, знаёміць ці не знаёміць з Ларывонавым госцем. А можа, разважаючы – як яго назваць.

Той, у пінжачку, унізаў востры позірк у Міканора Глушака, пачакаў з выразнай насмешкай. Устаў, з гуллівым выразам на твары пакланіўся:

– Яўхім Глушак. Сын Халімона Глушака.

У тоне, якім ён назваўся, пад гуллівасцю таілася значнае, сур'ёзнае.

«А-а, вось ён!» – Башлыкоў не ўхаваў цікавасці, прыгледзеўся: асоба гэта завочна даўно была вядома сакратару райкома. І неабыякаваю была. Таму першым адчуваннем была цікавасць: а, вось які ён знешне. Гэта прабівалася праз даўнюю і трывалую непрыхільнасць да яго, кулацкага сынка, па вестках, якія даходзілі да Башлыкова – небяспечнага тыпа. Тое, што цяпер бачыў Башлыкоў, не мяняючы нічога, дапаўняла ўсё, што ён ужо ведаў, рабіла больш наглядным, жывым. Такою была цікавасць, з якою Башлыкоў глядзеў на Глушака.

Услед за гэтым Башлыкоў адзначыў уважліва, як пранікліва гэты кулацкі выкармак выкрыў сэнс Міканоравага вагання і як спрытна знайшоў, што сказаць. Умомант зразумеў, што ад яго трэба. Здагадлівы проста надзіва. І разумны, відаць. Па-свойму, вядома, разумны.

«Халімона Глушака сынок. Яс-сна».

Яўхім Глушак нібы ведаць не хацеў, што там пра яго могуць разважаць. З той жа насцярожлівай гуллівасцю глянуў да печы, з дзіўнай, задзірлівай весялосцю сказаў:

– Цётко, што ж вы ето! Не прыглашаеце гасцей за стол! – Ён павярнуўся да Ларывона, крутнуў галавой і з дакорам: – І ты, Ларывон!

– Аге! – адразу азвалася старая. Мітуслíва ўзялася перавязваць фартух, як бы паказваючы, што зараз гатова старацца для гасцей.

Ларывон не зварухнуўся, утаропіўся ў Яўхіма Глушака п'яна, няцямна: як бы хацеў зразумець нешта і не мог.

– Такія госці прыбулі! З самаго раёну! – Яўхім Глушак гаварыў без лісліваcці і без насмешкі, нібы тлумачыў абоім: – Можно сказаць, першы чалавек у раёне. І – сваё начальство! – Тут Глушак кіўнуў на Дубадзела.

Пры апошніх словах, улавіў Башлыкоў, зноў пачулася гуллівасць. Гуллівасць была такая, быццам кулачок падсмейваўся з Дубадзела. Быццам лічыў сябе роўным з ім.

Ларывон Бугай кінуў позірк на Яўхіма Глушака і раптам дзіўна павесялеў. І позірк быў вясёлы, гарэзны, як бы змоўніцкі; здалося, паказваў дружку: зразумеў усё, падтрымаю.

Чырвоны твар распоўзся дурнаватаю ўсмешкаю. Дужа ўзняўся, шырока павёў рукою з тоўстымі, нібы распаранымі, пальцамі. Нахабна-шчодра аб'явіў:

– Давайце!.. Прыглашаю ўсіх!..

Башлыкоў паглядзеў на яго са знішчальнай строгасцю, хацеў асадзіць адразу, адкінуць недарэчныя жарцікі. Адрэзаў строга, годна:

– Дзякую. Але мы прыйшлі па справе.

– А што, за сталом хіба не робяць справы? – адгукнуўся адразу той, у пінжаку.

– За сталом толькі і робяць! – падхапіў Ларывон. – Усякая справа за сталом – як па маслу! За яечняй ды з чаркай – адразу йдзе!

Ён зіркнуў на Глушака, як бы чакаючы ўхвалы, голасна зарагатаў. Адчувалася, здаравіла гэты ва ўсім слухаўся таго, дружка. Той кіраваў ім.

Глушак не падтрымаў рогату, і Ларывон сціх.

Тут у гаворку ўступіў Міканор Глушак: адчуў, што настала яго пара. Важна, вельмі недавольна, як бы судзячы, папракнуў:

– Чаго з калгасам валаводзіш? Заяву не падаеш!

Ларывон знарок пачухаў патыліцу. Ашчэрыўся задзірліваю, нахабнаю ўсмешкай:

– Няграматны я. Пісаць не ўмею.

Міканор не адказаў на ўсмешку, але падхапіў яго словы:

– Дак, можа, – памагці? Напісаць табе?

– Не трэба, – адказаў ён цвёрда. Потым паспрабаваў зноў нібы пажартаваць: – От сам вывучуся...

– Доўго сабіраешся! – аб'явіў упэўнена Дубадзел. У тым, як ён сказаў свае словы, здавалася, быў яшчэ важны, недагавораны сэнс.

– А хіба трэба канешне хутко? – Ларывон, адчувалася, не хацеў адступацца ад свайго тону. Стараўся трымацца малайцом. Нават пакпіў: – Ці вы баіцеся не ўправіцца?

– Каму, можа, і трэба баяцца, – адказаў рэзка Дубадзел, зноў быццам прытаіўшы важнае, з якім лічыцца трэба. – Толькі не нам. Нам баяцца няма чаго. Цягнуць не хочацца. Ясно?.. Дак як?

Пытанне Дубадзела было грознае. Ларывон сцёр усмешку.

– Што вам канешне я? – сказаў ніякавата. Ён глянуў на дружка, які быццам не бачыў нічога. – У вас ужэ і без мяне багато. Хапае без мяне... А я і граматы не знаю...

– Хваціць граматы! А не хваціць – навучым! Бо ты ж, мабуць, араць, сеяць не вучаны! – паіранізаваў Дубадзел.

Ларывон прамаўчаў.

Башлыкоў адчуваў, што ва ўсім тым, што гаварыў і як трымаўся Ларывон, мела значэнне, што побач быў друг яго, Яўхім Глушак. Ларывон усё рабіў так, каб выглядаць малайцом перад другам.

Друг жа, можна было падумаць, вельмі спакойна сачыў за ўсім, што было з Ларывонам. Выглядам сваім паказваў: тое, што гаварыць і як паводзіць, – клопат аднаго Ларывона, нікога больш не датычыцца. Башлыкоў, аднак, бачыў, што слухае і сочыць за ўсім Глушак гэты неспакойна, нацята. Толькі стрымліваецца, тоіць. Умее стрымлівацца. Па ўсім відаць, характар дужы. Відаць: цану сабе ведае. Цэніць сябе высока. Больш, чым трэба, няйнакш...

Башлыкоў быў упэўнены, што бачыць яго навылёт. Не з такіх Башлыкоў, каб надта даверыцца таму, што бачыцца звонку. Ды і звонку пільнае вока нямала прыкмеціць можа. Тоіцца Глушак, але выдаюць яго вочы. Не-не ды і пакажуць, што там на душы. Цікаўнасць і непрыязнасць там, схаваныя. Апасліва схаваныя. Башлыкову такое вядома ўжо. Не адзін раз прыкмячаў такое ў іншых.

Яўхім Глушак, аднак, раптам засмяяўся адкрытай, задзірыстай усмешкай. Задзірыста запытаў Дубадзела:

– Дак, можа, і мяне возьмецеся навучыць грамаце?

Дубадзел памаўчаў строга. Засунуўшы рукі ў кішэні шыняля, стаяў недаступны, непахісны. Паказаў, што не ўхваляе такога несур'ёзнага тону з такім пытаннем. Прамовіў важка:

– З табой не возьмемся. З табой асобы разгавор.

– Чаму ето?

– Ты знаеш.

Глушак раптам парывіста павярнуўся да Башлыкова. Башлыкоў убачыў проста перад сабой яго вочы: яны глядзелі востра, патрабавальна.

– А мяне чаму не завеце? – сказаў ён ціха, з выклікам.

Позірк быў такі смелы і ў тоне была такая ўпэўненасць, што Башлыкоў мімаволі прыгледзеўся: як бы нанава пазнаваў чалавека ў пінжаку. Як бы ўбачыў толькі што.

Башлыкоў не быў чалавекам вельмі ўражлівым. Усяго нагледзеўся і да ўсяго быў гатовы. І ўсё ж тое, з якой смеласцю, нават нахабнасцю глядзеў і пытаў гэты выкармак, адзначылася ў ім. Нібы судзіць, нібы загадвае!

Было ў тым, што адчуваў Башлыкоў, яшчэ адно: вось ён, адкрыўся сваёй сапраўднай сутнасцю, кулацкі выкармак. Паказаў сваё аблічча. Выказаў жаданне сваё.

«Чаму мяне не завеце?» Чаго захацеў!

– А я – пайду! – сказаў Глушак, нібы задзіраючыся. – Зразу пайду! Ей-бо! От хоць цяпер!

Па тым, як ён глядзеў і казаў, Башлыкоў адчуваў: пойдзе!

Башлыкова не дзівіла гэта: сярод такіх нямала ўжо бачыў, што гатовы былі. Толькі чаму гатовы былі, дзеля чаго? Гатовы – таму, што хацелі ўхавацца ад падаткаў, цёпла ўладзіцца, зашыцца. Каб дачакацца зручнай пары. Каб шкодзіць знутры.

– Пайду! Толькі скажыце!

– Ведаю, – дасведчана, лядзяна аб'явіў Башлыкоў.

– Не хочаце!

– Не хочам.

– Чаму? – наступаў Глушак. – Я здам усё! Рабіць буду, як усе. Старацца буду. – Позірк яго ўсё вастрэў. Усё нецярплівей унізваўся ў Башлыкова.

– Старацца вы будзеце, – губы Башлыкова працяла з'едлівая, мудрая ўсмешка. Уся іронія яго была ў гэтым «старацца».

– Старацца буду! – зацята вёў сваё Глушак. З рашучасцю, як самае пераконлівае, выказаў: – Што я, жыць не хочу?

Башлыкоў падхапіў гэта:

– Іменна таму, што жыць хочаце. Па-свойму! Па-кулацкі!

Ён сказаў з нудою на твары і з нудою ў голасе. Сказаў і адвярнуўся, паказваючы, што кончыў непатрэбную балбатню.

– Не хочаце! – пачуў ён.

Глушак прамовіў гэта так цвёрда і з такой нястрымнай злосцю, што Башлыкоў азірнуўся.

Іх позіркі сутыкнуліся. У вачах Глушака гарэла такая лютая нянавісць, што здавалася: ён любы момант можа кінуцца, учапіцца рукамі ў шыю.

– Не хочаце! Куды ж мяне? Куды ўсіх нас? На падсцілку! На гной! Ці – як вошы, пад ногаць!

Па тым, як казаў ён, Башлыкоў адчуў, што гэта – невыпадковае. Перадуманае. Што яно збіралася не сёння і вось – вырвалася.

І ад таго, што ён бачыў, якая лютасць за гэтым і якая смеласць у вачах кулацкага выкармка, ён адразу зразумеў, як небяспечны гэты тып. І як неабходна ўжыць належныя захады, каб яго абясшкодзіць.

Ён павёў гаворку з Ларывонам. Стараўся гаварыць разважна, стрымана, але ўзрушанасць не адступала. З ёю ён і пакрочыў з хаты.

На вуліцы ён увесь час адчуваў на сабе ненавідны, бязлітасны позірк Яўхіма Глушака. Недарэчна падумалася, што, калі з такім трапіцца сустрэцца на дарозе адзін на адзін!

Тады прыйшла іншая, цвярозая думка, важнасць якой ён адчуў адразу: вось такія тут і верхаводзяць! Разумеючы нядобрае значэнне гэтага факта, Башлыкоў падумаў турботна: «Чаму ён расхаджвае на волі?»

3

Яшчэ адна сустрэча выдалася асаблівая.

Ігнат Глушак – вядома ж, Глушак, – хударлявы, нервовы, лысы, з нейкай дзіўнай іроніяй ківаў, калі Міканор, Дубадзел, а потым і Башлыкоў тлумачылі прычыну прыходу, папракалі за адсталасць.

Да пары да часу маўчаў, ківаў лысаю галавою, а вочы, пільныя, хваравіта-неспакойныя, сцераглі, высочвалі і ўсё свяціліся іроніяй. Нібы паказвалі: вось слухаю, чакаю, калі разумнае што пачую, а няма ўсё, няма...

Не вытрываў хутка, рынуўся, запалены:

– От зганяеце ў гурт!..

– Не зганяем, а арганізуем, – адразу паправіў Башлыкоў. – У калектыў.

– Ну добра – арганізуеце. Зводзіце, нібыто. А хто – над гуртам... над калектывам будзе?

– Каго выбера агульны сход калгаса. – Башлыкоў без усмешкі дадаў: – Могуць і вас выбраць.

Ігнат зіркнуў строга, заявіў:

– Хрэн вы мяне, нібыто, паставіце!

– Паставім, калі выберуць! – Башлыкоў гаварыў такім тонам, што і сумнявацца не даваў.

Ігнат на момант задумаўся.

– Не выберуць мяне, – сказаў упэўнена, без шкадавання. Проста канстатаваў факт. Потым з выклікам, не вагаючыся, нібы радуючыся, заявіў: – А калі б і выбралі – я б не пайшоў! От!

Вочы яго свяціліся рашучасцю.

– Гэта – іншая рэч... – сказаў Башлыкоў.

– А чаму б я не пайшоў? – Ігнат глядзеў на Башлыкова так, нібы патрабаваў: ну, дапетры, вучоны чалавек! Адказаў сам, з гонарам: – Бо з такім кагалам, нібыто, зладзіць – не з маім характарам! Я пераб'ю палавіну!

Так казаў, што было відаць: не жартуе. Пераб'е. Жонка ля стала ўхапілася за галаву: што гаворыць!

– Ігнатко, што ето ты пляцеш? – амаль прастагнала яна. – Людзі і праўда падумаюць.

Ігнат зіркнуў на яе.

– За ето – знаеш што? – падчапіў яго Андрэй, дзядзька ў кажушку, што зноў аказаўся пры іх. Ён яўна пакепліваў дзеля начальства. – Засудзяць па закону!

– Ты, Андрэй, не лезь! Куды не просяць! Не сунь, нібыто, носа!

– Да дайце выказацца да канца! – распарадзіўся Дубадзел. У голасе яго чулася незразумелая Башлыкову злараднасць.

Міканор Глушак маўчаў, было відаць, неспакойны: пабойваўся, мусіць, што гэты несамавіты таксама выкіне што-небудзь на бяду яму.

Ігнат, здавалася, не мог бы ўжо спыніцца. Прагнуў дагаварыць, давесці.

– А чаму я перабіў бы? – зноў патрабаваў ён ад Башлыкова: дапетры. – А таму! Бо за кажным вачэй не зводзь! Тут жа стаў чалавека да за ім, нібыто, наглядчыка! Штоб глядзелі, як робіць кажны! Штоб сцераглі дабро! Вачэй не зводзілі! А не, дак такое наробяць! Расцягаюць усё па норах сваіх! І не ўгледзіш!.. Кажны, ён што? Да сябе добранькі! Да сябе грабе! От!

Башлыкоў спыніў Міканора, які абурана хацеў запярэчыць штосьці, сказаў дасведчана:

– Калгас хутка пераробіць гэту псіхалогію. У калгасе будзе іншая псіхалогія.

– Іншае? – засмяяўся горача Ігнат. – Адкуль яно возьмецца! – Не даў нікому слова сказаць, заявіў: – А я такога цярпець не магу! Я праўду люблю! А тых, хто за праўду, – не любяць!

– Гэта ў вас – адсталы настрой, – сказаў Башлыкоў.

– Дак от, я не пайду! – вёў сваё Ігнат. – Кеб і выбралі, не пайду! – Ён прыпыніўся на момант, востра зірнуў на Башлыкова: – Да і вы не паставіце! – выказаў непахісна. – Я – непаслухмяны, нібыто. Нязручны! А начальство ўсякае нязручных не любіць! Дак вы не

возьмеце! А калі і возьмеце, дак патом – пад зад! А я етаго – не люблю! І не пайду адтаго!

Ён перачакаў пярэчанні Міканора, Башлыкова з усмешачкай, якая казала: гаварыце, гаварыце, не саб'еце! Было падобна, што і не слухаў нікога. Ледзь настала паўза, выказаў сваё:

– Дак вы і паставіце – каго?

Ігнат глядзеў з насмешкай, у якой былі і з'едлівасць і непахіснае перакананне ў сваёй мудрасці. Ён імкліва павярнуўся да Міканора Глушака:

– Яго паставіце! Паставілі ўжэ!.. А ён – які гаспадар, запытайце? Ну, Андрэй, скажы, – загадаў ён раптам дзядзьку ў кажушку.

Дзядзька падумаў, аўтарытэтна адказаў:

– Міканор – чалавек сазнацельны, ідзейны.

– «Сазнацельны, ідзейны», – перакрывіў яго Ігнат. – Гаспадар ён які, пытаю!.. Гаспадар ён, – сказаў Ігнат дзіўна зларадна, – нібыто з г... пуля! От які ён гаспадар!

– Вы дарэмна абражаеце, – нелагодна сказаў Башлыкоў. Дубадзел падтрымаў яго.

Ігната гэта яшчэ больш запаліла.

– Я праўду кажу. Ён і ў сваёй гаспадарцы не быў ніколі гаспадаром. Поля сам, можна сказаць, адзін не абрабіў. Бацько ўсё. Ці пад бацькавым наглядам. Няпраўду хіба, Міканор? – бязлітасна сказаў ён да цяперашняга старшыні. Той, гнеўны, не адазваўся.

– Ну от, – Ігнат як пераможца павярнуўся да Башлыкова. – А цяпер яму – усе гаспадаркі!

Зноў з насмешачкай чалавека, якога ніхто не можа збіць з адзіна правільных пазіцый, слухаў, што пярэчылі яму. Перачакаўшы, зацята павёў далей сваё:

– От і вы! Адкуль? – рынуўся ўжо на Башлыкова. – З горада – відно! Знаеце хоць, як, нібыто, адрозніць грэчку ад жыта?

– Ты, Глушак, кінь ето! – адразу важка, з пагрозным намёкам сказаў Дубадзел. – Кінь ету кулацкую анцімонію!

– Ігнатко! Памаўчы! – забедавала жонка. Ухапілася за рукаў, хацела адвясці ўбок, як ад бойкі. Ён нецярпліва адштурхнуў яе.

– Не лезь! – У нястрымным запале сказаў Дубадзелу: – Не, няхай ён паслухае! Бо вы ж не скажаце! – Узрадавана сказаў Башлыкову пра грэчку-жыта: – Не знаеце!

Башлыкоў не спрачаўся, не пярэчыў: смешна, нікчэмна было спрачацца, абараняць сябе ў такой дыскусіі. Годнасць не дазваляла прыніжаць сябе такім чынам.

Ігнат махнуў неспакойнаю, кручкаватаю рукою, як чалавек, што гатовы на ўсё.

– Ну, так і быць! Станьце ў нас старшыном! Пайду! Ей-богу! Хоць зараз! Пайду!

– Ты, Глушак, етыя кулацкія свае штучкі! – заступіўся зноў за Башлыкова Дубадзел. – За агітацыю процiў прадстаўніка ўласці – знаеш што?!

– Дзела нашаго, нібыто, не знаеце, – Ігнат не зважаў на Дубадзела, бачыў толькі Башлыкова, – дак хоць грамату знаеце! А сельскаму хазяйству – навучыцеся! Давайце! Пайду! Ей-бо!

Башлыкоў сказаў строга:

– Маім жыццём распараджаецца партыя. Куды яна загадае, туды я і пайду. Не раздумваючы.

– Ну от! – адгукнуўся Ігнат з насмешкай, якая значыла: я так і ведаў. – Не пойдзеце.

– Ты, Глушак, кінь етыя жартачкі! – пагразіўся Дубадзел. – Далеко завядуць яны цябе. Запомні!

Ігнат не паслухаўся папярэджання Дубадзела.

– А я не жартую, – сказаў ён задзірыста. – Дзеці унь. Карміць трэба.

Калі ішлі вуліцаю, Міканор Глушак адстаў, прытрымаў з сабой дзядзьку ў кажушку. Башлыкоў, што неўзабаве спыніўся, азірнуўся, бачыў, як Глушак штосьці недавольна кажа дзядзьку, дзядзька спрачаецца з ім ці апраўдваецца.

Башлыкоў падумаў, што Глушак, няйнакш, хоча адшыць дзядзьку, які невядома чаму круціцца побач. Згадзіўся, што правільна робіць: дзядзька тут ні да чога. Падумаў, аднак, Башлыкоў пра гэта мімаходзь, хвалявала, турбавала яго іншае: толькі што перабытая размова. Было ад яе на душы нядобра, мутна, адчуваў патрэбу разабрацца, праясніць...

– Усюды трэба ўткнуць яму нос! – сказаў Глушак, нібы апраўдваючыся.

Башлыкоў не адгукнуўся. Дымячы папяросай, паказаў, што ў яго свой клопат, і клопат сур'ёзны.

– Душок нядобры! – прамовіў ён значна, ледзь кіўнуўшы да хаты Ігната. Позірк, якім павёў да Глушака, да Дубадзела, казаў, як гэта важна: «душок».

– Д-да, – адразу падтрымаў Дубадзел. Тон згоды паказаў, што ён разумее цалкам, як гэта сур'ёзна.

Глушак вінавата пераступіў з нагі на нагу.

– Пляце сам не ведае што.

– Знае. Добра знае, – выказаў непахісна Дубадзел.

У тым, як сказаў, чуліся і праніклівасць, і нейкі сур'ёзны намёк. Быццам мудрае папярэджанне: небяспечны тып. Трэба пільна глядзець...

– Ад кантузіі, можа... Кантужаны буў...

Дубадзел смыкнуў губамі недавольна, сказаў, судзячы:

– Сердабольны ты нешто, Глушак!

Башлыкова таксама здзівілі словы Глушака, паблажлівасць яго. Падумаў: разгублены пачутым, ці не хоча, каб палічылі, што ён помсціць за злыя словы? Ці – мяккацеласць?..

Не дадумаў, гледзячы ў вочы Глушаку, выказаў галоўнае:

– Як ён, не займаўся такімі разгаворчыкамі публічна?

Міканор на момант задумаўся. Сказаў няцвёрда:

– Да не. Ён не вылазіць асабліва...

– Што значыць – не асабліва? Значыць, бывае часам?

– Да не. Можно сказаць, не...

– Зноў: можна сказаць!

Міканор зусім зніякавеў. Адолеў сябе:

– Не.

Дубадзел хмыкнуў з пагардай.

– А летам? Калі наразалі зямлю? – сказаў з намёкам. Як бы выкрываючы.

Глушак пачырванеў, пацвердзіў:

– Схапіўся загрудкі. З каморнікам...

– Узялі пад арышт, – Дубадзел гаварыў да Башлыкова. Адкрыта, аддана. – Адправілі ў Алешнікі, у сельсавет.

– Судзілі?

– Не. Адпусцілі.

– Калі?

– Адразу!

– Хто?

– Гайліс.

– Чаму?

Дубадзел прамаўчаў. Маўчанне яго сказала больш за словы. Твар яго сказаў: ён, Дубадзел, дасюль зразумець не можа такі фокус.

– З-за дзяцей... Пашкадавалі... – адгукнуўся Глушак.

Башлыкоў быццам не зразумеў. Раптам, не дакурыўшы, кінуў папяросу ў снег. Рашуча загадаў Глушаку:

– Вядзі!

Раздзел пяты

1

Гадзіны за тры абышлі яшчэ дзесятак хат, агледзелі калгаснае, паабедалі ў Міканора Глушака.

Было далёка да вечара, калі выехалі з Куранёў. Башлыкоў хацеў пабыць яшчэ ў Мокуці, адной з самых далёкіх і глухіх вёсак раёна.

За крайнімі хатамі Куранёў было трохі поля, белага, чыстага прастору. Хоць конь бег трушком, не надта хапаўся, поле хутка сышло, падступіў сцяною падбелены, маўклівы лес. Неўзабаве вазок нырнуў у гэту зацятую маўклівасць, ва ўладанні лесу, якому, ведаў Башлыкоў, тут канца-краю не было.

Фактычна лясы тут, а можна сказаць, што і лес, адзіны, агромністы, цягнуліся больш як на сотню кіламетраў. У гэтае вялізнае, зацятае ўладарства і ўехаў цяпер вазок.

Ехалі нейкі час моўчкі. Шархалі адно палазы ды парыпвалі гужы. Дубадзел, горбячыся побач з Башлыковым, наставіўшы каўнер шынелькі, не то драмаў, не то думаў. Не варушыўся, маўчаў Башлыкоў. Адпачываў ад нядаўняга клопату, ад бачанага і чутага.

Ад лясной вусцішнасці аж звінела ў вушах. Пакуль не звыкся, пярэсціла ў вачах ад чорнага і белага, ад дрэваў і галін, што насоўваліся, звісалі, знікалі, зноў ішлі і ішлі абапал, над імі. Хоць быў стомлены і не хацеў думаць попусту, было не надта добра, не па сабе сярод гэтай бясконцай лясной глухамані, зацятай цішыні. Было з прыдушаным неспакоем разуменне пэўнай гераічнасці ад таго, што сам, самохаць рашыў дабрацца ў такую глуш.

Пра гэта, пра гераічнасць, аднак, не думаў. Перакананы, што неабходныя сціпласць і самакрытычнасць, нават стрымана іранізаваў над нікчэмнай гэтай уцехай. Падтрымліваў, не студзіў у душы гарачага імкнення, якое было цяпер самым важным для яго: як бы далёка ні было і якія б нялёгкія дарогі туды, усё роўна даедзе, дабярэцца. І дакапаецца. Усё раскапае. Сам.

Дубадзел зварухнуўся, палез у кішэню. Закурыў. Нейкі час курыў, адвярнуўшыся, каб дым не ішоў да Башлыкова. Пра нешта затоена думаў. У вачах, прымружаных, засяроджаных, было вострае, жорсткае. Сутаргава хадзілі худыя сківіцы.

Курыў похапкам, нервова. Акуркам апёк пальцы, ледзь не мацюкнуўся. Са злосцю кінуў акурак у снег, плюнуў.

Яшчэ нейкі час мружыў вочы кудысьці, соўгаў сківіцамі. Не пазіраючы на Башлыкова, нібы думаючы ўголас, хрыпата, горача прамовіў:

– Ім разгаворчыкі етыя... – Ён запыніўся, нецярпліва саўгануў сківіцамі. Хацеў, відаць, знайсці належнае слова. Грэблівае. Скончыў звычайным, але з грэблівасцю: – Як гарох аб сценку.

Башлыкоў не варухнуўся. Нібы не чуў. Але словы Дубадзела ўразілі яго. Дубадзел быццам пачуў яго думкі, выказаў за яго. Аднак разам з тым думкі гэтыя, сказаныя не ім, а Дубадзелам, былі непрыемныя яму. Башлыкоў як бы пачуў знявагу сваёй рабоце.

– Без разгаворчыкаў таксама нельга, – сказаў ён павучальна, значна. «Разгаворчыкі» – вымавіў з насмешкай: паставіў Дубадзела на месца.

Дубадзел, падобна, не заўважыў іроніі. Таропячыся ўсё перад сабой, сказаў ранейшым тонам:

– Ім не разгаворчыкі трэба!

Былі ў тоне яго гаворкі важкасць і непахісная пераконанасць. Чуліся трывожнасць і нават боль, і Башлыкоў зацікаўлена чакаў, што ён яшчэ скажа.

Але ён сцяў губы, маўчаў.

Башлыкова не раз ужо дзівіла яго ўменне маўчаць. Скажа што-небудзь важнае і абарве гаворку, не дагаварыўшы. Думай, гадай, як разумець.

Гэта дзівіла, тым больш што ў выступленнях сваіх Дубадзел быў надзіва гаварлівы і гарачы: як пачне, паліць без перадыху, здаецца, не спыніцца.

– Тлумачыць трэба, – сказаў Башлыкоў стомлена. – Без тлумачальнай работы – нельга...

Дубадзел абазваўся не адразу.

– Многа разгавораў у нас... – Ён гаварыў з той жа пераконанасцю і нібы судзячы. – А ён слухае, слухае, а сам думае: «Гавары, гавары!»

Словы гэтыя краналі чулае ў душы Башлыкова. Можа быць, самае чулае, нават балючае цяпер, вярэдзілі, як свежую рану. Башлыкоў слухаў, як і раней, з адчуваннем: Дубадзел нібы падгледзеў, што яго рупіць.

І ўсё ж непрыемна было чуць гэта. І хацелася пярэчыць.

– Нельга без тлумачальнай работы...

– Разгаворы само сабой... – не то згаджаючыся, не то думаючы ўголас сваё, сказаў Дубадзел. – А толькі – мала етаго!

Дубадзел памаўчаў момант, выказаў горача, непахісна:

– Брацца трэба за яго! Крэпкай рукою! Як таварыш Сталін вучыць. Па-бальшавіцкаму.

– А мы што ж, «не бярэмся»? – У Башлыкова ўмомант ускінулася абурэнне.

Дубадзел не зварухнуўся.

– Вы-то бярэцеся, – прамовіў ён пазней, як бы разважаючы сваё. Памаўчаў хвіліну: – Да трэба, кеб усе браліся!

Ён нібы вучыў Башлыкова, але гнеў Башлыкова апаў.

– Трэба.

Дубадзел сказаў павучальна і важка:

– Асабліва тыя, каторыя на месце. У нізах.

Башлыкову ўжо зусім не хацелася злаваць і нават спрачацца. Чуў ужо ў Дубадзела не толькі шчырасць і боль, але і гарачае жаданне перасцерагчы, памагчы. І бачыў добрае разуменне рэальнага становішча і цяжкасцей яго.

– Вы кіруеце, даеце ўказанні, як і што, – Дубадзел усё таропіўся кудысьці, раз-пораз сцінаў сківіцы. – А на месцы павінны брацца. А яны – не бяруцца! Від толькі паказуюць. Сердабольныя!

Ён плюнуў. Заявіў цвёрда:

– Ад таго слабо ідзе!

Зноў ехалі моўчкі. Ківаючыся ў вазку, пад ледзь чутны тупат капытоў і парыпванне гужоў, Башлыкоў думаў пра Дубадзела. Нязграбны нібы, не надта граматны, а – з галавой. Недалёкі, здавалася б, а бачыць – і вакол, і ўглыб. Правільна бачыць і мысліць. Лепш, чым некаторыя «далёкія», адукаваныя. Разумны па-свойму. Усё ясна, проста ў яго. Пазайздросціць можна.

І моц ёсць у яго. Надзейнасць адчуваецца. На такіх можна спадзявацца. Недарма, значыць, ён кінуўся ў вочы. Не памыліўся ў ім.

Падумаў з усмешкай: неадукаваны, а такт які! Слова лішняга не скажа. Кожнае слова – са значэннем. «Падумай», маўляў. «Разваж».

А галоўнае – шчырасць якая, адданасць. Усё – з душой, са страсцю...

– Глушак еты, Яўхім – штучка! – прамовіў унураны ў думкі свае Дубадзел. «Штучка» – праказаў так, што Башлыкоў зірнуў пільна. – Выкіне шчэ. Пабачыце.

Прарочыў з такой упэўненасцю, быццам бачыў ужо, загадзя.

– І Ігнат – загадачка!

У памяці Башлыкова надоўга засела гэта: «штучка», «загадачка». Засела тым больш моцна, што сам думаў падобна.

2

Цяпер ужо доўга маўчалі. Конь цяпер не бег – клыпаў цярпліва свежым снегам. Вазок не кідала на паваротах і ў ямах, далікатна паводзіла. І дрэвы, чорна-белая пярэстасць, плылі паволі, і можна было думаць, што ім канца не будзе.

Але Башлыкоў думаў пра іншае. Растрывожаная памяць вяртала яго назад, у Курані, да пабачанага і пачутага там.

Найперш вярэдзіла, пякло незразумелае. Неверагоднае. Як гэта магло здарыцца? Чаму гэта здарылася! Што выпусцілі з-пад арышту, пасля такога злачынства! Пасля замаху на савецкага работніка. Замаху фактычна на законы і парадкі, вызначаныя савецкай уладай. Выпусцілі яўных антысаветчыкаў, ворагаў. Арыштавалі, адправілі і адпусцілі! «Гайліс загадаў: адпусціць!» «Пашкадаваў дзяцей!»

Які дабрадзей! Сам бацька не дбае пра дзяцей, дык ён паклапаціўся! І Глушака дарослага пашкадаваў, відаць, таксама, каб не трывожыць бацьку! Праявіць такую даверлівасць, глухату і слепату! Проста немагчыма паверыць, што гэта – усяго неразуменне, неразуменне элементарных законаў! Не хочацца думаць, што тут горшае, свядомае ўкрывацельства, але ж факты пра што гаворацць! Не паведамілі нават райкому, адпаведным органам! Мімаволі прыходзіцца думаць, што спадзяваліся – ніхто ведаць не будзе! І не ведаў бы ніхто ў раёне – каб не прыехаў, не раскапаў! Сам! І сакратар ячэйкі – дзіва проста. Быў пры гэтым, бачыў усё і хоць бы варухнуўся. Глядзеў, назіраў, як пабочны, не паправіў, не запярэчыў нават! Не паведаміў райкому! Ніякага сігналу не даў!

Не сыходзіла з памяці: «А нас куды? Усіх нас куды? На падсцілку! На гной! Ці – як вошы, пад ногаць!» Помнілася так, быццам гучала яшчэ ў вушах. Быццам пёк вочы люты позірк. Ён добра разумеў значэнне гэтага позірку і разумеў небяспеку, якая свяцілася ў гэтых вачах. З гэтым мяшалася насмешлівае, крыўднае: «Знаеце хоць, як адрозніць грэчку ад жыта?» «Дзела нашага не знаеце! Дак хоць грамату знаеце! Давайце к нам!.. Ну от!» Вярэдзіла, паліла гэтае злое, зларадная «ну от» – я, маўляў, так і ведаў: ты толькі ўгаворваць майстар, а сам сядзець будзеш збоку, у чыстай местачковай кватэры, у кабінеце сваім!

Як яны, Гайліс і Глушак, могуць мірыцца з такімі! Як маглі даравацць адкрытае выступленне супраць калгасаў, супраць савецкай палітыкі! Больш таго – арыштаваць, адправіць у сельсавет і – выпусціць! Класавага ворага выпусціць на волю! Башлыкоў ніяк не мог звыкнуцца з гэтым фактам, не мог спакойна думаць пра яго.

У яго даўно былі сумненні, што да бальшавіцкай прынцыповасці Гайліса. І ўсё ж і ад Гайліса ён не чакаў такога.

З гэтым спляталіся развагі пра Міканора Глушака. Чаму ж ён не паправіў, не запярэчыў нават? Не паведаміў райкому? Ці не захацеў сам, са сваіх перакананняў, ці не рашыўся пайсці супраць Гайліса? Вядома, першае слова тут, у гэтай гісторыі, за Гайлісам, Гайліс вярнуў арыштаванага. Гайліс тут непахісны аўтарытэт, камандзір. Але як можна было – сакратару ячэйкі – праяўляць такую мяккацеласць і проста бесхарактарнасць пры Гайлісу, патакаць усім яго фокусам! Як можна так адносіцца да сваіх партыйных абавязкаў, да таго давер'я, якое аказана!

А можа, тут прычына не толькі ў мяккацеласці, у паслухмянасці перад Гайлісам. Можа, тут прычына перш за ўсё ў тым, што такая «дабрата» па сэрцы самому. Што самому па душы сядзець ціхамірна, аберагаць свой асабісты спакой. Жыць мірна побач з варожай поганню, таму, што і яна, як кажа маці яго, таксама «людзі». Глушак абураўся развагам маці, але – наколькі шчырае гэтае абурэнне. Ці не ад таго яно, што – перад сакратаром райкома. І адкуль гэтыя погляды ў маці сакратара партячэйкі, і чаму сакратар ячэйкі не мог зламаць іх?

І ці так ужо бяскрыўдна тое, што сакратар ячэйкі, аказваецца, састаіць няхай і не ў непасрэднай, а ўсё ж сваяцкай сувязі з кулацкай сям'ёй? Канешне, у вёсках гэта не так і рэдка, але ж ці не пакідае следу ў поглядах Міканора Глушака гэтая сувязь? У поглядах і ва ўчынках. Ці не ў гэтым корань таго, што Дубадзел добра называе – «сердабольнасць»?

Так, чуццё не ашукала яго, што тут, у Алешніцкім сельсавеце, кіраўніцтва не на ўзроўні. Не памыліўся тады, на сходзе ў Глінішчах, і потым, у Юравічах, калі шукаў прычыны таго прарыву, у які трапіў сельсавет. Тады ён толькі меркаваў, цяпер ён ужо мае факты, дакладныя факты, якія гавораць пра тое, што кіраўніцтва сельсавета і кіраўніцтва ячэйкі, па сутнасці, займаюць апартуністычную лінію, не вядуць належнай барацьбы з антыкалгаснымі, кулацкімі праявамі.

Калі думаў пра гэта, мацнела адчуванне, якое ўжо не раз прыходзіла, што добра зрабіў, выбраўшыся сюды: раскапаў, знайшоў факты, якія праяснілі становішча ў сельсавеце і, што яшчэ больш важна, кірунак таго, як выправіць гэта становішча. Фактычна тое, што адкрылася тут, калі паглядзець шырэй, – а яму і належыць глядзець так, хоць бы з абсягам раёна, – паказвае, якім кірункам можна вывесці з прарыву і ўвесь раён. Тое, што адкрылася тут, дае

зрабіць вывады для ўсяго раёна. На фактах гэтых вёсак ён навучыць усе вёскі раёна, уздыме ўвесь раён.

Так, трэба брацца. Дубадзел добра сказаў: «Брацца крэпкай рукою!» Брацца не аднаму яму, брацца ўсім! Поспех у маштабе раёна будзе залежаць ад таго, наколькі ўдасца ўзняць усе кадры! Каб зламаць ворага, трэба ўзняць баявы дух усіх партыйцаў, усяго актыву! Для гэтага трэба навесці перш за ўсё парадак у нашых радах! Перш за ўсё вытравіць у нашых радах які б ні было лібералізм да ворага, расхлябанасць. Для гэтага – строгасць, непрымірымасць да саміх сябе! І не на словах, слоў ужо даволі было, а на справе! На канкрэтных фактах, якія ён выявіў тут!

Трэба справу аб злачынствах у гэтым сельсавеце паставіць на бліжэйшым бюро. Трэба Гайліса і Глушака прыцягнуць да суровай адказнасці, пакараць са ўсёй строгасцю! Гайліс за ўсё тое, што ўчыніў, бясспрэчна, заслугоўвае выключэння з партыі. Строгае спагнанне варта даць і Глушаку. Абодвух, вядома, належыць вызваліць ад пасад. Бесхрыбетным згоднікам не месца на такіх адказных пасадах, дзе патрэбны рашучасць і цвёрдасць!

Строгія вывады па справе Гайліса і Глушака павінны, няйнакш, падцягнуць іншых, мабілізаваць усіх. Гэта будзеварты ўдар па мяккацеласці і марудлівасці, гэта прывядзе да пералому ў справах. Наш крок будзе спарнейшы! Пойдзем хутчэй!

Ніякіх мер не прынясць да адкрытых варожых выступленняў, няньчыцца з такімі небяспечнымі элементамі, даваць разгульваць ім на волі! Башлыкоў усё не мог ні зразумець Гайліса і Глушака, ні супакоіцца. Гэта так хвалявала, што хацелася проста павярнуць каня, вярнуцца ў Алешнікі, выказаць усё цяпер жа Гайлісу. Вярнуцца ў Юравічы, расказаць усё членам бюро, пачаць рыхтаваць бюро.

Сярод гэтага ў памяць унізвалася іншае, што бачыў і чуў у хатах. З гэтага першым прыйшло і найбольш хвалявала тое, што ўбачыў у хаце глінішчанскай неадступнай прыгажуні. Было такое адчуванне, быццам раптам, шчасліва адкрылася вельмі важнае і вельмі цікавае аб ёй. І зноў, як у хаце, хвалявала здзіўленне, што такая чулая, багатая душою, такая ганарлівая нарадзілася, вырасла ў такой хаце, у такой затхласці. Недарэчнае, разумеў, здзіўленне. Але яно было, не сыходзіла.

А яшчэ было, ад таго, што ўведаў раптам такое важнае, адчуванне нязвыклай блізкасці і еднасці. Было такое, нібы сустрэўся з ёй самою, нібы дакрануўся да яе, адчуў яе перад сабою, усутыч, так што чуў цёплае дыханне яе. І адчуў, што яны блізкія і што іх нішто не раздзяляе. Што яны людзі аднаго свету.

Яшчэ да гэтага дня незразумела завабная, цьмяная, яна бачылася ўжо блізкаю, рэальнаю, сваёй.

Гэта востра хвалявала ўсяго. Калі думаў пра гэта, глядзеў на бела-чорную пярэстасць лесу, што ішоў і ішоў насустрач, нецярплівым і вясёлым позіркам. У такія хвіліны знікалі з душы трывога і злосць і было толькі гэтае, харошае і дзіўна маладое, бяздумнае. Поўнае добрага чакання і прадчування. Але за гэтым раз-пораз унізваліся некаторыя падрабязнасці ўбачанага ў хаце, і ў душу ішоў неспакой. Неспакой гэты браў кожны раз, калі згадваў маці яе. Чуў зноў Глушакова: «Злая жмінда! З-за прагнасці дачку родную з дому выпхнула. Жыццё дзеўцы пакалечыла!» Так, нялёгка, пэўна, было ёй з гэтай злаcліўкай, якая, здаецца, і не здатна зірнуць прыхільным вокам.

У такія хвіліны ў сэрца Башлыкова лілося спачуванне да Ганны. За спачуваннем быў гонар за яе, за непадатную, смелую душу яе. Душу, як думаў перакананa ён, новага чалавека.

З тым, што пабачыў у яе хаце, мяшалася пабачанае ў іншых хатах. Прыходзіла на памяць, як спаткала жонка гэтага маладога, Дзятла. «Сходамі жыць не даюць! Дак шчэ і ў хату век лезуць!» Успомніў, колькі нянавісці было ў яе зацятым позірку. «Кулацкага роду». Успомніў зноў развагі маці сакратара партячэйкі. Падумаў: з асаблівай упартасцю за старое чапляюцца жанчыны. Самая адсталая і цёмная сіла.

Тады памяць нагадала, як стаяў перад ім, як зіркаў спадылба Дзяцел. «А я пабачыць хочу, што з етаго ўсяго будзе!» Ён хоча яшчэ пабачыць, ён яшчэ наогул не ўпэўнены, што з «етаго» што-небудзь выйдзе! І паспрабуй давядзі яму, як гэта сур'ёзна ўсё абдумана, давядзі, што думаць тут ужо няма чаго! Не такія розумы думалі, абдумалі ўсё! Прадумана ўсё, і – вырашана! Вырашана, а раз вырашана, то будзе – зроблена! Зноў вярэдзіла адчуванне неадольнай глухаты ўсюды, няздольнасці разумець просты сэнс. І зноў узяло злое: было б за што чапляцца! Быў бы не тое што рай, а было б хоць бы чалавечае жыццё. Былі б гаспадаркі як мае быць. А то ж – беднасць, галеча, цемра, бруд, смурод. І ўсё адно – «асмеліцца трудно!». Нібы палацамі рызыкуюць!

Пякла злосць: гэтыя ўпартасць, недаверлівасць, якія не хочуць, здаецца, ведаць нічога! Дурная сялянская глухата і слепата, бяссэнснае чаплянне за старое, за гнілое, абы было сваё. Гэта асабліва пякло таму, што было іменна бяссэнсным. Ну, калі на тое, кулацтва, што цікуе адусюль, шкодзіць усюды, робіць сваё са свядомай мэтай. Абараняе нажытае эксплуатацыяй, нарабаванае, адстойвае свае

класавыя інтарэсы. Яго супраціўленне натуральнае: непрымірымы класавы вораг. Але ж як спакойна думаць пра тое, што з ім, з ворагам, заадно фактычна колькі такіх, што павінны быць з намі. Павінны быць з намі, а фактычна стаяць побач з імі, з кулацтвам, з ворагам! Як іх пасобнікі, як іх сіла! Толькі з-за дурной сялянскай глухаты, з-за чаплянне за старое, з-за нежадання бачыць і разумець новае.

І раней не любіў гэтае, а цяпер думаў пра яго проста з нянавісцю.

Была ў яго думанні пра гэта адна асаблівасць. Ён гэту асаблівасць ужо рэдка калі і заўважаў. Кожны раз у такія хвіліны Башлыкоў ці ўспамінаў, ці проста адчуваў, як звыклае, той час, калі малым уражлівым хлапчуком упершыню сутыкнуўся з усім гэтым. Можна нават сказаць, што ён ніколі не забываў пра гэта, што гэта як бы назаўсёды было ўжо ў крыві. На ўсё жыццё ўвайшлі ў яго гнеў і злосць тых нелагодных, галодных гомельскіх дзён, калі на вірлівым рынку ён упершыню сутыкнуўся з такімі цёткамі і дзядзькамі. Сутыкнуўся, як з незнаёмым і нялітасцівым светам. Светам чужым. На ўсё жыццё асела ў душы яго непрыхільнасць да цётак і дзядзькоў, што, здалося яму, бесчалавечна дралі з іх, гарадской беднасці.

Пазней да гэтага далучылася вычытанае з разумных кніг. У кнігах было не толькі гэтае, у лепшых з іх таксама было няпроста, але Башлыкоў вылучыў і запомніў больш гэтае: што ён, селянін, у аснове сваёй – двудушны, што ў кожным ім ёсць уласнік. Эксплуататар. Саюзнік не толькі рабочага, а і кулака. Башлыкоў заўсёды помніў, што кулацтва – гэта частка сялянства.

З гэтым было ў Башлыкове набытае ў жыцці і ў кнігах разуменне сваёй гарадской, рабочай перавагі перад цёмнай вясковай масай. Разуменне вышэйшасці перад ёй.

Цяперашнія сустрэчы раз-пораз блыталі гэты цвёрды лад башлыкоўскіх поглядаў. У цёмнай масе сустракаў ён іншы раз такі розум, што дзівіўся: адкуль гэта? Больш таго, адкрываў праявы такой культуры, якая не ўступала ні ў чым не толькі юравіцкай, а і гомельскай. Ці трэба казаць, як блытала адносіны з гэтым светам сустрэча з куранёўскай красуняй, да якой увесь час вяло яго думкі.

3

Не раз, не два ён вяртаўся думкамі да Ганны.

Хто б мог падумаць, што маладога, але такога сур'ёзнага, засяроджанага сакратара хвалююць такія тайныя думкі.

Мусіць, ад таго, што ў душы так востра чулася нядаўняя сустрэча са светам, у якім яна жыла, з хатаю, з бацькамі яе, у душу лезлі, мроіліся з дзіўнай рэальнасцю, надзвычай хвалюючы, як бы жывыя, відовішчы, у кожным з якіх была, жыла яна. Гучалі словы, і ад слоў гэтых аж кружылася галава. І млела, дзіўна, недарэчна, сэрца. Млела, сцішалася ад гарачыні, як у хлапчука.

У такія хвіліны мімаволі перасцярожліва паглядваў да Дубадзела, як бы пэўны ў тым, што той сочыць за ўсім, што яму мроіцца. Паглядваў, быццам хацеў пабачыць, што той думае пра яго. Тады цверазеў, адводзіў вочы. Сам-насам хаваў у душы тайнае сваё.

Ад моцнага, непадатнага ўзрушэння раптам недарэчна закарцела: загаварыць пра Ганну, запытацца пра тое-сёе, Дубадзел, няйнакш, ведае. Павінен ведаць, старшынстваваў жа тут, не раз быў, канешне. Не мог не заўважыць такую красуню. Пэўна, ведае, чаму яна ў школе. Ведае, ці была замужам. І наогул, што яна сабою.

Карцела загаварыць. Цяжка было таіцца, утаймоўваць неспакойнае, ліхаманкавае бачанне і думанне. Але не загаварыў, нават не памкнуўся як мае быць. Помніў: не мог, не меў права паказаць такое. Зацікаўленасць такімі рэчамі. Дубадзел адразу зразумеў бы ўсё. Рашыў разважліва: як-небудзь навядзе даведкі ў справах. Ці самую запытае.

У рэшце рэшт – галоўнае ведае. Карэнні яе пабачыў. Бацькоў бачыў, хату яе.

Ад таго, што яна раптам так пабліжэла, мацней брала імкненне – заехаць да яе. Мацней брала і здавалася больш простым: варта толькі збочыць з дарогі. Едучы ў Юравічы, збочыць у Глінішчах да школы. Пакіраваць не на шлях, а на загуменную дарогу.

Калі думаў пра гэта, проста вачавідкі бачыў: кончыліся рады гумнаў і вось – узыходзіць на ганак. Уваходзіць у цёмны калідор, у яе пакой. І вось ужо – удваіх, насупраць, вочы ў вочы.

Кожны раз, калі бачыў ахвочаю ўяваю гэта, сэрца, усяго залівала гарачынь. Горача біла ў скроні. Лес, дарогаківаліся, як у ліхаманцы.

ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ

Раздзел першы

1

Гэта было вельмі дарэчы, што Казачэнка аказаўся ў сельсавеце і цяперківаўся разам з Башлыковым у вазку.

Праўда тое, што з Алешнікаў Башлыкоў выправіўся ў Глінішчы, і надта цікаўных не павінна было б, пэўна, дзівіць. Глінішчы як-ніяк проста на дарозе ў Юравічы, ды да таго ж і адна з найбольшых у сельсавеце вёсак. Натуральна, здаецца, павінна выглядаць тое, што сакратар райкома захацеў наведацца сюды.

Усё ж тое, што Казачэнка ківаўся побач, было не лішнім: яно як бы паказвала кожнаму, каго магла зацікавіць сакратарова паездка, дзелавы характар яго наведання ў Глінішчы. Пра гэта гаварыла і тое, што, заехаўшы ў Глінішчы, Башлыкоў адразу падаўся па калгасных дварах, клопатна высвятляў, як ідзе калгас. Можна было бачыць, што ён давольны: той помны сход быў усё ж не марны, частка людзей вярнулася ў калгас, і гаспадарка жыла. Калгас патрохі як быццам выкіроўваў на лад.

Адсюль Башлыкоў заехаў яшчэ ў хату Казачэнкі. Ад Казачэнкі неўзабаве ён вярнуўся назад на коварат і збочыў да шляху на Юравічы. На звыклую дарогу...

Яшчэ і тут, пакуль не даехаў да краю сяла, Башлыкоў вагаўся – ехаць, не ехаць у школу. Вагаўся, можа, нават больш, чым раней, бо трэба было рашаць.

А рашаць было цяжка. Чамусьці думалася цяжка, і ў думках не было пэўнасці. У думкі ўпарта лезла тое, што пабачыў і перажыў за паездку, хвалявала, вярэдзіла яго. Але пэўнасці не было не толькі з гэтай прычыны, а і таму, што тое, што так карцела, не бачылася, як і раней, яму неабходным і годным яго становішча. Разуменне свайго становішча і той адказнасці, якая вынікала з гэтага, рашуча пярэчыла яго незвычайнаму, дзіўнаму імкненню. Але імкненне гэта, як і раней, не хацела саступаць. І не толькі не хацела саступаць, а час ад часу нават брала нібы мацней.

Таму ў яго развагі ішла зноў думка, што заехаць у школу, можа быць, варта хоць бы дзеля таго, каб не тлуміць сабе лішне галаву, вызваліцца такім чынам ад непатрэбшчыны. Каб потым жыць толькі дзеля справы.

Ён цяпер проста-такі быў перакананы, што імкненне яго да куранёўскай прыгажуні – усяго толькі непатрэбная прымха, якую не цяжка будзе адагнаць. Вядома, лепш за ўсё – паглядзеўшы спакойнымі вачыма, пераканаўшыся, што тое ўсё, што ён прыдумаў, дурное.

Паглядзіць, пераканаецца – і канец.

Было зноў і такое меркаванне. Канешне, спецыяльна дзеля такога ён не паехаў бы, не стаў бы неашчадна траціць дарагі час. А тут жа школа, можна сказаць, проста пры дарозе. Варта толькі збочыць, запыніцца на нейкія хвіліны.

Не было ў ім яснасці і тады, калі ўжо збочыў на загуменную дарогу, пакіраваў да школы. Як бы павастрэлымі вачыма бачыў, як ішлі абапал, глядзелі на яго, сачылі за ім з-пад белых, нізка навіслых шапак стрэх панурыя, непрыязныя гумны. Дзе-нідзе каля гумнаў трапляліся людзі, здавалася, усе яны пранізвалі яго пільнымі, здагадлівымі позіркамі. Пранізвалі, падсмейваліся.

Гэтыя позіркі, аднак, не толькі не кволілі яго, а нібы дадавалі дужасці. Бачачы, як ідуць побач і як цікуюць за ім гумны і людзі, ён насуперак усяму злому, што магло быць, мацнеў душою. І ехаў усё больш упэўнена.

Адно тачылася ў ім, не знікала – няёмкасць. Няёмкасць ад таго, што ў такі адказны час, такі адказны чалавек, сакратар райкома, ён дазваляе сабе губіць час на асабістае, на дробнае. Што дапушчае ўчынак, які не адпавядае яго годнасці.

Што ж да самой сустрэчы ў школе – не трывожыўся надта. Паглядзіць, пераканаецца – і канец. У кожным разе так пераконваў сябе.

Адкуль было яму ведаць, што пачынаецца, завязваецца з гэтага наведання!

Вунь і школа. На дарожцы, найбольш вытаптанай лапцямі і ботамі, звярнуў да яе. Саскочыўшы ля ганка з вазка, загадаў возчыку пачакаць крыху. Лёгкім, дужым крокам узышоў на ганак. Калі ішоў, здавалася, быццам з вокан абапал глядзяць. Таму і ішоў так, як трэба, калі на цябе пазіраюць. Аднак, спыніўшыся на ганку, адчуў з прыкрасцю, што ў нагах няма цвёрдасці. Стаў абмятаць дзеркачом снег з ботаў і пачуў, што сэрца б'ецца мацней, часцей.

І было такое ў душы, нібы вінаваты. І не толькі перад сваім адказным становішчам, але і яшчэ перад нечым, невядома перад чым. З'явілася раптам нейкая незразумелая трывожнасць, стала браць недарэчная млоснасць. Чорт ведае што! Ад гэтай блытаніны ў душы ўскінулася злосць – на сябе, на ўсё на свеце. Найбольш на сябе,

на нікчэмнасць сваю. З гэтай злосцю, з імкненнем трымацца як належыць і ступіў у калідор, пастукаў у дзверы пакоя.

Ён пачакаў. Чамусьці быў упэўнены, што Параска дома. Чакаў яе голасу. Чакаў, адольваючы дурную трывожнасць. Неспакойна гадаў, як яна сустрэне, як паглядзіць. Мусіць, гэта і трывожыла: зіркне сваім хітрым позіркам і адразу зразумее ўсё.

Ніхто не адгукнуўся, і ён адчыніў дзверы. Параскі ў пакоі не было. Нікога не было. Ён ступіў у пакой і, адразу пачуўшы сябе вальней, рушыў па пакоі гаспадарскім крокам. Пастукаў у дзверы суседняга пакоя, кухні. Адчыніўшы трохі дзверы, запытаў голасна:

– Ёсць хто тут жывы?

У пакоі была яна.

Яна ішла насустрач, і яны ледзь не сутыкнуліся ў дзвярах.

Момант яна нібы не пазнавала ці не верыла сабе. Не чакала. Тады раптам, адразу твар яе заяснеў.

– А-а! – сказала яна, уся свецячыся радасцю.

Радасць яе была надзіва смелая, як бы безразважная. І гэта смеласць, гэта раптоўная, як усплёск, сіла пачуцця рабілі яркія, як вішні, вочы яе, смуглявы яе твар такімі прыгожымі, што хараство іх быццам асляпіла Башлыкова.

Ён не чакаў гэтага. Не быў гатоў да такога. Не ўмеў так адкрываць душу, хоць бы на момант. З падрыхтаванымі загадзя асцярогай і важнасцю, якія здаваліся чамусьці абавязковымі, сказаў не надта прыязна:

– Добры дзень!

Ён быў разгублены. Разгублены больш таму, што тое, што яна так проста і шчыра сказала, незвычайна ўсхвалявала яго. Ён ледзь хаваў у сабе гэта хваляванне і з гэтай прычыны асабліва датрымліваўся звыклай ролі.

– Вечар хутка! – адказала яна, здалося, з папрокам, неяк дзіўна ўглядваючыся, як бы стараючыся штосьці зразумець.

Яго бянтэжыў яе хуткі і востры позірк. Быццам у душу глядзела.

Тады ж ён пабачыў, як вочы яе і твар сталі паволі, нібы неахвотна, шкадуючы аб гэтым, хмурнець.

Яна не адразу выйшла насустрач, мусіць, таму, што нешта затрымала яе. Нешта тады рабіла. Рукі яе былі закасаныя за локці, на іх бялела мука. Цяпер яна ўспомніла пра іх і з тым жа выразам шкадавання, одуму стала выціраць аб фартух.

– Д-да, хутка, – сказаў ён важна. Клапоцячыся, каб яна не заўважыла, што там у ім, стоенае. Зняў шапку. – От ехаў міма...

– Работы багато?

Яна прамовіла так, што ён адчуў: запыталася, абы не маўчаць. Нацяты, чуў яе вострую ўвагу, праніклівы позірк.

– Многа работы... – Ён трымаўся ўсё важна, незалежна. – Гарачая пара...

– Можна сказаць – ворыва... – Прамовіла так, быццам затаіла, а схавала нешта іншае.

– Ворыва... Скора – пералом будзе... Лягчэй пойдзе...

– Лягчэй? – здалося, не паверыла яна.

– Лягчэй. Пералом будзе!

Ён сказаў цвёрда, тонам чалавека, які добра ведае, як будзе, і ўпэўнены ў сабе. І тым, што сказаў і як сказаў, ён як бы ўмацаваў сваю годнасць.

Яна прамаўчала, але ў маўчанні яе пачулася нязгода. Нібы казала: лягчэй не будзе. Мусіць, сход той помніла...

Дзіўна, ён не мог глядзець на яе проста, адкрыта, адводзіў вочы. І, як ні хацеў, не было ў ім спакою, належнай яснасці. Было гарачае, збродлівае, недзе там, у глыбіні ўзрушанай свядомасці: якая краса! З гэтым увайшло, важка лягло на душу выразнае, самотнае: «Не трэба было заходзіць! Не трэба было!..»

Разуменне красы яе было такім моцным, што гэтая незнаёмая, вясковая жанчына нібы ўзяла неадольную ўладу над ім.

«Не трэба было... Не трэба было...» – чуў ён у сабе асцярожлівае, цвярознае.

Хаваючы кволасць, шкадаванне сваё, ён прамовіў знарок дзелавіта:

– А дзе... Параска Андрэеўна?

Улавіў на сабе хуткі, праніклівы позірк яе. Здалося: бліснула насмешлівае ў вачах. Убачыла хлуслівасць яго, нікчэмнасць яго паводзін.

– На сяле недзе... Пайшла ў сяло...

І ў тоне слоў яе чулася насмешлівае, упіклівае.

– Пазваць яе?

Іменна таму, што яна бачыла, сачыла насмешліва, ён трымаўся належнай ролі.

– Д-да, канешне...

– Зараз...

Яна, хапаючыся, адвязала фартух, здалося, намерылася ісці, але затрымалася. Ён улавіў на сабе яе позірк. Здалося, яна чакала, што ён спыніць гэту нікчэмную хлусню.

Ён прамаўчаў, і яна рушыла да дзвярэй. Бачачы, як яна ідзе, хутка, імкліва, ён адчуў, што яшчэ момант – і ён страціць яе, і гэта

дало яму дужасці, рашучасці. Хаваючы няёмкасць, стараючыся трымацца як можна годна, ён прамовіў:

– Не. Не трэба.

Яна спынілася. Ужо гатовая ўзяцца за клямку, азірнулася, нібы не разумеючы. Ніякай насмешкі ў вачах яе не было. Яна чакала тлумачэння.

Спыніўшы яе, ён зрабіў самае цяжкае ў сабе. Ён зрабіў першы крок, ён пачаў дзейнічаць адкрыта. Ужо не хаваючыся, ён шчыра, цвёрда сказаў:

– Я не да яе ехаў.

Першы момант ён адчуў палёгку, як бы скінуў тое, што замінала. Адкінуў фальш, зрабіў учынак па законах праўды. Але амаль адразу ж за гэтым у яго ўнізалася цвярозае, разважнае: «Што я раблю?» Асцярожлівае, яно паспрабавала разумна стрымаць яго: «Не трэба! Не трэба гэтага!» Праз сумяціцу пачуццяў ён добра адчуваў гэтае разумнае: «Не трэба!» – аднак яно не мела над ім належнай улады. Мала было ў ім, у гэтым перасцярожлівым, сілы. Іншае, заваблівае, смелае, было мацней, вяло, звала.

А, чорт, зазлаваў ён на сябе, на таго асцярожнага. Нашто гуляць у хованкі, круціць! Ён усё ж мужчына!

Ён глянуў рашуча. Пайшоў напралом:

– Я – да цябе.

Ён прыпыніўся на міг перад гэтым першым «цябе», але вымавіў цвёрда.

Башлыкоў бачыў, як вочы яе, твар яе ўмомант успыхнулі. Яна раптам ураз уся засвяцілася радасцю, быццам дзівосна змянілася. Змянілася так імкліва і такім хваляваннем адкрылася, што гэта ўразіла і ўзрушыла Башлыкова. Захапіла яго.

Услед, аднак, амаль адразу – як у ёй гэта хутка мянялася! – радасць яе саступіла нейкаму клопату і нават, падобна было, недавер'ю.

Цяпер вочы яе, здалося, не зычылі дабра, судзілі. Было відаць, яе мучыць нейкі цяжкі, паганы роздум. Ён улавіў, што гэты роздум пагражае ўсяму таму, чаго ён прагнуў. Гэта разуменне небяспекі ўзняло ў ім рашучасць. Ён паўтарыў цвёрда:

– Я хацеў цябе ўбачыць.

Яна, усё яшчэ ва ўладзе панурага роздуму, угледзелася ў яго невясёлымі, уважлівымі вачыма. Угледзелася і адвяла позірк, як раней, клопатны, важкі.

Яму здалося, яна не верыла яму. Ён разумеў, што патрэбны яшчэ нейкія словы, нейкія доказы, якія б пераканалі яе, развеялі б

недавер'е. Але ён не шукаў гэтых слоў. Не хацеў шукаць. Як ні быў узрушаны, ён быў усё ж Башлыковым, сталым, дзелавым чалавекам, нават цяпер помніў, хто ён і якім павінен быць. Зрабіўшы і так, здавалася, многа, больш, чым мог бы нядаўна, ён адчуў патрэбу спыніцца, падумаць. Разважыць – як быць далей.

Тое, што выспела ў ім, ён выказаў. Далейшае ж было вельмі цьмяным. Трэба было разабрацца, падумаць. А думалася цяжка. У галаве не было яснасці. Цяжка, горача біла ў скроні.

Было няёмкае, здавалася, доўгае маўчанне, поўнае тлумнага хвалявання і супярэчлівасці ў настроі.

Ён у гэты час не глядзеў на яе. Аднак, чулы, нацяты, адразу ўлавіў незразумелы, неспакойны рух, кінуў позірк да яе. Ён не памыліўся: яна з нейкім новым хваляваннем глядзела ў акно.

– Параска ідзе... – прамовіла, сустрэўшыся з ім вачыма.

З сэнсам гэтых слоў ён улавіў непрытоенае шкадаванне ў яе голасе. Азірнуўся ў акно: Параска была ўжо на двары, блізка да ганка. У яго з Ганнай заставаліся цяпер нейкія дзве-тры хвіліны.

Гэта як бы дало знак Башлыкову, што марудзіць нельга. Што ўсё трэба рашыць зараз жа. Інакш будзе позна.

Можна было б, вядома, спыніцца на тым, што ён сказаў. Гэта было б самае простае. Але ў гэты момант, калі ўзнікла небяспека, ён у раптоўным парыве адчуў, што пакінуць усё так, недагавораным, нявысветленым, нельга. Што можа так абарваць усё.

Чуючы патрэбу дзейнічаць неадкладна, рашуча, Башлыкоў хапатліва загаварыў:

– Слухай... Заўтра. Як сцямнее. Выйдзі на шлях. Добра?

Можа, гэта гаварыў і не Башлыкоў, цяперашні сталы чалавек, кіраўнік. Можа, гэта аб'явіўся той гарачы, зялёны хлопец, якім ён быў некалі. Такая маладая імклівасць, безразважнасць былі ў гэтым яго парыве...

Яна не адказала адразу. Усё нібы не магла адолець чагосьці, вагалася. Потым моўчкі кіўнула.

Кіўнула стрымана, без радасці.

Але кіўнула. Згадзілася.

Так раптам адбылося тое, што зблізіла іх, звязала адной змовай. Так, у маладым парыве, спехам, Башлыкоў зрабіў крок, які потым даў яму столькі турбот.

2

Параска адразу, як увайшла, весела аб'явіла:

– Вось хто, аказваецца, у госці да нас!
Башлыкоў сказаў як мог спакойна, сціпла:
– Да от ехаў міма. Завярнуў...
– І добра! Даўно ж ужо не было! – Параска хутка скінула паліто, развязала хустку. І так жвавая, захадзілася, загаманіла яшчэ больш – іграла перад госцем, артыстка: – Мы ўжэ думалі тут, што мінае знарок!
– Ды не, часу не было...
– Пачулі пазаўчора: прыехалі ў Алешнікі. Паехалі ў Курані. Праехалі міма!
– Рана ехаў...
– Не адгаворвайцеся! – упікнула Параска весела, гулліва. – Ну, але калі вы ўсё ж заехалі, то віна ваша ўжэ змяншаецца. Можа, мы і даруем вам! Даруем? Праўда, Ганна?
Ганна сказала стрымана:
– Трэба дараваць, мабуць...
Яна стаяла каля дзвярэй на кухню, зацятая, з ледзь прытоенай гаркаватай усмешкай.
А Параска павяла ўжо новую ролю: гасціннай гаспадыні.
– Хоць рэдка, ды – метка! У час прыехалі! У самы час! У нас – боршч якраз умлеў! Боршч такі! – Параска аж смачна заплюшчыла вочы.
Башлыкоў прамовіў:
– Я на хвілінку толькі... Спяшаюся...
– Такога баршча нідзе не будзе!.. А да яго яшчэ – дранікі! – Параска па-змоўніцку падміргнула Ганне, заклікаючы падтрымаць яе.
Ганна няўпэўнена адгукнулася:
– Праўда, паабедайце...
– Ну от, – як бы ўзрадавалася падтрымцы Параска, – падмацуйцеся на дарогу! Тады і паедзеце! Весялей у дарозе будзе!
Башлыкоў паважна, цвёрда адмовіўся:
– Дзякую за запрашэнне. Толькі я паабедаў ужо. У «Камунары».
– Што вы там абедалі! – пацішэла, не ўтаіла папроку Параска. А можа, знарок паказала, што пакрыўджана незгаворлівасцю на яе гасціннасць.
Башлыкоў першы раз паблажліва ўсміхнуўся:
– Не падбівайце, Параскева Андрэеўна! – Без усмешкі ўжо, значна растлумачыў зноў: – Я на хвіліну. Ехаць трэба. – Дадаў весялей: – Падвезці от магу.
– Не, дзякую, – адказала нядобра Параска. Тон гаворкі яе выказваў, што яна ў крыўдзе на Башлыкова.

Вельмі вострай цяпер увагай Башлыкоў яшчэ раней перахапіў, што ў яе вачах паявілася клопатнасць. Нібы яна штосьці заўважыла дзіўнае, хацела зразумець і не магла. Здалося: яна зразумела ўсё, што адбылося тут. Вядома, зразумела. Але не паказвае гэтага.

Ён тут жа, аднак, супакоіў сябе: не ведае і не здагадваецца ні аб чым. Проста яму, Башлыкову, насцярожанаму, здаецца, што ўсё ўсім відаць.

Пасля ўсяго, што адбылося між ім і Ганнай, Башлыкоў перад Параскай чуў сябе вельмі няёмка. Але ён як мог хаваў гэта і, калі глядзець збоку, трымаўся, здавалася, упэўнена, ураўнаважана, як і належала трымацца такому паважнаму чалавеку.

Няёмка было, але трэба было трымацца, годна трымацца.

– А вы?.. А вам не трэба ў Юравічы? – зірнуў Башлыкоў, нібы спакойна і абыякава, на Ганну.

– Не... – У вачах яе мільгнуў неспакой, амаль страх.

Башлыкоў адзначыў: Ганна ледзь прыхоўвала хваляванне. Стаяла, склаўшы рукі на грудзях, моўчкі ціснулася да вушака дзвярэй. Раней такая імклівая, лёгкая ў рухах, яна цяпер хоць бы зварухнулася, ціснулася, невядома што тоячы. Знешняя яе стрыманасць дзіўна не пасавала з тым, што свяцілася на яе твары, у вачах. З вачэй яе проста зырчэў, біўся неспакой. Сляпы і той, здавалася, мог бы бачыць: сама не свая, штосьці здарылася...

– Я пайду... – нарэшце скранулася, знікла на кухні.

Башлыкоў, як і належала, затрымаўся трохі. Павінен быў затрымацца. Зняў паліто, у якім усё яшчэ стаяў, прайшоўся па пакоі. Сказаў некалькі слоў пра тое, дзе быў гэтыя два дні, што рабіў. Павёў дзелавы роспыт пра справы ў Глінішчах, пра настроі. Паказваў, што з заклапочанасцю і вялікай цікавасцю слухае Параску. Тады загаварыў пра раённыя турботы, пра тое, якая небяспечная сітуацыя цяпер у раёне. Пасля ўсяго даў парады Парасцы, што да яе грамадскай працы сярод сялян. Гаворачы гэта, у сваёй звычайнай ролі, набыў нарэшце, хоць на час, нетрывалую раўнавагу, сцішыў насцярогу Парaскі.

Сабраўшыся ехаць, надзеўшы зноў паліто, выйшаў да Ганны развітацца. На Ганніным твары былі ранейшы неспакой, сумяціца. Рука, гарачая, разгубленая, паспешліва адказала на поціск. Ганна не пайшла праводзіць. На двор, накінуўшы на плечы каптанчык, выйшла адна Параска. Ужо без ранейшай гуллівасці, з нядобрай прытоенасцю папракнула, што не застаўся абедаць, сказала не мінаць іх дому, заязджаць. Ён, паказваючы, што заклапочаны ўжо новымі справамі, падзякаваў, паабяцаў, што будзе заязджаць. Калі будзе час.

Была сумяціца пачуццяў і думак, калі вазок выслізнуў з-за гумнаў, пад рыпенне гужоў нячутна паплыў у белае пустое поле. Спачатку гарэў перажытым. Бачыў вочы яе, усю яе, не мог супакоіцца: якая краса! Проста чорт ведае што: нічога, здаецца, такога не бачыў! Як яна тут вырасла такая! У звычайнай сляпой хатцы! Цуд нейкі, і толькі! І краса, і разам – годнасці колькі! Розум які свеціцца! Здзівіўся: як ён не пабачыў гэтага першы раз! Аслеп тады ад няўдачы. За гэтым згадваў, чуючы, як у грудзях гарачэ: «Да цябе прыехаў... Цябе пабачыць хацеў...» Словы гэтыя, здавалася, гучалі ў галаве. Асабліва ж гучала, моцна, нецярпліва, завабна: «Заўтра... Як сцямнее... Каля дарогі...» Згадваў, як яна кіўнула, і нібы не паверыў шчасцю...

Чым далей, тым больш, аднак, у душу ўпаўзала іншае. Жаданае, добрае хмарыла няпрошаная, непрыемная прыкрасць. Згадваў з няёмкасцю, як сустрэўся, гаварыў з Параскаю. Як бы пачуў папрок сабе: таіўся, хлусіў! Хлусіў, і Параска гэта зразумела. Зразумела – ён цяпер бачыў гэта, здавалася, зусім ясна. Ад гэтага на душы было проста брыдка. Тады прыйшла недавольнасць наогул сабою: не ўтрымаўся на ўзроўні, збочыў з лініі. Не паказаў вытрымкі. Падатны аказаўся, слабаваты. Сваё, асабістае не стрымаў. Даў волю свайму, асабістаму. Непатрэбнаму, недаравальнаму ў такі час. Захацелася любові!..

Раптам узяло разважнае: не трэба было заязджаць. Не трэба было сустракацца. Разважнае гэта павяло далей: а можа, спыніцца, адмовіцца? Вядома, адмовіцца трэба. Сказаць, што не мае часу, заняты. І скончыць тым.

Але з гэтым было: якая краса! Яе неспакойны позірк, адчуванне блізкасці. «Заўтра. Як сцямнее...» Непатрэбнае, яно хораша цяплела ў грудзях, вабіла. Сціскала сэрца чаканнем.

«Спыніцца. Спыніцца трэба...» – думаў ён.

3

Пакуль ехаў дадому, думкі Башлыкова блыталіся.

Дома, у кабінеце, дзе адразу абступілі звыклыя, значныя клопаты, тое, што адбылося ў Глінішчах, здалося раптам зусім простым і далёкім. Яно, праўда, час ад часу прабівалася ў важны, раённы свет яго кіруючых турбот, адцягвала на момант думкі, але Башлыкоў без асаблівай цяжкасці адганяў яго.

Увечары, калі навалач турбот сышла і застаўся адзін, яно, тое далёкае, зноў падабралася. Дзіўная рэч: удзень амаль рашыў, што ўсё,

адмовіцца, скажа, што няма часу, і скончыць тым. А тут як бы і не было той цвёрдасці. Зноў нібы пачуў: «Заўтра. Як сцямнее...» Зноў убачыў, як яна кіўнула. Згадаў, як радасна заблішчалі вочы, калі ўбачыла адразу. Успамінаючы ўсё, чуў, бачыў: любіць яго. Такая красуня любіць! Мала хто ведаў, што Башлыкоў быў вельмі падатны жаночаму хараству. І калі дадаць да гэтага тое, што ведалі многія: што Башлыкоў быў аж занадта самалюбны, то можна ўявіць, як цешыла яго цяпер разуменне, што чалавек такога хараства хінецца да яго. Што заўтра яны будуць разам, адны.

Башлыкоў узрушана захадзіў па пакоі. Засунуўшы рукі ў кішэні галіфэ, молада, імкліва стаў мераць кабінет. Бачыў, здавалася, побач яе, перад сабой, твар у твар. Чуў, здавалася, цяпер яе. Чуў сябе маладым, дужым, удачлівым.

Не адразу супакоіўся. Калі захадзіў спакайней, падумаў: яна ўражвала яго не толькі знешнім хараством, але і нечаканым багаццем унутранага жыцця. Нейкай незвычайнай, трапяткой чуласцю. Цэлы свет угадваўся ў ёй, вабіў, клікаў. І хто б мог падумаць – прыйшло недарэчнае: звычайная прыбіральшчыца. Ён, праўда, тут жа спыніўся, цвяроза папракнуў сябе, што разважае, як арыстакрат, як законны дваранін. Дваранін з залінейных гомельскіх баракаў. Падумаў са з'едлівай насмешкай з сябе: адкуль гэта ў яго з'явілася такая вышэйшасць! Нагадаў сабе: кожная кухарка павінна навучыцца кіраваць дзяржавай. Далучыў упэўнена: гэта так званая прыбіральшчыца зможа. Калі даць толькі падвучыцца.

Ён стаў думаць пра яе. Ён адчуваў, што так мала ведае яе. Хто яна? Чаму яна ў школе? Чаму не з бацькамі? Ці вольная, не замужняя? Яна не падобная на дзяўчыну. Відаць, была замужам, відно: нямала паспытала. Успомніў, як стрымлівалася, падумаў: а можа, і цяпер замужам?.. Не, запярэчыў адразу – калі і была, то разышлася. Інакш не жыла б адна, пры школе. Свайго кутка няма. А калі быў муж, то хто ён? Чаму разышліся? Ці – з'ехаў куды? Багата пытанняў раптам узнікла, і яны так закарцелі, што Башлыкоў перастаў хадзіць, гатоў быў усё зараз жа высветліць. Ён ледзь не ступіў да стала, да тэлефона – выклікаць каго трэба, загадаць высветліць. У час схамянуўся, што выклікаць нікога нельга. Не толькі таму, што ніхто тут такога не ведае, а і таму, што так лепш – не высвятляць. Нельга дапускаць у гэта нікога.

Пашкадаваў: мог бы высветліць там, былі нагода і час. Успомніў доўгае маўчанне, з-за гэтага, падумаў цяпер недавольна, многае і засталося недагаворанае. Зазлаваў на сябе, што лічаны час быў страчаны так па-дурному. Пра што б ён ні думаў, сярод усяго

неадступна тачылася ў яго вінаватасць, што адступіўся ён ад дзённага, належнага: адмовіцца, скончыць, і ён думкаю ўхапіўся за згаворлівае, што апраўдвала яго. Нельга канчаць так, як ён думаў раней. Трэба пабачыцца. Пагаварыць, высветліць усё і тады развітацца. Сумленна і годна...

Аднак ён да гэтага часу пастражэў ужо да сябе і асудзіў гэты хітраваты подступ, што прыхоўваў маладушнасць. Як бы там ні было, трэба называць усё сваім імем. Што ёсць – тое ёсць. Не можа справіцца з сабою, са сваім жаданнем. Непатрэбным жаданнем. Не можа ўтаймаваць дурной крыві, якая не ў час разгулялася. Мужчынскага імпэту, якому захацелася жанчыны. Бабы. З гэтым злым нездавальненнем увайшла няёмкасць за сябе: да чаго ж, відаць, недарэчна выглядаў перад ёю. Як хлапчук. Вярнулася прыкрасць ад таго, як ён нікчэмна маніў Парасцы. У гэты момант у злосць яго, што давала добрую дужасць, раптам увайшло кволае, амаль беспараднае: што ж гэта завязалася, што будзе? Пачуў жаль: як ён кіне сам такую красу?! Такое шчасце...

Думкам не было ладу. Заблытаўшыся ў думанні, ён зноў зазлаваў на сябе, на ўсё і падужэў. Намогся, адкінуў бескарыснае думанне. Узяўся думаць пра паездку. Згадаў, як хадзіў па Куранях, па Мокуці, гаворкі, адчуванні. У душу ўлілася злосць на людскую дурнату, на сляпую ўпартасць. Зноў убачыў нядобрыя твары, сярод іх вылучыліся Ігнат і Яўхім Глушакі. Нібы паўтарылася, ясна і ўнізліва, размова з Гайлісам. Нічога не разумее, апартуніст аслеплы! З-за такіх вось, з-за ліберальных дабрадзеяў, і бяда ўся, прарыў у раёне! На бюро, гэта правільна, адзіна правільна. І абавязкова – аргвывады! Трэба належныя кадры! З такімі і тое, што ёсць, загубім.

Кадры – аснова ўсяму. Башлыкоў заўсёды надаваў асаблівае значэнне кадрам. Ён потай быў перакананы ва ўменні сваім падбіраць кадры, з таго, што было пад рукой, выкарыстоўваць лепшае для справы. Ён бачыў: ідэальных па ўсіх якасцях людзей мала – і таму ведаў, як няпроста выбраць тое, што трэба. З усіх патрабаванняў, якія ён выстаўляў да чалавека, найпершымі былі палітычныя якасці чалавека, яго адданасць справе. Тут ніякіх кампрамісаў ён не рабіў ніколі. Палітычная надзейнасць была неадменнаю ўмоваю прыдатнасці чалавека. Усё іншае даводзілася вырашаць, кіруючыся складанай жыццёвай дыялектыкай. Тут і выяўлялася тое, што Башлыкоў лічыў сваім уменнем.

Башлыкоў ужо і сам не помніў, калі ўзнікла ў ім нездавальненне Гайлісам. Даўно ўжо стала карцець думка, што трэба б замяніць некім гэтага ўпартага, недалёкага чалавека, які нярэдка гне нейкую сваю

лінію. Можна сказаць, гэта думка акрэслілася канчаткова на сходзе ў Глінішчах. Тады ж, на недалужным гэтым сходзе, кінулася ў вочы і асоба Дубадзела. Едучы з Алешнікаў, Башлыкоў не так сабе падсадзіў у свой вазок яго, рашыў прыглядзецца, праверыць.

Мераючы цяпер кабінет, уткнуўшы рукі ў галіфэ, Башлыкоў заглыблена думаў пра Дубадзела. Думаў не з бескарыснай цікаўнасцю, а з дзелавой заклапочанасцю. Як пра кадравага работніка. Развагі былі няпростыя. Ведаў: Дубадзел малакультурны, грубаваты. П'е. Ва ўсякім разе – піў. Быў ужо старшынёй сельсавета, правалілі. А разам з гэтым – дзелавітасць, веданне народа. Веданне мясцовых умоў. Паходжанне, даныя ўсе – што трэба. Ніякіх заган са сваякамі. Мінулае – чыстае. Былы чырвонагвардзеец. А галоўнае – адданасць якая і рашучасць. І энергія – пазайздросціць можна. Гэты цацкацца з кулаччом не будзе.

Піў – гэта агідна. Пра гэта папярэдзіць трэба, са ўсёй строгасцю. Папярэдзіць, што за такое з партыі гнаць будзем... Малакультурны і грубы – а дзе ты знойдзеш даволі культурных, адукаваных? Мала іх. Ды і ці многа сярод гэтых культурных, адукаваных так адданых, з такой рашучасцю! І гэта ў такой абстаноўцы, дзе неабходны цвёрдыя, жалезныя! Здольныя крышыць ворага, рушыць усё, што на шляху замінае. Гэты – цвёрды, гэты – крэмень, барацьбіт. Гэта – галоўнае. А недацягвае ў нечым – падымаць трэба. Расціць трэба, правільна накіроўваць! Добра кіраваць – усё ў гэтым!.. Ды калі падумаць толкам – палітычны кірунак ён разумее нядрэнна. Ёсць палітычнае чуццё. Тэарэтычна не аформленае, а ёсць. Стыхійнае, але правільнае. Лепшае, чым у некаторых засохлых ад кніг грамацеяў.

Так што галоўнае выходзіла на карысць Дубадзела. Гэта супакойвала Башлыкова, давала яму адчуванне нямарнасці пражытага дня, абнадзейліва звязвала з будучымі днямі.

4

Пасля таго як Башлыкоў паехаў і Параска вярнулася, Ганна не ведала, дзе дзець вочы.

Стала раптам такою вінаватаю перад Параскаю, было так нядобра перад ёю, а трэба было быць разам. Падаваць абед, сядзець насупраць, абедаючы: так было ўжо ў іх заведзена. Сядзець вочы ў вочы пасля таго, што адбылося, і не паказваць, што ў цябе на душы.

Ганну гняло разуменне таго, што яна стала раптам між Башлыковым і Параскаю. Убілася ў іх дружбу ці, можа, і любоў, адвяла Параску ўбок, пабурыла, лічы, яе шчасце. Аддзячыла, можна

сказаць, Парасцы за ўсё добрае, што тая зрабіла для яе! Аддзячыла – больш няможна: адбіла кавалера! Няхай не таму, што яна, Ганна, старалася для гэтага; як бы там ні было, на віду будзе адно: адбіла! Улезла ў чужое шчасце, адхапіла!

Ды і то сказаць, калі добра падумаць, прыгледзецца, не такая ўжо яна і невінаватая. Не старалася, праўда, асабліва, але – чаго таіцца перад сабой – хацела ж гэтага, зайздросціла Парасцы. Няхай не старалася, а неяк, пэўне, дала знак, што рада б! І не спыніла ж, не адрэзала, калі здарылася ўсё! Так што не такая ўжо і невінаватая. Вінаватая!

Асабліва няёмка было сядзець перад Параскаю таму, што добра чула: Параска, вострая на вока, адразу прыкмеціла, што яны, Ганна і Башлыкоў, нядобра тояцца. Што між іх, значыць, нешта здарылася, паганае для яе. Кепска на душы было Ганне яшчэ і таму, што, хоць чула сябе вінаватаю перад Параскаю і хоць разумела, што павінна была б расказаць пра ўсё сама, павінавацціцца, ні расказваць, ні вінавацціцца не магла. Як бы разам адняло мову і сумленне.

Калі праўду казаць, то маўчанне і стрыманасць Ганны тлумачыліся не гэтымі прычынамі, а тым, што яна была яшчэ вельмі ўзрушана ўсім, што раптам звалілася на яе. Яна не магла яшчэ прывесці да ладу свае пачуцці і думкі, разабрацца ў іх.

Параска, прытворшчыца, сёрбала гарачы боршч, ела дранікі з такой ахвотай, нібы згаладалася немаведама як і нібы ў гэтым, у ядзе, была найвялікшая радасць. Яна такі, праўду сказаць, любіла паесці, ведала смак у ядзе, але сёння, бачачы, як яна кідаецца на боршч, на дранікі, Ганна не верыла ёй. Бачыла, здавалася, што тоіцца, што збіраецца, вось-вось выбера момант і скажа. Не, паабедала і хоць бы знак які падала, як яна глядзіць на тое, што здарылася.

Калі ўстала з-за стала, давольная, абцерла губы, пахваліла:

– Смачна паела!.. – Амаль папракнула весела сябе: – Наелася на два дні!.. – Мелькам, весела ж, зазначыла: – Дарэмна ён не застаўся! Не пашкадаваў бы!.. – Заплюшчыўшы соладка вочы, пацягнулася, нібы спалохалася: – Ой, на сон нешта павяло!.. – Яна пазяхнула, потым выпрасталася, нязгодна крутнула галавой: – Не, спаць няма калі! Трэба – за сшыткі!

З выгляду рашучая, нібы ганарлівая, той цвёрдай хадою, якою кіравала звычайна ў клас, на заняткі, падалася ў свой пакой. Крокі там амаль адразу ж запыніліся, чыркнула, пасоўваючыся, гнутае з дручкоў, з фанерным донцам, крэсла, што стаяла каля стала і на якім Параска любіла сядзець, і ўсё сціхла. Падобна было на тое, што Параска села-такі за стол, правяраць сшыткі.

Праверка сшыткаў, ведала Ганна, – доўгі клопат.

Калі толькі яна будзе сапраўды чытаць, то гэта надоўга. Надоўга ці ненадоўга ўзяла яна сшыткі, Ганна пачула палёгку. Можна нарэшце пабыць адной, перадыхнуць.

Прыбрала са стала, перамыла посуд, праз калідор выйшла ў клас, стала прыбіраць там пасля дзённых заняткаў. Рабіла ўсё хутка, нецярпліва, як бы хацела перадаць, збыць з душы той неспакой, што неадступна вярэдзіў яе. Сярод класа раптам кінула мокрую анучу, якой мыла падлогу, з адчаем села на парту, бяссіла апусціла рукі на калені. «Заўтра. Як сцямнее...» – біла, здавалася, у скроні.

Горача было. Задыхалася нібы. Аж паверыць няможна. Як бы выдумка якая: «Да цябе прыехаў... Заўтра. Як сцямнее...» Думкі рваліся ў тое заўтра, на шлях. Галава тлумілася ад гэтых думак. Радасць залівала ўсю. Радасць і неспакой. І радасць, і неспакой былі моцныя, грымелі проста, здавалася, на ўвесь пакой. Першы час не магла саўладаць з імі, не магла думаць ні аб чым. Потым ужо вылучылася неспакойнае: што ж гэта значыць? Што будзе? Нарэшце зусім стрымала сябе, зірнула на ўсё стомлена і, як бы працверазеўшы, прысудзіла сабе: «Нічога не будзе. Нічога!»

Калі паспакайнела, стала большназаляць тая вінаватасць, якую чула перад Параскаю. Нейкі час думкамі горача даводзіла не то сабе, не то Парасцы, быццам тая стаяла перад ёй, чула, што не рабіла нічога для таго, не старалася ніяк. Скончылася гэта тым, што яна рашыла смела: пайсці да Параскі, вылажыць ёй усё, як яно ёсць і як было, няхай ведае. І няхай не думае, чаго не трэба. Не думае няхай, што яна, Ганна, такая, як ёй, мабыць, здалося.

Спусцілася з парты, выцерла рукі аб фартух, прыгладзіла валасы. У калідоры, перад тым як адчыніць пакой, прыпынілася, пачула цішыню ў Парасчыным пакоі. Мудра не паверыла цішыні. Не чытае, канешне, сшыткаў сваіх. Не да чытання. Сядзіць, няйнакш, і думае: каго прыгрэла?..

Упэўненай рукой адчыніла дзверы, рашуча ступіла. Ведала: будзе непрыемная, цяжкая гаворка, але гатовая была да яе. Скажа ўсю праўду. Няхай не думае. Ступіла і здзівілася, узяло расчараванне: Параска хілілася за сталом, чытала. Вочы пільна бегалі па лістках, аловак раз-пораз хутка ставіў знакі. Знаёмы чырвоны аловак.

Не азірнулася нават на Ганну. Ганна бачыла: не прыкідваецца, уся ў клопаце. У сшытку сваім.

У такія хвіліны Ганна раней выходзіла з пакоя. Цяпер цвёрда пайшла да стала, села побач на табурэт. Выказаць усё адразу. Скінуць з сябе.

– Параска, – прамовіла строга, тонам загаду.

Тая, не адрываючыся ад сшытка, матлянула галавою: пачакай. Пабегла вачыма далей па радках, паставіла хутка некалькі знакаў.

Ганна зазлавала:

– Ды паслухай ты!

– Пачакай, патрывай!.. – зноў крутнула галавой. – Бачыш жа...

Толькі дачытаўшы, паставіўшы ў канцы апошняе – адзнаку, подпіс, узняла галаву. Зірнула надзіва лагодна, з усмешкай.

– Ну што?

– А от што! – Ганна знарок выказвала злосць. – Не знала ты, каго брала к сабе!

– Ты чаго гэта? – здзівілася Параска. Здзівілася, бачыла Ганна, шчыра.

– А таго! – Ганна гаварыла задзірыста. Нібы падбівала Параску на спрэчку. З націскам, са злосцю аб'явіла: – Папрашчайся са сваім Башлыковым!

Параска, было відаць, не зразумела нічога.

– Папрашчацца... Чаму?

Ганну ўздымала рашучасць.

– А таму! – Рэзаць, дык рэзаць адразу: – Адбіла я яго ў цябе!

Параска, праўда ж, усё не магла ўразумець як след тое, што ёй казалі.

Можа, падумалася Ганне, гэта ад таго, што яна гаварыла Парасцы нібы з насмешкай над сабой. Нібы не сур'ёзна.

– Калі ж ты ўправілася! – засмяялася раптам Параска. – От і не падумала б!

У голасе ПарасКі было захапленне. Быццам хваліла Ганну.

– Ты не смейся. Спатканне назначыў, – сказала Ганна строга.

Як ні рашуча настроена была, нядобра было. Твар гарэў, дыханне сцінала. Вінаватаю перад Параскаю, навек вінаватаю чула.

– Спатканне? – не паверыла Параска.

– Спатканне.

Параска нарэшце зразумела ўсё, перастала смяяцца. Але жалю не паказала. Проста, годна прамовіла:

– Што ж, віншую.

Было трохі маўчанне.

– От каго ты прытуліла! – не вытрывала Ганна.

Параска доўга глядзела ў сшытак. Нерухома ўжо. Ціха сказала:

– Не думай пра гэта. Пра мяне.

Трэба было б пайсці: галоўнае ж зрабіла. Але не магла ўстаць. Не адразу выказала:

– Што ў вас було?

Параска ўсё глядзела ў сшытак.

– Што было? – Павольна, цвёрда прамовіла: – Нічога не было.

– А казалі... Чула я…

– Разы тры заехаў. Увесь грэх.

– А гаварылі ж... – У Ганніным голасе быў папрок.

Параска ўскінула вочы, адолела тугу. Пажартавала нават:

– Глядзі, каб пра цябе гаварыць не сталі...

Ганна бачыла: туга ўсё таілася ў Парасчыных вачах. Не адазвалася на жарт.

– Ні на што мне ўсё ето, – прамовіла цвёрда, шчыра. – Да і не пара мы. Што дуб і лаза... Не дацягнешся... Каб і можна було...

– Ну, ты гэта – глупства, – задуменна запярэчыла Параска. – Невядома яшчэ: каму да каго цягнуцца.

– Сказала!

Параска маўчала. Ганна дадала наастатак:

– Да і ні да чога ўсё ето.

Калі Ганна ўзнялася, Параска адразу ўзяла наступны сшытак, разгарнула, пабегла вачыма па радках.

А Ганна не магла супакоіцца. Вярнуўшыся ў клас, паспрабавала зноў мыць падлогу – і не здолела. Кінула анучу ў вядро. Сядзела за партай, хадзіла па пакоі, тады выйшла на ганак, на халодны вецер. Думала, што, можа, на холадзе паспакайнее. Вечарэла. Далячынь – балотны хмызняк – агортваў сумны прыцемак. Сумны вячэрні прыцемак клаўся і на хаты, на вуліцы, на двор перад школай. А ёй было, насуперак усяму, радасна. Цяпер, калі ўсё выказала Парасцы, калі Параска як бы дазволіла, дык радасць гэта нібы выбавілася на волю, падужэла. Захапіла мацней.

Яна не ўспамінала, яна ўся жыла адчуваннем незвычайнага. Такога дзівоснага, што, хоць сама бачыла і чула, проста не верылася. Як гэта магло здарыцца з ёй, якой усе гады так не шанцавала? Як магло зваліцца іменна да яе такое шчасце? Як выдумка.

Адно вылучылася з усяго, білася, паліла, спявала: «Да цябе прыехаў... Цябе пабачыць хацеў... Заўтра, як сцямнее. На шлях...»

«Заўтра. Як сцямнее». Заўтра. Заўтра.

Не, і цяпер радасць была нядоўга адна. Не тая цяпер была Ганна, каб так лёгка паверыць у шчасце, ды яшчэ такое. Якое і ўявіць сабе нельга і якое так нечакана зваліліся да яе. Неспадзеўкі і нібы не па закону.

Стаяла ў кофтачцы, без хусткі. Рукі былі яшчэ закасаны. Вецер сцінаў усю. Стрымліваючы дрыжыкі, знарок кпіла з сябе: знайшла

шчасце, дурная! Само ў рукі ўляцела! Трымай мацней! Халодны вецер такі выдзімаў тлум з галавы, думалася ясней. Цвяроза прысудзіла сабе: нічога не будзе з усяго гэтага. Пустое! Не пара яму! Прыбіральшчыца!.. Не такую яму трэба!

Параска – от хто яму пара!

«Пара не пара, а от выбраў! – запярэчыла ў ёй неразумнае, даверлівае, што вельмі ж не хацела траціць радасць. – Выбраў! Не Параску, а яе, Ганну, выбраў!» – «Выбраў! – пакпіла яна з той даверлівай дурніцы. – Захацелася пацешыцца мужчыну. Падурэць трохі: маладая кроў! Пабачыў – адзінокая, вольная!..» – «Адзінокая, вольная, – адразу падхапіла тая, якой так хацелася шчасця. – А Параска – не вольная?..» – «Вольная – ды не такая, няпростая. Да гэтай так не падыдзеш, не пазавеш так зразу!..»

Вучыла сябе розуму, а не разумела. Не слухалася ўсё ж сама сябе. Не даходзілі неяк, не бралі цвярозыя перасцярогі. Калі азіралася на тое, што было, які быў ён, калі казаў «да цябе», «заўтра» – чулася, верылася: няпроста і ў яго. Не так сабе казаў. Упадабаў. Бачыла, не сляпая. Упадабаў.

Трымаўся, праўда, важна, аж лішне. Але, відаць жа было, знарок гэта: гонар свой мужчынскі помніў. І начальніцкі гонар не забываў. Ганарлівы аж занадта, відаць. З-за гонару, не інакш, так багата маўчаў, нібы не адважваўся паступіцца. І сказаў толькі некалькі слоў, і то не адразу, і не абы-як. Дзівілася, згадвала з ухвалаю: далікатны які, не дакрануўся нават, не тое што не палез сляпіцаю, як нашы вясковыя. Ведама, культура.

А можа, і ад таго такі – радасна хацелася гэтага, – што ўпадабаў. Як ні стрымлівала гэта, баючыся памыліцца, весела чула: сілу мела над ім. І ён знаў гэта. Таму і быў такі, не падобны на сябе, ціхі, стараўся адолець гэта. Стараўся і не змог! Сказаў: «Да цябе прыехаў!» Да цябе адной. Не магла думаць інакш, як пра дзіва: такі чалавек быў неабыякавы да яе. Прыкмеціў, выбраў, захацеў яе, іменна яе. Такі дужы, такі разумны, такі строгі!

Вярнулася ў клас, запаліла лямпу. Стала завіхацца. Потым кінула ўсё, зноў села, задумалася. Зноў судзіла сябе: не строй, дурная, свят. Не будзе ў цябе нічога. Не пара!..

Не будзе, і няхай не будзе, унізалася яшчэ адно цвярозае. Можа, ёй нічога і не трэба. Ёй, можа, і таго даволі, што ёсць. І тое – свята ёй...

А наогул – няма чаго сушыць галаву.

Раздзел другі

1

Познім завейным вечарам, апошнім вечарам дваццаць дзевятага года, вяртаўся Апейка з «раёна» дадому. Вецер, што ні на момант не ўціхаў, налятаў то збоку, то спераду. Збоку і спераду гнаў снег, кідаў яго на коней, на вазок, у твар Ігнату, у твар Апейку. Клубы абодвух коней былі белыя, у вазку было поўна снегу, снег лажыўся на грудзі, на плечы паліто, біўся ў вочы. Коні то беглі, паслізгваючыся, па голым шляху, то грузлі, важка лезлі ў сумётах, якія ўжо часта перагароджвалі шлях. У посвісце ветру амаль няўціхна было чуваць цягучае, неспакойнае гудзенне правадоў.

Было цёмна. Ад завеі не было відаць агнёў нават недалёкіх вёсак, ды і блізкія слупы ішлі ў цемры ледзь прыкметнымі мутнымі знакамі. Відаць былі адно рухлівы перадок вазка, конскія клубы ў мерным пакалыханні ды хвасты, якія матляліся ад бегу і ветру. Апейка чуў, што ногі мерзнуць, засоўваў іх у сена, утульваў ад ветру і снегу твар у каўнер. Як праз дрымоту, адзначаў лёгкі лёт, з посвістам, па санных каляінах, важкі скрып па голых прагалінах, павольны, мяккі рух у сумётах. Ён драмаў, дрымота была такая, што відовішчы сну, ява, трызненне, думкі мяшаліся, зблытваліся так, што і сам не дабраў бы ладу. Ён амаль не спаў некалькі начэй і, як толькі рушылі з сяла, адразу, нібы з надмернай ношай, уваліўся ў сон. Але сцюжны вецер неўзабаве, хоць і не дарэшты, разварушыў сон. Апейка то драмаў, то расплюшчваў вочы і бачыў поле, панылы хмызняк, слупы, то зноў заплюшчваўся і адно чуў снег, вецер, посвіст, пад якія рвана, бязладна ішлі, выходзілі думкі. У дрымотнай душы было то неспакойна, то клопатна, то радасна. У хвіліны яснасці ён некалькі разоў лез рукой пад паліто, нахаладалымі, непаслухмянымі пальцамі даставаў вялікі і нязвычна коўзкі кішанёвы гадзіннік, падносіў да самых вачэй, узіраўся – ці не позна? Ён выехаў пазнавата: нельга было раней ды і спадзяваўся, што дарога будзе лягчэйшая; а гэта завея запыняла, і ён баяўся, што не ўправіцца. У цемры лічбаў на гадзінніку амаль не было відаць: ён хутчэй здагадваўся, чым бачыў – колькі часу. Позіркі гэтыя на гадзіннік іншы раз былі і ад таго, што сядзець нязрушна станавілася сумна, што таміў нейкі цьмяны, няпэўны, як змрок навокал, неспакой.

У галаву лезлі малюнкі і галасы гэтых пяці неспакойных, амаль бяссонных сутак, амаль няспынных сходаў, гаворак, пераконванняў, спрэчак. Яму раптам у дрымоце так ясна бачыўся які-небудзь твар,

чуўся які-небудзь голас, што ўсё гэта як бы нанава станавілася яваю, і ён зноў як бы ўрываўся ў гоман, у галас, гаварыў тое, што не знайшоў тады, як трэба было, што трывожыла і цяпер. Як заўсёды, у гэтыя хвіліны, хвалюючы, гарачачы, набягалі раптам вельмі ўдалыя доказы, трапныя адказы. І ў дрымоце яго таміла адчуванне незавершанасці, неразвязанасці тых гаворак-спрэчак, імкненне адолець, даказаць, пераканаць іх у сваёй, у цяжкай іхняму разуменню праўдзе. Ён ішоў, прабіваўся, даказваў – думкамі яшчэ як бы прадаўжаў тое, чым жыў усе дні і ночы. Ён мог бы быць давольны: недарэмна ночы не спаў, расцінаўся, аж у галаве гуло, аж ахрып: за пяцёра сутак яшчэ амаль пяцьдзесят чалавек сталі калгаснікамі, дакладна – сорак сем. Але амаль заўсёды цвярозая яснасць хмарыла ўцеху нярадаснай, ужо звыклай рэальнасцю: тое, што ён зрабіў, – як кропля ў моры. Амаль нічога не змяняла. Раён далёка адставаў ад таго плана калектывізацыі, які быў дадзены яму. І Апейка добра адчуваў, што ніякага радаснага дзіва чакаць не трэба. Не будзе яго. Значыцца, раёну і далей давядзецца адставаць, з усімі непрыемнымі дадаткамі для яго кіраўнікоў.

Яго душу трывожыла – і гэта было, можа, самае даўкае – памяць пра нядобрыя настроі, якія ён заўважаў і раней, але ў гэты прыезд адчуў і пабачыў асабліва моцна. Тое, што ён прыкмячаў яшчэ ўвосень, усё расло і шырылася, гразілася ўсяму раёну, ды, можа, не толькі раёну. Яны станавіліся ўсё большай перашкодай на дарозе – няўпэўненасць людзей у заўтрашнім, недавер'е да таго, што нёс ён, Апейка, іншыя ўпаўнаважаныя. Нецярплівы націск, несправядлівыя і грубыя меры, якія з часам не толькі не знікалі, а большалі, нібы падмацоўвалі закарэлае, векавое мужыцкае недавер'е ў тое, што збоку могуць прыйсці з добрым, зрабіць добрае...

Няпэўныя ў заўтрашнім, у кожным сяле рэзалі, з нязвыклай для сялянскай ашчаднасці лёгкасцю губілі нажытае – авечак, цялят, кароў. Апейка не з адным загаворваў пра гэта, не на адным сходзе пераконваў, патрабаваў – і бачыў, што нішто не дае толку. «Трэба неадкладна – нейкія строгія меры...» – падумаў заклапочана і расплюшчыў вочы: за завеяю, за рухомай аднастайнасцю прысад разабраў некалькі кустоў вышэй поля. «Курган», – здагадаўся Апейка; самога кургана не было відаць: выбелены снегам, зліваўся з навакольнай шэранню. «Скора ўжэ дома... Дацягліся...» Ён палез быў па гадзіннік, але адумаўся: усё роўна ўжо – спазніўся ці не спазніўся. Ён як бы ўбачыў жонку, сына, дачку – уявіў, як услухоўваюцца, ці не пад'ехаў вазок, ці не рыпнулі веснічкі. Нецярпліва варухнуўся, скінуў снег з паліто, выпрастаўся. Чым вышэй узбягалі коні па ўздыме

дарогі, тым мацнеў вецер, што вольна і шырока рушыў з-за Прыпяці, насустрач. Дарога пайшла тут цвёрдая, без сумётаў, падмеценая, вылізаная ветрам. Ці ад таго, што і Ігнат як бы ажыў, ці ад таго, што коні самі пажвавелі – пачулі блізка дом, – вазок па ўздыме памчаў лягчэй, лётам. Бліснуў, – здалося, весела – агеньчык, і вось ужо блізка відаць сталі і само акно, цёмны абрыс хаты – адной, другой. Уехалі ў Юравічы, у верхнюю вуліцу. На спуску зноў раз-пораз дарогу пераймалі сумёты, але тут гэта нават памагала: ямчэй было спускацца з кручы. У прарэзе між гор зажаўцела ўжо некалькі блізкіх ніжніх агеньчыкаў. Усяго мястэчка не было відаць – засцілала завея.

Жаўцеў агеньчык і ў выканкоме. Апейка затрымаў Ігната, узбег па зледзянелым – з трэскам – ганку на другі паверх. Павітаўшы, павіншаваўшы з Новым годам санлівага дзяжурнага, які адказаў узрадавана, голасна, – убег у свой пакой, хапаючыся, запаліў лямпу. На стале было некалькі лістоў папер, паперка са зводкай аб стане калектывізацыі ў раёне. Ён паглядзеў: дваццаць дзевяць і сем дзесятых працэнта. Пісана рукою Зубрыча, унізе яго ж акуратны, сціплы подпіс.

Лісты, паперы. Адносіны з Мазыра: на папяроснай паперы, пад капіроўку – хутка прагледзеў адну, другую. Разарваў канверт, дастаў пісьмо. Чытаючы, схамянуўся, адкінуў крысо паліто, дастаў гадзіннік: яшчэ не позна. Можна ўправіцца. Сабраў паперы, лісты ў папку. Узяў тэлефонную трубку, крутнуў ручку. Райкомаўскі дзяжурны адазваўся адразу. Башлыкова яшчэ не было. Не вярнуўся. Ужо сабраўшыся ісці, Апейка кінуў позіркам на стус газет, складзеных ускрай стала. Заўважыў адразу на верхняй: «І.Сталін. Да пытанняў аграрнай палітыкі ў СССР». Забраў увесь стус пад паху, хукнуў у лямпу і рынуў уподбег назад.

Ледзь сеў у вазок, Ігнат шмаргануў коней. Даляцелі дамоў умомант.

– Прывяжы пакуль – ды ў хату. Здаецца, управіліся!..

Тут намёрзлыя ступенькі таксама трашчалі пад нагамі нецярпліва і радасна. Стукаць не трэба было: дзверы нібы самі адчыніліся. У цёмных сенцах абняў жонку. У хату ўвайшоў, абдымаючы за галаву сына. Валодзя папракнуў:

– Каб трохі, пачалі б без цябе.

– Усё-ткі ж управіліся!

Стол быў засланы белым абрусам. На стале ўсё было падрыхтавана да сустрэчы. Ніначка, што таксама не спала, адразу пабегла да стала. Апейка пацалаваў яе, хутка скінуў паліто, рушыў

умывацца. Калі вярнуўся, Ігнат быў у пакоі ўжо, і лямпа гарэла ярка, святочна. Вера памагала Ігнату распрануцца.

– Што ж, каб гэты год быў не горшы за іншыя. За шчасце ўсіх нас!.. – Апейка па чарзе паднёс да ўсіх сваю чарку: да малых, якім налілі чырвонага морсу, да Веры, да Ігната.

Ігнат, як і каля коней, трымаўся за сталом чынна. Сказаўшы за Апейкам: «За тое, штоб дабро не пераводзілася ў етым доме!» – ён потым і піў, і закусваў ужо моўчкі. Як і ў дарозе, і ў сёлах, ён трымаўся незалежна, з годнасцю, як бы паказваючы ўсім, што ведае мяжу, якая ёсць паміж ім і старшынёй. Ён і тут не бянтэжыўся – ды і чаго было бянтэжыцца: свой, лічы, даўно ў хаце, – але і не дапушчаў, хоць павесялеў ад гарэлкі, якой-небудзь вольнасці. Вера гасцінна сачыла, каб у яго ўвесь час было і выпіць, і закусіць. Ён браў гэта як належнае, са звычайнай паважнасцю.

Ігнат не спяшаўся асабліва, але неўзабаве паважна ж устаў, падзякаваў. На Верына запрашэнне пабыць яшчэ сказаў цвяроза:

– Не. Трэба і пра другіх не забуваць. – Апейка здагадаўся: «другія» на той час – коні.

Апейка правёў яго на ганак, хвіліну пастаяў пад павевамі халоднага ветру. Весела пайшоў зноў у бесклапотны, шчаслівы гоман і смех за сталом. Вясёлай, бясхмарнай была гэта ноч, гэта сустрэча года, які потым суджана было Апейку ўспамінаць і з нязменным гонарам, і – не адзін год – з болеснай крыўдай. Годам, у які суджана было зазнаць і вялікія радасці, і вялікія няшчасці.

Тады ж, у тую ноч, усім ім за сталом было вельмі весела. Дзеці дурэлі, рагаталі, смяяліся па-маладому, закахана тулілася Вера. Молада, хораша было і Апейку. Весялосць прыціхла ненадоўга толькі тады, калі паявілася жонка Харчава, стрымана і неяк вінавата загаварыла:

– З Новым годам вас, суседзечкі нашы! Хай будзе добра ўсё!

І гаварыла, і кланялася яна па-вясковаму. Ва ўсім яна была вясковаю жанчынаю: жывучы даўно ў «горадзе», яна, Маруся, амаль нічога не змяніла ў звычках. Нават крамныя кофта і спадніца, пашытыя ў юравіцкай швейнай, выглядалі на ёй па-вясковаму.

Вера з радасцю пасадзіла яе за стол, наліла ў чарку. Выпілі разам.

– На Новы год неяк нядобра адной. У другія дні – дак не так... А ў Новы год – дак проста сэрца смокча...

Апейка заўважыў, што яна, гамонячы па-вясковаму ахвотна, амаль увесь час услухоўвалася, ці не чуваць чаго на вуліцы, на двары. Ці не прыехаў чалавек. Добрая душою, Апейка ведаў, яна няёмка чула

сябе за свайго мужа, за яго разлад з ім, з Апейкам. Не магла згадзіцца сэрцам і абыходзілася заўсёды лагодна і вінавата, хоць і стрымлівалася і пабойвалася Харчава. От і цяпер Апейка чуў і яе дабрату, і прыхаваную апаску, што чалавек, калі пабачыць, не пахваліць. «А ўсё ж такі – прыйшла...»

Ёй не сядзелася. Пагаманіўшы столькі, колькі трэба было для прыліку, яна падалася дадому. Пайшла ў час – амаль адразу за гэтым пад'ехаў Харчаў. Ён прыехаў не адзін, з нейкімі знаёмымі, за сцяной стала адразу шумна – затупалі боты, загаманілі дужыя галасы. Апейка мімаволі прыслухоўваўся да гэтых галасоў, стараўся пазнаць, хто там: выдзеліў сярод іншых напорлівы барытон Дубадзела. Сябры! Здалося, пачуў сваё прозвішча: успомнілі! Але не разабраў – што казалі, ды і не хацеў разбіраць: яны вясёлыя, і яму няма чаго псаваць весялосці!

Пазней падляцеў яшчэ нехта. Апейка прыслухаўся да хуткіх крокаў: можа, да яго. Не, таксама да Харчава. Вера сабралася ўжо весці дзяцей спаць, калі на іх ганку пачуліся крокі. Хтосьці ўвайшоў у сенцы. Апейка адчыніў – у пакой ступіў Башлыкоў, вясёлы, п'янаваты.

– Чытаў? – Ён усміхнуўся шырока, па-п'янаму прасцецкі, як бы ўрачыста.

– Што?

На твары Башлыкова паявілася, праўда, паблажлівая, пагарда:

– Адстаеш!.. Зараз жа вазьмі! Праштудзіруй!.. – Ужо па-сяброўску, з захапленнем: – От – галава! От – розум! Недарэмна – на самым версе! Прачытаеш – і ўсё ясна становіцца! На сто вёрст наперад відаць! І ўглыб – на сто! Усё ясна! Як двойчы два!.. – Паблажліва, па-сяброўску ж папракнуў: – Ну, чаго стаў?! Як сустракаеш госця! Налі! Выпіць трэба!

Ён звонка чокнуўся, хвацка перакуліў чарку. Весела, узнята прайшоўся, стройны ў сваім амаль вайсковым гарнітуры, у хромавых ботах, дужы ў хадзе, прыгожы.

– Усё – ясна! Як двойчы два! Усё – па палічках разлажыў! Гэта – сюды, гэта – туды! Недарэмна – на самым версе! Самога Энгельса, брат, на месца паставіў!.. Зараз жа вазьмі!.. Ну, яшчэ па адной! Раз такое дзела!

Ён выйшаў так жа хутка, як і паявіўся.

2

Вера засталася ў спальні з дзецьмі, і Апейка ўзяў стус газет, палажыў на стале, дзе яшчэ былі чаркі, навагодні пачастунак. Зверху

апынулася газета, у куточку якой у рамачцы было надрукавана пісьмо Сталіна, якое ён чытаў ужо спехам, калі ехаў у раён. Пісьмо яму тады спадабалася сціпласцю, якая Апейку не здзівіла ні трохі, бо так пасавала з тым абліччам Сталіна, якое нязменна бачылася яму і якое ён заўсёды паважаў. Сталін быў Апейку чалавекам і незвычайнай адвагі, і незвычайнай цвёрдасці ў нялёгкія гады барацьбы з трацкістамі і бухарынцамі. У яго, у Сталіна, былі найвялікшыя заслугі перад партыяй, і тая сціпласць, з якой адзначылі яго пяцідзесяцігоддзе, сціпласць, якою было поўна і гэта пісьмо, яшчэ ўздымалі ў Апейку павагу да Сталіна.

З гэтай павагай ён стаў нанава перачытваць: «Усім арганізацыям і таварышам, якія прыслалі прывітанні ў сувязі з 50-годдзем Сталіна... Вашы віншаванні і прывітанні адношу на рахунак вялікай партыі рабочага класа, якая нарадзіла і выхавала мяне па ўзору свайму і падабенству. І іменна таму, што адношу іх на рахунак нашай слаўнай ленінскай партыі, бяру на сябе смеласць адказаць вам бальшавіцкай падзякай... Можаце не сумнявацца, таварышы, што я гатоў і ў далейшым аддаць справе рабочага класа, справе пралетарскай рэвалюцыі і сусветнага камунізму ўсе свае сілы, усе свае здольнасці і, калі спатрэбіцца, усю сваю кроў, кроплю за кропляй... З глыбокай павагай І.Сталін. 21 снежня 1929 года».

За гэтым, не чытаючы больш нічога, Апейка выбраў той артыкул Сталіна, пра які казаў Башлыкоў. Гэта была прамова на канферэнцыі аграрнікаў-марксістаў 27 снежня 1929 года. З першых радкоў прамова зацікавіла Апейку: Сталін гаварыў пра тое, што найбольш хвалявала – пра калгасы, пра калгасны рух. «Калгасны рух ператварыўся з руху асобных груп і праслоек працоўных сялян у рух мільёнаў і мільёнаў асноўных мас сялянства...» «Але калі мы маем падставы ганарыцца практычнымі поспехамі сацыялістычнага будаўніцтва, то нельга тое ж самае сказаць пра поспехі нашай тэарэтычнай працы ў галіне эканомікі наогул, у галіне сельскай гаспадаркі ў прыватнасці...» Багата што з таго, што чытаў Апейка, пераклікалася з тым, пра што ён думаў, як бы падмацоўвала яго развагі, давала яго думкам упэўненасць і зладжанасць. Яснасць, лагічнасць, прастата, з якімі Сталін тлумачыў, раскрываў самыя складаныя, супярэчлівыя праблемы, надавалі радасную яснасць і прастату і думкам, якія не адзін раз вярэдзілі Апейку. Звыклы верыць розуму Сталіна, цешачыся, што от яны ёсць самыя дакладныя адказы на самыя трудныя пытанні, Апейка проста ўбіраў у сябе думку за думкай, развагу за развагай. Ён ахвотна згаджаўся з усімі доказамі, цвёрдымі, абгрунтаванымі, якімі Сталін разбіваў адну за адной

буржуазныя тэорыі ў сялянскім пытанні. Падуладны роўнай, моцнай плыні сталінскай логікі, ён гатоў быў, здаецца, даверліва ісці за прамоўцам да канца, калі раптам наткнуўся, як на нечаканы пень, на адну думку. Думка гэта здзівіла, запыніла ўвагу. Ён, яшчэ добра не цямячы, як бы не верачы, што не памыліўся, перачытаў неспадзяваны радок другі раз. Не, ён не памыліўся – так і было напісана: «У нас няма... рабскай прывязанасці селяніна да шматка зямлі... якая ёсць на Захадзе...»

Няма? Няма – «рабскай прывязанасці да зямлі»?.. Сталін тлумачыў гэта тым, што ў нас няма прыватнай уласнасці на зямлю. Ён лічыў, што гэта «акалічнасць» «не можа не аблегчыць» пераходу сялян «на рэйкі калгасаў». Больш таго, ён гаварыў, што гэта дае калгасам магчымасць «так лёгка» дэманстраваць свае перавагі перад аднаасобнымі сялянскімі гаспадаркамі. З дзіўным адчуваннем, з разгубленасцю чытаў Апейка тое, як Сталін тлумачыў, чаму Энгельс у сваёй брашуры «Сялянскае пытанне» раіў быць асцярожнымі і ўважлівымі да селяніна, ведучы яго на новую дарогу калгаснага жыцця. Гэта, мабыць, было тое, што ўзрадавала Башлыкова: «Самога Энгельса на месца паставіў!» Апейку зноў усхвалявала вялікая чуласць, з якой пісаў пра селяніна Энгельс: «Мы будзем рабіць усё магчымае, каб яму было лягчэй жыць, каб аблегчыць яму пераход да таварыства...» Сталін не пярэчыў, згаджаўся нібы з Энгельсам; але ўслед гаварыў такое, што можна было думаць: чуласць да селяніна, пра якую пісаў Энгельс, неабходна нібы толькі на Захадзе. Дзе ёсць прыватная ўласнасць на зямлю. «Ці можам мы сказаць, – што ў нас, у СССР, ёсць такое ж становішча? – спытаўся Сталін і тут жа адказаў: – Не, нельга гэтага сказаць. Нельга, бо ў нас няма прыватнай уласнасці на зямлю, якая прыкоўвае селяніна да яго індывідуальнай гаспадаркі. Нельга, бо ў нас ёсць нацыяналізацыя зямлі, якая аблягчае справу пераходу індывідуальнага селяніна на рэйкі калектывізму... Вось дзе адна з прычын, – упэўнена гаварыў Сталін, – той параўнаўчай лёгкасці і быстраты, з якой у нас развіваецца ў апошні час калгасны рух...» Тут Апейка зноў спыніўся, вярнуўся, перачытаў сказ. Сталін лічыў, што калгасны рух расце «параўнаўча лёгка»! Лёгка!

Нецярплівая цікавасць павяла Апейку далей, але сачыў ён за прамовай Сталіна ўжо як бы з насцярожанасцю. Згадзіўся, што і ў калгасах застануцца яшчэ элементы класавай барацьбы, што там могуць быць перажыткі індывідуалістычнай ці нават кулацкай псіхалогіі, некаторая няроўнасць у матэрыяльным становішчы. Раптам напаткаў ленінскую думку, душа ўзяла яе ахвотна, узрадавана: у словах Леніна была падтрымка таму, што нарадзілася з

незлічоных сустрэч з людзьмі і што разам як бы пярэчыла поглядам некаторых лішне хуткіх, «прынцыповых» дзеячаў. Апейка хапатліва пашукаў аловак у пінжаку, акуратна, задаволена двойчы адкрэсліў збоку. Перачытаў, стараючыся запомніць слова ў слова: «Справа пераробкі дробнага земляроба, пераробкі ўсёй яго псіхалогіі і навыкаў ёсць справа, якая патрабуе пакаленняў». «Пакаленняў!» – паўтарыў ён думкаю, нібы гаворачы Башлыкову.

Башлыкова, мабыць, найбольш усцешыў раздзел, дзе Сталін казаў, што партыя ад палітыкі абмежавання кулацтва перайшла да ліквідацыі яго як класа. Сталін разважліва даказваў, чаму правільнай была ў свой час палітыка абмежавання кулацтва. Заявіў, што цяпер створана эканамічная аснова для таго, каб замяніць кулацкую прадукцыю – калгаснай і саўгаснай. «Ну, а як быць з палітыкай раскулачвання, – лавіў Апейка з вострай увагай, – ці можна дапусціць раскулачванне ў раёнах суцэльнай калектывізацыі? – пытаюць з розных бакоў. Сталін цвёрда адказваў: – Смешнае пытанне! Раскулачвання нельга было дапускаць, пакуль мы стаялі на пункце гледжання абмежавання эксплуатататарскіх тэндэнцый кулацтва, пакуль мы не мелі магчымасці перайсці ў рашучае наступленне супраць кулацтва, пакуль у нас не было магчымасці замяніць кулацкую вытворчасць вытворчасцю калгасаў і саўгасаў... А цяпер? Цяпер другая справа... Цяпер мы маем магчымасць павесці рашучае наступленне на кулацтва, зламаць яго супраціўленне, ліквідаваць яго як клас і замяніць яго вытворчасць вытворчасцю калгасаў і саўгасаў».

Як стрэмка, упілося ў памяць – першымі словамі адказу Сталіна было: «Смешнае пытанне!» Што ў гэтым было смешнае! Далей Сталін зноў амаль паўтарыў гэты выраз: «Смешна і несур'ёзна гаварыць доўга цяпер пра раскулачванне. Зняўшы галаву, па валасах не плачуць». Нешта гуллівае пачулася Апейку ў гэтым новым «смешна». «Не менш смешным, – гаварыў зноў Сталін, – здаецца другое пытанне: ці можна пусціць кулака ў калгас?.. Канешне, нельга яго пускаць у калгас. Нельга, бо ён з'яўляецца заклятым ворагам калгаснага руху...»

3

Дачытаўшы, Апейка хвіліну сядзеў ціха. Потым закурыў над шклом лямпы, стаў хадзіць па пакоі. Хмелю ў галаве не чулася, стомы як не было. Адну за адной успамінаў ён думкі з прамовы, цвёрдыя, упэўненыя довады. Тое, што яшчэ нядаўна здавалася цьмяным і выклікала трудныя развагі, сумненні, стала раптам простым, ясным. Было такое адчуванне, быццам пасля блуканняў і пошукаў у тумане

выбраўся раптам на чыстае, дзе ўсё ляжала адкрытае вачам, з палямі і лясамі, з дарогамі і сцежкамі. Чалавеку заўсёды хочацца прастаты, яснасці, Апейка ж у той вечар зусім не меў схільнасці такой, каб ацэньваць ці ўзважваць нешта, правяраць у прамове. Для яго гэта была найперш прамова кіраўніка партыі, тлумачэнне найбліжэйшай задачы ўсіх войск, у якіх ён, Апейка, быў, можа, толькі аддзялённым камандзірам. Кім бы ён ні быў, задача гэта датычылася яго, і ён перш за ўсё з клопатнасцю думаў пра тое, на што яна скіроўвала ўвагу, якую ставіла мэту, чаго патрабавала ад яго.

Пры ўсім давер'і да Сталіна, разбіраючы са сваёй няўціхнай і ўедлівай паляшуцкай уважлівасцю прамову, Апейка хутка зноў запыніўся, задумаўся. Насуперак таму, што казаў Сталін, улезла сумненне, што калгасам так проста – са сваімі сялянскімі конікамі ды дзядоўскімі плужкамі – паказваць перавагі над аднаасобнымі гаспадаркамі. Варта толькі, выходзіла з прамовы, проста сысціся разам – і з'явіцца цудадзейная сіла: можна і араць, і сеяць наўздзіў, паказваць цуды і з тымі конікамі ды плужкамі. Неяк лёгка, здавалася, разворвалі так багата цаліны названыя да прыкладу данскія казакі, без машын, без трактароў.

Ён закурыў, пастаяў каля акна: у святле за шыбай круціла снег. Завіруха ўсё мяла. Падумаў: «Замяце ўсе дарогі: чорт знае, як дабірацца будзеш... Самы час, каб дарога была, а яе замятае. Як знарок...» Ён згадаў Загалле, апошні сход, не скончаны з-за гэтай віхурнай навагодняй ночы, адчуў імкненне ехаць назад, давесці справу да ладу. Стары год сышоў, а клопаты не сыходзілі; без мяжы, без якога-небудзь прыпынку пераходзілі ў новы. Амаль адразу ж Апейка цвяроза падумаў, што – пры ўсім гэтым – новы год будзе не зусім працягам старога. «Тая ж дарога, але ўздым другі. Другая круцізна пачынаецца...»

Мяло, кідала снегам у шыбу. У галаву раптам зноў увайшло здзіўленне: «лёгка!.. параўнаўча лёгка і быстра!..». Ён падумаў пра свае амаль няспынныя паездкі па сёлах, пра незлічоныя, бясконцыя, зацятыя сходы. Падумаў пра тую ўпартую нязгоду, якая была ў Глінішчах, калі спрабавалі зноў зладзіць калгас. «Параўнаўча лёгка»! Чаму – «параўнаўча лёгка»?! Думка адразу падказала: лёгка – у другіх месцах; але цвярозая разважнасць запярэчыла: законы сялянскай псіхалогіі – адны ўсюды...

«У нас няма рабскай прывязанасці да шматка зямлі...» – успомніліся яму словы Сталіна. «На Захадзе ёсць, а ў нас – няма...» «Бо ў нас няма прыватнай уласнасці на зямлю...» У вельмі яснай галаве паявілася здзіўленне: «Няма прывязанасці да зямлі? Рабскай

прывязанасці?.. Чаму – няма?!.» Не толькі прыдзірлівая разважнасць – душа запярэчыла: «Ёсць!.. У тым і бяда – што ёсць!.. Фармальна, можа, няма, а фактычна – ёсць!.. Той шматок зямлі селяніну – свой! Не чый-небудзь, а яго, свой! Ён зямлю – гэта праўда – не купляў, але ж яму дала яе рэвалюцыя! Дала, і ён – узяў, з радасцю ўзяў, як справядлівую дачу, – і стаў лічыць сваёй! І яна, шматок той, стала яго найдаражэйшым набыткам, яго ўласнасцю, яго – не чым іншым – прыватнай уласнасцю! І ён любіць яе, як немаведама што, прывязаны да яе, як уладар яе і раб яе, – па-рабску прывязаны! У яго ёсць – рабская прывязанасць! Ёсць! У тым і ўся бяда!.. І прывязаны ён, пэўна, не менш, чым той селянін – на Захадзе! Той – купіў; а гэты – за «шматок зямлі» – паліў памешчыкаў, гнаў пілсудчыкаў і дзянікінцаў; як адзіную надзею сваю на жыццё ратаваў савецкую ўладу. Ён – не купіў; ён – заваяваў сабе яе, зямельку сваю, – штыком, агнём, крывёю! Хіба ж – меншаю цаною?!. Ці ж выпадкова першыя савецкія дэкрэты былі – аб міры, аб зямлі? Самае дарагое, да чаго рваліся людзі адвеку, ад дзядоў і прадзедаў, у гэтых дэкрэтах: мір і – зямля! Савецкая ўлада, абвясціўшы іх, адразу заваявала мужыцкія сэрцы мільёнаў. Не трэба думаць іншага – амаль кожны з тых, хто змяніў на шынель світку, бачыў больш не зямлю наогул, а зямлю за сваім сялом, свой шматок зямлі!.. І вось – калі параўноўваць селяніна ў нас і на Захадзе, то ці трэба забываць, што наш набыў свой шматок зямлі толькі дзесятак гадоў якіх! Можна сказаць, хвіліну якую назад! Можна сказаць, не спатоліў яшчэ ахвоту сваю! І як яно выходзіць, калі глянуць збоку, адтуль: тая самая савецкая ўлада, якая хвіліну назад дала яму зямлю, сёння ў нашым абліччы прыходзіць да яго ўгаворваць адмовіцца ад свайго шматка, падзяліцца ім з другімі. Прыходзіць – дакажы катораму іншае – адабраць яе! «Учора далі, а сягоння – адбіраюць! Ето – ваша справядлівасць?!. Ашукалі!!!»

«Не, Энгельсава парада – быць чулым да селяніна, каб памагчы лягчэй выйсці яму на новую дарогу, – не лішняя і ў нас. Не лішняя. Можа быць, у нас яна яшчэ больш важная...»

Апейка падумаў: чаму Сталін сказаў, што ў нас – «параўнаўча лёгка»? Яму, які верыў Сталіну, які верыў у вялікі вопыт Сталіна, яго розум, не прыходзіла нават у галаву, што Сталін мог гэта сказаць таму, што не ведаў добра селяніна, усяго таго складанага, супярэчлівага, што стаяла на калгаснай дарозе. Самому Апейку, звычайнаму, радавому аддзялённаму ў вялікай арміі, усё гэта здавалася такім зразумелым, простым для разумення, што нават на момант не падумалася: Сталін мала ведае селяніна. Як Сталін мог не ведаць самага важнага і самага простага, самага віднага ўсякаму, хто

бачыў блізка мужыка. Натуральна прыйшло меркаванне: Сталін сказаў гэта з асаблівых, тактычных меркаванняў...

Ужо раздзеўшыся, слухаючы цягучы посвіст ветру, гледзячы ў поцемак, Апейка як бы пачуў зноў: «Смешнае пытанне!» Чаму смешнае, калі яно такое – важнае?! Калі яно – перад такою вялікай і цяжкай бітвай!.. «Смешна і несур'ёзна!..» «Зняўшы галаву, па валасах не плачуць!..» «Несур'ёзна!..» – як бы гучала ў яго галаве.

Думкі блыталіся, у галаве звінела. Ён чуў ужо неадольную стому, што раптам навалілася на яго, зрабіла яго бяссілым. Пабачыў зноў мяцельную ноч, сумётную дарогу, мернае пакалыхванне конскіх клубоў. Пачуў маркотны гул правадоў. «Смешна і несур'ёзна...» – прабілася яшчэ, і, каб адагнаць, ён загадаў сабе: «Спаць, спаць!.. Нарэшце – выспацца...»

Дарога бегла ўсё мякчэй, хутчэй.

Раздзел трэці

1

Пачынала днець, калі Башлыкоў прачнуўся. Ён заўважыў: у вокнах бела – і адразу пацягнуўся да гадзінніка. Было без дзесяці дзевяць. Ганьба! Даўно так доўга не валяўся ў ложку.

Ён адкінуў коўдру, ускочыў. Хапатком нацягнуў галіфэ, абуў боты, сарваў з цвічка, накінуў ручнік на шыю. У майцы рушыў да ўмывальніка.

Умывальнік – жалезны бачок – вісеў на сцяне каля дзвярэй у бакоўцы кухні. Блізка ад умывальніка была печ, крываватая, пабеленая, падобная на іншыя печы ў мястэчку і ў вёсках. Пры печы корпалася гаспадыня, Цыля. Башлыкоў прывітаўся з ёю і дзелавіта схіліўся над эмалевым тазікам, што стаяў пад бачком на табурэтцы.

Цыля адхілілася ад печы, выцерла па-сялянску твар, адказала на прывітанне весела, са святочнай урачыстасцю:

– З Новым годам вас!

– А! Дзякую, Цыля Савулаўна! З Новым і вас!

Вада ў бачку здалася цеплаватаю. Змыўшы мыла з рук, Башлыкоў выйшаў у сенцы, у вялікім медным карцы нанасіў з вядра халоднай. Наліў поўны бачок. З асалодай халадзіў рукі, шыю, твар, ледзь стрымліваўся, каб не закрактаць.

Калі дужымі і хуткімі рухамі выцерся і пакіраваў назад у свой пакой, злавіў сябе на тым, што мармыча нейкую вясёлую мелодыю.

Гатоў быў заспяваць, хоць спяваць наогул не любіў і не ўмеў. У душы ўздымалася невядомая, хлапчукоўская радасць.

Толькі намерыўся адчыніць дзверы ў свой пакой, як хтосьці праляцеў паўз вокны, у сенцах бразнула клямка. Праз момант з сенцаў уварваўся расчырванелы, у паліто наросхрыст, Лёва.

Лёва таксама быў у выдатным настроі. Ці ад таго, што зрабіў нешта ўдалае, ці ад таго проста, што прабег па марозе, што маладая кроў загаварыла, Лёва быў перапоўнен энергіяй. Можа, пачаў бы мітусіцца, кідацца па пакоі, спрачацца задзірыста з маці, але адразу вясёлым, гарэзным позіркам трапіў на паважанага іх кватаранта. І хоць сакратар райкома быў без гімнасцёркі і ўсміхнуўся ў адказ таксама гарэзна, Лёва адразу схамянуўся. Амаль умомант стаў тым разумным, разважным Лёвам, якім яго Башлыкоў ведаў звычайна.

– Добры дзень, Аляксей Іванавіч! – прывітаў ветліва і стала зняў паліто, павесіў на цвік.

Цыля была ўжо ля дзвярэй з кухні, з насмешачкай, пад якой таілася пяшчота, глядзела на сына. З другога боку, ад акна на вуліцу, у камізэльцы і расшпіленай сарочцы, з сумнаватай усмешкай сачыў стары Савул.

– Сабраў? – сказала Цыля. – Ад усіх сабраў налог?

І ў твары, і ў голасе была пяшчота да сына, але яна выстаўляла насмешачку.

– Сабраў, – адказаў Лёва з годнасцю. – Але не налог, а – попел.

– Дак попел ето, мабуць, твой налог.

– Попел ето попел! – адрэзаў, не дазваляючы жартаў, Лёва.

– Дак ты ж сабіраеш яго па хатах як налог, – сказала Цыля, яўна маючы на ўвазе Башлыкова. – Нашы жанкі смяяліся, гаварылі: дзеці сабіраюць попел як налог.

– Не трэба слухаць глупства, – адрэзаў Лёва.

Башлыкоў ведаў, пра што гаворка: Лёвавы камсамольцы ўзяліся сабраць для падшэфнага калгаса, для «Рассвета», трыццаць пудоў попелу. З гэтай мэтай хлопцы абышлі многа местачковых хат, растлумачылі, што попел ёсць карыснае ўгнаенне, і дамовіліся, што попел будуць зберагаць і аддаваць ім. З дня ў дзень камсамольцы абыходзілі хаты, збіралі попел. Вось і сёння Лёва вярнуўся якраз з аднаго такога абходу.

Башлыкоў разумеў, што гаспадыня запаліла гэту гаворку дзеля яго забавы, але не лічыў годным забаўляцца з таго, што рабілі хлопцы. Рызыкуючы, што яго палічаць няўдзячным і нетактоўным, цвёрда стаў на бок Лёвы, пахваліў за карысную справу.

Ён рушыў у свой пакой. Надзяваючы гімнасцёрку, падпяразваючыся, думаў пра камсамольцаў са школы: нямала добрага рабілі хлопцы і дзяўчаты – лом металічны сабралі, бібліятэчкі падарылі калгасам, са спектаклямі ездзяць. З сабранага лому скавалі некалькі плугоў, перадалі калгаснікам. Але думкі пра гэта былі нядоўга і хвалявалі мала. Карцела іншае. Карцела радасць, тая, якая бруілася, калі плёскаўся пад умывальнікам, якую перапынілі Лёва і Цыля. Ён злавіў сябе на адчуванні, што радасць яго зусім не без прычыны, што яго чакае штосьці добрае і важнае. Тады ж згадаў прычыну радасці: Сталін, яго выступленне! Газета з выступленнем у кабінеце, чакае!

Услед, а можа, і разам, дзіўна з'яднаўшыся са згадкай пра выступленне, увайшло ў душу: быў у школе, дамовіўся! Сёння, як сцямнее, пабачацца!.. Гэта ўзрушыла моцна, гэта аж заліло гарачым, нецярплівым. Сёння, як сцямнее!

Ад хвалявання ён захадзіў неспакойна і дужа. Першы момант не думаў нічога, быў перапоўнены хваляваннем, незвычайным, здавалася, неймаверным прадчуваннем. Сэрца білася так гулка, так молада, што адчуў няёмкасць, папракнуў знарок сябе: як хлапчук!

Тады ў хваляванне яго прарваліся ўспаміны: нібы нанава ўбачыў яе перад сабой, зноў уразіўся яе хараству. Якая красуня! І дзе вырасла! І колькі хараства не толькі знешняга, а і ўнутранага! Якая годнасць! Згадаў, як кіўнула: сёння, як сцямнее!.. Успомніў: нялёгка было сказаць ёй, але ён сказаў, дамовіўся! Зрабіў тое, чаго так хацелася.

Але калі думаў гэта, у душу ўжо тачылася штосьці нядобрае. Успомніў Параску, як няёмка было перад ёй. Як давялося таіцца, фактычна, калі глядзець праўдзе ў вочы, – маніць. Ён запярэчыў сабе: не маніў ён, нельга было інакш. Не меў ён права, калі на тое, выдаваць тайну іх без згоды яе, кахання свайго. Але неспакой, недавольнасць сабой не сыходзілі ўжо. Бачыў ужо, што і адзін перад ёю паводзіў сябе нядужа. Недарэкам, мусіць, выглядаў у яе вачах. Папракнуў сябе: не пагаварыў як след. Мала ведае пра яе. Амаль нічога не ведае.

Ён адагнаў нядобрае, перапыніў думанне. Няма калі думаць попусту. Час дарагі. Трэба на працу. Энергічнымі рухамі зняў паліто, надзеў. З шапкаю ў руцэ выйшаў у суседні пакой, кіруючыся на вуліцу.

– На работу? – сустрэў яго стары Савул.

– На работу.

У голасе старога было ці то здзіўленне, ці то папрок. Савул глядзеў з-пад акуляраў востра, дапытліва. Нібы турбавала штосьці і не мог сам высветліць.

– Сёння – Новы год, – аб'явіў ён значным тонам. І змоўк, і глядзеў, дапытваючыся, з-пад акуляраў.

Башлыкоў не разумеў, што ад яго трэба.

– Так, Новы год...

Савул кіўнуў. Аказалася, яму гэтага было пакуль даволі.

Памаўчаў, як бы даваў зразумець значнасць таго, што сказана, ці – скажа зараз. З кухні паявіўся, дажоўваючы нешта, Лёва, зірнуў насцярожана на дзеда. Але не сказаў нічога.

– Раней пасля Новага года, – загаварыў Савул тонам прапаведніка, – быў святочны дзень. Ці, як цяпер гавораць, – выхадны дзень. Цяпер гэты парадак адмяняецца?

Башлыкоў усміхнуўся. Усмешка была паблажлівая. Стары настроены па-філасофску. Адказаў з адчуваннем перавагі:

– Раней многа чаго было.

– Многа розных забабонаў! – пацвердзіў упэўнена Лёва.

Дзед кінуў на яго пагардлівы позірк. Як бы загадаў маўчаць, не ўцінацца ў гаворку сталых, мудрэйшых. Глядзеў толькі на Башлыкова. Глядзеў востра, строга.

– Ёлку на Новы год, напрыклад, вы лічыце таксама – забабонам? – Дзед вымавіў «забабонам» з націскам, яхідна.

– Забабонам, – усміхнуўся Башлыкоў.

Стары не адступіў. З вядомай ужо Башлыкову звычкі дабіваўся высветліць усё дарэшты:

– Новы год без ёлкі – хіба ето свято?

– У нас Новы год будзе ў працы.

– Праца – ето наша свято! – убіўся зноў Лёва.

Дзед зноў звысака зіркнуў на ўнука. Памаўчаў засяроджана.

– Значыць, выхадны дзень на Новы год не будзе?

– Рабіць будзем!

Дзед улавіў нецярплівасць Башлыкова, спыніў цікаўнасць сваю. Пачціва падзякаваў, пакланіўшыся.

Башлыкоў рушыў да сянец.

2

На ганку вочы засляпіла белым, мітуслівым, грудзі заліло свежым халадком.

Мяло, круціла. Сонца весела паблісквала ў белай мітусні. Сама прырода нібы радавалася з ім.

«Выхадны дзень!» Які тут можа быць выхадны! І што такое наогул – выхадны! Забыў ужо, што гэта такое! Ніякіх выхадных даўно няма. Ад таго і забыў, можна сказаць.

Даўно не было выхадных. І сам не сядзеў, і людзям не даваў. Раней не да таго было, цяпер – тым больш. Няма калі сядзець. Не да таго. Боты цвёрда мералі мяккую ружаватую бель. Чуў у нагах, ува ўсім целе маладую, нецярплівую дужасць.

Сам добра разумеў прычыну яе: Сталін, яго выступленне. Памяць пра гэта ўвесь час жыла, бруілася, праменілася. Як сонца ў снежнай мітусні.

Ішоў лёгка і молада. З юначай задзірыстасцю паглядваў на вуліцу, на дамы абапал, на людзей. Учарнелыя драўляныя пабудовы і аблезлыя камяніцы хмурна і санліва драмалі абапал. На дзвярах і аканіцах крам усюды завалы. Людзей амаль не відаць. Ды і тыя марудлівыя, як бы санлівыя. Спакой і ціша ў мястэчку.

Драміце, драміце! Хутка абудзіцеся! Разварушым вашы бярлогі запляснелыя! Новы год гэты будзе сапраўды новым! Пабачыце!

Ледзь распрануўся ў баковачцы ў сталоўцы, прысеў да стала – Ліза была побач. Толькі зірнула пільным вокам, зразумела настрой сакратара райкома. Умомант на стале з'явіліся талерка з хлебам, талерка з рагу і пюрэ, шклянка чаю. Еў маўкліва, засяроджана і хутка, непрыкметна для сябе, па даўняй звычцы налягаў на хлеб. Апетыт сёння быў выдатны, Башлыкоў усё ўбіраў са смакам.

Быў заклапочаны, спяшаўся, а ў памяць зноў увайшло – школа, яна, размова з ёю. «Да цябе прыехаў... Сёння, як сцямнее...» Захвалявала, пагнала кроў гарачэй, унесла ў бадзёрую яснасць клопатнасць, што і радавала, і непакоіла.

Гэта разбівала думкі, і ён адагнаў непатрэбнае думанне.

Зноў былі ганак, санлівая ціша і снежная мітусня. Жыццярадасны, засяроджаны чалавек цвёрда крочыў вуліцаю да райкома.

На ганку значыліся сляды, прыцярушаныя снегам і зусім свежыя. У калідоры патхнула цяплом жылля, жыццём знаёмым, добрым душы і надзейным. Поцемкам калідора ён звыкла пакіраваў да дзвярэй прыёмнай. Міша, што гнуўся над нейкай паперай, адразу ўскочыў. Ускочыў, вядома, хвалячыся спрытам, гатоўнасцю зрабіць усё.

– Добры дзень, Аляксей Іванавіч! З Новым годам вас! – сказаў, нібы робячы падарунак.

Башлыкоў павіншаваў таксама, ветліва і сабрана.

Фрэнч, галіфэ Мішавы былі прымяты, а зграбная Мішава постаць была поўная энергіі і імкнення. Аднак Башлыкова гэта не ашукала, пільным вокам адзначыў адразу: Мішаў твар быў шараваты, прытомлены. Спаў Міша, было відаць, мала. Пагуляў у гонар Новага.

Распрануўшыся ў кабінеце, прычасаўшыся, абцягнуўшы рэмень, стрымаў Мішу, што ўварваўся з папкаю ў руцэ.

– Пачакай. Потым. – Паказаў далонню пачакаць у прыёмнай.

Энергічны, стройны, рушыў з кабінета. Як заўсёды выказваючы сабранасць, ён цяпер не таіў урачыстасці ў абліччы, у словах. У кожным кабінеце, пакоі – шчырае, узрушанае: «З Новым годам!» – кароткае пажаданне і моцны, дужы поціск рукі.

На віншаванне і пажаданні адгукаліся ахвотна, радасна, асабліва жанчыны. Адчувалася, што ўсе жылі разуменнем: новы год. У кожнага былі свае надзеі, і надзеі радасныя. Кожны раз, калі віншаваў, ціснуў руку, узнікала адчуванне асаблівай таварыскасці, еднасці, якое расчульвала самога. З расчуленасцю прыйшло перакананне, што вельмі добра гэта, чалавечна – аказаў увагу, праявіў такт, у такім выпадку.

Праўда, з гэтым кінулася ў вочы: людзі жылі яшчэ нібы не на зямлі, луналі ў святочных марах. Настрой быў яўна святочны, лёгкі. Падобна было, што ніхто не працаваў як належыць. Не было сапраўднай, рабочай сабранасці. Гэта не падабалася: не да часу бесклапотнасць, размагнічанасць.

Цешыла, супакойвала, што двое: другі сакратар Сташэўскі і загадчык аддзела кадраў Сагайдак – былі на раёне, Каржыцкі збіраўся ехаць. Памчаў толькі што, раніцаю, на раён Кудравец. Гэта як бы пацвярджала, што людзі райкома і ў гэты дзень з народам. Што і сёння нешта робіцца для вялікай справы, якой так неабходны тэмпы і якой гэтых тэмпаў не хапае.

– Зводку, – загадаў ён, вярнуўшыся зноў у прыёмную.

Міша адказаў: зводка на стале. У тоне голасу было здзіўленне: як гэта ён, Башлыкоў, можа думаць, што Міша будзе чакаць, калі яму загадаюць прынесці яе? Можа, яшчэ пачне рыхтаваць яе, пасля таго як напомняць? Нібы Міша не ведае, што трэба ў першую чаргу.

Башлыкоў у кабінеце адразу пакрочыў да стала. Сапраўды, на самай сярэдзіне стала бялеў ліст. Башлыкоў зайшоў за стол, нецярпліва ўзяў ліст паперы. Рост ёсць. Лічба зноў пайшла ўгару. Але які малы рост. За тыдзень – пяцьдзесят пяць гаспадарак. Менш працэнта ад агульнай колькасці гаспадарак. За цэлы тыдзень. Чарапашыя тэмпы.

Увайшоў Міша. Башлыкоў узняў вочы: што яшчэ? Міша сказаў: трэба падпісаць. Так, трэба падпісаць, пасляць у акружком. Падпісаць, распісацца ў сваім адставанні. У няўменні павесці народ за сабою. У насцярожанай увазе мімаволі адзначылася: Мішаў твар, не адпаведна падзеі, недарэчна быў вясёлы, бесклапотны. Але не сказаў нічога, перамаўчаў.

Калі падаваў падпісаную зводку, здзівіўся: Міша па-ранейшаму пасміхваўся. З нейкім нібы намёкам. Незразумела гулліва.

Башлыкоў зірнуў недавольна, патрабавальна.

Міша засмяяўся па-дружбацку, змоўніцкі.

– Соня ўчора пра вас гаварыла, – растлумачыў ён шчыра. – Глядзі, кажа пра вас, – прыклад табе!.. Яна лічыць, што я, як яна выражаецца, за кожнай спадніцай гатоў пагнацца! Што я толькі і думаю – пра іх спадніцы...

Башлыкова не надта вабіла гаворка такая і зусім не падабалася Мішава панібрацтва, але ён стрываў. Помніў, што – Новы год і гэта абавязвае да нечага.

Міша яшчэ асмялеў.

– Аляксей Іванавіч, можна – па сакрэту? – Ён ледзь не падміргнуў. Паведаміў як тайну, як сябру: – Дзяўчаты ўсе проста захапляюцца вамі. І – дзівяцца!..

– Чаго гэта? – нахмурыўся Башлыкоў.

– Дзівяцца, што малады вы, прыгожы, а нікога з дзяўчат не заўважаеце! Яны глядзяць на вас, а вы – хоць бы адным вокам! Саша, Соня, Маруся, Сара – усе дзівяцца!

– Скажы, няхай не дзівяцца.

– Я разумею – становішча ваша, – сказаў Міша тонам мудрага. – Становішча ваша ёсць становішча. Кожны крок бачыць усё мястэчка, увесь раён! Могуць пабачыць тое, чаго і не было! Трэба думаць пра кожны крок. Але і так нельга. Што за маладосць – без любві!

Башлыкоў перарваў яго:

– Міша, зводку трэба паслаць зараз жа.

Міша глянуў на Башлыкова і ўсё зразумеў. Твар і ўся пастава ўмомант змяніліся.

– Ведаю! – адрапартаваў Міша. Тон быў такі: гаварыць пра гэта лішне.

Вочы і ўвесь Міша чакалі распараджэнняў. Іншых распараджэнняў не было. Міша знік за дзвярыма.

Застаўшыся адзін, Башлыкоў падумаў, што ў нечым ён няправільна паставіў сябе з Мішам. Канешне, работнік ён нядрэнны.

На сваім месцы. Але панібрацтва гэтае – ні да чаго. Трэба гнаць гэтае панібрацтва. Даць трэба яму ўрок належны.

«Завёўся ўночы і ніяк не можа перастроіцца на рабочы лад...» – прайшло ў думках. Але больш хвалявала іншае. І згадка пра тое, што дзяўчаты дзівяцца, і словы Мішавы пра яго становішча. «Кожны крок бачыць усё мястэчка...»

У гэтае думанне зноў уварвалася – школа ў Глінішчах, аблічча той. «Да цябе прыехаў». «Сёння, як сцямнее...»

3

Ён прымусіў сябе супакоіцца. На стале ляжалі іншыя зводкі – з сельсаветаў, з райза, быў пакет з акружкома. Ён прачытаў усё хутка, похапкам і працягнуў руку да «Праўды», што ляжала побач на стале. Тут ён палажыў яе ўчора з намерам – вярнуцца, перачытаць. Цяпер ён і браў яе дзеля гэтага – перачытаць на ясную галаву, паглыбіцца, удумацца. Высветліць усё. Учора ён быў для гэтага занадта ўсхваляваны.

За некалькімі сказамі рука яго пашукала аловак. Важныя думкі ён меў звычку падкрэсліваць.

Чытаў ён сёння не так хутка, як учора. Гэта было зусім не тое, што ўчора, гарачае, ліхаманкавае чытанне, калі ён нецярпліва бег вачыма ўперад: а што далей, а як там? Ён сёння не рваўся так наперад, ён добра помніў, што там, далей. Яму сёння важна было пранікнуць глыбей, высветліць усё. Вызначыць усё ясным поглядам, цвярозаю думкаю.

Сёння чытаў ён не хапаючыся, паволі. Раз-пораз нават вяртаўся назад, калі думка бачылася асабліва важнаю або калі што-небудзь з першага разу, здавалася, не спасцігаў да канца. Чытаў, можна сказаць, больш цвяроза і разважна. Аднак і гэтае, сённяшняе чытанне не было зусім спакойным. Працятае цвярозасцю, разважнасцю, чытанне гэтае было поўнае ўзрушэння.

Узрушала Башлыкова, як і ўчора, найперш тое, што Сталін адказваў на самыя вострыя, пякучыя пытанні. Хоць Сталін у сваім выступленні, як ён сам казаў, высвятляў тэарэтычныя асновы становішча ў вёсцы, для Башлыкова ўсё, што ён чытаў, мела перш за ўсё значэнне практычнае. У сталінскім выступленні ён найперш шукаў адказ на тое, што турбавала і мучыла. Чытаючы, Башлыкоў амаль увесь час чуў побач Апейку: чытанне гэтае было нібы працягам той спрэчкі, якую яны фактычна няспынна вялі. Падобна было на тое, што Сталін уступіў таксама ў іх спрэчку, выказвае свае погляды.

У выступленні Сталіна Башлыкоў шукаў падтрымку сабе. Ён, вядома, не сумняваўся, што погляды яго ва ўсім адпавядаюць сталінскім, што гэта ва ўсім – бальшавіцкія погляды. Ён быў упэўнены, што не мог ні ў чым памыліцца, што не магло чуццё ашукаць яго. І з уцехай знаходзіў усё новыя доказы правільнасці сваіх меркаванняў. Як і ўчора, як падтрымку сабе чытаў ён разважі Сталіна аб адносінах сялян да зямлі на Захадзе і ў нас. І Апейка, і Гайліс ніяк не здольны зразумець простую ісціну, што зямля ў нас не прыватная, што яе нікому не дадзена права прысвойваць. Башлыкоў над гэтымі радкамі думкамі пераносіўся на глінішчанскі сход, у Курані, з абурэннем успамінаў галасы-пагрозы: «не дадзім», «не згодны». Якое права мелі яны там не даваць зямлю, якая належыць не ім, а народу, дзяржаве. Ён пашкадаваў, што тады, на сходзе, у вёсцы, сам не дадумаўся, не сказаў гэтага.

Адсюль, ад гэтага, браў вытокі і другі важны вывад, які Башлыкоў выразна вычытваў у выступленні. Ён, Башлыкоў, не памыліўся, бачачы небяспечную шкоду ў Апейкавых павучаннях пра «псіхалогію» і нейкі спецыяльны падыход да селяніна. Вось тут, дзе Сталін успамінае пра Энгельса, пра розніцу між сялянамі на Захадзе і ў нас, ён жа фактычна высмейвае «мудрых падыходчыкаў». Ён жа фактычна строга судзіць апартунізм, міндальнічанне, спекуляцыю на «чуласці»! Па сутнасці, судзіць апейкаў і гайлісаў.

Зноў, як і ўчора, асабліва хвалявала і радавала тая частка прамовы Сталіна, дзе ён аб'яўляў аб пераходзе ад палітыкі абмежавання кулацтва як класа да раскулачвання. Башлыкоў яшчэ ўчора, адразу, асабліва адзначыў гэты факт як факт незвычайны, у поўным сэнсе – гістарычны. Сёння, цвярозым, праніклівым розумам, ён яшчэ мацней адчуў значэнне гэтага як аднаго з самых рашучых крокаў у рэвалюцыі на сяле. Тут Сталін, бачыў Башлыкоў, асабліва моцна біў па асцярожненькіх ціхаходах тыпу Апейкі, з асаблівай смеласцю зваў наперад. Башлыкова проста захаплялі цвёрдасць і рашучасць Сталіна.

У памяці між іншага мімаволі праходзілі глінішчанскі сход, гаворкі ў Куранях, і душу радавала прадчуванне блізкіх вялікіх падзей, рашучых дзеянняў. Ён усёй душой прагнуў гэтых рашучых дзеянняў. Так і трэба! Даволі слоў, асцярожнасці, міндальнічання!

Башлыкоў з захапленнем ухваліў, што пытанне пра тое, ці можна дапусціць раскулачванне, смешнае. Гэта пытанне могуць ставіць толькі недарэкі-бухарынцы ці падобныя ім недабіткі. Такога пытання няма і быць не можа ў сапраўднага бальшавіка! Башлыкоў зноў засмяяўся, калі прачытаў: «Зняўшы галаву, па валасах не

плачуць!» Вельмі падабалася Башлыкову гэта ўменне Сталіна ў належны момант сцебануць слоўцам, прымаўкай. Тут яно здалося асабліва ўдалым.

Так, «па валасах не плачуць»! Наогул, плакаць нам – ні да чаго! Нам – калі што – то радавацца! Пачынаем рашуча брацца! Даём апошні бой кулацтву! Цвёрдасць, рашучасць Сталіна як бы перадаваліся Башлыкову, поўнілі яго ўпэўненасцю, імкненнем ісці, зрабіць усё, што належыць. Хоць зараз гатоў быў Башлыкоў зрабіць усё, што патрабавалі законы класавай барацьбы дзеля перамогі над апошнім, зацятым ворагам. Непахісна, бязлітасна.

Дачытаўшы, устаў, энергічна захадзіў. Зноў, як і ўчора, адчуў, што спаў з душы паганы цяжар. Было адчуванне радаснай палёгкі. Увесь поўніўся імклівай дужасцю. Здалося: пакуль чытаў, нібы падужэў.

Мераючы пакой, калі ішоў да стала, узняў позірк на партрэт: Сталін, стоячы ўрост, нібы глядзеў насустрач уважлівымі вачыма. Башлыкоў мімаволі спыніўся, прыгледзеўся. Глядзеў хвіліну з удзячнасцю, з павагай. Падумаў: якое ўменне бачыць углыб і вучыць нас бачыць! Так ясна бачыць, мабыць, толькі адзін ён умее.

Усё было добра відным. Ясным і простым. Ясным было становішча. Яснымі – задачы.

«Як двойчы два!» – успомніў Башлыкоў словы, што вырваліся ў яго ўчора. Удала сказаў: сапраўды, пасля прамовы ўсё – як двойчы два! Усё відаць.

Пахадзіўшы, вярнуўся зноў да стала, схіліўся над газетаю. Але чытаў ужо не ўсё падрад – асобныя радкі. Хацеў запомніць найбольш важныя, вострыя выразы даслоўна. Для будучых сваіх выступленняў.

Запомніць самае важнае даслоўна – у гэтым была асаблівая адзнака прачытання.

Тады зноў хадзіў, думаў. Пра тое, што сказаў Сталін. Пра тое, як выглядаюць становішча раёна, яго дзейнасць у святле выступлення. Якія вывады зробіць з выступлення Апейка. Што належыць зрабіць райкому, усім арганізацыям раёна дзеля выканання ўказанняў Сталіна. Пра многае думаў.

Сярод гэтых думак адна была асаблівая. Яна не была выказана ў прамове, але, Башлыкоў лічыў, вынікала з яе. Ён лічыў, што яе ўбачаць усе дасведчаныя, праніклівыя людзі. Яна не выказана адкрыта таму, што гаварыць яе не варта, з няпісаных, але вядомых кожнаму разумнаму дзеячу меркаванняў. З меркаванняў, як ён адзначыў, палітыкі.

Гэта здагадлівая думка Башлыкова была ў тым, што раскулачванне, ён лічыў, мае значэнне не толькі як справядлівая дзея супраць кулака. Якая вырве з асяроддзя сялян класавага ворага, абясшкодзіць яго для грамадства, расчысціць глебу для новага. Башлыкоў лічыў – хоць пра гэта ў прамове не было тактоўна ні слова – яшчэ больш важным тое, што раскулачванне дасць адчуць іншым, што савецкая ўлада не збіраецца доўга ўгаворваць. Не збіраецца цырымоніцца надта. Дасць адчуць не толькі кулакам, а і астатнім сялянам. Тое, што гэта, вядома ж, падзейнічае і на іншыя пласты сялян, Башлыкову і здавалася вельмі важным для яго, для цяперашняга становішча ў раёне. Раскулачванне, прадбачыў ён, павінна падахвоціць многіх іншых, асабліва сераднякоў, да калгасаў. Небяспека страціць усё: маёмасць, хату, сесці на пясок, на балота каму не паддасць ахвоты!

Трывожны тым, як марудна ідзе калектывізацыя ў раёне, ён у гэтай акалічнасці бачыў абнадзейлівую, радасную прасветліну. Ён быў проста ўпэўнены, што самае непадатнае павінна хутка зрушыць. Не можа быць, каб не зрушыла!

Ад таго, што блізка чуў жаданую перамену, брала нецярплівасць. Мімаволі пачаў крочыць хутчэй, дужэй. Усё мацнела, вярэдзіла імкненне: пачаць дзейнічаць зараз жа. Але нейкі час замінала раскіданасць думак. Не адразу ўдалося засяродзіцца.

На паўдарозе спыніў крок, цвёрда пакіраваў да стала.

Бюро. Трэба рыхтаваць бюро. Справу Гайліса і іншых. З гэтага пачне.

Гэта будзе пачатак новага этапа ў яго дзейнасці. Этапа рашучай дзейнасці.

4

З гэтым увесь час, амаль не сціхаючы, жыло іншае. Што ні рабіў, пра што ні турбаваўся, увесь час помніў: «Сёння. Як сцямнее...»

Амаль неадступна, ці хадзіў, ці рупіўся за сталом, адчуваў побач тую, глінішчанскую. Нельга сказаць, каб прагнуў гэтага, больш было такое меркаванне, што ёй тут пакуль не трэба быць. Цяпер не яе час. Яе час будзе пазней. І месца іх іншае. Увечары, як сцямнее. На дарозе з вёскі. Дзе бярозы...

Цяпер у яго справы. Важныя абавязкі адказнага за цэлы раён чалавека. Да таго ж, у яго сёння такая падзея, такі важны дакумент перад ім. Гэты дакумент вызначае, можна сказаць, новы кірунак у

яго жыцці, трэба добра падумаць над многім, засяродзіцца. Нельга рассейваць увагу.

А ў важныя раённыя клопаты, як ні праціўся, унізвалася, урывалася тое, патайное, недазволенае. Сцінала сэрца радасцю і нецярплівасцю, тлуміла галаву іншымі згадкамі і клопатамі. Згадваліся школа, сустрэча, зноў і зноў вярэдзіла сэрца. Мроілася – вечар, бярозы, яна; такое, што дзіўна кружылася галава...

За вокнамі ўсё мітусілася белае і зіхцела сонца. І падобна – мітусілася, зіхцела штосьці ў душы Башлыкова.

Радасць, нецярплівасць былі не адны ў душы. З імі тачыліся, трывожылі Башлыкова нядобрая вінаватасць і незычлівы одум. І раз, і другі назалелы одум гэты судзіў: што ты робіш? Ты – кіраўнік раёна. У такі час, калі ўсё трэба аддаваць справе. Замест таго каб думаць пра справу, пра раён, ты думаеш пра непатрэбства. Пра жанчыну. Да таго ж – пра выпадковую жанчыну.

У рэшце рэшт, развàжаў одум, – калі табе ўжо так захацелася жаночай ласкі, хіба мала тут дзяўчат, прыгожых і надзейных. Адданых справе, з ясным жыццём. Дзяўчат, якія могуць стаць сапраўднымі таварышамі ў справе. Колькі дзяўчат – камсамолак – з радасцю пайшлі б насустрач, каб ты зажадаў гэтага. Чаго ж ты паўз іх прайшоў і прыліп да нейкай невядомай?

Башлыкоў пярэчыў сабе: чаму – невядомай? Ведае і самую, і нават бацькоў яе. Таксама – наш чалавек, няхай і не камсамолка. І што, калі на тое, перашкаджае ёй, калі прыйдзе час, стаць таксама камсамолкай, таварышам па справе? Бацькі – беднякі, можна сказаць, пралетарыі сельскія. Праўда, не калгаснікі, гэта, вядома, мінус, пляма. Ва ўсім віною – маці, цёмная, злая істота, непрыемная, скажам шчыра, асоба. Відаць, з-за яе дачка і пакінула бацькоўскае гняздо. А бацька – чалавек што трэба. Хоць зараз мог бы на новую дарогу пайсці... Так, аднаасобнікі – гэта, канешне, мінус. Але ж, калі на тое, то яна ж ужо не з бацькамі. Сваё становішча ў яе – на службе. Савецкая служачая. Ды і з бацькамі павінна паправіцца. Быць не можа, каб не паправілася. Да таго ідзе.

Сярод усяго ўнізвалася няёмкае: становішча яе. Школьная тэхнічка. Прыбіральшчыца. Ён, кіраўнік раёна, і – прыбіральшчыца школьная!.. А што – прыбіральшчыца? – уздымалася нязгода. Хіба на ўсё жыццё гэта – прыбіральшчыца! Хіба не відаць – што выпадкова там! Што прыладзілася, відаць, на момант. Пасварыўшыся з маці-ўласніцай. Рашыўшы пачаць новае жыццё. Сёння – тэхнічка ў школе, а заўтра работніца арцелі. Можа быць, актывістка новага жыцця.

«Прыбіральшчыца». Можна падумаць, што сам – сакратаром нарадзіўся. Не з таго пачынаў. Колькі прайшло з той пары, як сам падмятаў за кульгавым шаўцом? А ўжо – арыстакратычныя замашкі. Арыстакратычныя не арыстакратычныя, а мяшчанскія – то яўна. Мешчанінам добра папахвае.

Раз-пораз у развагі прыходзіла горшае. Такое, ад чаго, здавалася, нібы трапіў у тупік. З якога адзін выхад – назад. Гэта звычайна было тады, калі ўспамінаў сустрэчу ў школе, той момант, калі прыйшла Параска. Няёмка зноў было, што таіўся, хлусіў фактычна, і з гэтым неадступна вярэдзіла: не ўтаіў, напэўна, здагадалася, ведае. Яна-то, відаць, не панясе навіну па свеце, чалавек разумны, але, як там ні таіся, заўтра вядома ўсё будзе многім. У вёсцы ўсё на віду. Усё на віду ў раёне.

Як бы ні хаваўся, раней ці пазней усё адкрыецца, стане вядома, у тым ліку і тут.

Як ён будзе выглядаць перад людзьмі, перад раёнам! У такія моманты першай думкай было: спыніцца, пакуль не позна. Не ехаць, не сустракацца. Кончыць.

У такія моманты ўсё станавілася раптам ясным. Ні да чаго гэта, асабліва цяпер, калі такія справы. Усяго сябе, усё трэба аддаваць справе. Не драбніць сябе.

Тады завіхаўся хутка, хадзіў цвёрда. І чуў лёгкасць і дужасць у сабе. Нібы скідваў цяжар з плеч.

Але лёгкасць, і дужасць, і яснасць былі не доўга. Кожны раз за гэтым чуў яе перад сабою, блізкую, вабную, і чуў, як непаслухмяна захлынаецца нечым гарачым, пранізлівым сэрца і тлуміцца галава. І як з гэтым знікаюць і лёгкасць, і яснасць, і як незразумелая сіла адбірае дужасць, вабіць, вядзе наперакор разумным развагам.

Тады не першы раз думаў здзіўлена: што ў ёй такое, чым яна займела такую ўладу над ім? Іншы раз, злуючыся на сябе, дакараючы сябе і яе, убіваў у сябе знарок груба: ва ўсім вінаваты яго дурная ўражлівасць, мяккацеласць! І тое, што кроў дурная гуляе, маладая, дзікая. Усё ад таго, што захацелася жанчыны, бабы! І ад таго, што характар, натура дурныя. Калі захацеў што, не ўмее стрымлівацца, адступаць. Ад прыроды такі. І не ўмее зыначыць сябе.

Калі спакайнеў, здзіўленне было іншае. Закахаўся, любіць! Сустрэў выпадкова, у такі паганы вечар, і закахаўся. Не разгледзеў толкам у той вечар, а прыкіпеў. Не разгледзеў, а не памыліўся. Колькі бачыў жанчын, а такую, здаецца, першую сустрэў! За ўсё жыццё першую такую. І дзе!..

І вось жа, у душы так – нібы нікога не было дасюль роўнага ёй! І такое ў душы – нібы не сустрэне больш такой, як яна!

А можа, і не сустрэне. Не сустрэў жа раней. Не было ж раней такога ні да адной. Можа, гэта – доля яго. Не, гэта не абы-што, гэта – рэдкасць. Такое хараство, такі розум. І да таго ж – дзіва – неабыякавая да яго. Відаць было. Хінецца душой. Рада была. Хвалявалася. Ці ж разумна – страціць гэта. Самому адмовіцца, загубіць. Загубіць і потым не знайсці больш.

Што ж, што ён кіраўнік, што да яго патрабаванні асобыя?! Што, яму і любіць нельга?

У такія хвіліны турбавала практычнае: дзе б ім знайсці нейкі прыстанак для сустрэч? Ну, сёння сустрэча кароткая, можна і пастаяць пад бярозамі. А дзе потым? Не стаяць жа сярод дарогі ці лесу, марозіць яе? Але што рабіць? У Юравічы прывезці, да сябе? Цяпер, калі яны адно аднаму яшчэ невядома хто? Выклікаць такую ўвагу да сябе?

У школу, да яе – таксама нельга. Нельга і ў Курані яе, да бацькоў. Нельга.

Як бы ён ні тлумачыў, што ў яго сур'ёзныя пачуцці, гэта выкліча крыватолкі. На яго рэпутацыю, бясспрэчна, ляжа пляма. Яго аўтарытэт будзе падарваны. Загадзя можна сказаць.

Ён ад душы пашкадаваў, што жыве не ў Гомелі. Там усё зрабіць было б прасцей.

Нялёгка і няпроста Башлыкову было ў гэты дзень. Не раз яшчэ брала цвярозае: спыніцца, не ехаць. І кожны раз за гэтым было: паехаць, пабачыць. Хоць адзін, апошні раз.

Вочы нецярпліва паглядвалі на гадзіннік. Дзень ішоў паволі.

5

Пад вечар ён загадаў запрэгчы каня. І Міша, і возчык ведалі, што трэба ў Загалле, на сход.

Калі запрэжаны конь стаў каля вокан, Башлыкоў нехапатліва пакіраваў на вуліцу. Ледзь ён падышоў да вазка, возчык падабраў лейцы, намерыўся сесці на звычайнае месца. На лавачку ўперадзе вазка. Башлыкоў спакойна стрымаў яго.

– Дайце, – ён узяў лейцы, пугу. Растлумачыў возчыку: – Адзін даеду. – Пажартаваў: – Каню лягчэй.

Заўважыў: возчык неахвотна аддаў лейцы, пугу. У вачах былі здзіўленне і недавер'е: сакратар першы раз выбіраецца адзін. Ніколі раней такога не было.

– Дарога цяжкая... – сказаў Башлыкоў.

Возчык кіўнуў: цяжкая. Свежы снег. І ўсё ж было яму дзіўна. Вядома, дзіўна. Але што ты зробіш. Нельга інакш.

Башлыкоў памацаў наган у кішэні, усеўся ў вазку. Перш чым шмаргануць лейцамі, загадаў Мішу, што цікаўна глядзеў побач з возчыкам: ноччу каб былі зводкі. Ноччу вернецца. Тузануў каня лейцамі.

Ехаў вельмі неспакойны. Не бачыў вуліцы, не заўважыў толкам, як уз'ехаў на гару. Толькі тут, на гары, апамятаўся: мястэчка было ззаду. Былі ззаду сумненні: ехаць – не ехаць.

Поўны супярэчлівасці ў душы, разумеў: едзе. На дабро ці на зло – едзе.

Як там ні будзе, трэба ехаць. Не можа не ехаць.

Раздзел чацверты

1

На дварэ было свежа і ціха. Лёгка мяло.

Абышла школу, сцежкай, пратаптанай малымі, выбралася за сяло. За загуменне.

У полі – як вокам кінуць – бель, чысціня. Толькі наводдаль вятрак круціць крылы. Вецер свежы, незласлівы.

Ад загумення проста да шляху – дарога, вылізаная саннымі палазамі. Між іх снег, пабіты капытамі коней. І каляіны, і сляды капытоў ледзь прыцярушаны свежым снегам.

Ішла каляінамі. Ісці было лёгка, як па падлозе, толькі ногі часам паслізгваліся. За тым толькі і сачыць трэба было. Тут, у полі, святлей было на душы. Не трэба было хавацца перад Параскаю. Але радасць не адну несла ў сабе, радасць хмарылася непадатным одумам. Чула сябе так, як бы грэх рабіць намерылася, вінаватая.

Яна запярэчыла сабе: няма перад кім ёй вінаваціцца! Няма! Вольная птаха. Усё ж калі не вінаватасць, то няёмкасць нейкая тачылася ў душы, і яна падумала разважліва: мабыць, такое таму, што не дзеўка ўжо. Што была – сплыла пара на спатканні бегаць. Што трэба б ужо жыць, як жывуць усе сталыя. За розум трэба б узяцца. Яна рашуча заспрачалася: што ж, яна такая ўжо, што ёй і шчасця хацець грэх? Што ж ёй – усё кончана?

Ад таго не толькі радасць несла, хоць і нібы падганяў нехта нецярпліва, завабліва: хутчэй, хутчэй! З гэтым поўз у душу, хмарыў усё важкі одум, лажыўся на плечы, чапляўся за ногі, перасцярожваў:

не бяжы, стань, пакуль не позна, вярніся. Але, як ніназаляў одум, не тое што вярнуцца, але і прыпыніцца ўжо не магла. Пасля Яўхіма, пасля дурных, не аціхлых, здаецца, яшчэ здзекаў як ёй было спыніцца, не бегчы, калі наперадзе бліснула надзея. Як ёй было стаць, калі звала радасць.

«Што будзе, тое будзе!» – прайшло ў галаве, гарачае, адважнае.

Злева сярод поля зацямнеў гаёк, Ганна ўспомніла: яго звалі таксама, як вёску, Глінішчы. Далей, сярод аднастайнай белай роўнядзі, доўгі, са шчарбінамі, значыўся строй старых бяроз. Шлях. Здалёк заўважыла: насустрач з-за бяроз выкаўзнуліся сані. Дробны конік трушком хутка набліжаў кагосьці. Яна насцярожана ўгледзелася, паспакайнела, адзначыла: не ён. Пэўна, нехта з глінішчанскіх.

Пайшла цішэй. Знарок нагнала абыякавасць на сябе. Калі пад'ехалі, саступіла з дарогі, уехала валёнкамі ў снег. У санях было трое: два дзядзькі і цётка, захутаная хусткай. Дзядзька і цётка сядзелі, другі дзядзька ляжаў, уткнуўшыся галавой у каўнер, відаць, п'яны.

– Куды ето проціў ночы? – зачапіў гарласта чалавек, што правіў канём.

Цётка нядобра зіркнула з-пад хусткі. Той, што ляжаў, варухнуўся, але не ўзняўся. Не чакалі адказу, праехалі сабе далей.

Яна зноў выбралася на дарогу. З тым жа супярэчлівым хваляваннем падалася коўзкаю каляінаю далей.

Вось і бярозы, шлях. З-за бярозы вызірнула востра ў адзін, другі бакі – нікога. Паглядзела яшчэ са шляху: пуста. Кранула прыкрая маркота: нібы ашукалася. Бегла, бегла, дурная, а тут пуста. Паспрабавала супакоіць сябе: рана яшчэ.

Што рабіць? Не тырчаць жа тут, навідавоку! Можа, шляхам пайсці насустрач? Не, яшчэ чаго не хапала.

За шляхам пачынаўся лес. З гэтага боку, пры бярозе, цямнела купка хмызняку. Вунь і пратаптаная сцежачка ў хмызняк. Падалася ў заснежаны зараснік, перабыць.

Ціха, халаднавата, мяце трохі. Колькі таго пастаяла, дайшло, акурат ад Юравіч, – раз-другі пырхнуў конь. Адразу наваструлася ўвагаю: хутка пачула, як парыпвае вупраж. Калі рыпанне наблізілася зусім, зірнула на шлях – і ўмомант адхіснулася за куст. Ад нечаканкі аж пахаладзела.

Трэба ж такое! У санях горбіўся Яўхім. Шапка была насунута, каўнер наставіў, але яна адразу пазнала. Мала не сутыкнуліся!

Затаілася ў не надта густым цяпер хмызняку, чакала. Пабачыў ці не пабачыў? Здалося, як бы зірнуў у яе бок. Не, паехаў далей...

Ужо калі мінуў, выглянула зноў: Яўхім ехаў па дарозе, аддаляўся. Адчула палёгку: небяспека адыходзіла. Ад перажытага ўтрапення не адразу дайшло, што Яўхім паехаў не па сваёй дарозе. На Курані паварот быў далей, ён жа збочыў тут, на гэты край Глінішчаў. Дзе школа.

У школу наведацца рашыў? Глядзела ўслед яго саням ужо з іншым неспакоем: заедзе, запытаецца, чаго добрага – кінецца сюды?.. Не, не кінецца, супакоіла ўпэўнена сябе. Не вернецца. Параска не скажа. Пашле, не інакш, у другі бок...

Ледзь паспакайнела, пачула – мерзнуць калені. Холад ішоў вышэй, стаў лезці ў валёнкі. Яна пачала тупаць, біць валёнкам аб валёнак. Пашкадавала: як павольна ідзе час, як марудна цямнее – цемра неяк асцярожна, нясмела абступае. І цішыня, ад якой аж ломіць у вушах. А на дарозе – ні гуку.

Рана прыйшла, падумала яна. Казаў жа: «Як сцямнее». Нібы апраўдваючыся, гаворачы яму ў думках, растлумачыла: давялося раней выйсці. Не надта зручна было б ісці пазней, поцемкам. Адной, сярод поля. Ды і ад Параскі адысці раней хацелася, пабыць вольна...

Пацямнела даволі. Можна ўжо і выйсці на шлях. Стала каля бярозы, затулілася ёй ад ветру, прыслухалася. Ні гуку на дарозе. Адно бярозы ледзь чутна шумяць. І мяце снегам. Дарогу не далёка відаць.

А можа, і не прыедзе? – узяло раптам. Можа, яна дарэмна бегла, попусту калее тут упоцемку, дурная. Можа, толькі так сабе сказаў, а яна і паверыла, прыбегла. Гэта, аднак, не надта занепакоіла, падумала пра гэта нібы знарок. Думкі гэтыя ўмомант сышлі, іх выгнала моцнае, упэўненае: не, не так сабе сказаў. Хацеў сустрэцца, сама бачыла. Можа, падумала разважліва, няўпраўка якая выйсці хіба. Не здолее чаму, заняты нечым. Не то з папрокам сабе, не то са спачуваннем яму адзначыла: ёсць калі яму займацца гэтым. Такою для такога чалавека драбязой.

Мяло, і шумела бяроза, маркотна, безнадзейна. На дарозе нікога ўсё не было. Праз мяцеліцу і поцемак убачыла каня, калі ён падышоў ледзь не ўсутыч. За канём вызначыла цёмны вазок і постаць. І конь, і вазок рушылі нячутна, павольна.

Было відаць, возчык прытрымліваў каня. Чалавек быў адзін і нібы прыглядваўся. Зноў ускінулася хваляванне. Білася моцна сэрца. Прытулілася да бярозы бліжэй. Вазок праехаў паволі, потым вярнуўся, стаў. Ён. Няхай пастаіць, пачакае! – падумала раптам ганарліва.

Ён пастаяў хвіліну, пачаў заварочваць каня на дарогу да школы. Хоча насустрач ёй.

Яна адарвалася ад бярозы, ступіла на шлях. З няёмкасцю, цяжка гукнула: «Эй, дзядзько!»

Ён павярнуў каня да яе, пад'ехаў. Саступіўшы з вазка, прывітаўся.

2

– А я ўжо рашыў... – прамовіў Башлыкоў весела, з кпінкай над сабой. Ён схамянуўся, сказаў урачыста: – Ну, з Новым годам.

– І вас таксама!

Бачыла: рады быў. Ад хвалявання маўчаў трохі, не знаходзіў слоў.

– Даўно тут?

– Не. Толькі што.

Каб яна ды выставіла сябе цяпер недарэкаю, прызналася: як бегла, як мерзла! Як магла, яна таіла радасць, паказвала сябе спакойнаю. Папрасіў, ну і прыйшла. І ўсяго.

– Не замерзла?

Яна стрымлівала дрыжыкі.

– Не.

Башлыкоў яшчэ памаўчаў. Здагадалася: думае аб нечым. Ён сказаў, запрашаючы:

– Сядай.

Сказаў не вельмі ўпэўнена. Не ведаў, мусіць, што рабіць. Яна села ў вазок. Пад ёй былі кажух, мяккае сена. Ён зайшоў на другі бок вазка, сеў побач.

– Паедзем, – сказаў ён весялей, чым трэба было. Як бы падбадзёрваў не толькі яе, а і сябе.

Зноў са здзіўленнем адзначыла ўжо вядомае ёй: ён з ёю не такі важны, жалезны, як на людзях. Далікатны надзіва і нібы разгублены. Як бы бянтэжыцца і не хоча, каб яна заўважыла. Як хлопец. Ёй гэта падабалася.

Башлыкоў крануў лейцамі каня. Намерыўся ехаць па шляху. Яна спыніла яго:

– Лепей сюды... У лес...

Калі ён павярнуў каня, больш каб не маўчаць, каб выказаць яму ўдзячнасць, што поўніла невядома чаму яе, дадала ціха, па-сяброўску:

– Дарога тут ціхая... Тут і днём мала хто... А цяпер...

Яе нястрымна апаноўвала хваляванне. Усё, што было да гэтага, растала, змыла гэтае хваляванне, хваляванне першай блізкасці з ім. Звінела ў галаве, калацілася сэрца, мала не калаціла яе ўсю. Шчасце ці прывід шчасця, што з таго, завалодалі ёю, залілі ўсю яе. Калі б гэта зычыла і пагібель, Ганна, напэўна, кінулася б, не раздумваючы, не шкадуючы.

Самае незвычайнае было ў тым, што яна чула: і ён так жа хвалюецца. Што і ў яго тое ж самае, як і ў яе. І што хоць яны сядзяць толькі побач, яны нібы з'яднаны. Цішынёй гэтай, цемрай, лесам, ноччу. Вазком, у якім яны адны. І ад таго, што ён маўчыць, далікатна стрымліваецца, шануе яе, гэта іх еднасць чулася яшчэ нібы вастрэй.

– Стань. Давай пастаім, – папрасіла яна, калі праехалі трохі. Прамовіла ціха, далікатна, быццам баялася парушыць нешта. І быццам змоўніца.

Чамусьці хацелася стаяць. Стаяць сярод ціхага, з ледзь чутным угары пошумам лесу і маўчаць. Маўчаць, як гэтыя засяроджаныя, зацятыя дрэвы.

– Ты змерзла, – заўважыў ён, што яна дрыжыць.

– Не, нічога...

– Уздыміся трохі.

Ён дастаў кажух з-пад яе і сябе, накрыў ёй плечы, затуліў калені. Заклапочана і пяшчотна. З насцярогай пільнавала – абдымаць возьмецца, абшчэпіць. Чамусьці вельмі не хацелася цяпер гэтага. Здавалася, гэта разбурыла б тое харошае, што поўніла ўсю. І рада была, што з пашанай абышоўся.

Адзначыла толькі: рука яго на момант затрымалася на яе каленях. Даўгавата затульваў калені ёй. Але адарваў руку.

– Я ненадоўга, – сказала яна.

Сказала невядома чаму. Бо хто ёй не даваў быць тут доўга. Сама сабе нібы загадала. Нібы баялася чагосьці, калі застанецца доўга.

– Я таксама, – прамовіў ён. Дадаў тонам важнага клопату: – Сход у Загаллі.

Заўважыла: ён нечым недавольны. Незразумела чым. Здалося: далёка думкамі ён. Сваімі думкамі, далёкімі ад яе. І ўвесь ён, пабачылася, далёкі. Узяло раптам вострае: нераўня яны, чужыя. Падумала з папрокам сабе: Божа, што яна ўдумала! На што спадзявалася! Чаго прыйшла!

Ледзь стрымала сябе.

– Е ў вас калі час для сябе? – прамовіла здзіўлена і нядобра.

– Цяпер мала, – адказаў ён, тоячы недавольнае. – Цяпер не да асабістых спраў.

– Як жа жыць так?

– Гарачая пара ў нас цяпер. Адказная.

Ён сказаў шчыра, дружалюбна, нібы са спадзяваннем, што яна зразумее, адчуе, як яму. Яна адчула, згадала на момант той даўні сход у школе. Душу кранула спачуванне яму, але блізкасць, якая так хораша толькі што чулася, усё ж не вярнулася.

Нейкі час маўчалі побач, розныя, далёкія.

Ён, відаць, адчуваў гэту адасобленасць, яна яму, пэўна ж, не падабалася, але ён не рабіў нічога, каб развеяць яе. Ці ўзрушаны быў вельмі, ці неспрактыкаваны ў такіх справах. Вельмі магло быць, што ён не знаходзіў, як трымацца, як павесці гаворку.

Можа, і недавольнасць, і стрыманасць яго былі ад гэтага.

– Як ты жывеш? – павярнуўся да яе. Цяжкавата вымавіў «ты».

– Так і жыву...

Яна сказала знарок весела, бесклапотна.

– Трэба выходзіць на дарогу, – параіў ён шчыра. – На сваю. Сапраўдную.

– Дзе яна, тая мая? – Ганна нібы пакпіла задзірліва.

Ён не адгукнуўся на смех яе, сказаў пераканана, сур'ёзна:

– У цябе добрыя здольнасці. Ты многа можаш дасягнуць.

– Аге! – падхапіла яна насмешліва. – З маёй граматай.

– Колькі яе ў цябе?

– А нісколькі!

– Зусім не вучылася?

– Вучылася. І багата. Толькі не таму, што некаторыя. Кароў даіць, на кроснах ткаць.

– Трэба вучыцца.

Ён цяпер знайшоў сябе. І гаварыў, і трымаўся ўпэўнена. І, падобна было, давольны быў сваёй роляю, дужага, дасведчанага. Мужчынскай роляю.

– Цяпер усюды патрэбны пісьменныя. На любым заводзе. У арцелях. Ды і калгасах. У вас жа, у школе, гурток ёсць!

– Е.

– А што ж не вучышся?

– Спрабую.

– Трэба!

Ён памаўчаў. Ганне здалося: пра яе, мабыць, думае – от з якой цемнатой звязаўся. У душы ўскінулася ганарлівае: не ўсё шчасце ў вашай грамаце. Свая грамата ёсць. «Звязаўся!» Нядоўга і развязацца. Ніхто не набіваецца. Ён раптам ашаламіў:

– А то, можа, у мястэчка давай? – Апярэджваючы яе пытанне, дадаў: – У мястэчку лягчэй будзе вучыцца.

Яна ўмомант убачыла мястэчка, чыстае, святочнае, сябе ў ім, прыбраную, незнаёмую. Мястэчка было, што там ні думай, як бы вышэйшым светам, яно вабіла. І словы Башлыкова завабілі, аж нібы закружылася галава ад прадчування нязнанага, цудоўнага... Яна намаглася, адолела непатрэбнае захапленне, прамовіла разважліва, з насмешачкай:

– Што я там рабіць буду?

– У нас арцелі там, – сказаў Башлыкоў стала, надзейна. – Работніцай можна будзе ўладзіць. Спачатку – падвучыцца трэба будзе, канечна. Пабудзеш вучаніцай. А там – майстрам станеш. Спецыяльнасць і прафесія рабочая! Рабочы клас, можна сказаць! Ну, а там і далей можна пайсці. Адтуль табе ўсе дарогі адкрыты.

– Унё, так проста! – стрымала яна сябе, хоць ад слоў яго ўсё ж нібы кружылася галава.

– Не проста, і не так страшна, як ты думаеш. – Ён, чула, зазлаваў на яе недавер'е, загаварыў гарачэй: – Я, ты думаеш, з чаго пачынаў? З таго ж, можна сказаць, што і ты. Распісацца ледзь умеў! Але рашыў: вазьмуся, адолею ўсё! І ўзяўся! Гурткі, курсы, камсамол! Работа і самаадукацыя! І дабіўся!

– Дык то вы! – знарок запярэчыла яна.

– Галоўнае: захацець і праявіць настойлівасць. І ўсяго даб'ешся. Ты зможаш, я бачу!

Праз некалькі хвілін ён раптам перарваў гарачую гаворку, сказаў клопатна:

– Ну, мне трэба ехаць. Справа чакае.

– Трэба дык трэба, – згадзілася яна, тоячы шкадаванне.

Ён завярнуў каня, тузануў лейцамі. Вазок лёгка, нячутна паплыў да шляху, пераціяў шлях. Ужо калі па баках разышлася роўнядзь шэрага поля, ён аб'явіў:

– Заўтра выберуся на больш. Зможаш?

– Прыйду.

– Туды ж?

– Добра.

3

Башлыкоў падвёз яе да гумнаў і адразу завярнуўся. Хутка вазок яго знік упоцемку.

Яна прайшла некалькі крокаў і стала на сцежцы, поўная тлумнага, супярэчлівага хвалявання. Стаяла адна сярод цемнаватага поля між загуменнем і школаю, сярод цішыні, у якую адно ўбіваліся п'яныя галасы, аднекуль з сярэдзіны сяла. Там спрабавалі спяваць. Яна не думала ні аб чым, не спрабавала разабрацца ў тым, што адбылося. Нібы разумела, што ні да чаго ўсё роўна цяпер думанне, не дадумаецца ні да чаго.

Проста хацелася пастаяць адной, пабыць з сабою. Пабыць пад гэтым паяснелым небам, з якога перастала сыпаць снегам. Цешачыся халаднаватаму ветру, што свежа абвяваў твар, парадавацца адчуванню волі, прасторы, якія так мілы цяпер душы.

Можа, ёй пасля Башлыкова нядобра было бачыцца цяпер з Параскаю. Можа, было і такое. Але яна не думала ясна пра гэта. Не хацела думаць ні аб чым. Нейкі час яна цешылася адно ноччу, цішынёю, воляю.

Неахвотна падалася да школы. Акно ў Парасчыным пакоі свяцілася, і яе кранула вінаватасць. Узяла няёмкасць перад Параскаю, і яна ўжо ясна адчула, што не проста будзе пабачыцца, глядзець у вочы ёй. Падумала мімаволі: лепш было б, каб яна спала ўжо. Каб не бачыцца цяпер, не сарамаціцца.

Нацятаю была, калі, прыцішваючы крокі, прайшла паўз паску святла з Парасчынага пакоя. Чакала з насцярожанасцю, што выйдзе з дзвярэй сама, паглядзіць, зразумее ўсё. Не выйшла. На кухні Ганна намацала лямпу, запаліла, больш для таго, каб прыглушыць сумяціцу ў душы, няцвёрдасць, стала пераціраць чысты посуд, перастаўляць тое, што было на месцы.

Рабіла так, нібы вярнулася з нейкіх адведак з сяла. Параска ўсё не выходзіла, гнулася, пэўна, над сваімі сшыткамі. Ці, можа, разумела ўсё, што на душы ў яе, Ганны, не хацела даваць прыкрасці. Ганна ж ужо як бы пачула дакор свайму хаванню, якое прыніжала яе, кранала яе гонар.

З вяртаннем гонару вярталася ўпэўненасць. Ужо як бы захацелася пабачыцца вочы ў вочы, выказаць годнасць сваю. Няхай не думае пра яе, Ганну, чаго не трэба!

Смела адчыніла дзверы.

– Слепіш вочы ўсё? – прамовіла амаль задзірыста.

Параска як бы неахвотна адарвалася ад стала. Але сустрэла нечаканай давольнаю, нават шчасліваю ўсмешкаю:

– П'еску выкапала! Такая смешная! Рогату будзе на ўсё Глінішча! Тут адна ролька ёсць, удавы-барыні! Хочаш, дам табе, па знаёмству?

– Найшла пра што! – папракнула Ганна.

– Не, я праўду! Згаджайся, пакуль не позна! А то перадумаю, сама вазьму! Зайздросная ролька! Кар'еру можна зрабіць адразу! Адразу славутай артысткай стаць! На ўсё Глінішча праславіцца! Ну?

– Хопіць мне той славы, што ўжэ е.

– От дзівачка! Удачы сваёй не бярэш! Ну што ж, я сказала! Дзела тваё! Кусай потым локці сабе! – Параска памаўчала, амаль не мяняючы тону гаворкі, сказала: – Заязджаў твой, былы. – «Былы» прамовіла з націскам, з насмешачкай.

– Гаварыў што? – не таіла насцярожанасці.

– Не, нічога. Пабачыць захацеў! Занудзіўся!

– І не пачакаў!

– Негасцінна сустрэла!

Пагаварылі яшчэ тым жа ладам, Параска раптам з адчайнай рашучасцю пазвала:

– Давай пагуляем! Першы ж дзень новага года як-ніяк! Не будзе ж больш першага?

Учора быў вечар у школе. Было поўна дзядзькоў, цётак, вучняў. Як заўсёды, і ў класах, і ў калідоры, і пад вокнамі. Даклад быў Парасчын пра новы год, вучні групкаю і паасобку спявалі песні, чыталі вершы. Была і п'еса маленькая, позна пачалі і позна скончылі, апоўначы. Параска, шчаслівая і стомленая, адно павіншавала Ганну і павалілася спаць.

Параска адразу захадзілася, кінулася ў куток, дзе стаяла шафа з адзеннем, выхапіла адтуль фасоністую бутэлечку, што бліснула густа-чырвона.

– О! Наліўка вішнёвая!

– Галіна Іванаўна спіць ужэ, – паспрабавала ўгаманіць яе Ганна.

– Ну, дык мы тут!

Параска змяла са стала кніжкі, журналы, сшыткі, паставіла слупам бутэльку. Ганна заспяшалася на кухню. Стараючыся не стукаць, хапатком унесла што было закусіць. Як ведала, уранку зрабіла студзень. Так што закускі было добрай.

– Ну от! – І словы, і выгляд Парaскі гаварылі, што вось яна хацела і дабілася таго, што належала. Яна з разуменнем важнасці моманту ўзняла чарку з наліўкай, стукнула яе з Ганнінай. – Штоб добры быў год!

– Няхай бы.

– Ды і не год. Дзесяцігоддзе пачынаецца, – прамовіла Параска задуменна. – Дзесяць гадоў... Якімі яны будуць?

Яна тут жа адагнала смутак: не для таго селі за святочны стол. І гаварыла, і трымалася весела, па-сяброўску, знаку не дала, што яна ў

якой-небудзь крыўдзе на Ганну. Як бы паказвала, што толькі дабра зычыць Ганне.

Ганна бачыла, што зычлівасць яе ад душы, што не тоіцца, і ёй станавілася ўсё лягчэй, вальней. Нарэшце разышліся так, што адна адну са смехам стрымлівалі, нагадвалі: Галіна Іванаўна спіць.

Спаць лажыліся вясёлыя, давольныя вечарам, адна адной.

У ложку, у цемры, Ганна чула, што нібы плыве. Узяла, хмеліла Ганну салодкая Парасчына наліўка. Праз хмель Ганне бачыліся дарога сярод белага поля, пусты шлях, Башлыкоў на вазку. Пачула сябе на вазку, побач з ім, так жыва, нібы і праўда цяпер сядзела з ім. У памяці пайшла іх гаворка, загучалі, захвалявалі яго словы: «Трэба вучыцца!.. А можа, у мястэчка давай? Там лягчэй будзе вучыцца... У нас арцелі там... Адтуль табе ўсе дарогі адкрыты... Я сам з таго пачынаў. Распісацца не ўмеў... Галоўнае, праявіць настойлівасць – і ўсяго даб'ешся!.. Ты зможаш, я бачу!..» Слухаючы гэта, поўнілася непаслухмяным, радасным хваляваннем. Бачыла сябе, незнаёмую, чыста апранутую, годную, у мястэчку, у Юравічах. Не адна была там, з ім! Нібы была ўжо гарадская зусім, такая граматная, як Параска. У трызненне гэта амаль неадчэпна прадзіралася цвярозае, недаверлівае. Паддаючыся яму, аберагала сябе, наганяла ў думанне одум: «Настроіла сабе бог ведае што! Так ето ўсё проста!» І ўсё ж бачыла мястэчка і сябе ў ім, і Башлыкова, і галава кружылася ад незвычайнага, што мроілася ўжо як рэальнае. «Новы год, – прайшло ў думках, як поўнае важнага значэння. – Новае пачынаецца. Пачалося!..» Чула, што як бы разарвалася ці вось-вось разарвецца ўсё, што аблытала, абціскала яе.

Сярод гэтага думання халадком працяла: ці ведае ён пра Яўхіма? Што ў яе такі муж, з такой сям'і. А калі не ведае і даведаецца, то што скажа? Але гэта адышло лёгка: мала хто быў яе мужам! Што было – сплыло.

У сне ёй бачыўся горад. Не Юравічы, а нейкі нябачаны, неймаверна вялікі. І снілася, што яна блукае, блукае па незнаёмых вуліцах, шукае і ўсё не можа знайсці свой дом. У адчаі яна прагне знайсці Башлыкова, ён ведае ўсё. І не можа ніяк знайсці яго...

4

Назаўтра, пад вечар, яна зноў была ля шляху. Першым поцемкам убачыла вазок. Башлыкоў здалёк выгледзеў яе, борзда пад'ехаў. Калі зноў збочылі ў лес, Башлыкоў спытаў раптам:

– Ты была ў Нароўлі?

– Не… – здзівілася яна.
– Я – адзін раз. З'ездзім?
Яна зразумела: сказаў невыпадкова. Абдумаў загадзя. Адказала, не вагаючыся:
– А чаго ж.
– Так і быць, – прамовіў ён задаволена. – Адзначым Новы год і сустрэчу!
Ён завярнуў вазок. Выкіраваў на шлях. Між двух блізкіх адхонаў спусціліся на грэблю. На грэблі мацней хадзіў вецер – абапал было адкрытае поле. Балота. Калі ўздымаліся шляхам пасля балота, насустрач прайшлі сані. Моўчкі размінуліся. Упоцемку было не разабраць – хто. І іх, мабыць, не пазналі.
Зноў былі адны, адны з цемрай, з ноччу.
– Утаміўся я, – сказаў Башлыкоў шчыра. – Усе гэтыя ночы – сходы. І без поспеху, можна сказаць. Не паддаюцца мужыкі. Рукамі і нагамі за лапік свой трымаюцца. Як у тваіх Глінішчах.
Ён нагадаў пра Глінішчы без злосці, пакпіў нібы смехам.
Ёй спадабаліся яго шчырасць і давер'е яго, якое за шчырасцю адчувалася. Кранула яе, што ён так проста прызнаўся, нібы папрасіў падтрымкі ў яе.
– Трудно ето людзям, – сказала яна, як бы супакойваючы яго. – Усё ж кроўю нажывалі. А тут зразу – аддай.
– Ведаю, што – нялёгка... Але ж талкуем, убіваем у галаву: ніхто не адбірае. Аб'ядноўваем для вашага ж дабра. Каб вылезлі з беднасці, з голаду.
– Многа чуў мужык абяцанак на вяку... Таму і верыць няпроста.
– Да, спадчына мінулага жыве. Але ж пара ўжо і адвыкаць ад гэтай спадчыны!.. Злуе, разумееш, глухата страшная! Колькі ні талкуй, не даходзіць!
– К мужыку падход трэба, – як больш дасведчаная, лагодна аб'явіла Ганна. Папракнула па-таварыску: – У цябе падходу не хапае. Гарачы ты, хутко хочаш! Па-гарадскому ўсё мерыш!.. Ты глядзі от як Апейка!..
– Апейка, Апейка!.. – нецярпліва перарваў яе Башлыкоў. – Не хачу я глядзець: як Апейка! Апейка кульгае – правы ўхіл, яўны!
– Ухіл ці не ўхіл, не знаю. А толькі ў яго – падход! Хітры ён!
– Хітры. Гэта – праўда, – згадзіўся ён ахвотна. Засмяяўся нават: удала падмеціла. – А я не люблю хітрасць, – выказаў ён як вельмі важнае, дарагое. – Я люблю проста, па-рабочаму! Па-партыйнаму... Я ўвесь час дасюль сярод рабочых жыў, – з гонарам і давер'ем адкрыў

ён частачку мінулага свайго. – На чыгунцы... Прывык рэзаць проста. І далей буду так.

Ёй не хацелася спрачацца з ім. Але была нязгода з тым, што ён казаў; у жыцці не заўсёды разумна гэта – рэзаць. Памкнулася памагчы, падказала яму:

– Знаеш, часам, абышоўшы, хутчэй дойдзеш, як напрасткі.

– Гэта – на балоце, – сказаў ён рэзка, амаль з насмешкай. – У палітыцы трэба ісці толькі прама.

Яна прамаўчала яму. Прытаіўшы крыўду, падумала: усё ж яны розныя вельмі, і ганарлівы занадта ён, не ўмее слухаць.

Ехалі зноў моўчкі і нібы адасобленыя. Башлыкоў, мабыць, каб разагнаць гэту нядобрую маўчанку, чужаватасць, пакпіў з сябе:

– Не прыжывуся я ўсё ніяк да вашай зямлі і да вашых парадкаў. Па дому свайму ўсё нуджуся. – Як мару выказаў: – Вось выканаю тут заданне і папрашуся назад, да сваіх. У Гомель, на чыгунку.

І гэта не спадабалася: хоць і кпіў, а нібы хваліўся горадам, парадкамі сваімі. Нібы вышэйшасць сваю паказваў. Але не адазвалася на яго прымірэнне больш з-за ранейшай крыўды. Няхай ведае, што ў нас таксама гонар ёсць.

Башлыкоў трохі маўчаў. Потым раптам захваляваў гаворкаю пра тое, што быў у Куранях, у яе хаце, пазнаёміўся з бацькамі яе.

– Маці ў цябе – з характарам!

– З характарам... – згадзілася яна.

Усё, што было да гэтага, умомант выветрылася з душы. З раптоўным халадком у грудзях чакала, што скажа зараз пра Яўхіма.

Чакала, быццам удару.

Доўгім, назольным здалося гэта чаканне. Пакуль чакала, зазлавала на сябе, на Башлыкова: што пачаў гэта; пацвярдзела душой. Гатова была ўжо як мае быць сустрэць удар, калі Башлыкоў уразіў нечаканым:

– Ты чаму адна? – Растлумачыў: – Не замужам?

Яна прыслухалася, старалася зразумець: шчыра ён гэта, сапраўды не ведае ці ад яе пачуць хоча. Па тону пытання цяжка было зразумець, чула толькі, што пытанне гэта – важнае яму. І што, можа, думаў пра гэта.

Нялёгка адужала хваляванне, выціснула, нібы жартуючы:

– Не бярэ ніхто...

– Не падобна, – цвёрда, сур'ёзна прамовіў ён. Не падтрымаў жарту.

Яна спахмурнела. Адказала нелагодна:

– Паспытала. Больш не хачу.

– А што... разышліся?

Божа мой, няўжо ён, праўда, нічога не ведае! Не ведае, пэўна ж. Што яму сказаць?

– Разышліся. – Зазлавала. – Няма яго, лічы. Памёр.

– Памёр?..

– Не хачу пра яго! – адрэзала.

Ехалі зноў моўчкі, кожны па сабе. Тады ён загаварыў, стаў лагодна, раздумліва расказваць пра сябе. Можа, таму, што вінаватым чуў за тое, што зрабіў прыкрасць ёй, а можа, ад таго, што згадка пра яе бацькоў напомніла яму пра сваё. Аказалася, і яму паспытаць давялося: не ў харомах рос, у цёмным бараку, бязбацькавічам. Бацька кінуў сям'ю, маці цёмная, зарабляла грашы, хоць рабіла свету не бачачы. Пасля работы на складзе – там прыбіральшчыцай была – вечарамі, вольнымі днямі мыла бялізну багацеям. У пакоі іх тады не было як дыхаць ад пары, сцінала грудзі, кашаль душыў. А жылі так, што хлеб не заўсёды быў на стале.

Ён старэйшы. Ледзь хадзіць навучыўся, давялося памагаць маці, зарабляць. Пачалося з бялізны, якую маці мыла, – разносіў па дамах. Тады аддалі вучыцца ў майстэрню, на цесляра. Багата перапрабаваў ён работ, пакуль знайшоў сваё месца. Але і цяпер няпроста ў яго дома: сястра, Нінка, няшчасная, калека, брат – здаровы, пешчаны, разбэсціўся зусім. З нэпманаўскай дачкою надумаў ажаніцца. Робіць яго, Башлыкова, нэпманаўскім сваяком...

Апошняе – словы пра «нэпманаўскага сваяка» – Ганну кальнула, але яна адагнала думкі пра гэта. Шчырая гаворка Башлыкова ўзрушыла яе: акрамя таго, што ёй неабыякавым было ўсё, што яму давялося паспытаць, шчырасць яго кранула Ганніна сэрца тым, што ён, не таячыся, шануючы, як бы ўвёў яе ў сваю сям'ю, у сваё жыццё. Яе ўсхвалявала, што жыццём сваім ён падобны на яе, можна сказаць, блізкі ёй. З удзячнасцю яму за шчырасць яна пачула блізкасць сваю яму.

Ад звычкі за дабро плаціць дабром яна, хоць і стрымана, коратка, расказала яму пра сваіх – бацьку, мачыху, Хведзьку. Расказала таксама шчыра, праўдзіва, ні словамі, аднак, не згадала Яўхіма і Васіля. Да тайны гэтай яна не захацела дапусціць яго. Тайна гэта, здалося, лягла між іх як нейкая вельмі чутная мяжа.

Ён ці не пачуў гэту тайну, ці не надаў ёй значэння. Абняў Ганну за плечы, прытуліў да сябе. Яна не здзівілася, не спрабавала вызваліцца. Не дзеўка, ведала, што гэта будзе. Раней ці пазней – будзе. Таячы сваю тайну, чутную ёй цяпер, маўчала, паслухмяная ў яго абдымку.

Каб не тайна гэта, ёй было б зусім хораша. Але тайна была, жыла ў ёй. Мімаволі прайшло ў думках: няўжо ён так і не ведае нічога пра Яўхіма? Для іх, для партыйцаў, гэта, здаецца, важна ж? Ці – ведае і не зважае? Смелы такі? Любіць так? Праўдзівая і смелая, яна, аднак, не наважвалася высвятляць. Баялася рызыкаваць тым, што ёсць. Адагнала думанне, неспакой, моўчкі цешылася яго ласкай, цішынёй, бегам вазка, шараватай упоцемку дарогай.

Толькі калі пачула яго далонь пад кажухом, на грудзях, адвяла руку Башлыкова.

– Не трэба.

Ён паслухаўся.

Мелькам адзначыла: ехалі незнаёмым полем. Шлях на Юравічы быў даўно ўбаку. Ішло і ішло гэта шэрае, нібы зажуранае поле. Потым поле скончылася, палезлі насустрач хаты, кінуўся пад каня сабака. Калі хаты адступілі, пачаў выбягаць чорнымі купамі нейкі лазняк. Вазок стала моцна хіліць з боку на бок, так што самой трэба было туліцца да Башлыкова.

За лазняком пайшла роўная дарога. Рака, напэўна. Штосьці бліснула ўперадзе, як бы на ўзгорку, – агеньчык нейкі. Потым яшчэ адзін, другі. Раптам вырасла, амаль усутыч, не відная раней града-бераг. Нейкім ярам сталі ўздымацца на яе, уехалі ў вуліцу. Чым далей, больш свяцілася агнёў. Башлыкоў адхінуўся. Сядзеў ужо роўна, трымаў аберуч лейцы.

Ля нейкага чалавека Башлыкоў прыпыніў каня, запытаў, дзе тут сталовая. Дзядзька расказаў, як праехаць да яе. Башлыкоў падзякаваў, рушыў далей. На плошчы яшчэ спыніў чалавека, запытаў. Нарэшце прытрымаў каня каля нейкіх светлых вокан. Загадаў ёй пачакаць, саскочыў на зямлю. Вярнуўся давольны:

– Тут. Прыехалі!

5

У вялікаватым пакоі, дзе стаяла поўна сталоў, было амаль пуста. Пасля змроку і холаду дарогі весела было мружыцца ад святла, чуць утульнасць, цяпло жылля. Святло і цяпло нібы зычылі радасць.

З чаканнем гэтай невядомай радасці Ганна і села за стол, які выбраў Башлыкоў. Ён зняў шапку, але не сеў, стоячы ля стала, заклапочана азірнуўся. Быў ён цяпер засяроджаны, строгі, падобны на таго, якім яна бачыла яго на сходзе ў Глінішчах.

Паявілася аднекуль, штосьці дажоўваючы, таўставатая цётка з фартушком, кінула нядобра позіркам на Башлыкова, на дзверы,

крыкнула недавольна: хто адчыніў дзверы! Рушыла проста да іх, не гледзячы, адрэзала:

– Усё. Зачынено.

Яна аб'явіла так, што пярэчыць было лішне. Башлыкоў не варухнуўся. У твары яго з'явілася нешта цвёрдае. Ён, відаць, стрымаў сябе, прамовіў спакойна:

– Мы з дарогі. Нам перакусіць.

Цётка ікнула. Жалезна паўтарыла:

– Сказано. Зачынено.

Твар Башлыкова яшчэ пацвярдзеў.

– Дзе загадчык?

– А што загадчык? Няма загадчыка!

– Тады паклічце буфетчыцу.

У голасе яго чулася такая цвёрдасць, што таўстуха, каб не дурная, павінна была б скеміць, з кім мае гаворку. Але не адступала, усё насядала са сваім: «Сказано!»

Башлыкоў, нібы не лічыў годным весці з ёй спрэчку, моўчкі, рашуча пакрочыў да буфета. Буфетчыца корпалася за доўгім сталом сваім са шкляным верхам, сустрэла таксама не надта ветліва, але адказала яму, і ён смела адчыніў дзверы побач. Паявіўся ён з дзвярэй з маладым, хударлявым чалавекам, што пакульгваў. Чалавек гэты штосьці сказаў буфетчыцы і пазваў афіцыянтку, тая была ўжо ля аднаго століка, разлічвалася з людзьмі. Яе, аказалася, звалі Надзяй.

Афіцыянтка, не хапаючыся, строячы з сябе няшчасную, паклыпала да буфета.

Усё гэта здарэнне адазвалася ў Ганне такой прыкрасцю, што яна глядзець на гэта не хацела. На яе характар, яна з такой ласкі ўстала б даўно і, пекануўшы належным слоўцам дурную таўстуху, з пагардай на твары выйшла б сама. Трэба яна ёй, такая вячэра, калі такі прывет. Але разам з тым, бачачы ўсё гэта, яна не магла не адзначыць, як трымаўся ў паганай гэтай гісторыі Башлыкоў. Тое, як ён годна гаварыў, як настойліва дабіваўся і дабіўся свайго, выклікала не толькі павагу да яго, але і ўдзячнасць: так клапаціўся, можна сказаць, пра яе. З гэтым жылі і прытоенае захапленне, гонар: з такім можна не баяцца нічога, такі не дасць у крыўду.

Ён прынёс ад буфета цёмную бутэльку, дзве шклянкі. Бутэльку паставіў між іх, адну шклянку перад Ганнай. Спрэчка, было відаць, запаліла яго, твар быў неспакойны яшчэ, але было ў ім ужо задавальненне тым, што ўсё ж дабіўся свайго.

– Ёсць толькі катлеты, – буркнула таўстуха, стаўляючы сподак з тоўстымі скрылікамі хлеба.

– Давайце катлеты.

Башлыкоў не глянуў на яе. Помсціўся за абразу. Узяў бутэльку, адкаркаваную ўжо – корак тырчаў толькі для прыліку, – лёгка выняў корак. Паднёс бутэльку перш да яе шклянкі, стаў далікатна наліваць. Калі наліў да паловы шклянку, яна ўзялася за бутэльку, сказала, што ўжо годзе, але ён лагодна адвёў яе руку, даліў поўна. Тады ўжо наліў сабе.

Віно было чырвонае, густое, падобнае на вішнёўку. На бутэльцы, аднак, была паперка з нейкімі зялёнымі ягадамі, гарамі, прыгожымі залатымі літарамі.

– За наша шчасце, Ганна, – Башлыкоў глядзеў ёй у вочы, глыбока, прыхільна. – За Новы год!

У голасе яго як бы было штосьці асобае: абяцанне і спадзяванне нібы. Голас гэты незразумела хваляваў.

Віно было добрае, салодкае. Не вішнёўка, невядомае нейкае. Не тое што дурная самагонка. Гэтае хацелася піць, смакуючы. Яна і смакавала, хоць і старалася не паказваць гэтага.

Незвычайнае, дзіўнае віно гэтае як бы ўзмацняла незвычайнасць усяго, што адбывалася. Ён выпіў, адзначыла, да дна, адзначыла з павагаю, бо помніла, Параска казала, не п'е наогул. Дзеля яе, значыць, выпіў. Яна ўсё ж стрымалася, выпіла толькі палову, як і належала. Палову пакінула ў шклянцы. Ён заўважыў, папрасіў дапіць, але яна не паддалася. Паказала, што дбае аб прыстойнасці. І ела катлету з тоўчанай картопляй, таксама помнячы сябе. Не як галодная.

Башлыкоў даліў ёй у шклянку, а сабе зноў наліў поўна. І зноў яна не дапіла. Елі моўчкі. Трымаліся як проста знаёмыя, нібы нават чужыя. Ганне гэта падабалася: нашто ж сарамаціцца перад людзьмі, выстаўляць тое, што ў душы. Тое, што ў душы, у душы і павінна быць. Для адных іх. Башлыкоў на людзях, бачна, паводзіў сябе так, нібы за ім увесь час назіраюць. Яна – разумела ж усё – трымалася таксама так, каб ніхто не падумаў нічога. Не глядзела нават на яго, хоць некалькі разоў чула вострыя позіркі яго на сабе. Але, хоць амаль не гаварылі, хоць амаль не перамаўляліся і вачыма, было ў Ганны і, пэўна ж, у Башлыкова харошае адчуванне блізкасці, святочнасці.

Да ўсяго і віно хоць і слабое, а ўсё ж паволі брала больш і больш. Хмеліла галаву, усё цела. Ганна чула сябе ўсё лягчэй. Усё весялеў і ён, весялеў і нібы прыгажэў. Рабіўся прасцейшым, бліжэйшым.

6

Яны скора ўзняліся, выйшлі. Калі сталі пры вазку, Башлыкоў узяў яе за локаць, нахіліўшы твар да яе, сказаў шчыра, з прыяцельскім смехам:

– Ты ведаеш, ад самага прыезду ў мяне першы такі вечар. Што я вось так – гуляю...

Ён дзівіўся з сябе, запрашаў яе падзівіцца. Захмялелы, ён быў, здавалася, зусім адкрыты і дабрэйшы. І нібы маладзей выглядаў.

Тут, упоцемку, на адзіноце, было лепш, лягчэй: не крывілася таўстуха, не карцелі іншыя, не трэба было так берагчыся чужых вачэй. Вальней было. І пасля цяпла і віна ў радасць быў халодны вецер, што пачынаў мясці снегам.

Яны селі ў вазок і паехалі па мястэчку, што моўчкі абступала іх каменнымі і драўлянымі пабудовамі, дрэвамі, цемраю, сярод якой яшчэ часта значыліся светлыя вокны. Але ўсё гэта мала цікавіла Ганну: мястэчка як мястэчка, што тыя ж Юравічы.

На халодным ветры хмель хутка сыходзіў, у галаве яснела. І хоць нібы, як і раней, добра было, ужо больш і больш учэпліваліся, вярэдзілі думкі. Ноч. Дадому няблізка. Пакуль дападуць, будзе за поўнач. Як яна явіцца да Параскі ў такі час. І не так Параскі трывожыцца трэба, як Галіны Іванаўны. Гэтая не тое што Параска – строгая, недавольная век. Пачуе адразу, выгаворваць стане. І да дня далёка; калі надыдзе той цяперашні, позні дзень! Дзень, у які можна будзе вярнуцца як бы з адведзін. Узяло раптам; можна было б, праўда, явіцца ў Бярозаўку, да цёткі! Можна было б, запярэчыла сабе, – але не сярод ночы!.. Як ні думай, пакпіла з сябе, застаецца адно: начаваць у полі ці ў лесе, на марозе!.. А чаго ж, падхапіла задзірыста, – можна і ў полі, на марозе! Такой бяды!..

Пра штосьці, можа, пра тое ж самае, думаў і Башлыкоў. Яна наогул не любіла, калі ён уцінаў падбародак у каўнер паліто, задумваўся: тачылася падазрэнне, нібы яго бярэ нядобры одум. Цяпер падавалася, быццам ён шкадуе, што выдумаў гэта, палез невядома чаго ў такую далеч.

Яна першая і бадзёра заявіла, што – пара дадому! Нагляд зеліся, наездзіліся ўжо. Башлыкоў як бы толькі і чакаў, адразу павярнуў каня, відаць, да берага. Вецер біў цяпер амаль насустрач, кідаў свежым снегам. Адчувалася, што завея ўсё разыходзіцца. Ганну не палохала завея, нават радавала яе, уздымала дзіўна весялосць. Разганяла нудныя развагі. Нешта завейнае, мяцельнае білася ў Ганне.

Праз завейную мітусню яна чула адгукалася на ўжо рэдкія агеньчыкі ў хатах. Агеньчыкі гэтыя трывожылі і вабілі яе: там, дзе яны бліскалі, мроілася Ганне жыццё, якога яна не ведала, не падобнае на яе. Там, з гэтымі агнямі, бег паўз яе свет, не толькі незнаёмы, але і ўтульны, поўны святла і цяпла. Свет, які ледзь адкрыўся ёй, дзякуючы Башлыкову. І які павінен быў вось-вось зікнуць.

Што іх чакае там, у полі? Сярод мяцеліцы, што разгульваецца. На самым выездзе з вуліцы, дзе блізка зашарэла шырокая рухомая роўнядзь, бліснуў яшчэ агеньчык, як апошні кліч. І яна раптам з тым імкненнем, якое ўскідвалася ў ёй умомант, схапіла Башлыкова за руку, за лейцы:

– Давайце заедзем!

Ён стрымаў каня. Азірнуўся на акно. Нейкі час глядзеў туды. Адарваў позірк, думаў, вагаўся.

– Дадому позно, – выказала нецярпліва яна. – Да й мяцеліца...

Ён без асаблівай ахвоты пад'ехаў бліжэй, сышоў з вазка. Пастукаў у акно, на якім ад святла з сярэдзіны паблісквалі марозныя ўзоры. Там, за марознай мярэжай, паявіўся цень. Прытуліўшыся да яго, Башлыкоў папрасіў:

– Выйдзіце на хвілінку.

Цень нейкі час яшчэ чарнеў на шыбе. Потым прапаў, у доме чулася нейкая гаворка. Нарэшце стукнулі дзверы недзе, потым рыпнулі веснічкі пры варотах. У іх акрэслілася цьмяная постаць, можна было вызначыць – мужчына ў кажуху.

– Хто тут? – У голасе дзядзькі чуліся цікаўнасць і неспакой. Але ён прыхоўваў іх, гаварыў спакойна, амаль абыякава.

– Мяцеліца разгульваецца, – сказаў Башлыкоў, здалося, яшчэ з нерашучасцю. – Ці не можна спыніцца ў вас, пакуль прыціхне?

Так, Ганна прыкмячала, Башлыкоў адчуваў сябе няёмка. Але можна было падумаць, няёмкасць гэта была да таго, што трэба прасіць, даваць людзям клопат. Бачачы, што дзядзька-гаспадар прыглядаецца да іх, ахвотна памагла Башлыкову:

– У Хвойнікі едзем. З Міхалак. У гасцях былі, дак от позно выбраліся.

Яна лёгка выдумляла, было весела ад таго, што яна вось лаўчэй за Башлыкова ўмее распарадзіцца ў бядзе. Як бы разумней за яго.

Дзядзька прыгледзеўся і адчыніў вароты. Заехалі, распраглі каня, паставілі ў хляве, далі з вазка сена. Разам з дзядзькам падаліся да ганка. Башлыкоў доўга абтрэсваў, абіваў снег на ганку, у сенцах.

Усе, хто быў у хаце, адразу з цікаўнасцю навастрыліся на іх. Былі тут немаладая, вясковага выгляду жанчына, што нешта латала,

чарнявая, падобная на маці, дзяўчынка гадоў дванаццаці за сталом, з кніжкай.

Адзін хлопец, трохі меншы за дзяўчынку, стрыжаны, бялявы, сядзеў на палку пры печы. Двое ці трое зырылі з печы.

Ганна і Башлыкоў весела прывіталіся.

– Папрасілі ў гаспадара вашага дазволу перабыць ноч. Мяцеліца разгулялася... – сказаў Башлыкоў да гаспадыні, стараючыся трымацца проста.

– А чаго ж, пабудзьце, – адказала прыхільна жанчына. – Тут і заблудзіцца нядоўга. На рацэ і ўдзень, бувае, з дарогі збіваешся. Калі ў мяцеліцу бярэшся з таго боку...

Башлыкоў, бачыла Ганна, быў насцярожаны. Перахапіла, як ён востра зірнуў на гаспадара, нібы правяраў: ці не знаёмы той, ці не пазнаў, хто да яго ў госці. Хоць стараўся трымацца ўпэўнена, Ганна адзначыла, што ён стоена нацяты. Неспакойнаю была і яна. Нават пашкадавала раптам, што падбіла Башлыкова завярнуць сюды. У той момант здалася не так ужо і страшнаю ноч у полі.

Але змяняць позна было. Заехалі, дык заехалі, трэба прынараўлівацца да таго, што ёсць. Павяла бяседу, якую належала весці ў чужой хаце, каб паказаць сябе як гасцей найлепшым чынам. Як бы дзякавала за прытулак, паскардзілася: на вуліцы мяце – страх, холад бярэ, конь змарыўся. Упікнула сябе за неразумнасць: позна выбраліся, не паслухаліся добрых людзей, раілі ж пачакаць да раніцы. «Праўда, – разважыла з одумам, – хто ж тады знаў, што будзе так. Ціхо ж саўсім було!»

За гэтым узялася распытваць пра сям'ю. Перш пра дзяўчынку, што хілілася над сталом, – як завуць, як вучыцца, пахваліла: відно адразу, што старатлівая. Пацікавілася пра хлопца на прыпеку, пра тых, што зіркалі з печы. Башлыкоў гаварыў мала, Ганна проста падзівілася, да чаго ён няспрытны быў тут. Праўда, гаспадар трапіўся таксама не надта гаваркі, але ж няўжо не можна было яму, такому адукаванаму, разгаварыць дзядзьку. Маўчалі абодва, дымілі адно папяросамі.

Падобна было: Башлыкоў усё не мог прызвычаіцца да таго, што заехаў сюды. Папракае, пэўна, сябе, яе. Зазлавала раптам на яго, ну і хай, сам вінаваты ва ўсім! Сам выдумаў ехаць на ноч гледзячы! А мерзнуць у полі яна не будзе! Вялікая ахвота калець у полі такую ноч! Тут гаспадыня ў гаворцы, нібы знарок, назвала ёй Башлыкова: «ваш чалавек»! Ганна ад неспадзеўкі ледзь не выказала праўду, але ў час спахвацілася: паказала абыякавасцю, як бы даўно прывыкла да гэтага – яе «чалавек». Пазней ужо не вытрывала, хітравата блiснула на

Башлыкова, затаіўшы смех: значыцца, ужо «чалавек і жонка»! Як ён да гэтага, неспадзяваны «чалавек»?

Гаспадыня перарвала гаворку, захадзілася: трэба ж даць павячэраць людзям з дарогі. Яна адразу папрасіла прабачыць, што жывуць бедна, ды і павячэралі ўжо, так што няхай госці не крыўдуюць. Башлыкоў адразу перастаў дыміць, устаў нават, цвёрда аб'явіў, што павячэралі зусім нядаўна таксама, заехалі ў сталовую. Ганна памагла яму. Але гаспадыня ведала закон, зрабіла сваё: паставіла міску з гуркамі, міску з капустай, нарэзала трохі хлеба. Ганна для прыліку ўзяла гурок, з'ела са скібачкай хлеба. Паспытала капусты, пахваліла ўсё, падзякавала. Следам за ёй пачаставаўся і яе «чалавек».

– Мы вам у баковачцы, – сказала раптам гаспадыня.

Ганна ад гэтай навіны стаілася. Мімаволі зірнула на Башлыкова.

Башлыкоў не паказаў неспакою. Ён ужо ўстаў з-за стала, намерыўся было, відаць, зноў задыміць, пацягнуўся ў кішэню за папяросамі. Пачуўшы словы гаспадыні, перахапіўшы Ганнін позірк, ён прамовіў паважна, стрымана:

– Не трэба. – Ён павёў вачыма па лаўках абапал стала. – Нам вось тут. На лаўках.

Гаспадыня разважыла па-свойму.

– Вы не думайце нічога, – супакоіла Башлыкова і Ганну. – Там – чысто.

– Я не пра тое, – заявіў Башлыкоў. Ён на момант запыніўся: што ж сказаць. – Што ж мы – прыехалі і адразу – высяляем гаспадароў.

– А нічога! – не адступала жанчына. – У нас такі парадак. «Госцю – гадзі», кажуць.

– «Госцю гадзі, да й сябе – глядзі!» – падхапіла, падтрымала Башлыкова Ганна.

– Глядзім, глядзім і сябе! – запэўніла гаспадыня. – На палку паспім. Пры цяпле. А вы не сумнявайцеся. Там – чысто. Добра будзе. Ідзіце, перадыхніце. Рано ж ехаць, да й дарога не блізкая.

– У вас і тут, на лаўках, добра, – паспрабавала адгаварыць гаспадыню Ганна. – Лепей не трэба!

Гаспадыня палічыла іх развагі, мабыць, за звычайную гаворку для прыліку. Загадаўшы малым спаць, запытаўшы старога, ці зачыніў вароты, параіла Башлыкову і Ганне:

– Лямпу вазьміце.

Спрачацца не мела толку. Ганна для прыліку сказала:

– Нічога. Так разбярэмся.

Праз адчыненыя дзверы Ганна ўжо разгледзела: баковачка была вузенькая, адразу за дзвярыма пры сцяне стаяў ложак, засланы даматканаю, у клетачку, коўдраю. Ганна, ідучы туды, пачула, як стала холадам поўніцца, калаціцца сэрца. Яснай, ліхаманкавай свядомасцю чула: гаспадары сочаць, чакаюць, стаяць, нельга, трэба ісці. З абыякавым выглядам рабіць усё, што належыць. Перамагаючы халадок у сэрцы, трывогу, зайшла ў баковачку і раптам зазлавала на сябе: чаго гэта яна так, бы на шыбеніцу! Адчула такі прыліў смеласці, хоць з гары галавой уніз. Рашучымі рухамі зняла валёнкі, скінула жакет, паклала на спінку ложка, каля акна. Мелькам адзначыла: акно зеленавата шарэла ад нейкага святла.

Не раздзяваючыся больш, адважна ўзняла коўдру, схавалася пад ёй.

Без трывогі слухала, як мерным крокам увайшоў Башлыкоў. Зачыніў дзверы. Упоцемку сеў на край ложка, пачакаўшы момант, нібы яшчэ падумаўшы, стаў шаргаць ботамі. Здымаў іх. Спачатку адзін, потым другі. Распеазаўся, зняў гімнасцёрку. Рабіў усё марудна, цяжка. Як бы раздумваў усё – рабіць не рабіць. Лёг, нарэшце.

Ляжаў нерухома. Можа, раздумваў: правільна ці няправільна зрабіў. «Муж і жонка»! Ганну раптам узяў дураслівы смех, ледзь утрымалася, каб не зарагатаць.

Не зарагатала. Помніла: гаспадары не спяць, чуваць усё.

Ён доўга ляжаў, думаў. Потым Ганна пачула, павярнуўся да яе, на плячо яе лягла гарачая рука. Пагладзіла плячо.

– Давай спаць! – параіла шэптам яна.

Ён не паслухаўся, абняў, прытуліў да сябе. Яна пацалавала яго, як хлопца, і рашуча адхіліла. Загадала:

– Спі!

Ён сілаю прыцягнуў яе да сябе, сціснуў. Стаў нецярпліва шукаць яе вусны, цалаваць. Цалаваў вусны, цалаваў шчокі, шыю. Гарачэў. Рукі нецярпліва хадзілі па спіне, па плячах, дакраналіся грудзей, дрыжалі. Яна адказвала на яго пацалункі, адзывалася на яго пяшчоты, яе самую ўсё больш паліў агонь. Ёй самой хацелася згарэць у гэтым шалёным, нясцерпным агні.

Але калі рука яго, пагладзіўшы калена, хутка пайшла вышэй, яна сціснула руку, адвяла яе. Выдыхнула горача, непахісна:

– Не.

Ён ці не паверыў ёй, ці не мог стрымацца. Стаў дамагацца, злаваць, хацеў узяць сілаю. Але чым больш шалеў ён, тым больш

упарцілася ў ёй нейкая нязгода, крыўда. Нешта такое, цераз што яна і сама не магла пераступіць. Што мацней было за яе.

Ён не разумеў гэтага. Не дабіўшыся, знясіліўшыся, прымушаны маўчаць, ён потым глядзеў кудысьці ў столь, часта, злосна дыхаў. Мабыць, лаяў моўчкі яе. Не мог зразумець яе.

А ў ёй расла крыўда. Крыўда і расчараванне. Доўга не магла заснуць.

7

Яна прачнулася ад таго, што побач успыхнуў агеньчык.

Ад сну першы момант не магла ўцяміць: хто побач, дзе яна. Кальнуў неспакой: Яўхім? Тады ўжо стала ўспамінаць учарашняе.

Башлыкоў свяціў запалкаю на гадзіннік.

– Трэба ўставаць, – сказаў клопатна, заўважыўшы, што яна прачнулася.

Ён узняўся, пашукаў рукамі ўпоцемку, надзеў гімнасцёрку, стаў абувацца. Тады, як ён адзеўся, абуўся, усхапілася яна, знайшла валёнкі, звыкла ўздзела жакет. У акне было цёмна, відаць, толькі бралася на золак.

Пад дзвярыма засвяцілася паска святла, прарэзаліся шчыліны з боку дзвярэй. У хаце запалілі лямпу.

– Чаго ето так рано? – спаткала іх гаспадыня, калі яны, жмурачыся ад святла, выйшлі ў пакой.

– Пара, – сказаў Башлыкоў сабрана. – Дарога няблізкая.

– Ці добра хоць спалі?

Пытанне гэта нядобра кальнула Ганну. Здалося, нібы не толькі гасцінная зычлівасць была ў ім.

– А як жа, – знарок абыякава адказала. – Добра. Як лягла, дак зразу – як у прорву. І не павярухнулася.

Гаспадыня, больш для прыліку, сказала, што, можа, перакусілі б перад дарогаю. Але Башлыкоў, не вагаючыся, адмовіўся:

– Дзякуем. Не хочацца яшчэ.

Ганна адзначыла: быў ён сёння, падобна, больш затоены і нейкі будзённы. Твар выдаваў цвёрдым, строгім. Інакш і яна адчувала ўсё, будзённа і цвяроза. Як бы пасля хмелю.

З гэтым настроем абое моўчкі адзяваліся каля парога. Завязаўшы хустку, яна падзякавала гаспадыні, гаспадару, што от далі прытулак, выратавалі, можна сказаць. Выйшла нібы заклапочаная на двор. Башлыкоў, адзеты зусім, не пайшоў услед. Затрымаўся сказаць свае словы ці, можа, – падумала раптам – заплаціць!

На дварэ было вельмі холадна. Рана. Яшчэ і не днела. Згадала востры развітальны позірк гаспадыні, няёмкасць гаспадара: нешта прыкмецілі, мабыць. Здагадаліся, ці што, якія чалавек і жонка?.. Не дай бог, яшчэ за начаванне плаціць захоча! Зусім здзівіць, насцярожыць...

Лягчэй стала, калі выехалі з варот, засталіся адны. Пацверазелым позіркам у паяснелай, без завеі, шэрані бачыла, як сыходзілі яшчэ хаты, трохі ўбаку, якіх учора нібы не было відаць. Спусціўшыся па схіле, апынуліся на цёмнай аднастайнай роўнядзі. Былі цяпер навокал толькі снег, ноч, шырокая цішыня, і яны адны сярод снегу, цішыні.

Снег свежа, чыста пах. А ў душы свежасці, чысціні не было. І лёгкасці, радасці не было.

Дарога была там і тут замецена гурбамі снегу, і конь груз, ішоў паволі. Яго ніхто і не паганяў, спяшацца не было чаго, часу было даволі. Ужо добра ўехалі другім берагам, калі развіднелася, прасторна расхінулася белая шырыня. Амаль увесь час Башлыкоў маўчаў, думаў, жыў нейкімі сваімі сур'ёзнымі клопатамі.

Калі завіднелася наводдаль Бярозаўка, Ганна папрасіла стаць. Сказала: пойдзе далей пешкі.

– Падвязу яшчэ, – прамовіў ён.

– Не трэба.

Ён спыніў каня.

Яна не адразу сышла. Сядзела момант, унурыўшыся ў каўнер, думала яшчэ. Потым ускінула галаву, зірнула адважна ў вочы яго. Асмелілася на тое, што гняло і што баялася адкрыць. Што будзе, тое будзе! Няхай ведае!

– Ты чаго? – здзівіўся ён.

– От думаю. Вінавата я перад табой...

– Вінавата?

– Вінавата. Вельмі. Не сказала табе, што трэба.

– Што?

– Хто буў мой муж.

– Хто ён?

– Яўхім. Глушак Яўхім. З Куранёў.

– Яўхім Глушак!

Яна бачыла: твар Башлыкова раптам вачавідкі пашарэў. Твар гэты працяла трывога. Але разам Башлыкоў глядзеў так, як бы не верыў. Як бы чакаў, што яна зараз скажа – пажартавала.

– Вы развяліся?..

Пытаў так, нібы шукаў прасветліну. Бязлітасная да сябе, адказала:

– Развяла нас доля.

Яна саскочыла з вазка. Намерылася ісці, але стала, павярнулася да яго. Момант глядзела на яго, як бы чакала чагосьці. Тады штосьці ўскінулася ў ёй. Хутка, парыўна ступіла да яго, сціснула, пацалавала. Аддала пацалунку, здалося, усю сябе.

– От усё! – сказала рашуча, жорстка.

І з той жа рашучасцю адарвалася. Пайшла ад яго. Разумеючы ясна, што ідзе назаўсёды. Што ўсё скончылася. Ледзь пачаўшыся.

1976

Мележ І.
Завеі, снежань: Раман з “Палес. хронікі”: - Мн., Маст. літ., 1995. – 240 с.

ISBN 985-02-0190-8

“Завеі, снежань” – трэці раман з “Палескай хронікі” Івана Мележа.